Ягор Новікаў

# Ваенная гісторыя

## беларускіх земляў да канца XII ст.

Том 2

Мінск
2007

ВАЕННАЯ
ГІСТОРЫЯ
БЕЛАРУСКІХ
ЗЕМЛЯЎ

Λ

GEORGIVS NOVICIANVS

# RES GESTÆ MILITARES RVTHENIÆ ALBÆ

MINSK
MMVIII

Ягор Новікаў

# ВАЕННАЯ ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯЎ

(ДА КАНЦА XII СТ.)

Том 2

МІНСК
Выд. І. П. Логвінаў
2008

УДК 930
ББК 63.3
Н 73

*Рэцэнзенты*

**Бохан Ю. М.**, доктар гістарычных навук, загадчык кафедры эканамічнай гісторыі БДЭУ

**Трусаў А. А.**, кандыдат гістарычных навук, дацэнт

*Навуковы рэдактар*

**Кананoвіч У. І.**, кандыдат гістарычных навук

**Новікаў, Я. У.**

Н 73 Ваенная гісторыя беларускіх земляў (да канца XII ст.). Том. 2 / Ягор Новікаў. – Мінск : Логвінаў, 2008. – 300 с.

ISBN 978–985–6800–65–1.

Другі том кнігі прысвечаны двум апошнім перыядам раннесярэднявечнай ваеннай гісторыі беларускіх земляў. Час магутнасці працягваецца ад 970-х гг. да 1101 г. і адзначае росквіт Полацкага княства і Кіеўскай дзяржавы, у склад якіх уваходзілі тады беларускія землі. Час міжусобных войнаў ахоплівае 1102–1200 гг. Зместам яго з'яўляецца палітычны крызіс старажытнарускіх княстваў і іх міжусобныя войны, якія садзейнічалі ўзвышэнню Літвы і заклалі падмуркі ўзнікнення Вялікага Княства Літоўскага. Акрамя гісторыі Полацкага і Тураўскага княстваў і гарадоў Беларускага Панямоння даследванне таксама закранае падзеі гісторыі Смаленшчыны, часткова Чарнігаўшчыны, Літвы, яцвягаў і Падляшша, разглядаючы іх як неад'емную частку беларускай палітычнай і этнічнай гісторыі.

**УДК 930**
**ББК 63.3**

**ISBN 978–985–6800–65–1**

© Новікаў Я. У., 2008
© Логвінаў І. П., выдавец, 2008

# ЗМЕСТ

*Кніга III.*
**Перыяд магутнасці**
**(970-я гг. – 1101 г.)**

**Раздзел 1. Гісторыя войнаў .................................... 9**

**Раздзел 2. Уплыў вайны на развіццё грамадства .......... 58**
А) Ваенны фактар у палітычным развіцці грамадства .................................. 58
Б) Ваенны фактар у эканамічным развіцці грамадства .................................. 64
В) Уплыў вайны на развіццё духоўнай культуры .................................. 65

**Раздзел 3. Ваеннае майстэрства Тураўскай і Полацкай земляў, радзімічаў, яцвягаў і Літвы ў 970-я гг. – 1101 г. .................................. 79**
А) Вайсковая арганізацыя .................................. 79
Б) Зброя .................................. 92
В) Умацаванні і аблога .................................. 99
Г) Стратэгія і тактыка .................................. 112

*Кніга IV.*
**Перыяд міжусобных войнаў**
**(1102–1200 гг.)**

**Раздзел 1. Гісторыя войнаў .................................. 134**

**Раздзел 2. Уплыў вайны на развіццё грамадства ........ 191**
А) Ваенны фактар у палітычным развіцці грамадства .................................. 191
Б) Ваенны фактар у эканамічным развіцці грамадства .................................. 214
В) Уплыў вайны на развіццё духоўнай культуры .................................. 216

*Раздзел 3.*

**Ваеннае майстэрства Полацкай, Смаленскай і Тураўскай земляў, Літвы і яцвягаў у 1102–1200 гг. ........ 224**

А) Вайсковая арганізацыя ........ 224

Б) Зброя ........ 236

В) Умацаванні і аблога ........ 244

Г) Стратэгія і тактыка ........ 250

**Заканчэнне ........ 279**

**Summary ........ 285**

**Бібліяграфія ........ 302**

Кніга III.

# Перыяд магутнасці
# (970–я гг. – 1101 г.)

# *Раздзел 1.*
# Гісторыя войнаў

Перагорнем яшчэ адну старонку ваеннай гісторыі беларускіх земляў, і нашым вачам адкрыецца час, аднолькава падобны і непадобны да ранейшых часоў панавання нарманскіх валадароў; падобны шматлікімі войнамі, дзе здабываліся і губляліся ўлада, багацце і слава; непадобны тым, што войны гэтыя нашмат часцей прыводзілі да трывалых вынікаў. IX–X стст. былі часам рабаўніцкіх паходаў ліхіх дружын. Гэта быў час яркай, але нетрывалай славы, якая зорным пылам захавалася на небасхіле сагаў і летапісаў, але не заўсёды ўплывала на гістарычны працэс. Правіцелі і палкаводцы канца X–XI стст. былі такімі ж ваяўнічымі і славалюбівымі, як і іх папярэднікі, але будавалі свой поспех на больш трывалым падмурку. Яны кіравалі значна больш спелымі і структураванымі грамадствамі, а войны, якія яны вялі, служылі дасягненню і замацаванню сталых інтарэсаў гэтых грамадстваў. Іх слава прыпадобілася ззянню сузор'яў, якое даносіцца ў аддаленыя куткі прасторы праз стагоддзі. Іх ваенныя поспехі і дзяржаўнае будаўніцтва былі вялікімі самадастатковымі дасягненнямі свайго часу, а ў будучыні сталі падмуркам, ад якога лінія пераемнасці працягнулася наўпрост да пазнейшых дзяржаўных фармаванняў на беларускіх землях. Таму і слова «магутнасць» зусім не з'яўляецца гіпербалай пры апісанні тагачасных падзей. Полацкае княства стала грозным супернікам Кіева і Ноўгарада і пашырыла сваю ўладу ў бок суседніх балцкіх земляў. Тураўцы здабылі сабе крывавую славу ў змаганні за кіеўскі стол. Літва няўхільна рушыла па дарозе ўнутранага развіцця, якое паволі заклала асновы яе па-знейшага ўзвышэння. Радзімічы ж і яцвягі пакінулі незабыўныя сляды сваёй мужнасці ў няроўным змаганні з мацнейшымі суседзямі.

Усё ж шлях да будучых здзяйсненняў быў цяжкім і доўгім. Пасля падзення незалежнасці Полацка і Турава і замаца-

вання Уладзіміра ў Кіеве ў канцы 970-х гг. жалезная хваля ягоных войскаў ізноў пракацілася па беларускіх землях, гэтым разам з поўдня на поўнач. Першачарговымі задачамі Уладзіміра пасля здабыцця кіеўскага стала былі вяртанне земляў, якія адпалі ад Кіева падчас міжусобіц і яшчэ раней, забеспячэнне межаў там, дзе ім пагражалі знешнія ворагі і замацаванне дасягнутага заваяваннем іншых стратэгічна важных тэрыторый.

У дачыненні да беларускіх земляў першай такой ваеннай акцыяй Уладзіміра быў паход на яцвягаў, які, вельмі верагодна, быў звязаны з ягонымі намаганнямі па адваяванні ў Польшчы чэрвенска-перамышльскіх земляў, адабраных у Русі князем Мешкам[1]. У 981 Уладзімір заняў і Перамышль, і Чэрвен. У 983 г. ён рушыў на «Ятвяги и победи Ятвяги и взя землю ихъ».[2] Такім чынам ён далучыў да сваіх уладанняў яшчэ адзін край, адсунуў мяжу ад ключавых чэрвенска-перамышльскіх земляў на поўнач і паўночны захад і пазбавіў іх ад пагрозы набегаў ваяўнічых яцвягаў.

Наступнай мэтай Уладзіміра сталі радзімічы, якія карысталіся незалежнасцю ад Кіева яшчэ з часоў Ігара. У ходзе ягонага паходу 984 г. ваявода Воўчы Хвост разбіў радзімічаў на рацэ Пішчане.[3] Гэтым самым Уладзімір вярнуў сабе кантроль над землямі па ўсходнім беразе Дняпра, якія знаходзіліся даволі блізка ад самога Кіева.

Аднаўленне моцы Кіева выражалася не толькі ў захопе і падпарадкаванні новых і адпалых земляў, але і ў сталым дзяржаўным і ваенным будаўніцтве. Стан тагачаснага грамадства вымагаў увядзення і ўкаранення складанейшых метадаў кіравання, культурных навін і стварэння інфраструктуры дзяржавы ў адпаведнасці з патрабаваннямі моманту. У рэчышчы гэтай тэндэнцыі каля 980 г. Уладзімір прадпрыняў няўдалую спробу стварэння агульнадзяржаўнага паганскага пантэону.[4] Следам за яе правалам ён пачаў схіляцца да прыняцця праваслаўнай версіі хрысціянства. Пасля ўдалага паходу 988 г. на візантыйскія ўладанні ў Крыме і

---

1 Пашуто В. Т. *Внешняя политика Древней Руси.* С. 32.
2 Лаврентьевская летопись. Ст. 81–82.
3 Тамсама. Ст. 83–84.
4 Тамсама. Ст. 79.

ўзяцця Корсуня (Херсанеса)[5] каля 990 г.[6] адбылося ўвядзенне Уладзімірам хрысціянства ў яго візантыйскай версіі ў якасці дзяржаўнай рэлігіі. Гэтая падзея дала магутны штуршок палітычнаму, эканамічнаму і духоўнаму развіццю грамадства на ўсходнеславянскіх і прылеглых землях і аблегчыла доступ на іх дасягненням хрысціянскай цывілізацыі. Адначасова з прыняццем хрысціянства адбылося і правядзенне важнай адміністрацыйнай рэформы. Уладзімір разаслаў сваіх сыноў па буйнейшых гарадах Русі ў якасці намеснікаў, што надало пэўную трываласць і цэнтралізаванасць сістэме дзяржаўнага кіравання і паклала канец існаванню племянных княжанняў.[7] На полацкае намесніцтва быў пасаджаны сын Уладзіміра і Рагнеды Ізяслаў. Тураўскім намеснікам стаў Святаполк.[8] Акрэсленыя абрысы набывала абарона межаў дзяржавы. Будаваліся гарады, якія выконвалі функцыю ўмацаваных пунктаў, палітычных, эканамічных і культурных цэнтраў. Заўважную ролю ў гэтай дзейнасці кіеўскага князя адыгрывалі жыхары беларускіх земляў. Падобна многім уладарам вялізных шматковых дзяржаў Уладзімір імкнуўся вырашыць праблему іх паяднання шляхам перасялення падданых з адных мясцовасцяў у іншыя. У мэтах абароны паўднёвай мяжы ад печанегаў, каля часу прыняцця хрысціянства ён «нача ставити городы..., и поча нарубати муже лучьшие отъ Словенъ, и отъ Кривичь, и отъ Чюди, и отъ Вятичь, и отъ сихъ насели грады».[9]

Усё ж, хаця дзяржаўнае ўладкаванне Русі часу Уладзіміра і было крокам наперад у параўнанні з ранейшым перыядам, але і яно не выяўляла дастатковай згуртаванасці паміж рознымі землямі, якія ўваходзілі ў яе склад. Занадта моцна адрознівалася іх геаграфічнае становішча, этнічны склад і палітычныя памкненні. Падобна імперыі Карла Вялікага, паўночнай дзяржаве Кнута Вялікага, Вялікама-

---

[5] Лаврентьевская летопись. Ст. 109–111.

[6] Традыцыйная дата, заснаваная на «Повести временных лет» і прынятая большасцю даследчыкаў – 988 г. А. М. Рапаў абгрунтавана настойвае на датаванні гэтай падзеі 990 г. Рапов О. М. *Русская церковь в IX – первой трети XII в.* С. 241.

[7] Фроянов И. Я. *Киевская Русь: Очерки социально-политической истории.* С. 505.

[8] Лаврентьевская летопись. Ст. 121.

[9] Тамсама.

раўскай дзяржаве ці іншым раннесярэднявечным дзяржаўным утварэнням яна неўзабаве пачала раздзірацца ўнутранымі супярэчнасцямі. Па многіх ужо згаданых намі прычынах найбольш нястрымным было памкненне да самастойнасці Полацкай зямлі. Гэтая мэта неўзабаве ажыццявілася. Адбылося гэта мірным чынам. Створаная Уладзімірам «лесвічная» сістэма кіравання прадугледжвала наданне кіравання найбольш важнай Наўгародскай зямлёй старэйшаму сыну і ратацыю намеснікаў паводле старшынства ў падуладных гарадах у выпадку раптоўных змен ці неабходнасці. Пасля смерці старэйшага сына ягонае месца займаў наступны паводле старшынства сын. Іншыя перасоўваліся па іерархічнай лесвіцы на адну прыступку ўгору. Па смерці сына Уладзіміра Вышаслава, які быў намеснікам у Ноўгарадзе каля 1012 г., ягонае месца заняў Яраслаў, які да таго знаходзіўся ў Растове. Адпаведна, і іншыя сыны Уладзіміра памянялі месца свайго прызначэння.[10] Гэтая сістэма дзейнічала на Русі пры размеркаванні кіравання землямі і ў пазнейшыя стагоддзі. Але пасля смерці Ізяслава ў Полацку ў 1001 г. улада над Полаччынай перайшла не да наступнага Уладзіміравага сына, а да аднаго з сыноў Ізяслава. Гэта быў альбо маловядомы Усяслаў, смерць якога летапіс згадвае пад 1003 г.[11], альбо Брачыслаў. І. М. Данілеўскі мяркуе, што гэтая падзея адзначыла выхад Полацка з-пад улады Кіева і вяртанне ягонай самастойнасці.[12] Варта адзначыць, што набыццё Полацкам самастойнасці не прывяло да рэакцыі і адкату назад ні ў адной сферы грамадскага жыцця. Хрысціянства захавала і працягвала ўмацоўваць свае пазіцыі. Дасягненні Уладзіміра ў арганізацыі палітычнага кіравання і ваенным будаўніцтве прыжыліся ў Полацку і напоўніцу выкарыстоўваліся там ужо для самастойнага развіцця.

Тым часам і іншыя падуладныя Кіеву землі пачалі выяўляць імкненне да самастойнага існавання. Першай у іх шэрагу была Тураўская зямля. Для падмацавання сваіх прэтэнзій на самастойнасць тураўскі князь Святаполк ужыў дыпламатычныя метады. Па звестках нямецкага храніста

---

10 Лаврентьевская летопись. Ст. 121.

11 Тамсама. Ст. 129.

12 Данилевский И. Н. *Древняя Русь глазами современников и потомков.* С. 157.

Тытмара Мерзебургскага, каля 1012 г. ён узяў шлюб з дачкой польскага князя Баляслава не толькі з мэтай матрыманіяльнага саюзу. Разам з ёй у Тураў прыбыў калабжэгскі біскуп Рэйнберн.[13] Улічваючы, што ў той час рэлігія адыгрывала ролю асноўнага носьбіта палітычных і культурных тэндэнцый, гэтым самым Святаполк мог разлічваць супрацьпаставіць палітычны і культурны ўплыў Польшчы ўплыву Кіева і стварыць падмурак для незалежнага існавання Турава. Аднак гэтыя захады не прынеслі жаданага выніку. Моц Уладзіміра была яшчэ вельмі вялікай. Калі ён даведаўся аб падступных дзеяннях сына, ён «схапіў і біскупа, і сына з жонкай і затачыў у адзіночным зняволенні», дзе Рэйнберн і памёр.[14] Менавіта гэтым даследчыкі тлумачаць той факт, што Святаполк не згаданы ў летапісе пры апісанні перадзелу намесніцтваў пасля смерці Вышаслава.[15]

Баляслаў, аднак, не збіраўся даравацъ Уладзіміру арышт сваёй дачкі і зяця і правал планаў па распаўсюджанні свайго ўплыву на Тураўшчыну. Па словах Тытмара, каля 1013 г. «ён напаў на Русію пры падтрымцы нашых атрадаў (Тытмар мае на ўвазе суайчынных яму нямецкіх ваяроў – *Я. Н.*), і калі ён спустошыў большую частку той краіны, адбылася свара паміж сваімі і печанегамі, якія прымалі яго, і хаця тыя былі ягонымі саюзнікамі, загадаў усіх іх перабіць».[16] Нягледзячы на гэты няпоўны поспех, хутчэй за ўсё, Баляславу менавіта тады пашчасціла захапіць Берасце, калі меркаваць па пазнейшых спробах Яраслава адваяваць горад.

Не паспела сціхнуць полымя вайны вакол Турава, пажар пачаў разгарацца вакол Ноўгарада. У 1014 г. наўгародскі князь Яраслаў парушыў даўнюю традыцыю выплаты даніны Кіеву. Выконваючы волю наўгародцаў, якія хацелі выйсці з ценю Кіева,[17] ён «сего не даяше к Кыеву отцю своему». У чаканні вайны ён накіраваў паслоў у скандынаўскія краіны і выклікаў да сябе ўзброены кантынгент найманых ва-

---

13 Хроника Титмара Мерзебургского. (Chron. Tietm.) VII., 72 (52) // Латиноязычные источники по истории Древней Руси. С. 66.

14 Тамсама.

15 Данилевский И. Н. *Древняя Русь глазами...* С. 342–343.

16 Chron. Tietm. VI., 91 (55). С. 65.

17 Фроянов И. Я. *Киевская Русь: Очерки социально-политической истории.* С. 506.

рагаў.[18] Уладзімір пачаў рыхтавацца ў паход на сына, але «Богъ не вдасть дьяволу радости». У 1015 г. Уладзімір «боляше велми в неиже болести и скончася».[19] Небяспека вайны паміж бацькам і сынам знікла, але на даляглядзе адразу ж сабраліся новыя хмары.

Падзеі некалькіх наступных гадоў пасля смерці Уладзіміра з'яўляюцца паваротным момантам гісторыі XI стагоддзя. Міжусобная вайна паміж Уладзіміравымі сынамі пракацілася крывавымі бітвамі па агромністых прасторах Русі, узрушыла сучаснікаў і аказала агромністы ўплыў на далейшую гісторыю Русі і яе спадкаемцаў. У выніку вайны валадаром усёй Русі, акрамя Полацка, на некалькі пазнейшых стагоддзяў стала дынастыя Яраслава. Акрамя непасрэдных палітычных і ваенных наступстваў вайна стварыла яркія вобразы герояў, святых і злачынцаў і прадвызначыла вырашальныя для культурнага развіцця Русі і ўспрыняцця русінамі саміх сябе стэрэатыпы, якія захаваліся і ў сучаснай беларускай традыцыі. Незалежна ад сапраўднага ходу падзей, у вачах нашчадкаў Яраслаў набыў арэол мудрага і вялікага дзяржаўнага дзеяча. У ягонай асобе выкрышталізаваўся вобраз магутнай і непахіснай цэнтральнай дзяржаўнай улады, якая з божай дапамогай заўсёды абараняе справядлівую справу і перамагае сілы зла і цемры. Ягоны брат і праціўнік Святаполк, наадварот, заслужыў рэпутацыю зямнога ўвасаблення зла, якое мяцежным чынам спрабуе парушыць спрадвечна ўсталяваны парадак свету. Зло гэтае нясе смерць і разбурэнне, але нязменна церпіць паражэнне. Барыс і Глеб Уладзіміравічы, што дачасна загінулі ў барацьбе і былі абвешчаны першымі святымі Русі, сталі сімвалам рахманых праведнікаў, чыстая вера якіх церпіць пакуты ад сіл зла і таму мае пільную патрэбу ў абароне з боку моцнай і справядлівай улады. Успрыняцце гэтай гісторыі праваслаўнай традыцыяй і афарбоўка яе ў рэлігійныя колеры асвяціла царкоўным аўтарытэтам непарушнасць улады і вызначыла не толькі свецкую, але і рэлігійную грахоўнасць замахаў на яе.

Але нягледзячы на падрабязнае апісанне гэтых падзей у крыніцах і іх хрэстаматыйнае месца ў гістарычнай свецкай

18 Лаврентьевская летопись. Ст. 130.
19 Тамсама.

і духоўнай традыцыі, яны з'яўляюцца, бадай ці не адной з найвялікшых загадак сусветнай гісторыі. Гісторыкі на падставе аналізу крыніц прапануюць нашчадкам свае варыянты разгадак таямніцы, якія заўважна розняцца паміж сабой. Ніводная з іх не абгрунтавана бясспрэчна. Усе яны пабудаваныя на пэўных дапушчэннях і даверы альбо недаверы да тых ці іншых крыніц.

«Повесть временных лет» падае вельмі выразную і рэльефную карціну міжусобнай вайны паміж сынамі Уладзіміра, разам з апісаннем фактаў раздаючы безапеляцыйныя маральныя ацэнкі ўчынкаў усіх дзейных асоб. Святаполк з'яўляецца галоўным адмоўным персанажам, завадатарам мяцяжу, узурпатарам улады і братазабойцам. Барыс і Глеб Уладзіміравічы выглядаюць яго нявіннымі ахвярамі, а Яраслаў – законным уладаром і мсціўцам за злачынствы Святаполка. Версія падзей «Повести» замацавалася ў традыцыйнай расейскай і ўкраінскай гістарыяграфіі і царкоўнай праваслаўнай традыцыі, заняўшы месца агульнапрынятай версіі.

Тым не менш, уважлівы разгляд летапіснага аповеду паказвае шматлікія факталагічныя супярэчнасці і недакладнасці. Іх аналіз і параўнальнае супастаўленне летапісу з такімі нарманскімі і заходнееўрапейскімі крыніцамі, як «Пасма аб Эймундзе Хрынгсане»,[20] Хроніка Гала Аноніма[21] і тая самая Хроніка Тытмара, дапамагаюць уявіць карціну тых падзей у іншым святле. Рэканструкцыя падзей, прапанаваная расейскімі навукоўцамі В. Л. Яніным, М. М. Ільіным і І. М. Данілеўскім[22] і беларускім даследчыкам Г. М. Філістам[23], не прытрымліваецца традыцыйнай чорна-белай маралістычнай гамы, дзе героі і злачынцы традыцыйнай версіі проста памяняліся б месцамі. Гэтыя даследчыкі імкнуцца апраўдаць дзейных асоб ад учынкаў, якія ім несправядліва пры-

---

[20] Прядь об Эймунде Хрингссоне // Джаксон Т. Н. *Исландские королевские саги о Восточной Европе (первая треть XI в.).* Москва, 1994. С. 104–119.

[21] Галл Аноним. *Хроника и деяния князей или правителей польских.* Москва, 1961. (Gall. Anon.).

[22] Данилевский И. Н. *Древняя Русь глазами современников и потомков.* С. 336–354.

[23] Филист Г. М. *История «преступлений» Святополка Окаянного.* Мн., 1990.

пісваюцца, і толькі аб'ектыўна аднавіць ход падзей жорсткага часу, дзе ў барацьбе за ўладу кожны выкарыстоўваў усе даступныя яму метады. У іх выкладзе узурпатарам выглядае Яраслаў. Святаполк пазбаўляецца дэманічнга адцення і ператвараецца проста ў далёкага ад ідэалу, але тыповага для свайго часу палітыка. Барыс жа з нявіннай ахвяры робіцца жорсткім, цынічным і актыўным удзельнікам змагання за ўладу.

Не прэтэндуючы на ролю суда апошняй інстанцыі, мы коратка выкладзем абедзве версіі.

Згодна з «Повестью временных лет», у 1015 г. на момант смерці Уладзіміра, з усіх ягоных сыноў прысутным у Кіеве быў Святаполк, які і заняў кіеўскі стол. Яшчэ адзін Уладзіміраў сын, Барыс, які «любимъ... бе отцемъ своимъ паче всехъ», у гэты самы час знаходзіўся ў паходзе на печанегаў на рацэ Альце, недалёка ад Кіева. Пачуўшы аб кіеўскіх падзеях, дружыннікі Уладзіміра згуртаваліся вакол Барыса і прапанавалі яму сваю падтрымку ў барацьбе за ўладу, але той высакародна адмовіўся ўзнімаць зброю на Святаполка, заявіўшы: «не буди мне възняти рукы на брата своего стареишаго». Пасля гэтага дружыннікі і воі пакінулі Барыса. Гэтым скарыстаўся Святаполк, які акрутным чынам паслаў да Барыса забойцаў. Забойцы «насунуша и копьи и прободоша Бориса и слугу его», але князь яшчэ дыхаў. Тады Святаполк накіраваў да яго двух варагаў, якія і завяршылі беззаконную справу. Затым па ягоным загадзе быў пераняты каля Смаленска і забіты яшчэ адзін ягоны брат – мурамскі князь Глеб. У выніку, Святаполк часова забяспечыў сабе поўны кантроль над Кіевам, але назаўсёды запляміў сябе братазабойствам, заслужыўшы ганебную мянушку «акаяннага». Барыс жа і Глеб былі пазней абвешчаны першымі святымі Русі.[24]

Тым часам Яраслаў бавіў час у Ноўгарадзе, не ведаючы аб смерці бацькі. Ягоныя найміты чынілі ў горадзе рабаўніцтва і гвалт над жанчынамі. Гэта выклікала паўстанне наўгародцаў, якія выразалі варагаў. У адказ на гэта Яраслаў «обольстивъ и исече» наўгародскую знаць, у чым мусіў жорстка раскаяцца на наступны ж дзень, бо атрымаў вестку з Кіева ад сястры Прадславы аб бясчынствах Святаполка. Але наўгародцы падтрымалі свайго князя ў ягоным намеры ад-

[24] Лаврентьевская летопись. Ст. 130–136.

ваяваць бацькаў стол. Сабраўшы наўгародскае апалчэнне і зноў наняўшы варагаў, Яраслаў рушыў на Кіеў. Святаполк выступіў яму насустрач. Бітва адбылася на пачатку 1016 г. ля Любеча пасля доўгага супрацьстаяння праціўнікаў па розных берагах Дняпра. Яраслаў першы наважыўся пераправесці сваё войска цераз раку і атакаваў Святаполка, ушчэнт разбіўшы ягонае войска. Святаполк уцёк з поля бою да Баляслава ў Польшчу. Яраслаў застаўся пераможцам і гаспадаром княскага стала ў Кіеве.[25]

У гэты самы час Святаполк у Польшчы рыхтаваўся да працягу барацьбы. У 1018 г. ён і Баляслаў выступілі на Русь. Нанесшы страшэннае паражэнне Яраславу на Заходнім Бугу, яны занялі Кіеў. Яраслаў ізноў уцёк у Ноўгарад. Дасягнуўшы сваёй мэты, Святаполк страціў патрэбу ў польскім саюзніку і загадаў сваім людзям цішком забіваць палякаў, каб выцесніць іх з Русі. Панесшы страты, Баляслаў вярнуўся ў Польшчу, але паспеў ізноў далучыць да сваіх уладанняў чэрвенскія гарады.

Пацярпеўшы няўдачу, Яраслаў сабраўся ўцячы з Ноўгарада ў Скандынавію. Аднак наўгародцы не пусцілі князя ўцякаць, пасекшы ягоныя лоддзі. Яны заявілі Яраславу аб сваёй цвёрдай рашучасці да далейшага змагання, сказаўшы яму: «хочемъ ся и еще бити съ Болеславомъ и Святополкомъ». Нанова сабранае з наўгародцаў у варагаў войска падступіла да Кіева. Святаполк баязліва ўцёк да печанегаў і на пачатку 1019 г. вярнуўся ад іх «в силе тяжъце». Рашучая і неверагодна жорсткая бітва паміж братамі адбылася на рацэ Альце. Святаполк пацярпеў апошняе паражэнне. У далейшым ён памёр у пустынным месцы пакутлівай смерцю ад страшнай хваробы, насланай на яго за ягоныя цяжкія грахі.[26]

І. М. Данілеўскі прапануе іншую рэканструкцыю падзей. Паводле ягонай версіі, пасля смерці Уладзіміра 15 ліпеня 1015 г. у найвыгаднейшай пазіцыі для барацьбы за ўладу апынуўся якраз Барыс. Маючы пад сваім камандаваннем сабранае супраць печанегаў войска і карыстаючыся прыхільнасцю бацькавай дружыны, ён пераадолеў невялікую адлегласць ад Альты да Кіева і захапіў княскі стол. Святаполк жа не мог гэтага зрабіць па той простай прычыне, што з

---

[25] Лаврентьевская летопись. Ст. 140–142.
[26] Тамсама. Ст. 142–146.

часу свайго арышту Уладзімірам за спробу змовы сядзеў у зняволенні ў кіеўскім парубе. Мяркуючы па тым, што ён ўзяў актыўны ўдзел у далейшых падзеях, адзінае, што яму ўдалося падчас сумятні ў Кіеве – гэта ўцячы з вязніцы да свайго цесця Баляслава.[27]

У гэты ж час Яраслаў у Ноўгарадзе не сядзеў у няведанні адносна падзей у Кіеве і актыўна рыхтаваўся да барацьбы. Аб ягоных дзеяннях падрабязна распавядае «Пасма аб Эймундзе». Галоўны герой гэтага твора нарманскага пісьменства, конунг Эймунд Хрынгсан, пазбавіўся сваіх уладанняў у Нарвегіі, калі да ўлады прыйшоў кароль Олаф Святы. Не жадаючы ўзнімаць супраць яго зброю і пачуўшы аб смерці Уладзіміра на Русі, ён разам са сваім паплечнікам ярлам Рагнарам накіраваўся туды «з вялікай дружынай, выбранай паводле храбрасці і мужнасці», каб здабыць багацце і гонар. Дакладнай мэтай варагаў было паступленне на службу да аднаго з трох спадкаемцаў Уладзіміра – Ярыцлейва з Ноўгарада, Бурыцлава з Кіева і Вартылава з Полацка, якія вялі паміж сабой барацьбу за ягоную спадчыну.[28] Двое з іх ідэнтыфікуюцца дакладна. У Ярыцлейве цяжка не пазнаць Яраслава, а пад нарманскай транскрыпцыяй «Вартылаў» мог хавацца толькі полацкі князь Брачыслаў Ізяславіч. «Пасма» памыляецца, называючы усіх трох братамі. Вядома, што Брачыслаў быў унукам Уладзіміра і значыць пляменнікам ягоных сыноў. Больш складана вызначыць, каго ж варагі называлі Бурыцлавам. Прынята лічыць, што паколькі «Пасма» была запісана толькі ў XIII стагоддзі, яна ўтрымлівае шмат недакладнасцяў. У прыватнасці, у асобе Бурыцлава змешаны дзве рэальныя асобы Святаполка і Баляслава. Аднак аналіз крыніц і існаванне поўнай версіі імені Барыса «Барыслаў», паказваюць, што ў «Пасме» гаворка можа ісці менавіта аб ім – улюбёным сыне Уладзіміра Барысе.[29] Пры прыняцці гэтага дапушчэння карціна падзей набывае рэзка адрозны выгляд.

Перш за ўсё, Эймунд і Рагнар прыбылі ў Ноўгарад да Яраслава і прапанавалі яму свае паслугі. Не здолеўшы

---

[27] Данилевский И. Н. *Древняя Русь глазами современников и потомков.* С. 342–343, 347.

[28] Прядь об Эймунде Хрингссоне. С. 104–107.

[29] Данилевский И. Н. *Древняя Русь глазами...* С. 346.

знайсці дастаткова грошай для выплаты наймітам, той дамовіўся з імі аб аплаце футрамі. Такім чынам, Яраслаў зусім не выглядаў як наіўны пачатковец у міжусобнай палітыцы, які толькі выконваў волю наўгародцаў і да весткі ад сястры не ўяўляў сабе, што ж адбывалася ў Кіеве. Тым часам Барыс даслаў да Яраслава пасольства з патрабаваннямі саступкі памежных валасцяў. На параду Эймунда Яраслаў першы выступіў у паход і, дасягнуўшы уладанняў Барыса, напрыканцы 1015 г. сустрэў ягонае войска. Пасля некалькіх дзён чакання ён атакаваў Барыса. Ваеннае ўмельства нарманаў, якія зайшлі войску Барыса ў тыл, вырашыла зыход бою. Яраслаў перамог, а Барыс уцёк да б'ярмаў, у якіх угадваюцца печанегі.[30]

У наступным 1016 г. Барыс падступіў да Кіева з вялізным войскам печанегаў, супраць якіх сам жа ваяваў яшчэ нядаўна. У ходзе штурму печанегі ўварваліся ў горад. «Шмат там загінула людзей, перш чым была захоплена гарадская брама». Яраслаў быў паранены ў нагу. Кіеў быў у кроку ад падзення, калі храбрасць нарманаў ізноў выратавала становішча. «Эймунд харобра кідаецца на іх [печанегаў] і падбадзёрвае сваіх людзей, і ніколі яшчэ такі жорсткі бой не цягнуўся так доўга. І пабеглі з горада ўсе б'ярмы, якія яшчэ ацалелі». Печанегі былі адбіты з вялікімі стратамі. Праз год Барыс сабраў сваіх печанежскіх саюзнікаў і рушыў знаёмай дарогай на Кіеў. Каб пазбегнуць вялікага кровапраліцця, Эймунд са згоды Яраслава вырашыў дзейнічаць іншымі спосабамі. Узяўшы з сабой адзінаццаць самых надзейных ваяроў, ён накіраваўся насустрач Барысу. На месцы, дзе Барыс меўся разбіць свой стан, варагі сагнулі вялікае дрэва і навязалі яго да зямлі. Калі той спыніўся на прывал, яны ўначы падабраліся да стану. Да сагнутага дрэва яны прывязалі яшчэ адну вяроўку, накінуўшы другі яе канец на шацёр Барыса. У патрэбны момант варагі абсеклі повязь. Дрэва рэзка разагнулася, сарваўшы шацёр з месца. Скарыстаўшыся цемрай, Эймунд забіў безабароннага Барыса і адсек ягоную галаву, якую і прынёс Яраславу ў доказ гібелі ягонага брата і галоўнага саперніка.[31]

---

30 Прядь об Эймунде Хрингссоне. С. 107–109.
31 Тамсама. С. 110–115.

І ўсё ж, нягледзячы на вялікія подзвігі, нарманам не даасталося нічога, акрамя славы. Цягам усёй службы Эймундавых людзей у Яраслава, «цаніў іх кожны ў той краіне, але жалаванне ішло кепска, і цяжка было яго атрымаць». Так адбылося і на гэты раз. Яраслаў не спяшаўся выконваць свае манетарныя абавязкі перад нарманамі. Зразумеўшы марнасць чакання, Эймунд паведаміў князю аб сваім намеры перайсці на службу да патэнцыйнага Яраславава саперніка, полацкага князя Брачыслава. На параду сваёй жонкі Інгігерд Яраслаў задумаў падступную расправу з нарманамі. Інгігерд і ярл Рогнвальд Ульфсан з яе атачэння заманілі Эймунда на сустрэчу і селі паблізу ад яго, каб даць сваім людзям сігнал для нападу. Але хітры Эймунд, разгадаўшы замысел, збег раней, пакінуўшы ў руках сваіх праследнікаў толькі плашч. Нарманы паспяхова пакінулі Кіеў. Брачыслаў, які адчуваў небяспеку з боку Яраслава, параіўся са сваімі мужамі і з іх згоды ўзяў Эймундавых ваяроў на службу.[32]

Але Яраславу было не да Брачыслава. Ён у чарговы раз мусіў пашкадаваць аб неабачлівым стаўленні да сваіх саюзнікаў. Ізноў кароткачасовая выгода прывяла да доўгачасовых праблем. Хцівасць пазбавіла кіеўскага князя дасведчаных і мужных ваяроў якраз тады, калі на захадзе сабралася страшэнная пагроза ягонай уладзе. У ліпені 1018 г. войска Баляслава і Святаполка рушыла на Русь. У бітве на Бугу Яраслаў быў разбіты і ўцёк у Ноўгарад. Пераможцы ўступілі ў Кіеў, «які прыняў Баляслава 14 жніўня і даўно страчанага ўладара свайго Святаполка».[33] Сцвердзіўшы Святаполка на кіеўскім княскім стале, Баляслаў «з весялосцю» вярнуўся ў Польшчу.[34]

Яраслаў, якога падштурхоўвала мужная рашучасць наўгародцаў, сабраў новае войска і выступіў на Святаполка. У снежні таго ж года браты-сапернікі сышліся ў баі каля Любеча. Святаполк прайграў, пасля чаго знік, ратуючыся ад помсты Яраслава. Цяжка сказаць, куды завялі яго далейшыя шляхі, але ягоны лёс, паводле летапісаў і хронік, склаўся жахліва. Несправядліва абвінавачаны ва ўчынках, якіх ён не здзяйсняў, Святаполк быў зроблены казлом адпушчэння за

---

[32] Прядь об Эймунде Хрингссоне. С. 115–117.
[33] Chron. Tietm. VIII., 32. С. 68–69.
[34] Ibid. VII., 65 (48). С. 65–66.

ўсе злачынствы той вайны і застаўся такім у памяці нашчадкаў. Такім чынам аднаўляе ход тых падзей І. М. Данілеўскі.[35]

Г. М. Філіст таксама абапіраецца на паўночныя і заходнія крыніцы. Даследчык пагаджаецца з «Пасмай аб Эймундзе» ў тым, што забойства Барыса было ўчынена найманымі Яраслававымі варагамі з ягонага ведама. Аднак ён лічыць, што ў міжусобнай вайне Барыс быў не галоўнай, хоць і важнай дзейнай асобай. У асноўным ён дзейнічаў як саюзнік Святаполка. Апошні ж быў вызвалены з кіеўскай турмы Баляславам ужо ў 1013 г., стаў рэгентам пры Уладзіміры і пасля ягонай смерці заняў кіеўскі стол. Ягоная храналогія падзей таксама трохі адрозніваецца ад храналогіі Данілеўскага.[36]

Пры супастаўленні абодвух версій у вочы адразу ж кідаюцца наступныя акалічнасці. Па-першае, традыцыйная версія будуецца амаль што выключна на дадзеных «Повести временных лет» і безумоўным даверы да яе. Па-другое, насцярожвае яе літаратурная правільнасць з проста мастацка-драматычным развіццём сюжэтнай лініі і характараў дзейных асоб. Яраслаў выглядае трагічным, але станоўчым персанажам, які ў рэшце рэшт прыходзіць да шчаслівага выніку. Ён грашыць і робіць памылкі. Ён збіраецца ваяваць з бацькам і ўчыняе разню наўгародцаў, але ўзнімаецца над сваімі слабасцямі, аднаўляе спрадвечны парадак у дзяржаве і помсціць злачыннаму Святаполку. Той, наадварот, прадстаўляе сусветнае зло. Ён няправедна захоплівае кіеўскі стол, акрутна забівае братоў і не спыняецца нават перад падступнай разнёй сваіх польскіх саюзнікаў. Ягонымі сябрамі ў барацьбе за ўладу з'яўляюцца чужынцы кшталту палякаў і печанегаў. Абставіны ягонай смерці дзесьці ў пустэчы сімвалізуюць глыбіню яго падзення. Статычныя Барыс і Глеб проста з'яўляюцца патрэбным фонам светлага колеру, на якім разгортваецца барацьба дабра і зла. Мімаволі ўзнікае думка аб пазнейшай літаратурнай і палітычнай рэдакцыі летапісу. У параўнанні з гэтым другая версія выглядае больш аб'ектыўнай і абгрунтаванай. Але паколькі мы не можам

---

[35] Данилевский И. Н. *Древняя Русь глазами современников и потомков.* С. 347–354.

[36] Филист Г. М. *История «преступлений» Святополка Окаянного.* С. 89–91.

цалкам упэўнена абвергнуць ці пацвердзіць ніводную з іх, мы проста вылучым шэраг сцверджанняў, якія не выклікаюць супярэчнасцяў паміж крыніцамі ці прынцыповых пярэчанняў тых ці іншых гісторыкаў.

У 1015 г. адразу ж пасля смерці Уладзіміра кіеўскі стол быў заняты тым з ягоных сыноў, які быў для гэтага ў выгаднейшым геаграфічным і палітычным становішчы. Неўзабаве яму давялося сутыкнуцца з Яраславам. Яраслаў карыстаўся падтрымкай наўгародцаў, якія хацелі з ягонай дапамогай паслабіць сваю залежнасць ад Кіева. Рыхтуючыся да вайны, ён наняў варажскую дружыну Эймунда і рушыў на Кіеў. У канцы 1015 ці пачатку 1016 г. на подступах да Кіева адбылася бітва паміж ім і кіеўскім князем, якую выйграў Яраслаў. Ягоны сапернік уцёк. У 1017 г., па звестках пазнейшага Цвярскога летапісу, на Кіеў напалі печанегі. Русь і печанегі «секошася у Кіева, и едва къ вечеру одоле Ярославъ печенегы».[37] «Повесть временных лет» дадае, што пры гэтым «погоре церкви».[38] Часова пазбавіўшыся печанежскай пагрозы, Яраслаў у тым жа годзе беспаспяхова паспрабаваў адбіць у палякаў раней захопленае імі Берасце[39] і, магчыма, узяў і спустошыў Тураў.[40] У наступным 1018 г. Баляслаў падрыхтаваў ход у адказ. Разам з прэтэндэнтам на кіеўскі стол, якім цяпер абсалютна дакладна быў тураўскі князь Святаполк, ён выступіў на Русь. Ягонае войска складалася з палякаў, немцаў, венграў і печанегаў. На нашую думку, яно не магло не ўключаць і пэўную колькасць Святаполкавых дружыннікаў з Турава. Як і наўгародцы, тураўцы маглі з дапамогай свайго кандыдата на кіеўскі стол пастарацца паслабіць залежнасць ад Кіева ці, прынамсі, дасягнуць пад яго эгідай прывілеяванага становішча. Не варта забывацца і на традыцыі асабістай адданасці князю ягоных дружыннікаў, якія маглі суправаджаць яго ў вандраваннях у выпадку няўдач і паражэнняў.[41] Мітрафан Доўнар-Запольскі, спасылаю-

---

[37] Летописный сборник, именуемый Тверской летописью. (Далей: Тверская летопись) // Рогожский летописец. Тверской сборник. Москва, 2000. С. 136.

[38] Лаврентьевская летопись. Ст. 142.

[39] Новгородская первая летопись. С. 180.

[40] Chron. Tietm. VIII., 32. С. 68.

[41] Фроянов И. Я. *Киевская Русь: Очерки...* С. 559.

чыся на пазнейшы Летапісец Пераяслаўля-Суздальскага, кажа аб набраных Святаполкам у Драўлянскай зямлі і Пінску воях.[42] Згадка аб заснаваным толькі ў канцы XI ст. Пінску выглядае на яўны анахранізм, але ў цэлым гэтае паведамленне можа быць цьмяным адлюстраваннем удзелу ваяроў Тураўскай зямлі, да якой потым адносіўся і Пінск, у баявых дзеяннях на баку Святаполка. Разбіўшы Яраслава на Бугу, Баляслаў і Святаполк занялі Кіеў. Дасягнуўшы сваёй мэты, Баляслаў у хуткім часе пакінуў Кіеў і вярнуўся дадому, не забыўшыся прыўлашчыць чэрвенскія землі. Яраслаў пры падтрымцы наўгародцаў ізноў выправіўся на Кіеў. У канцы 1018 ці пачатку 1019 г. ён разбіў Святаполка і канчаткова захапіў уладу ў Кіеве.

Паколькі пасля гэтага тураўскі князь больш не ўдзельнічае ў барацьбе за ўладу ў Кіеве, далейшыя намаганні Яраслава па ўтрыманні кіеўскага стала захоўваюць для нас цікавасць толькі ў той меры, у якой яны ўплывалі на складванне знешнепалітычных камбінацый з удзелам Полацка, Літвы і іншых палітычных суб'ектаў на беларускіх землях. Але каб завяршыць тэму вайны 1015–1019 гг., дадамо яшчэ некалькі слоў наконт таго яе боку, які хваляваў і яе сучаснікаў, і наступныя пакаленні не менш за палітычныя меркаванні: легітымнасць і маральная абгрунтаванасць прэтэнзій супернікаў на ўладу. Легітымнасць прэтэнзій Святаполка, старэйшага на той момант сына Уладзіміра, не выклікае сумненняў. Калі разглядаць падтрымку паспалітага люду і знаці як маральную падставу княскай улады, то Святаполку не бракавала і гэтага. Як сведчыць Тытмар, не толькі страхам перад польскімі войскамі, але і міласцю Святаполка, «уся гэтая краіна была звернута да пакорлівасці».[43] Наўгародскі першы летапіс пры апісанні супрацьстаяння Святаполкавых і Яраслававых войскаў на Дняпры ля Любеча называе імя ваяводы Святаполка, які абразлівым чынам задзіраў наўгародцаў. Гэта быў паплечнік Уладзіміра, ветэран радзіміцкага

---

[42] Довнар-Запольский М. *Очерк истории Кривичской и Дреговичской земель до конца XII столетия.* С. 75. Летописец Переяславля-Суздальского, составленный в начале XIII века (между 1214 и 1219 годов). Москва, 1851. С. 33.

[43] Chron. Tietm. VIII., 32. С. 68.

паходу Воўчы Хвост.[44] Гэтае невялікае паведамленне выразна адлюстроўвае, на чыю карысць зрабілі выбар паміж Святаполкам і Яраслававам Уладзіміравы дружыннікі.

Як часта здараецца, ці не найбольшую выгаду ад вайны атрымаў той, хто ўхіліўся ад удзелу ў ёй. Ад самага захопу Полацка Уладзімірам крыніцы не згадваюць ваенных дзеянняў на тэрыторыі Полаччыны. Доўгі перыяд міру і набыццё незалежнасці ад Кіева дазволілі полацкім князям займацца як мірным дзяржаўным і культурным будаўніцтвам, так і нарошчваннем вайсковай моцы. Прыняцце Брачыславам на службу Эймунда з варагамі ў 1018 г. было цудоўным прыкладам такой палітыкі. Між тым пакуль Полацк мацнеў, падуладныя Кіеву землі марнавалі свае сілы ў крывавых усобіцах Уладзіміравых сыноў.

Гэтыя войны нарэшце далі Брачыславу магчымасць скарыстацца з назапашанай сілы, пашырыць полацкія ўладанні і здабыць выгады за кошт суседзяў. Тая акалічнасць, што ўвага Яраслава была засяроджана на паўднёвым і заходнім кірунках, падказала яму натуральную мэту для ўдару. Стары палітычны сапернік і гандлёвы канкурэнт Полацка Ноўгарад часова адышоў на перыферыю ўвагі Яраслава. Ягонай першачарговай задачай было адваяванне чэрвенскіх гарадоў і Берасця ў Польшчы. На поўдні ж выяўляў небяспечную актыўнасць яшчэ адзін ягоны брат — тмутараканскі князь Мсціслаў. Таму, верагодна, наўгародскія вайсковыя кантынгенты яшчэ знаходзіліся ў Кіеве і дадому не вярталіся. У ваенным дачыненні горад аказаўся безабаронным. У 1021 г. Брачыслаў «прииде... с вои ис Полотска на Новгородъ и взя Новгородъ; и поимъ Новгородци і именіа ихъ, и всь полонъ и скотъ и поиде к Полотцьку опять. И пришедшу ему к Судоми реце». Але на гэты раз Яраслаў паказаў сябе лепшым палкаводцам, чым звычайна. Ён «слышавъ ту весть и съвокупивъ вои многи, ис Киева въ седмыи день постиже и ту, победи Брячислава, и Новгородци вороти к Новугороду, и полонъ оу него отъя, елико бе в Новгородцкои области, и посла ихъ к Новугороду, а Брячиславъ побежа къ Полоцку».[45]

---

44 Новгородская первая летопись. С. 175.

45 Новгородская четвертая летопись. Москва, 2000. С. 110–111.

Яраславу ўдалося разбіць полацкае войска. Але развіць асобны тактычны поспех у поўную перамогу над Полацкам было нашмат цяжэй. Верагодна, войска Яраслава ў значнай ступені складалася з наўгародцаў, для якіх было важней вярнуць нарабаванае майно і палон, чым замацоўваць ваенную перамогу. Таму Брачыславу ўдалося вярнуцца ў Полацк і захаваць свае вайсковыя сілы, сярод якіх быў і атрад Эймунда, для далейшай барацьбы. Улічваючы неспакойнае становішча ў іншых падуладных Кіеву землях, Яраслаў не мог сабе дазволіць поўнамаштабнай вайны з Полацкам. «И оттоле призва к собе [Брачыслава] и да емоу два града, Въсвячь и Видбескъ, и рече емоу: «Боуди же съ мною единъ». И воеваше Брячиславъ съ Ярославомъ вся дни живота своего».[46] Такім чынам, сутыкненне завяршылася стратэгічнай перамогай Полацка. Найперш, Брачыслаў дамогся прыніжэння Ноўгарада. Гэта́ мела не толькі палітычны сэнс. Узяцце гандлёвага горада паніжала давер да яго купцоў, якія высока цанілі бяспеку руху тавараў. Гэта дазваляла перанакіраваць частку таварных плыняў з Волхава на Дзвіну, праз Полацк. Па-другое, з далучэннем да полацкіх уладанняў Усвята і Віцебску і самі валокі на Волхаўска-Дняпроўскім шляху траплялі пад кантроль Полацку, што дазваляла выкарыстоўваць іх як інструмент палітычнага ціску, магчымасць для атрымання добрага прыбытку і выдатны ваенны плацдарм.

Зрэшты, і Яраслаў ніяк не прайграў, не спакусіўшыся на вайну з Полацкам. Наколькі разумным быў дасягнуты з Брачыславам кампраміс, паказалі наступныя падзеі. Ужо ў 1022 г. «приде Ярославъ къ Берестию».[47] Маўчанне летапісца аб выніках паходу дазваляе меркаваць, што ён скончыўся няўдачай. Як лічыць У. Т. Пашута, Берасце было вернута Русі толькі ў 1042 г.[48] У 1023 г. распачалася цяжкая для Яраслава вайна з Мсціславам. У 1024 г. Мсціслаў перамог Яраслава пры Ліствене. У 1026 г. паміж імі быў заключаны мір на нявыгадных для Яраслава ўмовах. Ён захаваў за сабой Кіеў і іншыя землі па правабярэжжы Дняпра. Мсціславу ж дасталося левабярэжжа, а ягонай сталіцай стаў Чарнігаў.[49] У такіх

---

46 Новгородская четвертая летопись. С. 111.
47 Лаврентьевская летопись. Ст. 146.
48 Пашуто В. Т. *Внешняя политика Древней Руси.* С. 39.
49 Лаврентьевская летопись. Ст. 147–149

умовах мір паміж Полацкам і Кіевам быў важкім фактарам трываласці становішча абедзвюх дзяржаў і дапамагаў ім актыўна прасоўваць свае знешнепалітычныя інтарэсы на іншых рубяжах.

Аднак сутнасць адносін паміж Полацкам і Кіевам падчас кіравання Брачыслава і Яраслава не вычэрпваецца трывалым мірам. Мірныя адносіны дапаўняліся ваенна-палітычным саюзам, апісаным у летапісе загадкавай фразай: «И воеваше Брячиславъ съ Ярославомъ вся дни живота своего». Між тым ні ў адным апісанні важных ваенных выправаў Яраслава не згадваецца дапамога яму з боку Брачыслава. Полацкія ваяры не ўдзельнічалі ні ў прайгранай Яраславам бітве з Мсціславам пры Ліствене ў 1024 г., ні пры адбіцці печанежскай навалы ад Кіева ў 1037 г.,[50] ні ў няўдалым паходзе на Канстанцінопаль у 1043 г.[51] Пра магчымую дапамогу Кіева Полацку ў яго ваенных кампаніях меркаваць яшчэ цяжэй. Ад самай бітвы пры Судоме да смерці Брачыслава ў 1044 г. Полацк прападае са старонак летапісаў. Паведамленне пра сумесныя войны хутчэй пакідае нашчадкаў у стане збянтэжанасці, чым пралівае святло на падзеі таго часу.

Ключ да іх разумення знаходзіцца пры больш уважлівым позірку на гістарычныя карты, якія паказваюць нам геаграфічныя кірункі дзейнасці полацкага і кіеўскага князёў. З «Повести временных лет» нам вядома аб паходах Яраслава на яцвягаў і Літву. Такая настойлівасць Яраслава сведчыць аб важнасці для інтарэсаў Кіева ўзброенай экспансіі ў Панямонні. Больш за тое, гэтая экспансія мела блізкае падабенства да ўзору, якога прытрымліваўся на гэтым кірунку бацька Яраслава Уладзімір. Гэтак жа сама наступ на Панямонне ішоў побач з ваеннымі дзеяннямі ў геаграфічна блізкай Польшчы. Гэтым разам выправы на яцвягаў і літву спалучаліся з паходамі супраць мазавецкага князя Мецлава у 1041 і 1047 гг.[52]

У гэты ж самы час з усходу на літоўскія землі няўхільна насоўваліся палачане. Як пабачым ніжэй, у першай палове XI ст. яны пераймаюць у Кіева ўладу над Менскам і будуюць Лагожаск (Лагойск). Працягвае выконваць свае фукцыі

---

50 Лаврентьевская летопись. Ст. 150–151.

51 Тамсама. Ст. 154.

52 Тамсама. Ст. 153, 155.

памежнай з літвой крэпасці Заслаўе. На землях Нальшы узводзіцца Брачыслаўль (Браслаў). Лінія полацкіх крэпасцяў няўмольна рухалася на захад, уключаючы балцкія землі ў склад Полацкага княства і ствараючы перадумовы для новай хвалі славянскай каланізацыі.

Калі паглядзець на гэтыя зрухі ў прасторавым вымярэнні, можна заўважыць, што кірункі полацкай і кіеўскай экспансіі канцэнтрычна сыходзяцца з розных бакоў да самага сэрца панямонскіх балцкіх земляў. Да таго ж, Панямонне з яцвяжскім і літоўскім насельніцтвам было адзіным рэгіёнам, які непасрэдна прылягаў і да полацкіх, і да кіеўскіх уладанняў, але дзе абодва бакі маглі пашыраць свой уплыў, не сутыкаючыся наўпрост. Больш за тое, агульнасць інтарэсаў магла прывесці іх да ўзаемаразумення, якое выражалася ў падзеле сфер уплыву і ўзаемнай ваеннай і палітычнай дапамозе. Таму мы можам меркаваць, што летапісец меў на ўвазе менавіта рух у Панямонне, калі казаў аб сумесных ваенных выправах Брачыслава і Яраслава. Каб упэўніцца ў гэтым, прыгледзімся бліжэй да панямонскіх падзей.

Пранікненне славян на балцкія землі ў XI ст. лагічна працягвала ранейшы працэс славянскай каланізацыі, які суправаджаўся заняццем прыдатных для гаспадарання земляў і змешваннем з аўтахтонным балцкім насельніцтвам. Нельга не заўважыць і якасных змяненняў у параўнанні з ранейшымі часамі. Па-першае, у адрозненне ад V—IX стст., працэс славянскай каланізацыі не быў наступствам ціску качэўнікаў з поўдня і іншых масавых перасяленняў народаў. Асноўным рухавіком каланізацыі было эканамічнае развіццё Русі, якое вяло да росту насельніцтва. У сваю чаргу, пры панаванні прымітыўных спосабаў вядзення сельскай гаспадаркі ўзрослае насельніцтва магло быць дастаткова забяспечаным толькі коштам экстэнсіўнага асваення новых земляў. У адрозненне ад непрадказальных палітычных зменаў эпохі перасялення народаў, ціск эканамічных патрэбаў рабіў плынь каланізацыі больш пастаяннай і магутнай. Па-другое, змянілася грамадская і палітычная афарбоўка каланізацыі. Рух славян у V—IX стст. уяўляў сабой хаатычныя перамяшчэнні слаба арганізаваных плямёнаў, якія знаходзіліся на патрыярхальнай стадыі развіцця. Каланізацыя IX—XI стст. адбывалася пад моцным уплывам

дзяржавы, якая стала асноўнай формай арганізацыі грамадства, набыла значную ступень самадастатковасці і аддзеленасці ад масы народу і магла накіроўваць працэс каланізацыі ў сваіх інтарэсах. Іншымі словамі, рух славян на Панямонне ўжо не быў справай асабістай ініцыятывы правадыроў шматлікіх дробных плямёнаў. Ён адбываўся пад пільным наглядам сюзерэнаў двух самастойных палітычных утварэнняў Русі – полацкага і кіеўскага князёў, якія маглі кантраляваць яго з далёка сягаючымі мэтамі. Па-трэцяе, у параўнанні з IX—X стст. нават тая самая дзяржава да XI ст. набыла прынцыпова новыя якасці. У дадатак да такіх сваіх падмуркаў, як улада, тэрытарыяльная арганізацыя і заканадаўства, яна атрымала дзяржаўны апарат, які і завяршыў фармаванне чацвярыцы асноў дзяржаўнага ўладкавання грамадства. З дапамогай апарату цэнтральная княская ўлада актыўна будавала фізічную інфраструктуру дзяржавы, што ператварала рыхлае фармаванне ў трывалы і складаны арганізм. Асновай такой інфраструктуры сталі ўмацаваныя гарады, якія выконвалі функцыі адміністрацыйных, эканамічных і культурных цэнтраў, і сухапутныя шляхі зносін, якія іх звязвалі. Менавіта гарады сталі апорай полацкай і кіеўскай экспансіі ў Панямонні. У гэтых умовах каланізацыйны рух славянскіх плямёнаў у Панямонне суправаджаўся заваявальнымі паходамі войскаў іх сюзерэнаў і заснаваннем гарадоў, сцены якіх прыкрывалі мірную працу каланістаў. Адваротна, і будаўніцтва гарадоў прыцягвала новых жыхароў на нованабытыя землі.

Як ужо згадвалася, новую хвалю славянскай каланізацыі першымі сустрэлі яцвягі, землі якіх непасрэдна межавалі з кіеўскімі ўладаннямі і былі заваяваныя Уладзімірам у выніку ягонага паходу 983 г. На той час на беларускіх землях лакалізуюцца тры племянныя групы яцвягаў. Адна з іх жыла на правабярэжжы Нёмана ў яго верхнім цячэнні і звалася Дайнавай. Другая племянная група яцвягаў з невядомай назвай займала землі па левабярэжжы Нёмана. Нарэшце, трэцяя група, якая, магчыма, складалася з крысменцаў, покенцаў і ўжо часткова асіміляваных валынянамі злінцаў, жыла ў міжрэччы Верхняга Нёмана і Буга.[53] Яраслаў пра-

---

[53] Квятковская А. В. *Ятвяжские могильники Беларуси (к. XI–XVIII вв.).* Вильнюс, 1998. С. 175.

цягнуў справу свайго бацькі. У 1038 г. ён «иде на Ятвягы», якія да таго часу, верагодна, адпалі ад Кіева.[54] Вынік паходу, аднак, не быў надта ўдалым. Як паведамляе пазнейшы Цвярскі летапіс, Яраслаў «не можаху ихъ взяти».[55]

Няўдача ўсё ж не спыніла кіеўскага князя. За яцвяжскімі землямі наступнай мэтай Яраслава стала Літва. Такая паслядоўнасць тлумачыцца яе геаграфічным становішчам. Тагачасная Літва была адной з пяці земляў аўкштайцкага культурнага арэалу і займала тэрыторыю Віленшчыны сучаснай Літоўскай Рэспублікі і ашмянска-свірскі рэгіён Беларусі. Яна мяжавала з чатырма іншымі аўкштайцкімі землямі: Дзялтувай (Дзяволтвай), якая знаходзілася ў сярэднім цячэнні ракі Швянтоі (Святой), з Нальшай (Нальшанамі) у цяперашніх ваколіцах Уцяны, Швянчоніса (Свянцян) і Браслава, з Нярысам на абодвух берагах сярэдняга цячэння Нярыса (Віллі) і з Дзерамелай паміж Нёманам, Мяркісам (Мераччу) і Нярысам.[56] Натуральна, што пасля сутычак з яцвягамі кіеўская экспансія выйшла на літоўскія межы. Першая пісьмовая згадка пра Літву з'яўляецца ў Кведлінгбургскіх і Хільдэсхаймскіх аналах і ў Хроніцы Тытмара. Кведлінгбургскія аналы пад 1009 годам паведамляюць, што «святы Бруна, які мянуецца Баніфацыем, арцыбіскуп і манах, пакараны смерцю паганцамі ў памежнай мясцовасці Русі і Літвы на адзінаццатым годзе свайго пастрыжэння, здабыў нябёсы з васемнаццацю сваімі спадарожнікамі 9 сакавіка».[57] Томас Баранаўскас вызначае месца гібелі Бруна і, адпаведна, тагачаснае руска-літоўскае памежжа на рацэ Ятры, прытоку Моўчадзі, які працякае па тэрыторыі сучасных Навагрудскага і Дзятлаўскага раёнаў.[58]

Прыкладна ў раёне гэтага рубяжа і прыпынілася кіеўская экспансія, каб вельмі хутка рушыць далей. Ужо ў 1040 г. «Ярославъ иде на Литву».[59] Па непацверджаных крыніцамі звестках Адама Кіркора, у тым паходзе Яраслаў разбіў Літву

---

54 Лаврентьевская летопись. Ст. 153.

55 Тверская летопись. С. 148.

56 Baranauskas T. *Lietuvos valstybės ištakos*. 257–258.

57 Кведлингбургские анналы (Annales Quedl.) 80 // Латиноязычные источники по истории Древней Руси. С. 106.

58 Baranauskas T. *Lietuvos valstybės ištakos*. 132.

59 Лаврентьевская летопись. Ст. 153.

«на палях Слонімскіх».[60] Так ці не, але вынік паходу быў яўна недастатковым, бо ў 1044 г., як паведамляе Наўгародскі першы летапіс, «ходи Ярославъ на Литву» і дадае: «а на весну же Володимиръ заложи Новъгородъ и сдела его».[61] Мікола Ермаловіч выказвае думку, што гэты Ноўгарад, закладзены сынам Яраслава Уладзімірам, з'яўляўся панямонскім Навагародкам (Навагрудкам) і ўзнік у прамой сувязі са згаданым паходам як апорны пункт Кіева на мяжы з Літвой.[62]

Гіпотэза Ермаловіча аб Навагародку, як і паведамленне Кіркора аб Слоніме, аспрэчваюцца многімі даследчыкамі. Тым не менш, яны падводзяць нас да важнейшага пытання аб ролі панямонскіх гарадоў у славянскай экспансіі і часе іх узнікнення. Археалагічныя дадзеныя сведчаць, што першапачатковае паселішча ў Навагародку на Малым замку ўзнікла ў канцы X ст., а на Замкавай гары – ў пачатку XI ст.[63] Дзесьці ў XI ст. узнікла паселішча на месцы сучаснага Слоніма.[64] У Ваўкавыску найстарэйшае паселішча ўзнікла на Шведскай гары ў сярэдзіне – другой палове X ст. Яшчэ два паселішчы на гарадзішчы Муравельнік і на Замчышчы датуюцца мяжой X–XI стст.[65] Тым не менш, паселішчы гэтыя яшчэ не абароненыя штучнымі ўмацаваннямі. Ва ўмовах руху славян на чужыя тэрыторыі такія паселішчы былі лёгкай здабычай для нападу. Так, паселішча на Шведскай гары загінула ў канцы X ст. ад пажару, магчыма, у выніку нападу мясцовых балтаў.[66]

Там, дзе не магла даць рады стыхійная народная каланізацыя, адчуўся ўплыў дзяржаўнай гаспадарскай рукі сюзерэна-кіеўскага князя, які ператвараў неўмацаваныя паселішчы ў фарпосты-крэпасці, пад абаронай якіх славянскае насельніцтва магло пачувацца больш упэўнена і бяспечна. У канцы X ст. вакол паселішча на Шведскай гары ўзводзіц-

---

[60] Живописная Россия. Отечество наше в его земельном, историческом, племенном, экономическом и бытовом значении. С.-Петербург-Москва, 1882. Т. 3. С. 195.

[61] Новгородская первая летопись. С. 181.

[62] Ермаловіч М. І. *Старажытная Беларусь. Полацкі і Новагародскі перыяды.* Мн., 2001. С. 103.

[63] Зверуго Я. Г. *Верхнее Понеманье в IX–XIII вв.* С. 67.

[64] Кведлингбургские анналы (Annales Quedl.) 80... С. 73.

[65] Тамсама. С. 69–70.

[66] Annales Quedl. С. 70.

ца вал. Ваўкавыск (які да таго часу мог яшчэ і не насіць такой назвы) становіцца горадам. Ён ператвараецца ў рэзідэнцыю княскага пасадніка і выконвае адміністрацыйныя і ваенныя функцыі.[67] У сярэдзіне XI ст. падобныя перамены адбываюцца і з Новагародкам. Замкавая гара становіцца дзядзінцам, пад абаронай якога знаходзіцца неўмацаваны пасад.[68] Каланізаваныя славянамі землі, якія апынуліся на поўдзень ад лініі паміж гэтымі двума гарадамі, маглі лічыцца фармальна далучанымі да кіеўскіх уладанняў. Такім чынам, калі мы і не можам упэўнена казаць аб існаванні Слоніма ў 1040 г. і не можам дакладна сцвярджаць, што летапіснае паведамленне аб Ноўгарадзе пад 1044 г. адносіцца да Навагародка Панямонскага, факт з'яўлення княскіх гарадоў Ваўкавыска і Навагародка ў Панямонні ў канцы X—сярэдзіне XI стст. бясспрэчны. Народная славянская каланізацыя падтрымлівалася паходамі ў Панямонне кіеўскіх княскіх войскаў, а са з'яўленнем гарадоў нованабытыя землі ўключаліся ў агульную адміністрацыйную сістэму Кіеўскай дзяржавы.

Пры гэтым ні пранікненне славян, ні будаўніцтва гарадоў ні ў якім разе не значылі знікнення ці поўнай асіміляцыі мясцовых яцвягаў і літвы. Каланізацыя Панямоння адбывалася цераспалосна, і паміж заселенымі славянамі землямі знаходзіліся вялікія раёны балцкага насельніцтва, жыхары якіх на працягу яшчэ доўгага часу захоўвалі сваю этнічную прыналежнасць і палітычную незалежнасць. Даследчыкі разыходзяцца ў ацэнцы ступені гэтай цераспалосіцы. Адны з іх проста адзначаюць існаванне балцкіх паселішчаў на пераважна славянскай тэрыторыі і славянскіх на пераважна балцкай тэрыторыі.[69] Іншыя ж зазначаюць, што нават пры славянскай каланізацыі большасць мясцовага насельніцтва складалі балты. Славянскі ж уплыў абмяжоўваўся гарадамі, якія выглядалі самотнымі астравамі ў балцкім моры. Адносіны славян і балтаў пры гэтым часта былі варожымі. Мяркуецца, што ў адзначаны час у Панямонні адбываліся шматлікія канфлікты паміж каланістамі

---

67 Annales Quedl. С. 70.

68 Тамсама. С. 67.

69 Охманьский Е. *Литовско-кривичское пограничье в племенную эпоху* // Становление раннефеодальных славянских государств. Киев, 1972. С. 252—253.

і аўтахтонным насельніцтвам. У такіх умовах гарады не так выконвалі функцыю памежных крэпасцяў, як абаранялі славянскіх каланістаў ад нападаў балтаў, якія засталіся ззаду лініі кіеўскага заваявання.[70] Ілюстрацыяй да гэтага пункту гледжання служаць падзеі 1038–1044 гг., калі Кіеў вёў наступ на Літву, маючы ў тыле непакорных яцвягаў, якія маглі пагражаць ваенным камунікацыям і паселішчам славянскіх каланістаў.

Падобныя працэсы праходзілі і на полацка-літоўскім памежжы ў паўночна-ўсходнім Панямонні і Прыдзвінні. Каланізацыйны рух славянскага насельніцтва ў глыбіню Літвы і Нальшы спалучаўся з ваеннымі выправамі і будаўніцтвам княскіх умацаваных гарадоў. Мы можам сцвярджаць, што ў першай палове XI ст. Брачыслаў, хутчэй за ўсё, здзейсніў шэраг паходаў на Літву, аналагічных паходам Яраслава на яцвягаў і Літву. Абодва князі, магчыма, стратэгічна каардынавалі свае ваенныя планы, а таксама дапамагалі адзін адному вайсковымі кантынгентамі. На жаль, дакладных летапісных звестак пра канкрэтныя падзеі, звязаныя з націскам Брачыслава на Літву, не захавалася. У сувязі з гэтым мы будзем вымушаныя абмежавацца аналізам археалагічных дадзеных аб будаўніцтве гарадоў і тапанімічных дадзеных, якія сведчаць аб глыбіні пранікнення полацкіх крывічоў на літоўскія тэрыторыі.

Найстаражытнейшым горадам Полаччыны на мяжы з Літвой было Заслаўе. Яшчэ да ўзнікнення горада, у першай палове – сярэдзіне X ст. на правым беразе Свіслачы было заснавана неўмацаванае паселішча, якое выконвала функцыі ваеннага, адміністрацыйнага і фіскальнага пункту Полацкага княства на стыку яго межаў з балцкімі землямі і кіеўскімі ўладаннямі. Залога гэтага паселішча складалася з ваяроў-крывічоў і выразна адрознівалася ад асноўнай масы навакольнага насельніцтва, якое складалася з дрыгавічоў і славянізаваных балтаў. Недалёка ад гэтага паселішча ў канцы X ст. узнік горад-крэпасць, верагодна, заснаваны Уладзімірам пасля заваявання Полацкага княства і паходу на яцвягаў у 983 г. Падзея гэтая адбылася каля 985 г. Залогу яго таксама склалі прышлыя ваяры, гэтым разам самага рознага

---

[70] Квятковская А. В. *Ятвяжские могильники Беларуси.* С. 177–179.

паходжання. Верагодна, яны былі набраныя ў аддаленых землях Кіеўскай дзяржавы ў працяг цэнтралізатарскай палітыкі Уладзіміра і па аналогіі з камплектаваннем гарнізонаў паўднёвых крэпасцяў з крывічоў, вяцічаў, славенаў і чудзі. Пасля хуткага адпадзення Полаччыны ад Кіева Заслаўе дасталося ў спадчыну полацкім князям і зноў перайшло на становішча іх паўднёва-заходняй памежнай крэпасці.[71]

Яшчэ адным умацаваным пунктам на мяжы з Літвой быў прагорад на Менцы, які, вельмі верагодна, з'яўляецца згаданым пад 1067 г. летапісным Менскам і перанясенне якога ў другой палове XI ст. на берагі Свіслачы дало пачатак сучаснаму гораду. Як сведчыць знойдзеная пры раскопках кераміка і тыповыя для Уладзіміравых часоў зрубы-гародні ў аснове абарончага вала, горад узнік у канцы X ст.[72] У адрозненне ад Заслаўя, ён ад самага пачатку быў заснаваны пад эгідай кіеўскіх князёў і не адышоў да Полаччыны ў канцы X ст. Верагодная перадача Менска Полацку адбылася каля 1024 г. і магла быць звязана з мірнай дамовай паміж Брачыславам і Яраславам, а таксама іх узаемнай каардынацыяй руху ўглыб Літвы.[73] Вал горада перабудоўваўся ў першай палове XI ст. сама меней два разы з-за знішчэння яго драўляных умацаванняў пажарамі,[74] якія маглі адбыцца ў выніку ваенных дзеянняў паміж Брачыславам і Яраславам альбо нападу літвы.

На поўнач ад Менску, на беразе ракі Гайны, палачане заснавалі Лагойск. Гэта адбылося ў пачатку XI ст., за дзесяцігоддзі да першай летапіснай згадкі пра горад.[75]

Нарэшце, на крайнім паўночным захадзе полацкіх уладанняў, на поўнач ад уласна Літвы, у балцкай зямлі Нальшы быў заснаваны Браслаў, сама назва якога паходзіць ад імені Брачыслава. Горад быў заснаваны на месцы спаленага ў першай палове XI ст. балцкага паселішча.[76] А. Плавінскі і М. Плавінскі мяркуюць, што гэта адбылося на самым па-

---

[71] Заяц Ю. А. *Заславль в эпоху феодализма*. Мн., 1995. С. 106–110.

[72] Археалогія Беларусі. Т. 3. С. 185–186, 192.

[73] Заяц Ю. А. *Полоцкие события «Саги об Эймунде»*. С. 10 // Полоцкий летописец. № 1 (2). Полоцк, 1993.

[74] Археалогія Беларусі. Т. 3. С. 188.

[75] Тамсама. С. 218.

[76] Археалогія Беларусі. Т. 3. С. 218–220.

чатку кіравання Брачыслава. Тое самае адбылося ў Дрысвятах. Полацкая крэпасць замяніла знішчанае нальшанскае паселішча.[77]

Разам з княскімі крэпасцямі ўглыб Літвы прасоўваліся і славянскія паселішчы. Даследчыкі вызначаюць ступень пранікнення славян у Літву паводле наяўнасці населеных пунктаў пад назвай Крывічы, якія ўзнікалі на межах рассялення крывічоў з іншымі этнасамі. Паколькі ў XI–XII стст. насельніцтва Полаччыны адносіла сябе да Русі пераважна ў геаграфічным і культурным сэнсе, а з этнічнага боку атаясамлівала сябе з крывічамі, назвы гэтыя адзначаюць этнічнае літоўска-полацкае памежжа ў час не пазней за XIII ст., калі на Полаччыне пачаў сцвярджацца этнонім «Русь». На поўначы гэтая мяжа пачыналася ад Плісы, абыходзіла з усходу Докшыцы, ішла далей на паўднёвы захад за Будслаў да ракі Сэрвеч да самага Куранца, затым на ўсход да Віллі і Ільі, абыходзіла выступ рассялення літвы на поўнач ад Радашковіч, ішла на захад ад Заслаўя праз Вялікія і Малыя Крывічы і працягвалася па лініі Ракаў – Волма.[78] Знаходжанне гэтай мяжы на такой невялікай адлегласці ад Менску, Заслаўя і Лагойску яшчэ раз падкрэслівае значную прысутнасць балцкіх каранёў у генетычным дрэве беларусаў, цеснае суседства славянскага і балцкага элементаў у беларускай гісторыі і важную ролю, якую ў адзначаны і пазнейшы час адыгрывала ў гэтай гісторыі Літва побач з Руссю. Крывіцкія паселішчы былі і далей на паўднёвы захад, дзе крывічы каланізавалі ваколіцы Наваградка, перайшлі на правы бераг Нёмана каля Беліцы, засялілі ваколіцы Слоніма і прыпыніліся на Зэльвянцы.[79] Пытанне аб палітычнай прыналежнасці гэтых тэрыторый застаецца не да канца вырашаным.

---

77 Плавінскі А., Плавінскі М. *Новыя дадзеныя па гісторыі Браслаўскага Паазер'я на мяжы I і II тыс. н. э. (па матэрыялах раскопак курганнага магільніка Опса)* // Браслаўскія чытанні. Матэрыялы VI навукова-краязнаўчай канферэнцыі, прысвечанай 150-й гадавіне з дня нараджэння браслаўскага лекара, грамадскага дзеяча Станіслава Нарбута (1853–1926) 7–8 мая 2003 года. Браслаў, 2003. С. 79.

78 Охманьский Е. *Литовско-кривичское пограничье в племенную эпоху.* С. 248–249.

79 Тамсама. С. 249.

Шматлікія паселішчы неасіміляванага балцкага насельнітва захоўваліся і на ўсход ад азначанай мяжы. Даследчыкамі таксама заўважана, што этнічная крывіцка-літоўская мяжа далёка не заўсёды супадала з палітычнай полацка-літоўскай мяжой. Так, Ежы Ахманьскі лічыць, што Браслаў быў заснаваны ў глыбіні балцкай тэрыторыі і быў там апорай полацкага панавання ў той час, калі славяне яшчэ не складалі там пераважнай большасці.[80] Гэта можа сведчыць аб тым значэнні, якое Брачыслаў надаваў экспансіі на балцкія землі. Ён дзёрзка распаўсюджваў сваё панаванне на этнічна чужыя тэрыторыі раней за з'яўленне там ягоных падданых у якасці каланістаў.

Такім чынам, у першай палове XI ст. падчас кіравання Брачыслава Полацкае княства адсунула сваю заходнюю мяжу з Літвой і Нальшай да лініі рассялення крывіцкіх каланістаў за выключэннем раёна Браслава. Браслаў з прылеглымі полацкім крэпасцямі далёка выступаў за межы этнічнай тэрыторыі крывічоў і служыў апорай панавання Полацка над Нальшай з аднаго боку, а з другога боку забяспечваў полацкі кантроль над цячэннем Дзвіны.

Агульным палітычным вынікам экспансіі Русі ў Панямонне было нарошчванне як Полацкам, так і Кіевам сваёй магутнасці коштам далучэння новых земляў. Гэтыя землі, заселеныя славянскімі падданымі абодвух дзяржаў і мясцовымі балцкімі жыхарамі, уяўлялі сабой новую крыніцу багатых прыбыткаў і вайсковай сілы. Апроч таго, яны былі важнай стратэгічнай пазіцыяй, якая ўзмацняла ваенна-палітычнае значэнне Полацка і Кіева ў рэгіёне.

Але менавіта па гэтых прычынах заваяванне панямонскіх земляў несла ў сабе зерні разладу паміж імі. Рост магутнасці абедзвюх дзяржаў коштам руху ў Панямонне быў ростам магутнасці адносна адзін аднаго. І для Полацка, і для Кіева Панямонне служыла добрым плацдармам для нападу на ўладанні адзін аднаго. Мясцовыя ж вайсковыя кантынгенты маглі з такім самым поспехам быць выкарыстаныя ў магчымай вайне паміж Полацкам і Кіевам, як і ў любой іншай вайне. Усе гэтыя меркаванні знайшлі сваё пацверджанне ў падзеях XII ст. Таму Полацк і Кіеў, будучы ў саю-

---

[80] Охманьский Е. *Литовско-кривичское пограничье...* С. 251.

зе, і дапамагаючы адзін аднаму ў панямонскіх справах, мелі ўсе падставы да адстойвання найперш сваіх інтарэсаў і ўзаемнага недаверу. У такіх умовах у выгаднейшым становішчы аказваўся той, хто першым завалодваў большымі і важнейшымі тэрыторыямі. Гэтым тлумачыцца і палітыка заснавання гарадоў на нованабытых землях. Яраслаў ставіў іх на пярэднім рубяжы свайго пранікнення ў край, пакідаючы за сабой вялікія астравы яцвяжскага і літоўскага насельніцтва. Брачыслаў жа і зусім будаваў некаторыя з іх далёка на чужой зямлі, на значнай адлегласці ад бліжэйшых крывіцкіх паселішчаў. Для абодвух гаспадароў Русі гэтая экспансія была своеасаблівым «бегам у панямонскія пушчы» ў поўным узбраенні напярэймы адзін аднаму, дзе мацнейшы і спрытнейшы атрымліваў добрую выгаду.

Але і балцкія землі не спяшаліся заняць становішча ахвяры і пасіўнага суб'екту экспансіі ў гэтым сутыкненні. Упартая барацьба з Руссю загартоўвала яцвягаў, літву, нальшанцаў і іншыя балцкія плямёны і давала моцны імпэт унутранаму развіццю іх грамадства. Вынікі апошняга асабліва моцна далі аб сабе ведаць у Літве, якая праз пэўны час заняла месца асноўнага прэтэндэнта на дамінаванне ў балцкіх землях.

Пільная патрэба ў абароне краю прывяла да паскоранага развіцця вайскова-дружыннага слою. Як і раней у славян, дружына на чале з правадыром пачала набываць выключны ўплыў на справы грамадства і неўзабаве стала падмуркам зараджэння ўлады. Атрымаць уяўленне аб гэтым працэсе можна са звестак аб місіі вядомага нам Бруна да балтаў. Пры апісанні хрышчэння аднаго з мясцовых балцкіх (верагодна, яцвяжскіх) валадароў Нецімера крыніцы прама ці ўскосна паведамляюць наступнае. Уладанне Нецімера, якое можа быць атаясамлена з воласцю, было самастойным у дачыненні да такіх самых суседніх воласцяў і мела выразныя межы, якія ахоўваліся. Будова грамадства мела іерархічны характар. Разам з «каралём» Нецімерам згадваюцца і ягоныя «герцагі». Сам каралеўскі тытул быў спадчынным. Аўтарытэт знаці, у прыватнасці «герцагаў», сягаў настолькі далёка, што яны маглі сваёй воляй асуджаць людзей на смерць ці дараваць ім жыццё.[81] Такое ўзвышэнне аднаго стану

[81] Baranauskas T. *Lietuvos valstybės ištakos*. 258.

над рэштай грамадства ўжо мала нагадвала просты аўтарытэт, які абапіраўся на традыцыю альбо на ваенныя заслугі. У дачыненні да ўсяго грамадства знаць была ў становішчы, якое ўжо вельмі моцна нагадвала ўладу.

Сацыяльнаму ўзвышэнню спадарожнічала і фізічнае адасабленне знаці ад грамадства. Аб гэтым сведчыць узнікненне замкаў на ранейшых гарадзішчах. Ва Усходняй Літве замкі існавалі на 80 гарадзішчах. Некаторыя з гэтых гарадзішчаў XI–XII стст. былі падобнымі да княскіх рэзідэнцый. Яны мелі круглыя пляцоўкі ад 20 да 50 метраў у дыяметры і нагадвалі пазнейшыя вялікакняскія рэзідэнцыі XIII–XIV стст. Фізічнае адасабленне знаці адлюстроўвала натуральную і надзённую спецыялізацыю ўлады, асноўнай задачай якой на той момант была абарона краю ад чужынскай экспансіі. Варта адзначыць, што і самі замкі, як і іншыя абарончыя збудаванні кшталту ўмацаваных пасяленняў і гарадзішчаў-сховішчаў, узводзіліся пераважна ўздоўж усходніх межаў Літвы і іншых балцкіх земляў. З 185 позніх гарадзішчаў культуры ўсходнелітоўскіх курганоў 45 знаходзяцца на тэрыторыі сучаснай Беларусі. З гэтых 45 ва ўсіх 15 даследаваных гарадзішчах знойдзены культурныя слаі XI–XII стст. У той жа час сляды культурных слаёў XI–XII стст. знойдзены толькі ў 13 гарадзішчах на тэрыторыі сучаснай Літоўскай Рэспубліке, і толькі ў двух з іх несумненным чынам. Гэта паказвае, што ўзвядзенне замкаў і іншае фартыфікацыйнае будаўніцтва канцэнтраваліся на напрамках полацкай і кіеўскай экспансіі з мэтай супрацьдзеяння ёй.[82]

Экспансія Русі на балцкія землі стала каталізатарам унутраных сацыяльных змен у Літве. Хуткае ўзвышэнне вайскова-дружыннай знаці, прыняцце ёй уладных функцый і стварэнне інфраструктуры краю з дапамогай фартыфікацыйнага будаўніцтва вялі да таго, што характар літоўскага грамадства хутка пераўтвараўся з патрыярхальнага ў дзяржаўны.[83]

У той жа час паволі змянялася і становішча на Русі. У 1044 г. памёр стары Брачыслаў, валадар Полацка, заваёўнік Нальшан і Літвы, сапернік і саюзнік мудрага Яраслава. Па

---

[82] Баранаўскас Т. *Вытокі Літоўскай дзяржавы* // Край=Kraj. Polonica-Albaruthenica-Lithuanica. 1–2 (4–5). Мінск, 2002. С. 107–109.

[83] Baranauskas T. *Lietuvos valstybės ištakos*. 259.

ягонай смерці Полацкае княства трывала стаяла на нагах, значна павялічыўшы ўладанні і ўзмацніўшы свае пазіцыі адносна суседзяў. І ўсё ж зеніт ягонай магутнасці і славы быў яшчэ наперадзе, падрыхтаваны і ажыццёўлены Брачыслававым сынам Усяславам.

Пастаўленыя побач, Брачыслаў і Усяслаў маюць падабенства да іншых бацькі і сына: македонскіх цароў Філіпа і Аляксандра. Як і Філіп, Брачыслаў руплівай працай, разумнай дыпламатыяй і ўпартай узброенай барацьбой узмацніў унутраны лад сваёй дзяржавы і прадэманстраваў яе знешнюю сілу суседзям, стварыўшы непахісны фундамент яе ўзвышэння ў будучыні. Як і Аляксандр, Усяслаў патрапіў збудаваць на бацькоўскім фундаменце велікапышны палац сваёй дзяржавы, рассунуўшы яе межы і прынесшы ёй нябачаную датуль славу і магутнасць. Як і Філіп Аляксандру, Брачыслаў мог з поўным правам сказаць Усяславу: «Шукай, сыне мой, царства па сабе, бо Македонія занадта малая для цябе».[84] Нарэшце, нараджэнне Усяслава, як і Аляксандра, было акружанае таямнічымі легендамі, якія спавяшчалі з'яўленне вялікага ваяўніка. Летапіс кажа: «Егоже роди мати от вълхвованья. Матери бо родивши его бысть ему язвено на главе его». «Рекоша бо волсви матери его: се язвено навяжи на нь да носить е до живота своего, еже носить Всеславъ и до сего дне на собе. Сего ради немилостивъ есть на кровьпролитье».[85]

Першыя гады княжання Усяслава прайшлі мірна. Мяркуючы па адсутнасці якіх-небудзь звестак аб супярэчнасцях паміж Полацкам і Кіевам, Усяслаў мудра працягваў бацькоўскую палітыку мірнага суіснавання з Яра славам, які да таго часу аднаасобна правіў Кіеўскай дзяржавай. У 1054 г. Яраслаў памёр, пакінуўшы ўладу сваім сынам. У адпаведнасці з Яраслававым запаветам, старэйшы Ізяслаў атрымаў у княжанне Кіеў, Святаслаў – Чарнігаў, Усевалад – Пераяслаўль, Ігар – Уладзімір-Валынскі, а Вячаслаў – Смаленск.[86] Пасля смерці ў 1057 г. Вячаслава, Ізяслаў, Святаслаў і Усевалад Яраславічы, якія валодалі важнейшымі княжан-

---

[84] Плутарх. Александр. VI // Плутарх. *Сравнительные жизнеописания.* Москва-Харьков, 1999. С. 889.

[85] Лаврентьевская летопись. Ст. 155.

[86] Тамсама. Ст. 161.

нямі і *de facto* мелі найбольшы ўплыў на справы ў Кіеўскай дзяржаве, сваёй воляй вывялі Ігара з Уладзіміра і перавялі яго ў Смаленск.[87] У 1060 г. памёр і Ігар, пасля чаго Ізяслаў, Святаслаў і Усевалад падзялілі паміж сабой Смаленск на тры часткі.[88] Адразу ж следам за гэтай падзеяй Усяслаў разам з братамі Яраславічамі выправіўся ў паход на качэўнікаў-торкаў, дзе здабыў сваю першую бліскучую перамогу. «Изяславъ, и Святославъ, и Всеволодъ, и Всеславъ совокупиша вои бещислены, и поидоша на конихъ и в лодьяхъ бещислено множество на Торкы». «Се слышавше Торци оубояшася, пробегоша и до сего дне, и помроша бегаючи».[89]

Звернем больш пільную ўвагу на гэтыя падзеі. На першы погляд, яны з'явілі яшчэ адзін прыклад трыумфу полацка-кіеўскага саюзу, закладзенага Брачыславам і Яраславам. Гэтым разам саюзнікі не абмежаваліся дапамогай адзін адному на тым кірунку, які ўваходзіў у сферу інтарэсаў абодвух дзяржаў, то бок панямонскіх балцкіх землях. Цяпер Усяслаў з палачанамі рушыў супраць стэпавых качэўнікаў, якія маглі цікавіць яго толькі як крыніца здабычы, але ніяк не былі яго знешнепалітычным прыярытэтам. Больш за тое, некаторыя беларускія даследчыкі лічаць, што папярэдняй платай Яраславічаў Усяславу за ваенную дапамогу супраць торкаў была ладная доля ад падзелу Смаленска. Паколькі пры апісанні пазнейшых падзей Орша і Копысь згадваюцца як уладанні полацкіх, а больш дакладна, менскіх князёў, М. Ермаловіч вылучае гіпотэзу, што гэтыя гарады маглі быць перададзеныя Полацку менавіта ў 1060 г.[90] Такім чынам, ізноў спрацаваў Брачыславаў прыём нарошчвання тэрыторыі ў абмен на мір і саюз.

Але саюз з Яраславічамі мог аказацца і траянскім канём. Па-першае, яны не выяўлялі вернасці свайму слову і прынятым абавязкам. Адзін толькі перавод Ігара з Уладзіміра ў Смаленск супярэчыў Яраслававай волі, які запавёў сынам «не преступати предела братня, ни сгонити».[91] Адстойваю-

---

[87] Тамсама. Ст. 162.

[88] Тверская летопись. С. 153.

[89] Лаврентьевская летопись. Ст. 163.

[90] Ермаловіч М. І. *Старажытная Беларусь. Полацкі і Новагародскі перыяды.* С. 110–111.

[91] Лаврентьевская летопись. Ст. 161.

чы свае карыслівыя інтарэсы, яны ніяк не паклапаціліся і пра Расціслава, сына іх старэйшага брата Уладзіміра Яраславіча, які княжыў у Ноўгарадзе і памёр у 1052 г.[92] Дасягнуўшы дарослага веку, Расціслаў застаўся ізгоем у кіраванай ягоным бацькам Наўгародскай зямлі, бо тая перайшла пад кантроль ягоных дзядзькаў. Пакінуты без княства, ён вымушаны быў у 1064 г. уцячы ў Тмутаракань. Разам з ім уцяклі такія выдатныя наўгародцы, як Вышата, сын ваяводы Астраміра, і Парэй, якім не спадабаліся новыя парадкі. З Тмутаракані Расціслаў выгнаў Святаслававa сына Глеба. На наступны год Святаслаў рушыў на Расціслава. Малады і ваяўнічы князь не збаяўся, але і не схацеў уздымаць зброю супраць дзядзькі. Каб пазбегнуць вайны, ён проста выступіў з горада. Святаслаў заняў Тмутаракань, дзе ізноў пасадзіў Глеба. Але варта было яму вярнуцца дадому, як Расціслаў ізноў выгнаў Глеба і сцвердзіўся на сваім стале.[93] Яму нават удалося абкласці данінай касогаў і іншыя сумежныя народы, што выклікала трывогу візантыйцаў. У 1066 г. ягонае яркае княжанне заўчасна скончылася, калі херсанэсскі катапан здрадліва атруціў яго на бяседзе.[94] Учынак гэты калі і не быў здзейснены са згоды Яраславічаў, то адпавядаў іх інтарэсам. Цяжкі лёс напаткаў і Барыса, сына Вячаслава Смаленскага. Крыўды, нанесеныя яму Яраславічамі, вярнуліся да іх цяжкой адплатай пазней у 1078 г. і адыгралі фатальную ролю ў лёсе старэйшага з іх, Ізяслава.

Па-другое, Яраславічы разгарнулі заўважную ваенную дзейнасць побач з межамі Полаччыны. У 1058 г. Ізяслаў перамог балцкае племя голядзь, якое жыло на рацэ Протве на Смаленшчыне.[95] У 1060 г., адразу пасля перамогі над торкамі, ён жа выправіўся ў паход на солаў, прыбалтыйскі народ фіна-угорскага паходжання, і абклаў іх нязвыкла вялікай данінай у 2000 грыўняў.[96] Калі паход на голядзь мог разглядацца як пагроза ўсходняй мяжы Полаччыны, то сцверджанне Кіева ў балтыйскіх краях пагражала паслабіць кантроль Полацка над ягоным важнейшым шляхам зносін –

92 Лаврентьевская летопись. Ст. 160.
93 Новгородская четвертая летопись. С. 121.
94 Лаврентьевская летопись. Ст. 166.
95 Тамсама. Ст. 166.
96 Новгородская четвертая летопись. С. 120.

Заходняй Дзвіной.[97] У гэтых абставінах дуалістычная сістэма бяспекі, заснаваная Брачыславам і Яраславам, якія абодва разумелі важнасць міру і саюзу для забеспячэння інтарэсаў сваіх дзяржаў, ужо не магла працаваць надзейна. Саюз з карыслівымі Яраславічамі, якія адкрыта прыніжалі сваякоў і нават паміж сабой не знаходзілі згоды, ужо не забяспечваў далейшага пашырэння полацкіх межаў. Больш за тое, ён не дазваляў цалкам пазбавіцца пагроз самой палітычнай і ваеннай бяспецы Полацкага княства. Такое становішча патрабавала іншай палітыкі і больш рашучых захадаў. Можна думаць, што ўжо ў канцы 1050-х гадоў, яшчэ будучы ў саюзе з Яраславічамі, Усяслаў зазіраў далёка наперад і шукаў шляхі доўгатэрміновага вырашэння знешнепалітычных праблем.

Сродкам абароны сваіх інтарэсаў Усяслаў абраў папераджальны ўдар па поўначы Кіеўскай дзяржавы. У выпадку поспеху такі ўдар мог значна пашырыць уладанні Полацкага княства, узмацніць яго стратэгічныя пазіцыі і аддаць пад яго кантроль важныя гандлёвыя шляхі, тым самым паслабляючы прамых сапернікаў – Яраславічаў. Пры любым зыходзе і нават у выпадку ваеннай няўдачы, як то паказаў досвед Брачыслава, такі ўдар вёў да перанясення вайны на варожую тэрыторыю. Вайна на варожай тэрыторыі адразу ж зраўноўвала шанцы патэнцыйна слабейшага Полацка. Гэта было важным аргументам для перамоваў аб міры і дазваляла полацкаму князю зрабіць прадметам гандлю ўжо не бяспеку і існаванне Полаччыны, а дэталі больш ці менш роўнага падзелу сфер уплыву і ўладанняў.

Вельмі ўдала быў абраны сам момант нанясення ўдару. Пасля шэрагу ваенных перамог у 1058–1060 гг. для Кіеўскай дзяржавы надышлі цяжкія часы. Ужо на наступную вясну пасля паходу Ізяслава паўсталі солы. Яны «изгнаша данники, на весну же, вышедше, повоеваша села о Юрьеве дні, и грады ихъ и хоромы пожгоша, и многа зла сътвориша, и Пскова доидоша воююще». «И идоша противу имъ Псковици и Новгородци на сечю, и паде Руси 1000, а Солы бес-

---

[97] Семянчук Г. *Усяслаў Брачыславіч, князь полацкі (штрыхі да гістарычнага партрэта)* // Białoruskie Zeszyty Historyczne. Nr. 18. Białystok, 2002. Сайт «Камунікат»; http://kamunikat.net.iig.pl/–Па адрасе: http://kamunikat.net.iig.pl/www/czasopisy/bzh/18/18art_siemianczuk.htm – 06.16.2004.

щисла».[98] У той самы час з поўдня на Русь абрынуліся полаўцы. 2 лютага 1061 г. іх сустрэла войска Усевалада Яраславіча. «И бившимъся имъ победиша Всеволода».[99] У 1064 г. у Тмутаракані сцяг барацьбы ўзняў Расціслаў. Такім чынам, уся ўвага Яраславічаў была звернутая на паўднёвыя справы. Ноўгарад і Пскоў часова выпалі з поля іх зроку, да таго ж страціўшы шмат баяздольных людзей у пабаявішчы з соламі.

Прадвесце новай вайны лунала ў паветры. Трывожныя навіны з палёў бітваў перапляталіся з містычнымі знакамі. У 1063 г. «в Новегороде иде Вълховъ на въспять 5 дніи; се же знаменіе не на добро бысть».[100] У 1065 г. «бысть знаменіе на небеси, на западнои стране, звезда превелика, луча имоуще кровавы, въсходящи с вечера по заходе солнечномъ и пребысть 7 дніи». «Се же проявляшеся не на добро; по семъ бо быша оусобица многы на землю Роускою и нашествіе поганых; сі бо звезда бе аки кровава, проявляющи кровъ».[101]

Нябёсныя знакі не падманулі людзей. «В се же лето Всеславъ рать почалъ копити».[102] І ў той самы 1065 г. ён «былъ оу Пьскова ратью и перси билъ порокы».[103] Горад, нават і з дапамогай парокаў, то бок абложных машын, узяць не ўдалося. Але гэтая няўдача была кампенсаваная вялікім тактычным поспехам. Як тлумачаць паведамленні Наўгародскага першага летапісу аб наступных падзеях сучасныя беларускія гісторыкі,[104] тагачасны наўгародскі князь Мсціслаў Ізяславіч рушыў напярэймы Усяславу, але быў разбіты на рацэ Чарэсе. Не наважыўшыся вяртацца ў Ноўгарад пасля паражэння і ведаючы аб непрыхільнасці наўгародцаў да свайго бацькі Ізяслава і двух ягоных братоў, ён уцёк у Кіеў.[105] Цяпер Ноўгарад апынуўся ў стане безуладдзя і збянтэжанасці і застаўся цалкам безабаронным. На працягу кароткага часу наўгародцы страцілі шмат людзей у бітвах з соламі і палачанамі; згубілі спачатку папулярнага князя

---

98 Новгородская четвертая летопись. С. 120.
99 Лаврентьевская летопись. Ст. 163.
100 Новгородская четвертая летопись. С. 121.
101 Тамсама.
102 Тамсама.
103 Тамсама. С. 123.
104 Тарасаў С. В. *Чарадзей сёмага веку Траяна: Усяслаў Полацкі.* Мн., 1991. С. 32.
105 Новгородская первая летопись. С. 161.

Расціслава, а затым і непапулярнага намесніка Мсціслава. Кіраваць зямлёй і абараняць яе не было каму. Гэтым шанцам не абмінуў скарыстацца Усяслаў. У 1066 г. «приде Всеславъ и възя Новъгородъ, съ женами и съ детми; и колоколы съима у святыя Софие». «О, велика бяше беда въ час тыи; и понекадила съима», — горка лямантуе наўгародскі летапісец.[106] У іншых летапісах гэтая падзея датуецца 1067 г. М. Ермаловіч тлумачыць разыходжанне кантамінацыяй у адным летапісным паведамленні двух паходаў Усяслава на гарады з падобнай назвай: Ноўгарад і панямонскі Навагародак. Паводле гэтай версіі, напад на першы адбыўся ў 1066 г., тады як напад на апошні — ў 1067 г.[107] Ведаючы важнае стратэгічнае значэнне панямонскага Навагародка і старое полацка-кіеўскае саперніцтва з-за балцкіх земляў, можна дапусціць, што Усяслаў сапраўды выяўляў інтарэс да Навагародка. Але прамых доказаў яго нападу на гэты горад няма.

У кожным выпадку папераджальны ўдар дасягнуў сваёй мэты. За два паходы Усяслаў пазбавіў Яраславічаў кіравання паўночна-заходняй часткай іх дзяржавы, перарэзаў Волхаўска-Дняпроўскі гандлёвы шлях і нанёс ім велізарныя матэрыяльныя і людскія страты. Далейшая задача заключалася ў адбіцці ўдару ў адказ, якога нядоўга давялося чакаць. У 1067 г. Яраславічы сабралі свае наяўныя войскі і рушылі на Полаччыну. Першай мэтай іх паходу стаў Менск. Прычын выбару такога кірунку магло быць некалькі. Перш за ўсё, Менск быў памежнай з Літвой крэпасцю Полацка. Яго захоп даваў Яраславічам магчымасць адсекчы Усяслава ад ваеннай дапамогі з боку ягоных літоўскіх даннікаў. Па-другое, валадары Паўднёвай Русі маглі, як і Усяслаў, скарыстаць фактар нечаканасці. Ведаючы, што найбольш зручным шляхам у полацкія ўладанні з'яўляецца Дняпроўскі і што Усяслаў мог чакаць іх менавіта там, яны ўхіліліся ад звычайнай дарогі і нанеслі ўдар па ўскраіне Полаччыны. Так ці інакш, на дапамогу Менску Усяслаў не паспеў. Мяняне зачыніліся ў горадзе, але не патрапілі даць рады супраць

---

106 Новгородская первая летопись. С. 17.

107 Ермаловіч М. І. *Старажытная Беларусь. Полацкі і Новагародскі перыяды.* С. 115–118.

аб'яднаных сіл Паўднёвай Русі. «Си же братья взяша Менескъ и исекоша мужи, а жены и дети вдаша на щиты и поидоша к Немизе».[108] На Нямізе братоў сустрэў Усяслаў. 3 сакавіка 1067 г. у траскучыя маразы на снезе адбылася адна з самых жорсткіх і крывавых бітваў ранняга беларускага сярэднявечча. «И бяше снегъ великъ, и поидоша противу собе, и бысть сеча зла, и мнози падоша, и одолеша Изяславъ, Святославъ, Всеволодъ; Всеславъ же бежа».[109] Тактычная перавага аказалася на баку Яраславічаў, але становішча пасля бітвы склалася амаль такое самае, як і пасля бітвы на Судоме. Цяжкія страты панеслі абодва бакі. Пірава перамога не дазволіла мацнейшаму боку замацаваць свой тактычны поспех і развіць яго ў агульную перамогу ў вайне. Адваротна, слабейшы бок фактычна адстаяў сваю тэрыторыю і захаваў сілы для далейшай барацьбы.

Яраславічы вымушаныя былі пайсці на перамовы. Сустрэча была прызначаная ля Смаленску на Ршы ў ліпені 1067 г. Пад прысягай на крыжы Яраславічы па-абяцалі Усяславу, што не зробяць яму нічога кепскага. Здавалася, што ён ізноў ішоў шляхам свайго бацькі, і адзінае, што ад яго цяпер патрабавалася, — замацаваць вынік узброенай барацьбы за сталом перамоваў. Між тым, як гэта часта здараецца ў палітыцы, дамоўленасці былі падступна парушаныя. Калі Усяслаў пераправіўся на ладдзі цераз Дняпро, Яраславічы арыштавалі яго, пераступіўшы крыжацалаванне, і разам з двума сынамі ўсадзілі ў поруб у Кіеве.[110]

Здавалася б, яны маглі святкаваць поўную перамогу. Адужаўшы, але не зламіўшы Усяслава на полі бою, яны атрымалі над ім поўную ўладу шляхам змовы. Але як то бывае, наступныя падзеі ізноў паказалі, што гісторыя часта знаходзіцца пад уплывам непадкантрольных чалавеку фактараў і можа крута мяняць свае шляхі, у адзін момант робячы пераможцаў пераможанымі. У 1068 г. на Русь ізноў абрынулася палавецкае нашэсце. Яраславічы, якія выступілі полаўцам насустрач, былі ўшчэнт разбітыя на Альце. Святаслаў уцёк да сябе ў Чарнігаў, а Ізяслаў з Усеваладам вярнуліся ў Кіеў. Узрушаныя кіяўляне запатрабавалі ад Ізясла-

---

108 Лаврентьевская летопись. Ст. 166.
109 Тамсама. Ст. 166–167.
110 Тамсама. Ст. 167.

ва коней і зброю, каб далей біцца з полаўцамі, у чым Ізяслаў адмовіў. Тады натоўп рушыў да поруба, каб вызваліць Усяслава, які, будучы грозным праціўнікам Кіеўскай дзяржавы, пэўна ж меў рэпутацыю добрага палкаводца. Дружына параіла Ізяславу здрадліва забіць Усяслава, але замест таго яму і Усеваладу давялося ўцячы з Кіева самім. Цікава, што Ізяслаў як бяздомны выгнаннік накіраваўся не да сваіх братоў, а ў Польшчу. Кіеўскім жа князем быў абвешчаны Усяслаў. Летапісец, якога цяжка абвінаваціць у залішняй сімпатыі да Усяслава, важка зазначае: «Богъ же показа силу крестную на показанье земле Русьстеи: да не преступають честнаго креста целовавше его; аще ли преступить кто то и зде прииметь казнь, и на придущем веце казнь вечную».[111]

На наступны год Ізяслаў з'явіўся на Русі разам з польскім каралём Баляславам і ягоным войскам, пыхаючы жаданнем помсты. Усяслаў з кіяўлянамі выступіў яму насустрач да Белгарада, але, усведамляючы безнадзейнасць барацьбы за чужы стол, пакінуў іх і накіраваўся ў Полацк. Заставшыся без правадыра, кіяўляне папрасілі заступніцтва Святаслава і Усевалада перад Ізяславам. Малодшым братам і самім не надта ўсміхалася магчымасць панавання ў Кіеве палякаў, бо яны выдатна ўяўлялі, як паводзіць сябе на чужыне акупацыйнае войска. Да таго ж, мяркуючы па ўцёкам Ізяслава ў Польшчу, а не да іх, паміж старэйшым і малодшымі Яраславічамі ўжо тады пралёг цень нязгоды. На просьбу братоў Ізяслаў адпусціў большую частку палякаў дадому, а сам рушыў з Баляславам і невялікім польскім атрадам. Гэта не перашкодзіла яму накіраваць наперад сябе сына Мсціслава, які ўчыніў над кіяўлянамі жорсткую расправу. Затым Ізяслаў выгнаў Усяслава з Полацка і пасадзіў там Мсціслава, які нарэшце змог адпомсціць за сваё паражэнне на Чарэсе. Неўзабаве Мсціслаў памёр, а ягонае месца заняў іншы Ізяславіч — Святаполк.[112]

Часовы і нетрывалы кіеўскі трыумф Усяслава скончыўся выгнаннем. Каб паправіць свае фартуны, дзейны князь вырашыў скарыстацца з выпрабаванага метаду барацьбы і нанесці ўдар туды, дзе яго не чакалі — на поўнач, на Ноўга-

[111] Лаврентьевская летопись. Ст. 170—172.
[112] Тамсама. Ст. 173—174.

рад, дзе ў той час ужо княжыў Глеб Святаславіч. Для гэтага ён сабраў войска з фіна-угорскага племені водзі. Як з незвычайнай руплівасцю занатаваў уражаны спрытам і ваяўнічасцю полацкага князя наўгародскі летапісец, у тым жа 1069 г. «месяця октября въ 23, на святого Якова брата господня, въ пятничи, въ чяс 6 дни, опять приде Все[славъ] къ Новугороду; новгородци же поставиша пълъкъ противу ихъ, у Зверинця на Къземли; и пособи богъ Глебу князю съ новгородци». «О, велика бяше сеця Вожяномъ, и паде ихъ бещисльное число; а самого князя отпустиша бога деля».[113] Звяртае на сябе ўвагу той факт, што Усяславу ізноў удалося выйсці сухім з вады. Гэта можа тлумачыцца тым, што наўгародцы маглі сапраўды прытрымлівацца ўсталяванага для свайго часу кодэксу паводзінаў. Памятаючы, што адкрытае парушэнне клятвы Яраславічамі выклікала абурэнне тагачаснага рускага грамадства, не з'яўляецца цалкам неверагодным, што пры ўсёй нянавісці да князя наўгародцы лічылі яго ахвярай несправядлівасці і маглі зразумець, калі не апраўдаць прычыны ягонага нападу. Больш таго, ён стаў ахвярай злачынства, якое ў сілу сакральнасці парушанай клятвы было накіравана і супраць самога Бога. Таму яны маглі адпусціць Усяслава літаральна «Бога дзеля». Усё ж не будзем забывацца, што ў такой цынічнай вобласці чалавечых адносін, як палітыка, сваю ролю маглі адыграць і іншыя прычыны. Глеб, будучы верным сынам свайго жорсткага бацькі Святаслава, мог адпусціць Усяслава, каб дапамагчы інтрыгам Святаслава супраць уласных братоў. Будучы людзьмі, выхаванымі на прыкладах жорсткай палітычнай гульні, Святаслаў і Глеб маглі выкарыстоўваць у свёй хітра плеценай палітыцы стары прынцып: *«Divide et impera»*. У іх інтарэсах на той момант было дапамагчы Усяславу, як найслабейшаму ўдзельніку палітычнай гульні, каб не дапусціць яго канчатковага паражэння і гібелі. Замест гэтага ў яго асобе яны захоўвалі фактар агульнай палітычнай нестабільнасці і маглі з яго дапамогай аказваць ціск на таго самага Ізяслава. Так ці не, але ў бліжэйшыя гады Усяслаў сапраўды прынёс шэраг праблем Ізяславу і працягваў аказваць велізарны ўплыў на справы і Полацкага княства, і Кіеўскай дзяржавы, у прыватнасці на

---

[113] Новгородская первая летопись. С. 17.

складаныя ўзаемаадносіны паміж Яраславічамі.

Але найперш, ён дасягнуў сваёй бліжэйшай мэты – вярнуў панаванне над спрадвечным бацькоўскім сталом. У 1071 г. Усяслаў «выгна... Святополка ис Полотска». І хаця «в се же лето победи Ярополкъ Всеслава оу Голотичьска»,[114] улада над Полацкам засталася ў руках яго законнага гаспадара. Абодва бакі маглі цяпер, так бы мовіць, падвесці прамежкавыя вынікі барацьбы. Нягледзячы на шэраг ваенных паражэнняў і кароткачасовую страту Полацка, Усяслаў застаўся на сваім стале і мог надалей бесперашкодна валадарыць у сваім княстве. Цяпер Полаччыну чакала чарада мірных гадоў. У Кіеўскай жа дзяржаве, наадварот, справы пайшлі далёка не бліскуча. Усё ў тым жа 1071 г. адбыўся чарговы напад на Русь полаўцаў, якія зваявалі землі ад Растоўца да Яціна. Карыстаючыся з навеяных войнамі і бедамі жаху, пустоты і адчаю ў душах людзей, у абодвух цэнтрах Русі ўзнялі галаву прыхільнікі паганства. Адзін вяшчун з'явіўся ў Кіеве.[115] Яшчэ адзін вяшчун-чудзін паспеў спакусіць мноства народу ў Ноўгарадзе, пакуль не быў забіты Глебам Святаславічам. Каб даць новы імпэт хрысціянству як аб'яднальнай сіле грамадства, Яраславічы ў 1072 г. разам урачыста ўшанавалі памяць святых Барыса і Глеба і перанеслі іх мошчы ў новую царкву, тым самым надаўшы асаблівае значэнне іх культу.[116]

Аднак агульны крызіс краіны працягваўся. Ён адбіўся і на ўзаемаадносінах паміж Яраславічамі. У 1073 г. Святаслаў «прелсти» Усевалада супраць Ізяслава, намаўляючы яму, што той чыніць з Усяславам змовы супраць іх абодвух. У выніку браты ўступілі ў Кіеў, прымусіўшы Ізяслава паўтарыць ягоны горкі шлях у Польшчу і далей на захад.[117] Цяжка сказаць, ці Усяслаў сапраўды спрабаваў весці тонкую гульню з Ізяславам супраць іншых Яраславічаў, ці гэта было ілжывым абвінавачаннем. У любым выпадку ён ізноў адыграў важную ролю ў лёсе Кіеўскай дзяржавы. Калі нават не ён быў

---

[114] Лаврентьевская летопись. Ст. 174.

[115] Тамсама.

[116] Тамсама. Ст. 179–182. Людольф Мюлер лічыць, што сама каназацыя Барыса і Глеба адбылася не пазней за 1039 г. Мюллер Л. *Понять Россию: историко-культурные исследования*. Москва, 2000. С. 71–84.

[117] Лаврентьевская летопись. Ст. 182–183.

сапраўднай прычынай выгнання Ізяслава, то Святаслаў мог хітра скарыстаць яго як той самы фактар нестабільнасці і зрабіць фармальнай нагодай прэтэнзій да свайго старэйшага брата. Са свайго боку, і Усяслаў мог бачыць у Ізяславе слабейшае звяно Кіеўскай дзяржавы. Будучы фармальна старэйшым князем, той моцна пахіснуў свой аўтарытэт і ўладу пасля парушэння крыжацалавання, паражэння ад полаўцаў, уцёкаў у Польшчу і расправы над кіяўлянамі. Адносіны з братамі, да якіх ён не наважыўся ўцячы і ў найцяжэйшыя для яго часы бунту ў Кіеве, таксама былі напружанымі. Таму падтрымка яго Усяславам супраць астатніх двух братоў была для полацкага князя цалкам наўральным крокам і дазваляла яму трымаць у расколатым стане патэнцыйна небяспечныя для яго сілы Кіеўскай дзяржавы. Пасля такога разладу паміж самімі Яраславічамі Усяслаў ужо мог не баяцца варожых дзеянняў з іх боку. Іх рукі былі звязаныя высвятленнем адносін паміж сабой. Неўзабаве Усяслаў займеў шанц нанесці ім чарговы ўдар іх жа рукамі.

Кіеўскую дзяржаву па-ранейшаму раздзіралі міжусобіцы Яраславічаў і іх эпігонаў. У 1076 г. сканаў Святаслаў Яраславіч. Па ім на кіеўскім стале сеў Усевалад. Ужо ў 1077 г. яму давялося звярнуць увагу на Чарнігаў, родавае гняздо памерлага Святаслава. На кароткіх восем дзён уладу там захапіў сын былога смаленскага князя Вячаслава Барыс, якому з дня смерці ягонага бацькі ў 1057 г. не дасталося ад Яраславічаў вартага яго роду княжання. Толькі ён уцёк у Тмутаракань да Рамана Святаславіча, як на захадзе для Усевалада сабралася новая пагроза. Разам з палякамі законны кіеўскі князь Ізяслаў ішоў адваёўваць свой страчаны стол. Застаўшыся паміж двух агнёў, Усевалад вымушаны быў без бою саступіць Ізяславу Кіеў, але забраў сабе Чарнігаў як другі па значнасці і прэстыжу горад паўднёвай Русі. У той жа час законны гаспадар Чарнігава, яшчэ адзін сын Святаслава Алег, быў выведзены з Уладзіміра-Валынскага і знаходзіўся ў сваім жа спадчынным уладанні пры Усеваладзе ці то як ганаровы закладнік, ці то як нелюбімы пляменнік-прыжывала.[118] Не вытрымаўшы цяжкой рукі дзядзькоў і іх знаёмай звычкі пазбаўляць сваякоў законных правоў, ён

[118] Лаврентьевская летопись. Ст. 199.

напачатку 1078 г. таксама ўцёк у Тмутаракань да роднага брата Рамана і Барыса Вячаславіча. Цяпер ужо на паўднёвых межах Кіеўскай дзяржавы сабралася навала ў выглядзе хаўрусу незадаволеных Ізяславам і Усеваладам князёў. Часу Алег з Барысам марна не трацілі. Прыцягнуўшы да свайго хаўрусу полаўцаў, яны пайшлі на Усевалада і нанеслі яму страшэннае паражэнне на Сожыцы, паклаўшы на полі бітвы мноства ягоных баяр і шараговых ваяроў. Затым хаўруснікі занялі Чарнігаў. Усевалад жа ўцёк да Ізяслава ў Кіеў. Сабраўшы апошнія сілы, браты рушылі на Чарнігаў. Разам з Ізяславам ішоў ужо знаёмы нам яго сын Святаполк, разам з Усеваладам – яго сын Уладзімір, званы Манамахам, які тады княжыў у Смаленску. Скарыстаўшыся тым, што Алега і Барыса не было ў Чарнігаве, чацвёра князёў пайшлі на прыступ. Верныя Алегу чарнігаўцы адчайна абараняліся. Уладзіміру ўдалося запаліць вакольны горад, калі прыйшла вестка, што на выратаванне Чарнігава рухаліся Алег з Барысам. На Няжацінай ніве адбылася рашучая бітва. Першым у баі загінуў Барыс Вячаславіч, але неўзабаве смерць ад варожага кап'я напаткала і Ізяслава. Алег пацярпеў паражэнне і мусіў уцякаць у Тмутаракань. Пераможцы нанова перадзялілі Кіеўскую дзяржаву на сваю карысць. Усевалад цяпер ужо трывала сеў у Кіеве, а Уладзіміру ў парушэнне ўсіх законных правоў Святаславічаў аддаў Чарнігаў.[119]

Не мог застацца ўбаку ад гэтых падзей і Усяслаў. Ізноў, як і ў сярэдзіне 1060-х гадоў, унутраныя супярэчнасці Кіеўскай дзяржавы прыкавалі да сябе ўсю ўвагу Яраславічаў. Усяслаў меў добрую магчымасць для новага папераджальнага ўдару. Магчыма, першай яго мэтай у чарговы раз стаў шматпакутны Ноўгарад, бо ўвесну 1077 г. Уладзімір Манамах хадзіў са Смаленска да Ноўгарада «Глебови в помочъ». Быць можа, неабходнасць такога паходу была якраз выкліканая нападам Усяслава. Як далей распавядае Манамах у сваім «Павучанні», у тым жа годзе ён хадзіў «на лето со отцемъ подъ Полтескъ, а на другую зиму с Святополкомъ подъ Полтескъ, ожгоша Полтескъ». Спаліўшы вакольны горад Полацка, Уладзімір працягнуў сваю кампанію, разам з по-

---

[119] Лаврентьевская летопись. Ст. 199–202.
[120] Тамсама. Ст. 247.

лаўцамі спустошыўшы раён Одрску.[120] Небяспека з боку Усяслава была настолькі вялікай для смаленскага князя, што ён быў цалкам пазбаўлены магчымасці прыйсці на дапамогу свайму бацьку Усеваладу, які на поўдні вёў жорсткую барацьбу з Алегам і Барысам. Менавіта адсутнасць смаленскага вайсковага кантынгенту магла стаць вырашальным фактарам паражэння Усевалада на Сожыцы. Зрэшты, Усяслаў мог не толькі весці ваенныя дзеянні супраць Смаленска, скоўваючы сілы Уладзіміра і такім чынам правакуючы новыя цяжкасці для Усевалада. Ён мог і актыўна ўмешвацца ў ход падзей на поўдні, свядома распальваючы полымя міжусобіц. Прынамсі, беларускі гісторык С. В. Тарасаў лічыць, што менавіта ва Усяслава перахоўваўся Барыс Вячаславіч, а ягонае васьмідзённае кіраванне ў Чарнігаве было толькі часовым прыпынкам па дарозе з Полацка ў Тмутаракань.[121]

Нарэшце прыцішыўшы пагрозу з боку Усяслава, у 1078 г. Уладзімір рушыў на паратунак да бацькі, калі той знаходзіўся на мяжы катастрофы. Але ў час, калі ён цішком краўся ў Пераяслаўль паміж палавецкіх войскаў на злучэнне з Усеваладам, паліў прадмесці Чарнігава і біўся на Няжацінай ніве, Усяслаў ізноў даў знаць аб сабе. Ваяўнічы полацкі князь спаліў вакольны горад Смаленска. Уладзімір кінуўся за ім, маючы пры сабе для большай хуткасці запасных коней, але так і не дагнаў яго. У помсту Уладзімір паваяваў полацкія землі да Лукомля і Лагойска і спустошыў ваколіцы Друцка. Пасля таго ваенныя дзеянні на некалькі гадоў сціхлі і эпізадычна аднавіліся толькі ў 1084 г., калі Уладзімір з чарнігаўцамі, полаўцамі і чыцеевічамі ўзяў і разбурыў Менск, не пакінуўшы ў ім «ни челядина, ни скотины».[122] Больш варожых дзеянняў паміж Усяславам і валадарамі Кіеўскай дзяржавы крыніцы не згадваюць.

Вядома ж, і Полацк, і Кіеўская дзяржава і надалей вялі актыўную знешнюю палітыку на іншых кірунках і ўжывалі пры гэтым ваенныя сродкі. Але дым паміж імі развеяўся і абодва бакі маглі агледзець свае набыткі і падлічыць страты. У адпаведнасці з адвечнымі законамі міжнародных адносін, асноўнымі мэтамі абодвух бакоў былі нарошчванне

---

[121] Тарасаў С. В. *Чарадзей сёмага веку Траяна: Усяслаў Полацкі.* С. 50–51.

[122] Лаврентьевская летопись. Ст. 248.

ўласнай магутнасці і паслабленне суседа. З полацкага боку мінімальнай мэтай было захаванне незалежнасці і нанясенне магчымай шкоды інтарэсам Кіеўскай дзяржавы. Максімальна дасяжнай мэтай было пашырэнне сваёй тэрыторыі за кошт кіеўскіх уладанняў. Дакладныя мэты Кіеўскай дзяржавы ў войнах з Полаччынай вызначыць больш цяжка з-за вялікай колькасці князёў-удзельнікаў, кожны з якіх быў самастойнай палітычнай сілай, і супярэчнасцяў у іх інтарэсах. Мяркуючы па развіцці ўнутрыпалітычных падзей у Кіеўскай дзяржаве, асноўнай мэтай Ізяслава, Святаслава і Усевалада Яраславічаў было выдаленне іншых прадстаўнікоў дынастыі Рурыкавічаў з палітычнай арэны, што яны і зрабілі з Ігарам Яраславічам, Расціславам Уладзіміравічам і Барысам Вячаславічам. Уладанні выгнаных князёў дзяліліся паміж Яраславічамі і іх сынамі. Тое ж самае магло чакаць і Усяслава. Пазней, з узнікненнем варожасці паміж самімі Яраславічамі, кожны з іх клапаціўся пра выгоды толькі сваёй галіны роду і ўступаў у саюзы, у тым ліку і з Усяславам, выключна ў сваіх карыслівых інтарэсах, мала дбаючы пра Кіеўскую дзяржаву.

Для дасягнення сваіх мэтаў абодва бакі выкарыстоўвалі як палітычныя, так і ваенныя сродкі. І ў той, і ў другой сферы ініцыятыва звычайна належала Усяславу.Ягоныя палітычныя захады зводзіліся да дзеянняў на баку слабейшай дзейнай сілы кіеўскай палітыкі. Гэта магло быць ускоснае выкарыстанне супрацьдзеяння гэтай сілы кіеўскай палітыцы, як у выпадку з Расціславам Уладзіміравічам, дамовы з такой сілай аб сумесных дзеяннях супраць іншых ігракоў, як у выпадку з Ізяславам, альбо адкрытая дапамога, як у выпадку з Барысам Вячаславічам. Ваенныя мерапрыемствы ўяўлялі сабой папераджальны ўдар у нечаканым і неабароненым кірунку. Кіеўскія валадары адказвалі на гэта адпаведнымі палітычнымі саюзамі і ваеннымі ўдарамі. Натуральна, такая палітычная лінія ўключала непазбежную рызыку гібелі людзей і спусташэння іх уладанняў, але князі, якіх такая рызыка закранала менш за іх падданых, ішлі на яе лёгка.

Зыходныя пазіцыі бакоў пры пачатку ваенных дзеянняў і іх суадносіны з намечанымі мэтамі больш выгодна выглядалі ў Полаччыны. Дзяржава з кампактнай тэрыторыяй, аднаасобным кіраўніком і лаяльным яму насельніцтвам мела

добрыя шанцы паспяхова вытрымаць цяжкасці вайны. Наадварот, Кіеўская дзяржава мела вялізную тэрыторыю, якую было цяжка кантраляваць і немагчыма абараняць. Гэтым карыстаўся Усяслаў, наносячы нечаканыя ўдары. Наяўнасць шматлікіх прадстаўнікоў кіеўскага княскага роду, якія пастаянна варагавалі паміж сабой, таксама давала Усяславу выдатныя магчымасці для ўмяшальніцтва ў кіеўскія справы і пошуку саюзнікаў. Нават няўдачы не прыводзілі яго да канчатковага паражэння з-за нязгоды ў стане праціўнікаў. Можна згадаць, што ў 1067–69 гг. полацкі князь двойчы знаходзіўся ў іх руках, у Кіеве і пад Ноўгарадам, і абодва разы быў вызвалены мясцовымі ж палітычнымі сіламі з нейкіх уласных меркаванняў.

Адпаведнымі былі і вынікі войнаў. Кіеўская дзяржава атрымала на сваю долю спусташэнне полацкім войскам наўгародскіх, пскоўскіх і смаленскіх земляў і адцягванне вайсковых сіл ад паўднёвай ускраіны, якой пагражалі мяцежныя князі і полаўцы. Цяжкім наступствам было і нарастанне міжкняскай варожасці і разладжванне палітычнай сістэмы, якому паспрыялі войны з Усяславам. Станоўчым вынікам быў толькі часовы кантроль над Полаччынай у 1069–71 гг. Полацкае княства расплацілася часовай стратай незалежнасці і спусташэннем сваёй тэрыторыі. Але, будучы колькасна слабейшым бокам канфлікту, яно адстаяла сваю незалежнасць. Калі ў 1097 г. на з'ездзе ў Любечы рускія князі абвясцілі прынцып падзелу ўладанняў і прызнання ўзаемнай самастойнасці,[123] Усяслава на ім не было. Полацкая княская дынастыя мела трывалы статус незалежных сюзерэнаў па-за межамі кіеўскай палітычнай і дынастычнай сістэмы і не мела патрэбы ўдзельнічаць у міжкняскіх адносінах Русі на правах шараговага суб'екта. Новых тэрыторый за кошт кіеўскіх уладанняў Усяслаў не набыў, за выключэннем магчымага і яшчэ мірнага далучэння Оршы і Копысі, але забяспечыў сабе магчымасць для пашырэння ўлады ў іншым кірунку.

Цяжкае, але паспяховае супрацьстаянне з Кіеўскай дзяржавай дазволіла Усяславу накіроўваць свае рэсурсы на працяг экспансіі на балцкіх землях. Пашырэнне полацкіх уладанняў адбылося найперш на захадзе, дзе ў XI ст. узніклі

[123] Лаврентьевская летопись. Ст. 256–257.

Лошаск (Лоск) і Гарадзец.[124] На паўночным захадзе ў дадатак да Браслава і Дрысвятаў былі ўзведзеныя новыя ўмацаваныя пункты ў Дзісне, Мядзеле,[125] Маскавічах і Рацюнках.[126] Цікава, што як і ў выпадку Заслаўя, этнічны склад залогі Маскавічаў быў вельмі стракаты. У крэпасці прысутнічала славянскае, балцкае і фіна-угорскае насельніцтва. Пры гэтым сярод славян былі выхадцы з такога аддаленага ад Полаччыны племені, як вяцічы. Рунічныя надпісы і рэчавыя знаходкі ясна гавораць аб знаходжанні ў Маскавічах і скандынаваў. Гэта маглі быць нашчадкі нарманаў, якія аселі на Полаччыне яшчэ ў папярэдні нарманскі перыяд яе гісторыі, альбо ваяры-найміты, якія, як і раней, славіліся сваім ваенным умельствам і годна служылі гаспадарам па ўсёй Еўропе.[127]

Пры гэтым у Панямонні працягвалася ранейшае саперніцтва полацкіх і кіеўскіх князёў, ужо не звязаных дамовамі аб міры і саюзе. На працягу другой паловы XI ст. кіеўскім князям удалося дасягнуць пэўных поспехаў на гэтым кірунку. У другой палове – канцы XI ст. узнікае паселішча на Замкавай гары ў Горадні. Ваенны характар паселішча выразна гаворыць аб яшчэ большым змяшчэнні акцэнту славянскай экспансіі ў Панямонні са стыхійнага сельскагаспадарчага да ваеннапалітычнага пад эгідай Кіеўскай дзяржавы. Паселішча ў Горадні ўзнікла менавіта як умацаваны пункт. Яно адразу ж было акружана валам з драўлянымі збудаваннямі. Насялялі яго ваяры і рамеснікі, якія абслугоўвалі патрэбы мясцовай залогі.[128] Гэтак жа сама ў канцы XI ст. у якасці памежнай крэпасці ўзнікае ўмацаванае паселішча Турыйск (каля сучаснай вёскі Турэйск Шчучынскага раёну).[129]

Але прасоўванне лініі крэпасцяў у балцкія землі і каланізацыя іх славянскім насельніцтвам не былі выключнымі формамі рускай экспансіі. Прынамсі, полацкія князі рушылі нашмат далей, аб чым добрае ўяўленне дае пералік у «Повести временных лет» народаў, якія даюць дань Русі.

---

124 Заяц Ю. А. *Заславль в эпоху феодализма.* С. 113.

125 Иллюстрированная хронология истории Беларуси. Мн., 2002. С. 28.

126 Семянчук Г. *Усяслаў Брачыславіч, князь полацкі.* http://kamunikat.net.iig.pl/www/czasopisy/bzh/18/18art_siemianczuk.htm

127 Дучыц Л. У. *Браслаўскае Паазер'е ў IX–XIV стст. Гісторыка-археалагічны нарыс.* Мн., 1991. С. 73–77.

128 Зверуго Я. Г. *Верхнее Понеманье в IX–XIII вв.* С. 63–64.

129 Тамсама. С. 73–74.

Сярод іх згадваюцца балцкія плямёны Літвы, Зімiголы (земгалаў), Корсі (куршаў), Нарамы (нярыс?) і фіна-угорскае племя Лібі (ліваў).[130] Паводле меркавання Томаса Баранаўскаса, спіс гэты быў складзены прыкладна паміж 1096 і 1103 гг.[131] Гэта значыць, ён адлюстроўваў становішча якраз на момант смерці Усяслава. Калі звярнуць увагу на тое, што ўсе адзначаныя народы альбо непасрэдна межавалі з полацкімі ўладаннямі, альбо знаходзіліся ў межах дасягальнасці ваенных акцый полацкіх князёў, то можна думаць, што пад выплатай даніны Русі разумелася менавіта іх даніна Полацку. Археалагічныя даследаванні падзвінскага гарадзішча Кукенойс паказваюць яго цесныя сувязі з Полацкам ужо ў XI ст., што можа быць доказам падпарадкавання Полацку племені латгалаў.[132] Таксама, найбольш верагодна, у XI ст. узнікае падуладны Полацку падзвінскі горад Герцыке.[133] Такім чынам, мы можам меркаваць, што падчас кіравання Усяслава Літва, латгалы, земгалы, куршы і лівы трапілі ў арбіту полацкай палітыкі. Не маючы дастаткова рэсурсаў для сталага будаўніцтва ўмацаванняў на землях, раскіданых на вялізных абшарах, і іх каланізацыі, Усяслаў скарыстаў палітычную і ваенную магутнасць Полацку для прызнання сваёй вярхоўнай улады над іх насельніцтвам і абкладання яго данінай. Як паказаў далейшы ўдзел балцкіх і фінаугорскіх кантынгентаў у войнах на баку полацкіх князёў, яшчэ адным абавязкам гэтых народаў перад полацкімі князямі была пастаўка вайсковых кантынгентаў.

Звяртае на сябе ўвагу адсутнасць у спісе яцвягаў і нальшанцаў. Гэта можа тлумачыцца тым, што падпарадкаваныя да таго часу Полацкам нальшанцы маглі ў разуменні суседзяў ужо атаясамлівацца з літоўцамі. Яцвягі ж яшчэ мужна стрымлівалі націск мацнейшых суседзяў у сілу сваёй ваяўнічасці.[134]

У выніку доўгага кіравання Усяслава, якое ўразіла сваімі бурлівымі падзеямі сучаснікаў і засталося ў памяці наш-

---

[130] Лаврентьевская летопись. Ст. 11.

[131] Баранаўскас Т. *Вытокі Літоўскай дзяржавы.* С. 112.

[132] Финно-угры и балты в эпоху средневековья. С. 357.

[133] Раппопорт П. А. *Военное зодчество западнорусских земель X–XIV вв.* С. 92.

[134] Баранаўскас Т. *Вытокі Літоўскай дзяржавы.* С. 112.

чадкаў, Полацкае княства ўзнялося на вяршыню сваёй палітычнай магутнасці. Яно паспяхова адбіла пагрозы сваёй самастойнасці з боку кіеўскіх уладароў і прымусіла іх лічыцца з сабой. Ліквідаваўшы пагрозы з аднаго боку, Полаччына перанесла асноўны кірунак сваёй знешняй палітыкі ў Панямонне і Падзвінне, дамогшыся значнага пашырэння сваёй непасрэднай тэрыторыі і прывядзення ў данную залежнасць ад сябе яшчэ большых абшараў. Магутнасць гэтая не магла быць вечнай ці нават доўгай. Як і ўсе раннесярэднявечныя дзяржавы, Полацкае княства зведала хуткае паслабленне і распад. Прычынамі былі палітычная і эканамічная адасобленасць розных частак дзяржавы, а таксама рост і разгалінаванне княскай дынастыі, розныя прадстаўнікі якой былі гатовыя скарыстаць гэтую адасобленасць у сваіх карыслівых мэтах. Ужо пры сынах Усяслава Полаччына стала ахвярай тых самых працэсаў драблення, якія пачыналіся ў Кіеўскай дзяржаве і якімі так удала карыстаўся Усяслаў для ўнясення расколу ў шэрагі сваіх сапернікаў.

У самой Кіеўскай дзяржаве ў другой палове XI ст. працэсы распаду яшчэ не набылі крайняй ступені. Мясцовыя князі яшчэ пачціва ўспрымалі намінальнае першынство кіеўскага князя ці нават яго фактычную ўладу, калі тая была добра падмацавана вайсковай сілай. Таму і Смаленск, і Тураў яшчэ не маглі адстойваць перад Кіевам сваю самастойнасць, дый не надта імкнуліся. У абодвух гарадах яшчэ не паспелі сцвердзіцца самастойныя княскія дынастыі. Іх палітыка кіравалася дасланымі з Кіева намеснікамі, якія мяняліся досыць часта і не маглі ў належнай ступені пранікнуцца мясцовымі інтарэсамі. Удзел Смаленска і Турава ў войнах і палітычных саюзах ішоў у рэчышчы барацьбы паміж рознымі княскімі групоўкамі за агульнае дамінаванне ў Кіеўскай дзяржаве.

У 1076 г. пасля смерці Святаслава Яраславіча Смаленск заняў Уладзімір Манамах. У 1077 г. ён хадзіў да Ноўгарада ў дапамогу Глебу, а затым двойчы на Полацк. У 1078 г. ён, як мы памятаем, прывёў на дапамогу Усеваладу і Ізяславу Яраславічам супраць Алега Святаславіча і Барыса Вячаславіча смаленскі вайсковы кантынгент. Кантынгент гэты ўзяў удзел у бітве на Няжацінай ніве і падзяліў славу той перамогі. Пасля смерці Усевалада Яраславіча ў 1093 г. у Смаленску,

праўдападобна, сцвердзіўся Давыд Святаславіч, які ў 1095 г. вытрымаў там аблогу Уладзіміра Манамаха і Святаполка Ізяславіча.[135] У 1095 г. у Смаленск да Давыда прыйшоў ягоны ваяўнічы брат Алег, які ў гэты час адчайна змагаўся з Манамахам за бацькоўскі чарнігаўскі стол. Смаляне не прынялі яго з павагі да свайго былога князя Манамаха альбо з простага страху перад ягонай помстай. Але ў тым самым годзе Алег усё ж такі «пришедъ Смолинску и поимъ вои». З гэтымі воямі ён рушыў на Манамахава сына Ізяслава, які ў той час трымаў Растоў і захапіў у Святаславічаў Мурам, і перамог яго. Ізяслаў загінуў у жорсткай бітве. Алегу ўдалося адваяваць Мурамскую і захапіць Растоўскую зямлю, але супраць яго выступіў іншы сын Манамаха-наўгародскі князь Мсціслаў. У 1096 г. Алег прайграў яму бітву на рацэ Калокшы ў ваколіцах Суздаля і вымушаны быў пакінуць Растоўшчыну.[136] Нарэшце, па-сля Любецкага з'езду 1097 г. Смаленск ізноў дастаўся Манамаху і на доўгі час застаўся пад уладай ягонага роду.[137]

Лёс Турава адрозніваўся тым, што ў ім звычайна княжвалі прадстаўнікі старэйшай галіны Яраславічаў, што падкрэслівала яго прывілеяванае становішча. Так, перад укняжаннем у Кіеве Ізяслаў Яраславіч сядзеў менавіта на тураўскім стале.[138] Такая тэндэнцыя працягнулася і пры сынах Ізяслава. Пасля ягонай гібелі Усевалад Яраславіч пасадзіў Яраполка Ізяславіча ва Уладзіміры-Валынскім, «придавъ ему Туровъ».[139] У далейшым, такое адвольнае звязванне Уладзіміра і Турава ў адну палітычную адзінку прымусіла тураўцаў брацць удзел у крывавай барацьбе за Валынь. Пасля забойства Яраполка ў 1088 г. тураўскім князем стаў ягоны брат Святаполк. Пасля смерці ў 1093 г. Усевалада Яраславіча Святаполк па старшынству становіцца кіеўскім князем. Як відаць з паведамлення летапісу, у Кіеў ён узяў з сабой сваю тураўскую дружыну, з якой адразу ж і вымушаны быў раіцца з нагоды нападу полаўцаў. Тая перавага, якую Святаполк аддаў тураўцам перад мясцовай кіеўскай дружынай

---

135 Алексеев Л. В. *Смоленская земля в IX–XIII вв.* С. 196.
136 Лаврентьевская летопись. Ст. 231, 236–240.
137 Алексеев Л. В. *Смоленская земля в IX–XIII вв.* С. 196.
138 Ипатьевская летопись. Ст. 150.
139 Лаврентьевская летопись. Ст. 204.

Усевалада, вельмі засмуціла апошнюю. Яшчэ больш Усеваладавых дружыннікаў засмуціла неразважлівае з іх пункту гледжання рашэнне адкінуць мірныя прапановы полаўцаў і рушыць супраць іх збройна. Скепсіс кіеўскай дружыны апраўдаўся, калі аб'яднанае войска Святаполка, Манамаха і Расціслава Усеваладавіча было ўшчэнт разбітае полаўцамі пад Трэполем.[140]

На любецкім з'ездзе Святаполк атрымаў пацверджанне на сваё валоданне Тураўскай зямлёй з галоўным горадам, а таксама Пінскам і Берасцем.[141] У далейшым Святаполк карыстаўся дапамогай ваяроў Тураўскай зямлі і ў барацьбе за Валынь, на якую заяўляў свае правы і адкуль хацеў выгнаць Давыда Ігаравіча і братоў Васільку і Валадара Расціславічаў. У 1099 г. з дапамогай пінян і берасцейцаў ён выгнаў Давыда з Уладзіміра. У тым самым годзе Святаполкаў сын Мсціслаў з залогай, што складалася з берасцейцаў, пінян і выгашаўцаў, абараняў Уладзімір ад ярасных штурмаў Давыда. Пасля смерці Мсціслава ад варожай стралы гараджане даслалі Святаполку вестуна з паведамленнем аб сваім адчайным становішчы. Дасланы Святаполкам ваявода Пуцята нанёс Давыдаву войску нечаканы ўдар ў тыл, а гарадская залога зрабіла вылазку. Давыду давялося ўцякаць.[142] Нарэшце, у 1101 г. Берасцем спрабаваў авалодаць Яраслаў Яраполчыч, але быў схоплены Яраславам Святаполчычам і дастаўлены да Святаполка ў Кіеў.[143] Тураўшчына заставалася пад уладай кіеўскіх князёў.

На гэтым мы прыпынім разгляд ваенных і палітычных падзей і часова пакінем ваяўнічых князёў. Авеянае славай Усяслава, Полацкае княства ў зеніце магутнасці дасталося ягоным сынам, якія мусілі працягваць справу свайго бацькі. Тураў і Смаленск змагаліся пад сцягамі дасланых Кіевам князёў і ў той жа час пакрысе выношвалі перадумовы для самастойнага дзяржаўнага быцця. Усе яны былі гатовыя да ўступлення ў XII стагоддзе, званае даследчыкамі «рыцарсцвенным»[144] з-за шматлікіх войнаў, выкліканых найскладанейшым перапляценнем дынастычных інтарэсаў князёў і палітычна-эканамічных інтарэсаў кіраваных імі земляў.

---

[140] Лаврентьевская летопись. Ст. 217–222.

[141] Тамсама. Ст. 258.

[142] Тамсама. Ст. 269–273.

[143] Тамсама. Ст. 274–275.

[144] Кирпичников А. Н. *Древнерусское оружие*. Вып. 3. С. 64.

*Раздзел 2.*
# Уплыў вайны на развіццё грамадства

## А) Ваенны фактар у палітычным развіцці грамадства

Прыпыніўшы наш агляд падзей, звернемся да вывучэння ролі вайны ў жыцці тагачаснага грамадства, пачаўшы з палітычнага вымярэння. Нас ізноў будзе цікавіць актыўная функцыя вайны як прычыны падзей, а менавіта каталізатара развіцця ўлады, а таксама яе пасіўная функцыя як іх наступства, ці інструмента палітыкі ўлады. У папярэднім раздзеле мы падрабязна разбіралі зараджэнне з'явы ўлады ў вайскова-дружынным слоі грамадства. Гэта было абумоўлена тым, што магутнасць як асноўная якасць улады мусіла абапірацца на збройную моц князёў і іх дружыны. Увасобленая ў князях і дружыне ўлада займалася абаронай грамадства ад знешніх ворагаў і падтрыманнем унутранага парадку. Яна перабудавала грамадства на тэрытарыяльнай аснове і паставіла побач са звычаёвым правам закон, які ахоўвала з дапамогай прымусу і зброі. Улада, тэрытарыяльная арганізацыя і закон склалі тройку першых неабходных элементаў дзяржавы. Калі пры разглядзе ролі вайны ў жыцці грамадства мы пераходзім ад нарманскага перыяду да наступнага перыяду магутнасці, можа падацца, што функцыі ўлады не змяніліся карэнным чынам. Сапраўды, абарона і ахова закону складалі самую яе сутнасць і таму не маглі знікнуць ці ператварыцца ў нешта прынцыпова іншае. Як адзначае І. Я. Фраянаў, «на князёў ускладалася кіраўніцтва як абарончымі ваеннымі аперацыямі, так і наступальнымі». «Ім прадпісвалася таксама ахова гандлё-вых шляхоў».[145] Між тым прачытанне крыніц стварае трывалае ўражанне пэўна-

---

[145] Фроянов И. Я. *Киевская Русь: Очерки социально-политической истории.* С. 514.

га адрознення дзейнасці дзяржаўнай улады ў канцы X–XI стст. у параўнанні з ранейшымі часамі. Той самы І. Я. Фраянаў піша, што «да канца X ст. функцыі кіеўскага князя заўважна памножыліся і ўскладніліся, а ўлада – узмацнілася».[146] Пры захаванні сутнасці ўлады адбыўся якасны яе скачок і ўскладненне, якое адпавядала ўскладненню будовы грамадства. Адбылося і звязанае з гэтым ускладненне з'явы вайны. Паспрабуем высветліць, у чым яно заключалася.

Гартаючы старонкі летапісаў, якія распавядаюць нам аб гэтым часе, мы пачынаем заўважаць той факт, што свет летапісных падзей дзіўным чынам набліжаецца да нас і нават звужаецца, становіцца больш блізкім і зразумелым. Амаль знікаюць экзатычныя назвы кшталту Свольда, Бердаа, Ітыля, Канстанцінопаля. Ідучы па слядах ваяроў з беларускіх земляў, мы больш не трапляем у Нарвегію, Табарыстан ці Віфінію. Замест гэтага крайняй паўночнай кропкай нашага ўяўнага падарожжа становяцца ваколіцы Ноўгарада і Пскова, выпаленыя падчас ярасных рэйдаў Брачыслава і Усяслава. На поўдні мы не заходзім за Тмутаракань. Мы заўважаем, што князі і іх ваяры аказваюцца нашмат больш прывязанымі да зямлі.

Такая мацнейшая тэрытарыяльная прывязка ўлады і яе ваенных акцый мела некалькі прычын. Перш за ўсё, змянялася міжнароднае становішча. З ростам насельніцтва і развіццём эканомікі свет станавіўся меншым і шчыльнейшым. Хаатычная сума рыхлых раннедзяржаўных утварэнняў усё больш ператваралася ў хітра збалансаваную сістэму дзяржаў, узаемазвязаных складанай сеткай палітычных, эканамічных, культурных і дынастычных сувязяў. Раней правадыр рабаўніцкага рэйду мог бясследна знікнуць разам з нарабаваным майном у непраходных лясах і балотах, унікнуўшы справядлівага пакарання за сваё ліхадзейства. Цяпер такі рэйд непазбежна наносіў удар па ўсёй сістэме міжнародных адносін, запускаючы ў дзеянне механізм саюзаў і ўзаемных абавязкаў, якія сціскаліся вакол завадатара непарадку.

Па-другое, далёкія заморскія паходы не ўмацоўвалі ўнутранае становішча князёў. Мінуў час, калі галоўнай умовай трывалай княскай улады была моцная ваяўнічая дружына,

---

[146] Фроянов И. Я. *Киевская Русь: Очерки...* С. 510.

падтрымка якой здабывалася раздачай нарабаванай здабычы і рэпутацыяй добрага палкаводца. Крывавыя войны за ўладу паміж Уладзімірам, Рагвалодам і Яраполкам, Яраславам, Святаполкам і Барысам, Усяславам і братамі Яраславічамі паказалі, што найбольшыя шанцы на перамогу меў той, хто патрапляў акрамя дружыны сабраць вакол сябе паспольства. Менавіта падтрымка паспольства, гарадскога люду і вясковых смердаў, дапамагала князям выстойваць на полі бою і браць верх у палітычнай барацьбе. На такую ж падтрымку мог разлічваць той, хто найлепш адлюстроўваў інтарэсы гэтага паспольства і паказваў мудрасць менавіта ва ўнутраных справах, а не ў заморскіх паходах. Гэтую заканамернасць выдатна прасочвае Д. С. Леанардаў у сваім даследаванні аб Усяславе, многія высновы якога можна аднесці не толькі да полацкага князя, але і да іншых князёў Русі XI ст. «Калі б полацкія князі і ў прыватнасці Усяслаў толькі следавалі палітыцы грубага эгаізму, калі б яны выключна кіраваліся думкай павялічыць свае ўдзелы шляхам захопу чужых земляў, калі б у ахвяру гэтай мэце яны бессаромна прыносілі грамадскае дабро, земскі мір і самыя сваяцкія сувязі... то, вядома, народныя масы Полацкага княства, нягледзячы на густую цямрэчу сярэднявечча, паспелі б хутка ўцяміць – здолелі б, з уласцівай праніклівасцю вострага інстынкту, вельмі хутка разгадаць падобную нізасць настрою кіраўнічых колаў і незваротна затым адмовіцца ад няўдзячнай ролі сляпога інструмента ў іх руках... Між тым, замест падобнай нязгоды паміж вярхамі і нізамі полацкага грамадства, замест раз'яднанасці паміж князямі і кіраванымі імі класамі, гісторыя Полацкай зямлі XI–XII стст. малюе нам іншую карціну. Менавіта рэдкім супадзеннем паміж асабістымі сімпатыямі і ўрадавымі ідэаламі князёў полацкіх і ў прыватнасці Усяслава, з аднаго боку, і племяннымі памкненнямі і эканамічнымі патрэбамі полацкіх крывічоў, з іншага – тлумачацца дзейсная падтрымка і самаахвярная аданасць роду Рагнедзічаў, якія так настойліва, так пастаянна выяўляюцца палачанамі ва ўвесь час іх геройскай барацьбы з Кіевам».[147]

[147] Леонардов Д. С. *Полоцкий князь Всеслав и его время* // Полоцко-Витебская старина. Вып. III. С. 133.

Гэтыя фактары прадвызначылі эвалюцыю ўлады. Князі IX–X стст. атрымалі ўладу над грамадствам, фактычна вынайшаўшы яе. Пакаштаваўшы яе першымі, п'яныя ад гэтага смаку, паху крыві, нарабаваных скарбаў і песеннай славы, яны маглі дазволіць сабе гэтае грамадства ігнараваць, абапіраючыся на адданую дружыну. Але ўжо Ігару гэтае самавольства каштавала жыцця. Ягоны сын Святаслаў яшчэ мог заходзіць за той рубеж, дзе канчаліся інтарэсы грамадства. Ён мог адвольна паспрабаваць перанесці сваю сталіцу ў Пераяславец на Дунаі, назваўшы яго «сярэдзінай сваёй зямлі». Ён мог яшчэ спакойна выслухоўваць скаргі кіяўлян на тое, што ён шукае чужых земляў, пра сваю забыўшыся. Але сумны канец яго паказаў, што часы князёў-зухаў прайшлі. Ягоны сын Уладзімір мусіў ізноў вынайсці функцыю ўлады на якасна новым узроўні, вярнуўшы яе ў спрадвечна прызначаную ёй нішу забеспячэння інтарэсаў грамадства.

Ягоныя нашчадкі на полацкім, кіеўскім і іншых сталах працягнулі ягоную справу. Вядома, яны не адмовіліся ад актыўнай знешняй палітыкі, якая часта ажыццяўлялася ваеннымі сродкамі. Але войны цяпер былі ў большай ступені сродкам дасягнення дакладных палітычных мэтаў, чым справай ўзбагачэння і праслаўлення асобнага князя і яго дружыны. Захопніцкія войны вяліся тады, калі гэта служыла мэце павышэння палітычнай магутнасці дзяржавы і здабыцця новых земляў, патрэбных грамадству для эканамічнага развіцця і каланізацыі новых земляў. Яны ўяўлялі сабой не аднаразовыя рабаўніцкія набегі, а доўгія мэтанакіраваныя кампаніі, якія вялі да сталага засваення захопленых тэрыторый з дапамогай будаўніцтва ўмацаваных пунктаў, як то паказвае полацкая і кіеўская экспансія ў Панямонні. На кірунках, прыступных для нападу знешніх ворагаў, князі арганізоўвалі сістэмы стратэгічнай абароны, якія складаліся з ліній крэпасцяў, населеных жыхарамі з усіх канцоў дзяржавы, як то адбылося з паўднёвымі гарадкамі каля Кіева і Заслаўем.

Улада атрымлівала шчыльнейшую тэрытарыяльную прывязку. Дзяржава ў большай ступені атаясамлівалася з краем. Самыя краі, якія ўваходзілі ў склад Полацкага княства і Кіеўскай дзяржавы, карэнным чынам мяняліся. З аморфнай сукупнасці ізаляваных адна ад адной патрыярхальных

воласцяў яны ператвараліся ў цэласныя структураваныя сістэмы. Вялікую ролю ў гэтым адыгрывала ўжо згаданае намі развіццё шляхоў зносін. Як і раней, у такой якасці выкарыстоўваліся водныя артэрыі. Прычым выкарыстоўваліся яны і як ваенныя, і як цывільныя шляхі. Ваенныя экспедыцыі па вадзе пракладалі дарогі гандлярам і падтрымлівалі іх бяспеку. Шляхі, адкрытыя ўвішнымі купцамі, выкарыстоўваліся для перамяшчэння войскаў. У сваім першым паходзе ў Польшчу Яраслаў адправіў частку войска ў Мазовію на лоддзях па водным Прыпяцка-Бужскім шляху.[148] М. Доўнар-Запольскі заўважае, што гэтым жа шляхам ажыццяўляліся паходы на яцвягаў.[149] У той жа час ён вядомы і як значны цывільны шлях.[150] Але калі шырокае выкарыстанне водных шляхоў зносін не было чымсці незвычайным, у XI ст. мы заўважаем і новыя тэндэнцыі. Пачалося пракладанне і асваенне сухапутных шляхоў, прычым першасным штуршком да гэтага паслужыла менавіта ваенная неабходнасць. Калі ў 1014 г. Яраслаў узняў у Ноўгарадзе мяцеж супраць свайго бацькі Уладзіміра, той пабачыў цяжкасці перамяшчэння вялікіх мас войскаў выключна воднымі шляхамі. Таму ён аддаў загад: «требите путь и мостите мостъ».[151] Такім чынам, пракладзеныя дарогі служылі далей цывільным мэтам і агульным тэндэнцыям грамадскага і дзяржаўнага развіцця.

Акрамя шляхоў зносін важнейшым элементам інфраструктуры дзяржавы і краю былі гарады. Калі шляхі зносін служылі толькі сродкам сувязі паміж асобнымі мясцовасцямі, гарады былі асяродкамі ўсяго іх грамадскага жыцця, выконвалі ролю палітычных, эканамічных і культурных цэнтраў. Вялізную ролю ў іх узнікненні адыграў ваенны фактар. Калі мы прааналізуем спіс гарадоў, узніклых на беларускіх землях у канцы X–XI стст., то ўбачым, што большасць з іх былі заснаваныя менавіта як ваенныя ўмацаваныя пункты. Гісторыя і археалогія Менска, Заслаўя, Лагойска, Браслава, Лоска, Ваўкавыска, Наваградка, Горадні і Турыйска выразна аб гэтым кажа.

---

148 Лаврентьевская летопись. Ст. 153.

149 Довнар-Запольский М. *Очерк истории Кривичской и Дреговичской земель до конца XII столетия.* С. 23.

150 Археалогія Беларусі. Т. 3. С. 169.

151 Лаврентьевская летопись. Ст. 130.

Нарэшце, дзяржава, якая мела тры важнейшых элементы: уладу, закон і тэрыторыю з пэўнай інфраструктурай, — мела патрэбу ў сіле, якая мусіла б гэтай тэрыторыяй пастаянна і эфектыўна кіраваць. Адчувалася патрэба ў дзяржаўным апараце. Першапачатковае выкананне гэтай функцыі ізноў лягло на вайсковы стан князя і яго дружыну. Адбылося гэта таму, што вайскова-дружынны слой быў, па-першае, адзінай арганізаванай сілай у структуры грамадства, які мог гэтую функцыю выканаць. Па-другое, паколькі кіраванне ўвогуле і падтрыманне ўнутранага парадку ў прыватнасці часта ўключала ажыццяўленне прымусу, збройная сіла князя і дружыны аказвалася вельмі дарэчы. Ужо Уладзімір адразу ж пасля ўзяцця Кіева вылучыў са сваёй варажскай дружыны «мужи смыслены и добры» і адаслаў іх кіраваць сваімі гарадамі.[152] Такім чынам быў пакладзены пачатак існавання дзяржаўнага апарату, які адразу ж пачаў выконваць свае функцыі. Так, «Повесть временных лет» згадвае пра бязлітасную барацьбу Уладзіміра з рабаўнікамі і іх пакаранне смерцю.[153] Далей ён жа ўдасканаліў гэтую сістэму, прызначыўшы намеснікамі ў гарады Русі сваіх сыноў, якія кіравалі валасцямі з дапамогай дружын і спалучалі ў сваёй асобе вышэйшую адміністрацыйную і ваенную ўладу. Такое спалучэнне яшчэ раз ілюструе вайсковыя карані дзяржаўных урадоўцаў. Развіццё сістэмы дзяржаўнага кіравання і інтэнсіўнае горадабудаўніцтва ў XI ст. у Полацкім княстве і Кіеўскай дзяржаве прадоўжыла традыцыю прыцягнення вайскова-дружыннага слою да адміністрацыйных спраў. Бадай, найбольш трапна гэты працэс характарызуе «Слова пра паход Ігараў», якое апісвае дзейнасць Усяслава Брачыславіча ў такіх радках: «Всеслав князь людем судяше, князем грады рядяше».[154]

Далучэнне дзяржаўнага апарату да ўлады, тэрытарыяльнай арганізацыі і закону завяршыла фармаванне чацвярыцы асноўных элементаў, на якіх грунтавалася дзяржава. Як мы бачым, ваенны фактар быў настолькі ж важным чыннікам узнікнення і развіцця апошняга з іх, як і трох першых.

---

152 Лаврентьевская летопись. Ст. 79.

153 Тамсама. Ст. 126–127.

154 Слово о пълку Игореве, Игоря, сына Святъславля, внука Ольгова // Анталогія даўняй беларускай літаратуры: XI – першая палова XVIII стагоддзя. (Далей: Анталогія...). Мн., 2003. С. 173.

### Б) Ваенны фактар у эканамічным развіцці грамадства

Апісаныя тэндэнцыі да стабілізацыі грамадства і яго складных элементаў уплывалі і на эканамічнае развіццё і ролю ў ім ваенных фактараў. Як і раней, дзяржавы, якім належалі беларускія землі, вялі войны прыбытку, дзе выразна прасочваўся элемент прыўлашчання матэрыяльных каштоўнасцяў. Аднак форма гэтага прыўлашчання заўважна змянілася. Як і раней, напады на варожыя тэрыторыі суправаджаліся вывадам палону і непрыхаваным рабаўніцтвам. Дастаткова прыгадаць славутыя паходы Брачыслава і Усяслава на Ноўгарад і зваротныя ваенныя акцыі кіеўскіх князёў на Полаччыне. Але гэта не былі проста рабаўніцкія рэйды. Мэта гэтых паходаў палягала, хутчэй, у сталым захопе тэрыторый, якія затым асвойваліся з дапамогай каланізацыі і заснавання гарадоў. Захоп ажыццяўляўся наўпрост альбо з дапамогай спустошэння нейкай іншай тэрыторыі і наступнага патрабавання тэрытарыяльных саступак у абмен на мір і вяртанне захопленага. Менавіта такім чынам Брачыслаў дамогся ад Яраслава саступкі Віцебска і Усвята.

Эканамічная выгода ад занятых тэрыторый мела некалькі аспектаў. Павелічэнне тэрыторыі і колькасці падданых спрыяла росту палітычнай магутнасці і эканамічнага дабрабыту дзяржавы і князя. Нават калі тэрыторыя была слаба заселенай і не вылучалася асаблівым эканамічным развіццём, яна магла мець патэнцыял дзякуючы сваім прыродным рэсурсам. Напрыклад, урадлівыя глебы маланаселенага Панямоння і былі адным з фактараў, якія заахвочвалі славянскую каланізацыю гэтай зямлі[155] і яе заваяванне полацкімі і кіеўскімі князямі. Важнай прычынай войнаў прыбытку было і геаграфічнае становішча спрэчных земляў. Тыя з іх, што знаходзіліся на ажыўленых, або перспектыўных гандлёвых шляхах, высока цаніліся і былі жаданым прызам. Мы ўжо адзначалі, што барацьба кіеўскіх князёў з яцвягамі ішла поруч з пракладаннем шляхоў у Польшчу па Прыпяці і Бугу.

---

[155] Піваварчык С. *Беларускае Панямонне ў раннім сярэднявеччы (X–XIII ст.ст.)* // Białoruskie Zeszyty Historyczne. Nr. 2 (6). Białystok, 1996. Сайт «Камунікат»; http://kamunikat.net.iig.pl/–Па адрасе: http://kamunikat.net.iig.pl/www/czasopisy/bzh/06/06art_pivavarczyk.htm – 09.26.2003.

Атрыманыя Брачыславам Віцебск і Усвят знаходзіліся на скрыжаванні важнейшых шляхоў паміж Дзвіной, Дняпром і Ловаццю. Нават сама рака Судома, сведка бітвы паміж полацкім князем і Яраславам, была адным з найважнейшых шляхоў паміж Полаччынай і наўгародскімі землямі.[156]

У параўнанні з ранейшым часам войны прыбытку ці тыя што мелі ў сабе гэтае адценне, усё менш былі авантурнымі княскімі акцыямі і ўсё больш адлюстроўвалі агульныя эканамічныя тэндэнцыі развіцця грамадства і інтарэсы яго пэўных слаёў.

### В) Уплыў вайны на развіццё духоўнай культуры

Змяненне ролі вайны ў сістэме палітычных і эканамічных адносін таго часу суправаджалася і зменай яе месца ў тагачасным светапоглядзе, карэннае адрозненне якога ад ранейшых часоў палягала ў тым факце, што цяпер яго галоўным стрыжнем стала хрысціянства. Распаўсюджанне хрысціянскіх ідэй прывяло да перамены поглядаў на прыроду вайны, яе мэты, этычную апраўданасць і месца вайскоўцаў у сусветнай іерархіі і структуры грамадства.

Паганскі светапогляд успрымаў вайну не проста як неад'емны элемент будовы свету, але і як натуральны стан рэчаў. Ужо вядомыя нам «Гутаркі Высокага», якія належаць да скандынаўскага эпасу, наўпрост кажуць:

Муж не павінен
Хоць на імгненне
Адыходзіць ад зброі
Бо не ўведаць
Калі па дарозе
Дзіда прыдасца.[157]

Вайна разглядаецца як крыніца задавальнення, славы і гонару людзей і багоў. Калі бог Хеймдаль пад іменем Рыга падарожнічаў па зямлі, ён:

---

156 Довнар-Запольский М. *Очерк истории Кривичской и Дреговичской земель до конца XII столетия*. С. 19.

157 Старшая Эдда. Речи Высокого. 38. С. 26.

стаў кідаць кап'ё,
трэсці шчытом,
скакаць на кані,
уздымаючы меч;
распальваў ён бітвы,
крывавіў палі,
ворагаў нішчыў,
заваёўваў ён землі.[158]

Адпаведна людзі, занятыя ваярскай справай, разглядаюцца як вышэйшы стан грамадства. Той самы Рыг падчас сваіх падарожжаў спарадзіў трох сыноў: Трэля, Карла і Ярла. Першыя два сыны, якія не вылучаліся ні асаблівай прыгажосцю, ні здольнасцямі, сталі родапачынальнікамі рабоў і сялян. Прыгожага, моцнага і вытанчанага Ярла Рыг абвучыў майстэрству вайны, пасля чаго ён і ягоныя нашчадкі занялі найбольш пачэснае месца ў грамадстве.[159]

З утылітарнага пункту гледжання вайна вядзецца, каб узбагаціцца, з маральна-этычнага – каб здабыць славу і прадэманстраваць доблесць. Пытанне аб маральнай апраўданасці вайны вырашаецца ў залежнасці ад таго, наколькі мужна і годна паводзяць сябе ваяры. Замест дыхатаміі «дабро – зло» выкарыстоўваецца дыхатамія «смеласць – баязлівасць». «Гутаркі Высокага» кажуць:

Шчодрыя, смелыя
шчасна жывуць,
не ведаюць клопату;
а баязлівец заўсёды
да ўцёкаў гатовы.[160]

У згодзе з такім успрыманнем вайны вымалёўваецца і паганскі ідэал ваяра. Гэта князь альбо дружыннік, які ўдзельнічае ў вайне дзеля ўласнага ўзбагачэння і ўзвелічэння сваёй мужнасці і доблесці. Яго грамадскае прызначэнне адыходзіць на другі план. Яскравым паказчыкам адасобленасці

158 Старшая Эдда. Песня о Риге. 37. С. 301.
159 Тамсама. 1–45. С. 294–303.
160 Старшая Эдда. Речи Высокого. 48. С. 28.

і індывідуалізму ваяра служыць яго містычная повязь са звярыным светам і здольнасць самому ператварацца ў звера і атрымліваць ягоныя сілы і здольнасці, што з'яўляецца распаўсюджаным матывам германскай міфалогіі.[161] Шматлікія вобразы ваяра-звера існуюць і ў славянскім эпасе і літаратуры. Быліна пра Вольха Усяслаўевіча, правобразам героя якой быў Усяслаў Брачыславіч, так апісвае дзівосныя ператварэнні Вольха:

Втапоры поучился Вольх ко премудростям:
А и первой мудрости учился –
Обвертываться ясным соколом;
Ко другой-то мудрости учился он, Вольх, –
Обвертываться серым волком;
Ко третей-то мудрости учился Вольх –
Обвертоваться гнедым туром – золотые рога́.[162]

Паганскія элементы трапляюць нават у літаратуру хрысціянскіх часоў. «Слова пра паход Ігара» кажа, што Усяслаў «скочи влъком до Немиги с Дудуток». Ён жа «въ ночь влъком рыскаше: из Кыева дорискаше до кур Тмутороканя, великому Хръсови влъком путь прерыскаше».[163] У тым жа «Слове» дружыннікі Усевалада «скачють, акы серыи влъци въ поле, ищучи себе чти, а князю славе».[164] Такі ваяр быў мала звязаны законамі і этасам грамадства і слаба ўсведамляў сваю адказнасць перад ім.

Зрэшты, ён нават не мог несці за гэта належнай адказнасці. Паганскі светапогляд ставіў чалавека перад раз і назаўсёды вызначанай воляй няўмольнага лёсу, не пакідаючы яму выбару. Добрай ілюстрацыяй на гэтую тэму служыць летапісная легенда пра Алега, якому вешчунамі была прадказана смерць ад уласнага каня. Князь загадаў прыбраць каня ад сябе і адно даглядаць яго. Праз пяць гадоў, згадаўшы пра каня, ён даведаўся, што той памёр. Не ўтрымаўся Алег ад жадання паглядзець парэшткі любімага каня і, так і не падмануўшы лёс, прыняў смерць ад укусу змяі, якая хавалася ў

[161] Кардини Ф. *Истоки средневекового рыцарства.* С. 116–123.
[162] Былины. Санкт-Петербург, 1999. С. 250–251.
[163] Слово о пълку Игореве. С. 173.
[164] Тамсама. С. 167.

касцях каня.[165] Адзінае, што чалавеку ў такіх варунках заставалася — сустрэць сваю долю мужна і годна. Але ж адсутнасць выбару пазбаўляла яго і адказнасці за наступствы сваіх дзеянняў, што давала ваярам яшчэ адну падставу ўжываць зброю ў сваіх інтарэсах, мала дбаючы пра бліжніх.

Прыход хрысціянства паступова, але няўхільна змяняў гэты светапогляд. Сама вайна ўжо не разглядалася як натуральны стан рэчаў для грамадства. Першапачаткова царква, грунтуючыся на вучэнні Ісуса, цалкам забараняла хрысціяніну ўжываць гвалт у дачыненні да іншага чалавека. Паколькі гвалт з'яўляецца адным з неад'емных элементаў вайны, гэта выключала для хрысціян магчымасць службы ў войску. Забраны ў войска святы пакутнік Максіміліян сцвярджаў: «Я не магу знаходзіцца на вайсковай службе, бо я — хрысціянін».[166] Змяненне адносін да вайны адбылося толькі ў пачатку IV ст. Прызнанне дапушчальнасці ўжывання гвалту ва ўнутраных справах вынікала з неабходнасці абароны слабых сяброў грамадства, што знайшло сваё адлюстраванне яшчэ ў Старым Запавеце. Заклік Ісаі: «шукайце праўды, ратуйце прыгнечанага, абараняйце сірату, заступайцеся за ўдаву» (Іс. 1. 17), знаходзіць адпаведнік у Псалтыры: «Давайце суд беднаму і сіраце; прыгнечанаму і жабраку аказвайце справядлівасць; ратуйце беднага і жабрака; вырывайце яго з рукі няправеднага» (Пс. 81. 3, 4). Існаванне пагрозы варварскіх нашэсцяў прывяло таксама да прызнання дапушчальнасці гвалту ў справах знешніх. Гэтаму паспрыяў і факт узыходжання на трон Рымскай імперыі Канстанціна Вялікага, які прыхільна ставіўся да хрысціянства. Палітычны падзел паміж варварамі, якія ў большасці былі паганцамі, і рымскімі падданымі, сярод якіх ужо было шмат хрысціян, наблізіўся да рэлігійнага. Вядзенне вайны з мэтай абароны імперыі стала для хрысціян не толькі дапушчальным, але і неабходным. Арльскі сабор 314 г. пастанавіў: «Тых, хто кідае зброю ў мірны час, вырашана не дапускаць да прычасця».[167] З абсалютнага зла вайна стала злом неабходным.

---

[165] Лаврентьевская летопись. Ст. 38–39.

[166] Флори Ж. *Идеология меча. Предыстория рыцарства.* Санкт-Петербург, 1999. С. 35.

[167] Флори Ж. *Идеология меча. Предыстория рыцарства...* С. 37.

З такога стаўлення да вайны лагічна выцякала і вызначэнне мэтаў, якія апраўдвалі яе вядзенне. Тэарэтычныя падставы для гэтага былі сфармуляваныя ў V ст. святым Аўгустынам, які ў сваім творы «Аб горадзе божым» заяўляе, што трэба не заключаць мір дзеля вайны, але весці вайну дзеля міру.[168] Такім чынам, мір быў абвешчаны найгалоўнейшай мэтай вядзення вайны. Ні захоп здабычы, ні дэманстрацыя ўласнай доблесці легітымнымі мэтамі ўжо не лічыліся.

Наступным крокам у сістэматызацыі хрысціянскага погляду на вайну стала выпрацоўка Аўгустынам паняцця справядлівай вайны. Калі вайна вялася ў справядлівых мэтах, удзел у ёй не клаўся плямай на сумленне хрысціяніна. Той, хто забіваў ворага, толькі выконваў закон, бо ўжываў гвалт у адказ на гвалт.[169] Наступнікі Аўгустына ў заходняй царкве ад Грацыяна да Ісідора Севільскага развілі і ўдакладнілі азначэнне справядлівай вайны. Справядлівай вайной можна было назваць тую, што: 1) была гранічна неабходнай з-за вычарпання мірных сродкаў вырашэння канфлікту; 2) вялася са справядлівымі мэтамі абароны ці вяртання адабранай маёмасці; 3) вялася ўладай, а не прыватнымі асобамі.[170] Нарэшце, у VIII–XI стст. у Заходняй Еўропе, як і ў апошнія стагоддзі існавання Рымскай імперыі, важнай перадумовай справядлівасці вайны стала яе вядзенне ў абарону хрысціян супраць паганцаў.[171]

Такі вобраз вайны прад'явіў і новыя патрабаванні да ваяроў і іх правадыроў. Цяпер яны ўжо не мусілі быць зухаватымі шукальнікамі славы і здабычы. Паводле святога Аўгустына, яны мусілі служыць Хрысту і змагацца мячом супраць паганцаў, як святары і манахі змагаліся малітвамі супраць нячыстай сілы. Такі падзел абавязкаў у зародкавай форме прадвызначаў пазнейшую станавую структуру сярэднявечнага грамадства. Пры гэтым стан ваярскі аказваўся ніжэйшым за стан святарскі, бо ваяры змагаліся ўсяго толькі за тленнае цела, ніжэйшае за душу, якая ўжо была прадметам апекі святароў.[172] Да IX–X стст. выпрацоўваецца ўяўленне

---

168 Августин Аврелий. *О граде божием.* (August. De Civ. Dei.). XIX, 12. Минск, 2000. С. 1023.

169 August. De Civ. Dei. I, 21, 26. С. 38, 45.

170 Флори Ж. *Идеология меча.* С. 46.

171 Тамсама. С. 47–48.

172 Тамсама. С. 39.

аб наступных функцыях ваярскага стану, увасобленага ў большай ступені ў каралях і князях і ў меншай ступені ў шараговых ваярах: правасуддзе, абарона хрысціян ад паганцаў і пакаранне злачынцаў.[173]

Сама ваярская доблесць атрымлівала зусім іншыя ў параўнанні з паганствам крыніцы. Знікла повязь ваяра са звярыным светам, у якім ён чэрпаў сваю дэманічную сілу. Наадварот, сіла, якая рухае ваяра на подзвігі, паходзіць выключна ад Бога. У VI ст. Фульгенцый Руспійскі ў лісце графу Рэгінону кажа, што правадыр ваяроў мусіць прыпісваць перамогу не ўласнай зброі, але волі Бога.[174]

Нарэшце, прынцыповы для хрысціянства свабодны выбар паміж Дабром і Злом у адрозненне ад сляпога паганскага фаталізму ўскладаў на ваяра-хрысціяніна адказнасць за ягоныя ўчынкі, найперш адказнасць за парушэнне усталяванага Богам парадку і боскіх законаў, якія распаўсюджваліся і на зямное свецкае жыццё. Ваяр-хрысціянін у адрозненне ад паганца ужо не быў да такой ступені адасоблены ад рэшты грамадства і не стаяў па-над альбо па-за законам. Выкананне зводу хрысціянскіх маральных правіл вяло яго да ўсведамлення сваёй функцыі ў грамадстве і прызнання адказнасці перад гэтым грамадствам. Фульгенцый выкладае для Рэгінона шэраг правілаў, выконваючы якія можна жыць праведна, па-хрысціянску, пры гэтым займаючыся свецкай ваеннай дзейнасцю.[175]

Усталяванне і развіццё сістэмы поглядаў на вайну і ваяроў на аснове хрысціянскага вучэння вянчалася з'яўленнем і распаўсюджаннем культу святых і анёлаў, месца якіх у нябеснай іерархіі мела прамое ці ўскоснае дачыненне да ваеннай справы: святога Георгія, архангела Міхаіла і іншых.[176]

Гэты шлях, пройдзены старым хрысціянскім светам за доўгія стагоддзі, грамадства беларускіх і сумежных ім земляў пераадолела за адносна кароткі час пасля пранікнення сюды хрысціянства. Працэс гэты паскараўся тым фактарам, што вайскова-дружынны слой быў першым адэптам і праваднікам хрысціянскіх ідэй на Русі. «Повесть временных лет» ужо пры апісанні заключэння дамовы Ігара з візантый-

---

[173] Флори Ж. *Идеология меча.* С. 274–275.
[174] Тамсама. С. 69.
[175] Тамсама. С. 68.

цамі ў 945 г. паказвае, што частка дружыннай русі была хрышчанай і хадзіла да прысягі ў царкве святога Іллі ў Кіеве.[177] Пад 983 г. летапіс таксама кажа аб хрышчаным варагу, які прыйшоў да Кіева з Візантыі.[178] Кіева-Пячэрскі пацерык распавядае аб варагу Шымоне, які ў 1073 г. фундаваў царкву Багародзіцы.[179]

Добрае ўяўленне аб эвалюцыі поглядаў на вайну дае створанае каля другой паловы XI ст. «Сказанне пра Барыса і Глеба», якое ў адрозненне ад засяроджанага на плыні падзей летапісу паказвае нам светапогляд чалавека таго часу. Агаворымся ізноў, што «Сказанне» прырымліваецца афіцыйнай летапіснай версіі гісторыі міжусобнай вайны пасля смерці Уладзіміра, канчатковае заключэнне аб праўдзівасці якой мы не можам зрабіць з-за недахопу пераканаўчых доказаў ці абвяржэнняў. Таму вобразы герояў «Сказання» могуць быць падобнымі да сваіх сапраўдных прататыпаў ці, наадварот, даволі далёкімі ад іх. Тым не менш, гэта ніяк не зацямняе філасофскі і маральна-этычны змест твору.

Змяненне сутнасці вайны ў вачах сучаснікаў праяўляецца ў апісанні падзей пасля забойства Святаполкам Барыса і Глеба. Барацьба ў краіне працягваецца, бо «...Ярослав, не търпя сего зълааго убииства движеся на братоубиица оного, оканньнааго Святоплъка и брани многы съ ним съставив».[180] Такім чынам, з боку Ярослава вайна ўжо не выглядае барацьба за ўладу. Яна выглядае як неабходнае зло, як сродак аднаўлення справядлівасці гвалтоўнымі метадамі, калі метады непраціўлення злу, увасобленаму Святаполкам, былі вычарпаныя.

Мэты вядзення вайны на Русі цяпер упісваюцца ў агульнахрысціянскі канон, які прадугледжвае яе дапушчальнасць для абароны слабага ці змагання са знешнім ворагам. У гэтым сэнсе вельмі паказальным з'яўляецца дыялог паміж тураўскім і кіеўскім князем Святаполкам Ізяславічам і сма-

---

[176] Кардини Ф. *Истоки средневекового рыцарства.* С. 60.

[177] Лаврентьевская летопись. Ст. 54.

[178] Тамсама. Ст. 82.

[179] Киево-Печерский патерик // Древнерусские патерики. Москва, 1999. С. 7–11.

[180] Съказание и страсть и похвала святюю мученику Бориса и Глеба // Анталогія... С. 80.

ленскім і пераяслаўскім князем Уладзімірам Манамахам і іх дружыннікамі пад Далобскам пры абмеркаванні планаў паходу на полаўцаў у 1103 г. Святаполкава дружына выказала меркаванне, што «негодно ныне весне ити хочем на смерды и погубити е и ролью ихъ», маючы на ўвазе тое, што калі вясной забраць у смердаў коней для паходу, то тым не будзе чым узараць раллю. У адказ Манамах зазначае: «дивно имя, дружино, оже лошади жалуете, ею же то ореть, а сего чему не промыслите, оже то начнеть орати смердъ, и приехавъ, Половчинъ оударить и стрелою, а лошадь его поиметь, а в село его ехавъ, иметь жену его, и дети его, и все его именье». «То лошади жаль, а самого не жал ли?».[181] Тут абодва князі і іх дружыны выказваюць рознагалоссі толькі ў сродках дасягнення прызначаных мэтаў. Мэты ж для ўсіх удзельнікаў вайсковай рады ўяўляюцца аднолькава зразумелымі. Гэтыя мэты, якія ў дадзенай сітуацыі атаясаміліся – абарона слабых (смердаў) і змаганне са знешнім ворагам.

Справядлівай цяпер лічылася толькі вайна, якая вялася ў праведных мэтах. Ашаламляльным кантрастам выглядае адрозненне паміж ваеннымі акцыямі Яраслава ў 1014–15 і 1015–16 гг. Вайна, якую ён рыхтаваў супраць свайго бацькі Уладзіміра толькі «дала бы радасці д'яблу» паводле выразу летапісца. Наадварот, вайна, якую ён, магчыма, вёў супраць Святаполка ў 1015–16 гг., адбывалася «пособиемь Божиемь». Розніца была заўважнай і ў выніках. Першая акцыя скончылася вынішчэннем найманых Яраслававых варагаў наўгародцамі і наступнай бойняй наўгародцаў, учыненай Яраславам. Другая – яго перамогай і ўкняжаннем на кіеўскім стале. Кніжнікі, якія апісвалі гэтыя падзеі ў летапісах і «Сказанні», відавочна, хацелі даць чытачу зразумець абавязковую сувязь паміж справядлівасцю вайны і яе поспехам, які забяспечваўся з Божай дапамогай.

Літаратура таго часу, якая адлюстроўвае характэрныя думкі і настроі грамадства, побач з асэнсаваннем з'явы вайны адводзіць месца і асэнсаванню ролі ваяроў як людзей, на чыіх плячах ляжала яе вядзенне. Паколькі грамадства беларускіх земляў і іншых земляў Русі яшчэ не наблізілася да той ступені жорсткага падзелу грамадства на станы, якая

---

[181] Лаврентьевская летопись. Ст. 277.

ўжо назіралася ў Заходняй Еўропе, грамадская думка яшчэ не вельмі выразна выдзяляе ваяроў як асобны стан. Тым не менш, яна ўжо даволі пільна разглядае пытанне іх місіі ў зямным свеце.

«Сказанне пра Барыса і Глеба» надае ўвагу і пытанню функцыі ваяра ў грамадстве, якая найперш увасаблялася ў князях як правадырах мас ваяроў. З пункту гледжання сучасніка прызваннем Яраслава было ажыццяўленне правасуддзя ці аднаўленне асвечанага Богам сусветнага парадку, парушанага Святаполкам. Перад рашучай бітвай Яраслаў уздымае рукі ў неба і моліць Бога: «Се кръвь брата моего вълиеть къ Тебе, Владыко, якоже и Авелева преже. И Ты мьсти его, якоже и на оном положи стонание и трясение на братоубиици Каине. Еи молю тя, Господи, да въсприимуть противу тому».[182] Перамога Яраслава і паражэнне Святаполка аднаўляе спрадвечны парадак і служыць доказам Божай велічы і справядлівасці.

Наступнай функцыяй ваяроў таго часу, даўно абгрунтаванай хрысціянскай царквой і цяпер успрынятай на Русі, стала абарона краіны ад знешняга ворага, вытлумачаная ў хрысціянскім кантэксце. Барацьба са знешнімі ворагамі была праблемай, спрадвеку надзённай для хрысціянскіх і нехрысціянскіх дзяржаў і дадзяржаўных грамадстваў. Цяпер, аднак, супрацьстаянне знешнім ворагам перастала ўспрымацца выключна ў выглядзе супрацьпастаўлення «свой – чужы» і ўзмацнілася рэлігійным вымярэннем у выглядзе супрацьпастаўлення «хрысціянін-паганец». Абарона радзімы перастала быць справай толькі грамадскай і палітычнай і стала расцэньвацца як рэлігійны абавязак таксама. Гэтаму спрыяла і тая акалічнасць, што цэлую Русь і беларускія землі атачалі некаторыя народы, што прытрымліваліся паганскіх вераванняў: літва, яцвягі, печанегі, полаўцы і іншыя. І. Н. Данілеўскі, аднак, трапна адзначае, што першапачаткова крыніцы не выяўляюць рэзкага супрацьпастаўлення паміж «сваёй» Руссю і «чужымі» печанегамі ці полаўцамі.[183] Аўтары тагачасных тэкстаў не праводзяць такой выразнай грані-

---

182 Съказание и страсть и похвала святюю мученику Бориса и Глеба. С. 80.

183 Данилевский И. Н. *Древняя Русь глазами современников и потомков.* С. 281–282.

цы ні пры апісанні паганскіх часоў, ні пры апісанні першых дзесяцігоддзяў хрысціянства. Сапраўды, калі прааналізаваць тое самае «Сказанне пра Барыса і Глеба», то мы ўбачым, што пры ўсёй сваёй эмацыйнасці і зараджанасці хрысціянскім пафасам яно не называе печанегаў «паганымі» ці іншым знакавым тэрмінам. Паводле Данілеўскага, яскравае адрозненне паміж «сваімі» і «чужымі», заснаванае на рэлігійным адрозненні, з'яўляецца ў крыніцах толькі пры апісанні падзей канца XI ст, калі ў грамадстве запанавалі эсхаталагічныя настроі.[184] Пры апісанні паражэння Русі ад полаўцаў у 1093 г. летапісец кажа, што Бог пакараў сваіх людзей «нахоженьемь поганых» і называе полаўцаў «врагы нашими».[185] Пры апісанні нашэсця палавецкага хана Баняка на Русь у 1096 г. летапісец называе полаўцаў біблійным выразам «бязбожныя Ізмайлавы сыны». Ваенная іх варожасць да Русі дзесяцікротна памнажаецца іх бязбожжам, якое найперш адлюстроўваецца ў спусташэнні Пячэрскага манастыра.[186] Паводле летапісца, «безбожнии сынове Измаилеви пущени бо на казнь хрестьяномъ».[187] Абарона ваярамі краіны ад такога ворага набывала цяпер легітымнасць з пункту гледжання хрысціянства.

Нарэшце, хрысціянства прынесла новы погляд на ўжыванне ваеннай сілы для пакарання злачынцаў. Эвалюцыя гэтага погляду прасочваецца ў летапісным аповедзе аб пакаранні Уладзімірам рабаўнікоў. Калі падчас ягонага кіравання землі Русі захліснула хваля рабаўніцтва, хрысціянскія біскупы запыталі князя, чаму ён не карае рабаўнікоў смерцю, на што Уладзімір адказаў вельмі сімвалічна: «Боюся греха». На гэта біскупы мовілі: «Ты поставленъ еси от Бога на казнь злымъ, а добрымъ на милованьне». «Достоить ти казнити разбоиника, но со испытомъ». Тады Уладзімір «нача казнити разбоиникы».[188] Гэты аповед паказвае, як свядомасць грамадства Русі ў мініяцюры паўтарыла доўгую эвалюцыю свядомасці грамадства хрысціянскіх краін у адносі-

---

[184] Данилевский И. Н. *Древняя Русь глазами современников и потомков.* С. 281–282.
[185] Лаврентьевская летопись. Ст. 222.
[186] Тамсама. Ст. 232–233.
[187] Тамсама. Ст. 233–234.
[188] Тамсама. Ст. 126–127.

нах да прызначэння ваеннай дзейнасці і манапалізаванага дзяржавай права на гвалт ва ўнутраных справах. Ад поўнага адмаўлення гвалту з-за боязі граху Уладзімір перайшоў да абмежаванага яго выкарыстання ва ўнутрыпалітычных мэтах, тэарэтычна абгрунтаванага парадай біскупаў, якія з'яўляліся для князя найвышэйшым аўтарытэтам у пытаннях веры і практычнага выкарыстання хрысціянскага вучэння.

Як бачым, асноўнай функцыяй ваяра з'яўлялася выкарыстанне сілы ў тых ці іншых мэтах. Сіла набывала статус асноўнай характэрнай рысы ваяра. Таму далёка не апошнім пытаннем было паходжанне гэтай сілы. Нягледзячы на згаданыя намі паведамленні пра перажыткі паганскіх уяўленняў аб звярынай прыродзе ваяроў, погляд на Боскае натхненне і дапамогу як крыніцу ваярскай сілы паступова перамагаў. На гэты конт «Сказанне» зазначае аб перамогах Яраслава: «И вьсегда пособиемь Божиемь и поспешениемь святою, победив елико брани състави, оканьныи посрамлен и побежен възвращаашеся».[189] Пад «поспешениемь святою» тут разумеецца дапамога з боку Барыса і Глеба. Стаўшы святымі, яны таксама занялі сваё месца ў нябеснай іерархіі і ўжо маглі служыць праваднікамі Боскай сілы. Далей «Сказанне» дэталізуе: «...ваю пособиемь и защищениемь князи наши противу въстающая дьржавьно побеждають, и ваю помощию хваляться».[190] Такую Боскую дапамогу атрымліваў толькі той, хто змагаўся за справядлівыя мэты. Наадварот, той, хто ўчыняў злачынства альбо пераступаў клятву, такой дапамогі пазбаўляўся. У паходзе Алега Святаславіча са смалянамі на Мурамскую і Растоўскую зямлю супраць Ізяслава Уладзіміравіча ў 1096 г. Ізяслаў «надеяся на множество вои, Олег же надеяся на правду свою, яко правъ бе в семь Олегъ».[191] Наступная бітва пад Мурамам паказальна для сучаснікаў скончылася перамогай Алега і паражэннем і смерцю Ізяслава. Наадварот, на думку летапісца, прычынай паражэння Яраславічаў ад полаўцаў у 1068 г., паўстання ў Кіеве і выгнання Ізяслава было парушэнне братамі хроснага цалавання з Усяславам і яго падступнага заключэння ў вязніцу.[192]

---

189 Съказание и страсть и похвала святюю мученику Бориса и Глеба. С. 80.

190 Тамсама. С. 82.

191 Лаврентьевская летопись. Ст. 237.

192 Тамсама. Ст. 167–173.

У адрозненне ад паганскіх часоў выбар паміж праўдай і няпраўдай цяпер быў справай асабістай. Выдатны прыклад такога маральнага выбару нам ізноў дэманструе «Сказанне». Пасля смерці Уладзіміра дружына прапануе Барысу: «Поиди, сяди Кыеве на толе отьни, се бо вси вои въ руку твоею суть». Аднак Барыс, усведамляючы няправеднасць узброенага выступлення супраць старэйшага брата, які меў законныя правы на бацькоўскі стол, адмаўляецца: «Не буди ми възяти рукы на брата свего и еще же и на стареиша мене, егоже бых имел, акы отьца».[193] Такі выбар вядзе Барыса да гібелі і пакутніцкага вянца, але гэта разглядаецца аўтарам «Сказання» як вышэйшае прызванне і Боская ўзнагарода. Ён падмацоўвае гэта словамі Бібліі аб вечным жыцці праведнікаў і Боскай да іх міласці (Пс. 36. 28, 29).[194] У той жа час выбар Святаполка на карысць няпраўды каштуе яму паражэнняў і хваробы ў жыцці зямным і вечных пакут у жыцці замагільным.[195] Такім чынам, маральны выбар накладаў на ваяра абавязак служэння дабру і адказнасць перад Богам і людзьмі. Гэтая маральна-этычная тэндэнцыя ішла поруч з тэндэнцыяй палітычнай. Наколькі палітычная эвалюцыя вайскова-дружыннага слою як асновы ўлады вяла яго да рэінтэграцыі ў грамадства, настолькі хрысціянізацыя вяла да духоўнага збліжэння з грамадствам і пры-знання яго законаў. Цяпер ваяр канчаткова стаў успрымацца з грамадстве і ўспрымаць сам сябе як абаронца.

Гэтае годнае прызначэнне знайшло адлюстраванне ў развіцці культаў «ваенных» святых, падобных да тых, што вызнаваліся ва ўсім хрысціянскім свеце. Акрамя ўсяго іншага, функцыяй такіх святых было змаганне з тыранамі і дапамога хрысціянскім войскам у зямных бітвах.[196] Святыя Барыс і Глеб яшчэ, бадай, не ўспрымаліся як нябёсныя ваяры. Тым не менш, як кажа працытаваны намі урывак са «Сказання», яны ўжо аказвалі дапамогу тым, хто змагаўся за праўду і родную зямлю. Больш за тое, аўтар «Сказання»

---

[193] Съказание и страсть и похвала святюю мученику Бориса и Глеба. С. 73.

[194] Тамсама. С. 73–74.

[195] Тамсама. С. 80–81.

[196] Walter, Christopher. *The Warrior Saints in Byzantine Art and Tradition.* Aldershot, 2003. 53.

параўноўвае іх з агульнапрызнаным «ваенным» святым — Дзімітрыем Солунскім, а Вышгарад пад Кіевам, дзе адбываліся некаторыя падзеі «Сказання», — з Солунем (Фесалонікай).[197] Паводле іроніі гісторыі, якая зрабіла поўнае кола, нашчадкі тых самых славян, ад чыіх ярасных штурмаў Дзімітрый дапамагаў абараняць Солунь, цяпер упадаблялі яму сваіх першых святых.

Разам з тым, на Русь пранікплі і развіваліся і культы традыцыйных «ваенных» святых і архангела Міхаіла. Пад 1063 г. летапіс згадвае пахаванне Судзіслава Уладзіміравіча ў царкве святога Георгія.[198] Імёны святых і анёлаў актыўна выкарыстоўваліся і ў рускім анамыстыконе. Забіты людзьмі Святаполка отрак Барыса носіць імя Георгія.[199] Вельмі сімвалічна ў кантэксце помсты Святаполку за Барыса і Глеба гучыць хрысціянскае імя Яраслава — Георгій.[200] Тураўскі і кіеўскі князь Святаполк Ізяславіч насіў хрысціянскае імя Міхаіл.[201] Гэтыя факты выдатна паказваюць, якую высокую ацэнку і абгрунтаванне з пункту гледжання хрысціянства атрымала прызванне ваяроў як абаронцаў люду і зямлі.

Увесь ход падзей цягам дзесяцігоддзяў, якія ішлі следам за прыняццем хрысціянства на Русі, і асвятленне іх у тагачасных крыніцах, а таксама лёс гістарычных персанажаў паказваюць, як карэнным чынам змяніўся погляд на сутнасць вайны і ваяроў у грамадстве, якія з авантурных шукальнікаў прыгод, славы і багацця ўсё больш ператвараліся ў паўнапраўных сяброў і абаронцаў грамадства. Абавязкі ваяра і ўласцівыя яму рысы ў асноўным увасабляліся ў князях. Гэта прасочваецца на прыкладзе Яраслава, які на працягу лічаных год прайшоў эвалюцыю ад мяцежніка да змагара за праўду, і Усяслава, які з ваяра-ваўкалака і крывавага заваёўніка вырас да справядлівага суддзі, будаўніка гарадоў і фундатара храма святой Сафіі ў Полацку.

Цікава, што ўскладанне ваярскай функцыі на князёў у рамках хрысціянскай думкі на Русі адбылося раней за Візан-

---

197 Walter, Christopher. *The Warrior Saints in Byzantine...* С. 82.

198 Лаврентьевская летопись. Ст. 163.

199 Съказание и страсть и похвала святюю мученику Бориса и Глеба. С. 75.

200 Іларыён. *Слова пра закон і ласку* // Анталогія... С. 29.

201 Житье и хоженье Данила, Русьскыя земли игумена // Анталогія... С. 138

тыю, дзе падобная з'ява ўкаранілася толькі ў канцы XI ст.[202] Тлумачэннем гэтаму можа быць з аднаго боку ўласная трывалая традыцыя ваеннай доблесці, з іншага боку – уплыў заходняга хрысціянства. У Заходняй Еўропе ваярская функцыя правіцеля знайшла адбітак ужо ў напісаных у рэчышчы хрысціянскай думкі «гаспадарскіх зярцалах» VIII–IX стст.[203] Гэтую традыцыю мог пераняць і кіеўскі клір сярэдзіны XI ст., які ў асобе мітрапаліта Іларыёна супрацьстаяў візантыйскаму ўплыву і меў прыхільныя кантакты з Заходняй Еўропай.[204]

Асноўная маса дружыннікаў і вояў яшчэ не выйшла з ценю князёў, і грамадская думка таго часу не разглядала ваяроў як асобны стан. Нават пры развіцці культу ваенных святых і іншых асобных элементаў, спецыфічных для ваеннай культуры, ваяры яшчэ не ўяўлялі сабой замкнёную карпарацыю. Асобны прывілеяваны ваярскі стан на беларускіх землях набыў акрэсленую форму толькі ў XIV–XV стст. пасля выдання прывілеяў Ягайлы і Вітаўта. Тым не менш, ужо ў XI ст. тагачасныя ваяры, князі і дружына, узялі на сябе настолькі адказную місію, а ўзровень патрабаванняў грамадства да іх быў настолькі высокім, што ўжо ў бліжэйшай будучыні іх імкненне гэтым стандартам адпавядаць сутыкнулася з вялікімі цяжкасцямі і не заўсёды было паспяховым.

---

[202] Чичуров И. С. *Политическая идеология средневековья (Византия и Русь).* Москва, 1990. С. 127–140.

[203] Флори Ж. *Идеология меча.* С. 126–133.

[204] Мюллер Л. *Понять Россию: историко-культурные исследования.* С. 88–114.

*Раздзел 3.*
# Ваеннае майстэрства Тураўскай і Полацкай земляў, радзімічаў, яцвягаў і Літвы ў 970–я гг.–1101 г.

## А) Вайсковая арганізацыя

XI ст. было часам найвышэйшага росквіту вайсковай арганізацыі раннесярэднявечнага дафеадальнага тыпу на беларускіх землях. Па-першае, дзяржавы, у склад якіх тады беларускія землі ўваходзілі, ператвараліся з рыхлых фармаванняў у структураваныя ўтварэнні з развітай сістэмай дзяржаўных інстытутаў. Замацаваўшы ўнутраную структуру, яны былі ў стане дакладна вызначыць сваё месца на знешнепалітычнай арэне сярод іншых дзяржаў. У выніку ранейшыя рабаўніцкія авантуры паступова змяніліся спланаванымі ваеннымі кампаніямі з мэтай забеспячэння дзяржаўных інтарэсаў. Па-другое, князь і дружына, якія і былі асноўнай крыніцай паходжання дзяржаўнай улады, занялі акрэсленае становішча ў сістэме дзяржаўных інстытутаў. Са з'явы, якая яшчэ часткова стаяла па-за грамадствам, княская дружына ператварылася ў яго неад'емны і эфектыўны элемент. Яна стала падмуркам узніклага дзяржаўнага апарату і замацавала сваю ролю як ядра ўзброеных сіл. Як вынік і вайсковая арганізацыя грамадства ў цэлым стала больш эфектыўным сродкам яго абароны ад знешніх ворагаў.

Найлепшым паказчыкам такога прагрэсу стала зніжэнне ваенізацыі грамадства, што прасочваецца па матэрыялах пахаванняў. У параўнанні з ранейшым часам колькасць пахаванняў з прадметамі ўзбраення адносна агульнай колькасці пахаванняў падае амаль у тры разы. Паводле даследаў А. Н. Кірпічнікава, у XI–XII стст. у розных рэгіёнах Русі пахаванні з узбраеннем складаюць толькі 2–6% ад усіх пахаванняў. Для Цэнтральнай і Паўднёвай Беларусі гэтая лічба складае 6%.[205] У выніку расейскі навуковец прыходзіць да

[205] Кирпичников А. Н. *Древнерусское оружие*. Вып. 3. С. 46.

справядлівай высновы, што гэтыя дадзеныя «адлюстроўваюць скарачэнне колькасці людзей, занятых на вайсковай службе».[206]

Вайсковая арганізацыя Полацкага княства і Кіеўскай дзяржавы, у склад якіх уваходзіла большасць беларускіх земляў, па-ранейшаму ўключала дзве асноўныя часткі, прадстаўленыя княскай дружынай і апалчэннем. У выніку далейшага ўскладнення, абумоўленага грамадскім развіццём, да іх дадаліся іншыя арганізацыйныя адзінкі кшталту гарадскіх залог. Пры гэтым усе яны траплялі ў склад альбо княскіх, альбо земскіх вайсковых фармаванняў. Такі падзел вайсковай арганізацыі ўвасабляў падзел грамадства на ўладу, аддзеленую ад народу, і земства, якое прадстаўляла сабой самакіраванне гарадскіх і сельскіх жыхароў. Абедзве паловы палітычнай арганізацыі фактычна мелі свае ўласныя вайсковыя фармаванні, якія на вайне падпарадкоўваліся князю, але захоўвалі значную ступень аўтаноміі адна ад адной. Асабліва выразна гэта выяўлялася падчас унутраных канфліктаў, калі княская дружына і земства маглі знаходзіцца па розныя бакі поля бою.

Працэс зніжэння ваенізацыі грамадства вёў да прафесіяналізацыі вайсковай службы і росту значэння дружыны. Як і раней, княская дружына дзялілася на старэйшую і малодшую з захаваннем грыдзьбы як прамежкавага слою. Але яна ўжо зазнала пэўныя змены. Раней старэйшыя дружыннікі кшталту Свенельда атрымлівалі ад князя права збору данін з захопленых тэрыторый. Цяпер пажалаванні ім ад князя набылі форму кармленняў, то бок прыбыткаў з унутраных тэрыторый, якія раней даставаліся князю за выкананне ім сваіх абавязкаў як правіцеля. У параўнанні з данінай васалітэт у форме кармленняў быў наступным крокам у кірунку да феадальнай рэнты.[207] З вайсковага пункту гледжання гэта значыла пачатак адыходу ад дружынных прынцыпаў і набліжэння старэйшай дружыны і ўласных вайсковых атрадаў старэйшых дружыннікаў да феадальнага войска.

Малодшая дружына яшчэ заставалася водгукам слаўнай мінуўшчыны і асяродкам дружыннага ладу жыцця. Яна была

---

[206] Кирпичников А. Н. *Древнерусское оружие*. Вып. 3. С. 49.

[207] Фроянов И. Я. *Киевская Русь: Очерки социально-политической истории*. С. 564–565.

бліжэйшым атачэннем князя, з якім яе звязвалі ранейшыя сакральныя адносіны баявога брацтва, сяброўства і гасціннасці. Князь быў для дружыннікаў баявым паплечнікам, першым з роўных, іх старэйшым сябрам і дабрадзеем. Дружыннікі былі для князя братамі па зброі і надзейным апірышчам агонай улады. З дружыннікамі князь бавіў свой час у бяседах і забавах, асыпаючы іх міласцямі, што накладала на іх святы абавязак абараняць свайго дабрадзея і служыць яму надзейнай падтрымкай. У сваю чаргу, князь мог разлічваць на дапамогу дружыннікаў у найскладанейшых сітуацыях. Вельмі яскрава аб гэтым кажа летапісны аповед аб размове Уладзіміра Святаславіча са сваёй дружынай. Калі дружыннікі «подъпьяхуться, начьняхуть роптати на князь, глаголюще: «Зло есть нашим головам: да нам ясти деревянными лъжицами, а не сребряными». Пачуўшы гэта, Уладзімір загадаў вырабіць для дружыннікаў срэбраныя лыжкі, зазначыўшы: «Серебромь и златом не имам налести дружины, а дружиною налезу сребро и злато, яко же дед мой и отець мой доискася дружиною злата и сребра».[208] Гэты аповед выдатна адлюстроўвае побытавую і духоўную блізкасць князя і дружыны, іх сумеснае баўленне часу і ўзаемазалежнасць.

Узаемаадносіны князя і дружыны не абмяжоўваліся толькі бяседамі. Дружыннікі былі найбліжэйшымі дарадцамі князя па асноўных пытаннях і выканаўцамі ягоных даручэнняў. Той самы Уладзімір «любя дружину, и с ними думая о строи земленем, и о ратех, и о уставе земленем».[209] З дружыннікаў рэкрутаваліся ўрадоўцы для толькі ўзніклага дзяржаўнага апарату, у тым ліку і военачальнікі. Адны з іх займалі камандзірскія пасады рознага рангу ва ўзброеных сілах. Іншыя ажыццяўлялі адміністрацыйную і ваенную ўладу на падуладных князю тэрыторыях. Можна думаць, што ў такіх справах князь у большай ступені імкнуўся абапірацца менавіта на асабіста адданую яму і залежную ад яго малодшую дружыну, чым на старэйшую дружыну, якая выяўляла тэндэнцыі да палітычнай і эканамічнай самастойнасці. У гэтай сувязі можам згадаць Святаполка Ізяславіча, які пры ўзыходжанні на кіеўскі стол у 1093 г. раіўся найперш з пры-

---

208 Лаврентьевская летопись. Ст. 126.
209 Тамсама.

ведзенай за сабой з Турава дружынай на шкоду старэйшай кіеўскай дружыне. Разам з тым, галоўнай функцыяй малодшай дружыны была функцыя асабістага ўзброенага атрада князя, які быў не проста ягонай аховай, а ядром усіх узброеных сіл, гатовым да баявых дзеянняў. Адразу ж следам за сваім укняжаннем у Кіеве Святаполк выказаў гатоўнасць рушыць супраць полаўцаў, абапіраючыся менавіта на сваіх отракаў.[210]

Колькасць княскіх дружыннікаў на працягу XI ст. бесперапынна расла. Паводле летапіснага паведамлення пад 1014 г. Яраслаў штогод раздаваў сваім грыдзям тысячу грыўняў. Грунтуючыся на гэтых звестках і параўноўваючы іх з сярэдняй аплатай найманага ваяра, Г. В. Ласкавы вызначыў колькасць дружыннікаў Яраслава ў 160 чалавек.[211] Але ўжо Святаполк Ізяславіч у 1093 г., ацэньваючы моц сваёй дружыны, называў лічбу ў 700 (па іншых звестках – 800) отракаў.[212] Разам з дзецкімі і грыдзямі яго малодшая дружына магла налічваць больш за тысячу чалавек.

У адрозненне ад ранейшага часу, дружына канца X–XI стст. была конным войскам, добра і разнастайна ўзброеным,[213] што было выклікана адпаведнымі зменамі тактыкі бою. На беларускіх землях, падуладных Кіеўскай дзяржаве, змены тактыкі дыктаваліся найперш неабходнасцю супрацьпаставіць уласную конніцу конным атрадам верагодных праціўнікаў – печанегаў, торкаў, полаўцаў і іншых качавых народаў.[214] Авалоданне складаным майстэрствам коннага бою стала магчымым дзякуючы далейшай прафесіяналізацыі дружыны.

Дружына была самай мабільнай і баяздольнай часткай войска, заўсёды гатовай адрэагаваць на ваенную пагрозу: ці то напад знешняга ворага, ці то выбух міжусобнай барацьбы. Адпаведна, і дружыннік быў прафесіяналам ваеннай справы. Ён быў ваяром, пастаянна падрыхтаваным да не-

---

210 Лаврентьевская летопись. Ст. 218.

211 Ласкавы Г. В. *Да пытання аб арганізацыі і складзе ўзброеных сіл Полацкай зямлі ў канцы XI – пачатку XIII стст.* // Гістарычна-археалагічны зборнік. Мн., 1993. Ч. 2. С. 12.

212 Лаврентьевская летопись. Ст. 218.

213 Кирпичников А. Н. *Снаряжение всадника и верхового коня на Руси IX–XIII вв.* Ленинград, 1973. С. 5.

214 Тамсама. С. 85.

бяспекі, пільным нават у мірны час і гатовым да абароны сваёй зямлі ад знешняга ворага ў любую хвіліну. Высокія патрабаванні да прафесійнага ўзроўню дружынніка вымагалі ад яго пастаяннай падрыхтоўкі і ўдасканалення баявога майстэрства, маральных якасцяў і фізічнага стану. Гэтыя патрабаванні датычыліся як шараговых дружыннікаў, так і баяр і князёў, якія асабістым прыкладам заахвочвалі высокі баявы дух дружыны і сваёй харобрасцю падтрымлівалі сярод дружыннікаў свой аўтарытэт. Нездарма адзін з найлепшых палкаводцаў таго часу Уладзімір Манамах, які ў канцы XI ст. займаў у тым ліку і смаленскі стол, у «Павучанні» для сваіх сыноў прысвяціў годнае месца выхаванню ў сабе належных ваярскіх якасцяў. Ён заклікаў сыноў быць дужымі і вынослівымі перад цяжкасцямі ваеннага побыту: «На воину вышедъ не ленитеся, не зрите на воеводы, ни питью, ни еденью не лагодите».[215] Ён нагадваў ім аб неабходнасці захоўваць пільнасць і асцярожнасць, трымаць сітуацыю пад кантролем і быць гатовым да любога павароту падзей: «а рано встанете, а оружья не снимаите с себе вборзе, не розглядавше, леноощами внезапу бо человекъ погыбаеть».[216] Для выхавання і ўдасканалення высокіх баявых фізічных і маральных якасцяў побач са звычайнай ваеннай падрыхтоўкай і непасрэдным удзелам у вайне, князі і дружыннікі культывавалі мужныя, дынамічныя заняткі, якія загартоўвалі чалавека перад тварам небяспекі і цяжкіх фізічных нагрузак. Адным з іх улюбёных спосабаў баўлення часу было паляванне. Як піша аб сабе Манамах, ён «створилъ дела на воине, и на ловехъ ночь и день, на зною и на зиме не дая собе оупокоя».[217] Такія заняткі былі звязаныя з вялікай рызыкай. Самому Манамаху давялося шмат ад іх пацярпець. Ён расказвае пра такія выпадкі: «медведь ми у колена подклада, оукусилъ лютыи зверь, скочилъ ко мне на бедры, и конь со мною поверже, и Богъ невережена мя съблюде». Увогуле, Манамах «въ оуности своеи вередих не блюда живота своего, ни щадя головы своея».[218] Гэтыя словы добра раскрываюць прыроду яго ваеннага майстэрства і затрачаную

[215] Лаврентьевская летопись. Ст. 246.
[216] Тамсама.
[217] Тамсама. Ст. 251.
[218] Тамсама.

для яго дасягнення цяжкую працу. Падрыхтаваны і выхаваны такім чынам, князь ці дружыннік цалкам адпавядаў свайму прафесійнаму прызначэнню і быў поўнасцю гатовы для ўдзелу ў баявых дзеяннях.

Разам з тым, як слушна, але трохі катэгарычна падкрэслівае І. Я. Фраянаў, прафесіяналізацыя ваеннай справы не прывяла да выціскання народнага апалчэння з вайсковай арганізацыі. Яно па-ранейшаму захоўвала сваё значэнне, несла цяжар вайсковай службы разам з дружынай і, прынамсі колькасна, складала найбольшую частку ўзброеных сіл Русі. Пры апісанні баявых дзеянняў летапісы надаюць увагу ролі «вояў», якія часта і былі вырашальнай сілай ва ўзброеных сутыкненнях.[219]

Першай часткай апалчэння былі атрады гарадскіх жыхароў. У сувязі з заснаваннем новых гарадоў і ростам іх насельніцтва ўскладнілася іх тэрытарыяльная і грамадская арганізацыя, якая вызначала арганізацыю вайсковую. Найменшай адзінкай гарадскога тэрытарыяльнага падзелу была вуліца. У буйных гарадах вуліцы аб'ядноўваліся ў пасады, як у Полацку,[220] альбо ў канцы, як у Ноўгарадзе. Адпаведна, вуліцы выстаўлялі «дзесяткі», якія гуртаваліся ў пасадскія альбо канчанскія «сотні», з якіх і складалася гарадское апалчэнне-«тысяча».[221] Такім чынам, гарадское апалчэнне захавала старыя формы дзесяцічнай арганізацыі, але яны мелі ўжо новы змест. Колькасць арганізацыйных адзінак вылічалася дзесяткамі, сотнямі і тысячамі толькі намінальна і на самой справе вызначалася мабілізацыйнай магчымасцю вуліц, пасадаў і гарадоў.[222]

Да гарадскіх атрадаў далучаліся вясковыя кантынгенты, якія арганізацыйна таксама маглі ўваходзіць у склад гарадскіх тысяч.[223] Як паведамляе «Пасма аб Эймундзе», калі Яраславу пагражала небяспека ад ягонага брата, «ён паслаў кліч на вайну па ўсёй сваёй зямлі, і прыйшло да яго вялікае войска бондаў».[224] Тое, што збор апалчэння з сельскіх

---

219 Фроянов И. Я. *Киевская Русь: Очерки*... С. 658–675.

220 Тарасаў С. В. *Полацк IX–XVIII стст.: Гісторыя і тапаграфія*. Мн., 2001. С. 36–39.

221 Разин Е. А. *История военного искусства*. Т. 2. С. 60.

222 Тамсама. С. 273.

223 Фроянов И. Я. *Киевская Русь: Очерки*... С. 675–679.

224 Прядь об Эймунде Хрингссоне. С. 110.

акруг быў справай звычайнай, пацвярджаецца існаваннем добра выпрацаванай працэдуры мабілізацыі. Паводле «Пасмы», перад пачаткам вайны супраць Бурыцлава Яраслаў «паслаў баявую стралу па ўсім сваім княстве, і склікалі конунгі ўсё войска».[225] Паводле Наўгародскага першага летапісу, колькасць наўгародскіх вояў у паходзе Яраслава на Кіеў у 1015–16 гг. склала 3 тысячы.[226]

Дзесяткі і сотні апалчэння кіраваліся дзесяцкімі і соцкімі, існаванне якіх адзначаецца ўжо ў час кіравання Уладзіміра.[227] Агульнае камандаванне апалчэннем ажыццяўлялі ваяводы, галоўным з якіх быў тысяцкі. І. Я. Фраянаў адзначае, што імі маглі быць як ваяводы, прызначаныя князем, так і ваяводы з земскай знаці. Пасаду ж тысяцкага прадстаўнік земскай знаці мог займаць з большай верагоднасцю, чым паплечнік князя.[228]

Традыцыйна ваенна-гістарычная думка прадстаўляе вояў апалчэння як пяхоту.[229] Між тым шматлікія летапісныя паведамленні ясна кажуць аб вядзенні воямі баявых дзеянняў на конях. Дастаткова згадаць, што адной з памылак, якая ў 1068 г. каштавала кіеўскага стала Ізяславу Яраславічу, была ягоная адмова даць кіяўлянам коней для змагання з полаўцамі.[230] Можна сцвярджаць, што ў аснове апалчэння ў цэлай Русі і на беларускіх землях палягала спалучэнне пешых і конных атрадаў. Менавіта гэтае спалучэнне і забяспечвала высокую баяздольнасць апалчэння.[231]

Разам з апалчэннем, якое збіралася неперыядычна, у выпадку ваеннай пагрозы ў гарадах прысутнічалі і пастаянныя вайсковыя атрады, якія неслі гарнізонную службу. Яны ахоўвалі гарады ад нападу знешняга ворага і падтрымлівалі ўнутраны парадак. Пры неабходнасці яны маглі браць удзел у вядзенні іншых ваенных аперацый. І. Я. Фраянаў лічыць іх земскімі дружыннікамі. Земская дружына, як і княская, з'яўлялася атрадам прафесійных ваяроў, але ў адрозненне ад княскай утрымлівалася за кошт земства, прадстаўляла

---

225 Прядь об Эймунде Хрингссоне. С. 109.
226 Новгородская первая летопись. С. 175.
227 Лаврентьевская летопись. Ст. 126.
228 Фроянов И. Я. *Киевская Русь: Очерки...* С. 681–683.
229 Разин Е. А. *История военного искусства.* Т. 2. С. 60.
230 Лаврентьевская летопись. Ст. 170–171.
231 Фроянов И. Я. *Киевская Русь: Очерки...* С. 671–672.

земскую палову вайсковай арганізацыі і была галоўнай ударнай сілай земскага апалчэння.[232] У доказ гэтага можна спаслацца на летапісны запіс аб падзеях у Кіеве ў 1068 г., калі ў ходзе паўстання супраць Ізяслава Яраславіча кіяўляне рушылі да поруба вызваляць *сваю* дружыну.[233]

Калі Кіеў быў прыкладам вайсковай арганізацыі вялікага горада, у невялікіх, збольшага ваенных паселішчах, залога была арганізавана іншым чынам. Паводле Ю. А. Зайца, які грунтуецца на матэрыялах раскопак Заслаўя, гарадскую залогу складалі ваяры княскай дружыны і гарадскія ваяры. Гарадскія ваяры не ўваходзілі ў склад княскай дружыны, але належалі да княскай часткі вайсковай арганізацыі, а не да земства. Яны неслі ваенную службу і адначасова займаліся сельскагаспадарчай працай і рамёствамі. Археалагічныя матэрыялы сведчаць аб тым, што ваяры заслаўскай залогі не былі мясцовымі жыхарамі, а паходзілі з паўночнай і цэнтральнай частак Полацкага княства і маглі быць пераселеныя разам з сем'ямі на загад полацкага княскага ўраду.[234] Таксама яшчэ раз можна згадаць, што залога Маскавічаў уключала нарманскіх перасяленцаў.

Відавочна, што ў гарадах Русі таго часу пры камплектаванні гарадскіх залог суіснавалі княская і земская вайсковыя арганізацыі. Прапарцыйныя адносіны паміж імі вызначаліся ў залежнасці ад працэсу ўзнікнення і развіцця розных гарадоў. У канцы X—XI стст. Кіеў быў вялікім горадам, насельніцтва якога ўключала як княскіх урадоўцаў і дружыннікаў, так і гандляроў, рамеснікаў і людзей сельскагаспадарчай працы. Натуральна, у такім горадзе роля земства была ў якасных і колькасных адносінах вялікай. Яна накладала свой адбітак і на вайсковую арганізацыю, што магло выражацца ў перавазе земскіх дружын. Заслаўе ж і Маскавічы былі невялікімі паселішчамі, якія атрымалі статус горада ў якасці памежных умацаваных пунктаў. Наяўнасць аднаго толькі мясцовага земскага насельніцтва была яўна недастатковай для выканання імі абарончай функцыі, што вымагала перасялення туды дружыннікаў і недружынных прафесійных княскіх ваяроў, якія і складалі значную

---

232 Фроянов И. Я. *Киевская Русь: Очерки...* С. 683.
233 Лаврентьевская летопись. Ст. 171.
234 Заяц Ю. А. *Заславль в эпоху феодализма.* С. 107.

частку залогі. Вялікі стольны Кіеў і маленькія мілітарызаваныя Заслаўе і Маскавічы з'яўлялі сабой розныя палюсы урбанізацыі на Русі. Іх вайсковая арганізацыя адрознівалася перавагай пастаянных земскіх атрадаў у Кіеве і княскіх атрадаў у Заслаўі і Маскавічах. Іншыя ж гарады маглі займаць паміж імі прамежкавы стан.

Да мясцовых вайсковых фармаванняў дадаваліся атрады наймітаў, якія па-ранейшаму фармаваліся пераважна з нарманаў. «Повесть временных лет» паведамляе аб удзеле нарманаў у шматлікіх кампаніях Яраслава. Тытмар Мерзебургскі адзначае вялікую колькасць «спрытных данаў», якія знаходзіліся на службе ў кіеўскага князя.[235] «Пасма аб Эймундзе» пацвярджае гэтыя звесткі, расквечваючы аповед аб баявых дзеяннях каляровымі эпізодамі, у якіх нарманы дэманструюць свой гераізм і баявое майстэрства. Полацкія князі таксама шырока карысталіся паслугамі нарманскіх ваяроў, аб чым кажа паведамленне «Пасмы» аб пераходзе атрада Эймунда і Рагнара да Брачыслава Ізяславіча і далейшым яго ўдзеле ў вайне супраць Яраслава. Найманыя ваяры, хутчэй за ўсё, не вербаваліся індывідуальна, але паступалі на службу цэлымі атрадамі, як то было ў выпадку з Эймундам і Рагнарам. На вайне нарманскія кантынгенты знаходзіліся пад вярхоўным камандаваннем полацкага ці кіеўскага князя, але захоўвалі сваю ўласную сістэму арганізацыі і сваіх камандзіраў. Найменшай адзінкай арганізацыі такога атрада быў экіпаж аднаго карабля, то бок 30—40 ваяроў. Камандаваў экіпажам стырнавы. Некалькі экіпажаў аб'ядноўваліся ў атрад пад камандаваннем конунга ці ярла, які і падпарадкоўваўся непасрэдна вярхоўнаму камандаванню. Колькасць аднаго атрада магла дасягаць некалькіх соцень чалавек. Атрад Эймунда і Рагнара налічваў 600 ваяроў.[236] Пры гэтым «Повесть временных лет» ацэньвае колькасць варагаў у паходзе Яраслава на Кіеў у 1 тысячу чалавек.[237] Верагодна, у Яраслававым войску былі іншыя нарманскія кантынгенты акрамя Эймундавага. Узнагароджанне выплочвалася наймітам у залежнасці ад іх рангу. Шараговы ваяр традыцыйна атрымліваў 1 эйрыр (унцыя, ці 27 г) срэбра ў

[235] Chron. Tietm. VIII., 32. С. 69.
[236] Прядь об Эймунде Хрингссоне. С. 109.
[237] Лаврентьевская летопись. Ст. 141.

месяц, стырнавы – 1,5 эйрыра, што складала адпаведна 1,5 і 2,25 маркі ў год. Узнагароджанне магло выдавацца ў выглядзе каштоўных металаў альбо ў іншым эквіваленце кшталту футра.[238] Разам з тым, пасля шэрагу паспяховых аперацый Эймунд запатрабаваў ад Яраслава павысіць аплату да 1 эйрыра золата шараговаму ваяру і 0,5 маркі золата стырнавому, на што кіеўскі князь быў вымушаны пагадзіцца з прычыны далейшых баявых дзеянняў супраць Бурыцлава.[239] Грошы, аднак, выплочваліся нерэгулярна, і нарманы сышлі да Брачыслава. Такія высокія запатрабаванні нарманаў тлумачацца тым, што, нягледзячы на сваю параўнальна невялікую колькасць, яны былі вельмі прафесійнай і кваліфікаванай узброенай сілай, якая ў войнах першай паловы XI ст. часта вырашала зыход асобных бітваў і цэлых кампаній. У другой палове XI ст. у сувязі са змяненнем палітычнага і сацыяльнага становішча ў скандынаўскіх краінах найміцтва прыйшло ў заняпад.[240]

Да ўдзелу ў асобных кампаніях таксама прыцягваліся іншаземныя вайсковыя кантынгенты саюзнікаў альбо даннікаў, якія падпарадкоўваліся вярхоўнаму камандаванню, але мелі сваіх камандзіраў і захоўвалі характэрную для іх арганізацыю. Узнагародай за ўдзел у баявых дзеяннях для іх, верагодна, служыла доля ў захопленай здабычы. У войсках Кіева і іншых паўднёварускіх княстваў у такой ролі звычайна выступалі качэўнікі. Летапіс фіксуе выпадкі выкарыстання печанегаў Святаполкам у вайне супраць Яраслава ў 1018 г.,[241] полаўцаў і чыцеевічаў паўднёвымі князямі ў кампаніях супраць Полацка ў 1077 г. і 1084 г.[242] У сваю чаргу, полацкія князі выкарыстоўвалі атрады падуладных ці саюзных балцкіх і фіна-угорскіх народаў, аб чым сведчыць напад Усяслава на Ноўгарад з воддзю ў 1069 г.[243] Натуральным удзельнікам кампаній полацкіх князёў маглі таксама быць і літоўскія атрады. Прынамсі, аб ваенным супрацоўніцтве Літвы і Полаччыны можа сведчыць знаходка ў гарадзішчы на Менцы

---

[238] Прядь об Эймунде Хрингссоне. С. 108.
[239] Тамсама. С. 110.
[240] Ласкавы Г. В. *Да пытання аб арганізацыі і складзе ўзброеных сіл Полацкай зямлі.* С. 9–10.
[241] Лаврентьевская летопись. Ст. 144.
[242] Тамсама. Ст. 247, 248.
[243] Новгородская первая летопись. С. 17.

(першапачатковы Менск) бронзавага наканечніка похваў двухлязовага мяча, характэрнага для Літвы XI ст.[244]

У гэтай сувязі варта звярнуць позірк і да нешматлікіх звестак аб вайсковай арганізацыі дзяржаўных ці прота-дзяржаўных утварэнняў на балцкіх землях. Крыніцы, якія датычацца місіі і гібелі Бруна ў яцвяжскіх землях, згадваюць караля Нецімера і ягоных герцагаў.[245] Адштурхоўваючыся ад падабенства грамадскага ўладкавання і ходу яго развіцця ў славян і балтаў, мы можам меркаваць, што грамадскі і вайсковы статус Нецімера быў аналагічны статусу князёў на Русі, а ягоныя герцагі прыкладна адпавядалі старэйшым дружыннікам. Адпаведна, першым элементам вайсковай арганізацыі яцвягяў і літоўцаў магла быць княская дружына (драугове), якая складалася з асабістага ўзброенага атрада князя (кунігаса), падобнага на малодшую дружыну на Русі, і знатных ваяроў накшталт рускіх старэйшых дружыннікаў, кожны з якіх меў уласны атрад. Другім і найбольш шматлікім элементам вайсковай арганізацыі ў балтаў было народнае апалчэнне, якое адыгрывала галоўную ролю ў вядзенні баявых дзеянняў. Найбольш верагоднай формай арганізацыі балцкіх дружыны і апалчэння была традыцыйная дзесяцічная сістэма, якая стасавалася з патрабаваннямі часу.

Падсумоўваючы звесткі аб колькасці чалавек у разнастайных элементах вайсковай арганізацыі, нам будзе цікава і разгледзець пытанне аб агульнай колькасці войскаў у канцы X–XI стст. у цэлай Русі і менавіта на беларускіх землях. Добрае ўяўленне аб гэтым нам даюць звесткі крыніц аб паходзе Яраслава на Кіеў у 1015–16 гг. і ягоным змаганні з Баляславам і Святаполкам у 1018 г. «Повесть временных лет» называе яўна нерэальную лічбу Яраслава войска: 40 тысяч наўгародскіх вояў і 1 тысяча найманых варагаў.[246] Карціну праясняе Наўгародскі першы летапіс, які рэалістычна кажа аб агульнай колькасці войска ў 4 тысячы, з іх 3 тысячы наўгародскіх вояў і 1 тысяча варагаў.[247] У святле гэтага паведамлення лічба ў 40 тысяч выглядае як свядомая ці выпадковая памылка летапісца, зробленая шляхам механічнага памна-

---

244 Археалогія Беларусі. Т. 3. С. 185.
245 Baranauskas T. *Lietuvos valstybės ištakos*. 258.
246 Лаврентьевская летопись. Ст. 141.
247 Новгородская первая летопись. С. 175.

жэння лічбы з Наўгародскага летапісу на 10. Адштурхоўваючыся ад гэтага паведамлення, мы можам пастарацца прыкладна вылічыць і колькасць войска ў Яраслававых праціўнікаў. Як адзначае пры апісанні супрацьстаяння на Дняпры «Пасма аб Эймундзе», першапачаткова розніца ў сіле паміж праціўнікамі не была значнай. Гэта значыць, што Яраславу супрацьстаяла прыкладна роўнае па колькасці войска. У далейшым шмат Яраслававых вояў разышлося, а да ягоных праціўнікаў прыбылі свежыя падмацаванні так, што Эймунду перамога пачала здавацца сумнеўнай.[248] У гэты момант колькасць войска Яраслава і супраціўнага войска магла дасягаць каля 3 і 5 тысяч адпаведна.

Аб падобных лічбах кажуць крыніцы і пры апісанні баявых дзеянняў у 1018 г. Як паведамляе Тытмар, у паходзе Баляслава на Русь акрамя польскіх войскаў бралі ўдзел 300 немцаў, 500 венграў і 1000 печанегаў.[249] Да іх мы з упэўненасцю можам дадаць некалькі соцень тураўскіх і кіеўскіх дружыннікаў і прыхільнікаў Святаполка, што разам дасць каля 2 тысяч вояроў. Лагічна мяркуючы, у войску Баляслава колькасць палякаў мусіла быць ніяк не меншай за няпольскія кантынгенты, а хутчэй за ўсё, і пераўзыходзіла іх, складаючы як мінімум 2–3 тысячы чалавек. Такім чынам, усё ягонае войска складалася з 4–5 тысяч вояроў. У бітве на Бугу яно ўшчэнт разграміла армію Яраслава. Між тым, мяркуючы па задзірлівых паводзінах Яраслававых ваяводаў,[250] русіны маглі мець колькасную перавагу. Аб гэтым, хоць і з відавочнымі перабольшаннямі, кажа і Гал Анонім.[251] Можна дапусціць, што, аб'яднаўшы пад сваёй уладай большую частку Русі, Яраслаў здолеў сабраць войска, большае за тое, што было ў яго ў 1015–16 гг. Яно магло дасягаць колькасці ў 6–8 тысяч вояроў.

Падводзячы вынік, мы можам сказаць, што ў войнах першай паловы XI ст. на Русі агульная колькасць войскаў у асобных кампаніях не вырасла ў параўнанні з нарманскім перыядам, а трохі скарацілася і не перавышала некалькі тысяч чалавек. У міжусобных войнах, якія зводзіліся да

---

[248] Прядь об Эймунде Хрингссоне. С. 109.
[249] Chron. Tietm. VIII., 32. С. 69.
[250] Лаврентьевская летопись. Ст. 143.
[251] Gall. Anon. 7. С. 36–37.

супрацьстаянне паміж Ноўгарадам і Кіевам, саапернікі выводзілі на поле бою не больш чым па 3–5 тысяч вояроў з кожнага боку з дружынай, апалчэннем, наймітамі і саюзнікамі ўключна, але без вояроў залог, пакінутых для аховы гарадоў. Войска аб'яднанай Русі з некаторымі беларускімі землямі, але без Полацкага княства дасягала 6–8 тысяч чалавек. У другой палове XI ст. гэтая лічба магла ўзрасці толькі нязначна. Агульны рост насельніцтва кампенсаваўся ўжо згаданым паніжэннем мілітарызацыі грамадства і спыненнем прытоку найманых войскаў са Скандынавіі. Сваю ролю адыгрывала і гібель баяздольнага насельніцтва ў бясконцых войнах. Як казалі Святаполку Ізяславічу кіеўскія «смысленнии мужи» ў 1093 г., адгаворваючы яго ад бітвы з полаўцамі, «наша земля оскудела есть от рати».[252] Таму нават у выпадку надзвычайнай ваеннай пагрозы Русь магла выставіць толькі ўмераную колькасць войскаў. У бітве з полаўцамі ля Сноўска ў 1068 г. чарнігаўскі князь Святаслаў Яраславіч меў 3 тысячы вояроў.[253] У тым самым нешчаслівым 1093 г. Святаполк і кіеўскія мужы не маглі знайсці досыць сіл, каб супрацьстаяць 8 тысячам полаўцаў.[254] Толькі аб'яднанне сіл усіх земляў Кіеўскай дзяржавы ў барацьбе супраць небяспечнага знешняга ворага магло даць войска, колькасць якога даходзіла да 8–10 тысяч. Такім выпадкам магла быць вайна трох князёў Яраславічаў з Усяславам у 1067 г., якая скончылася страшэнным пабаявішчам на Нямізе.

Аб Полацкім княстве якія-небудзь дакладныя звесткі адсутнічаюць. Таму спекулятыўнае дапушчэнне – адзінае, што мы можам зрабіць у гэтым дачыненні. Несумненна, полацкае войска саступала колькасцю войску Кіеўскай дзяржавы па прычыне нашмат меншых памераў і меншай колькасці насельніцтва Полаччыны. Але калі грунтавацца на звестках аб бітвах на Судоме, Чарэсе, Нямізе і ля Галоцічаска, можна зрабіць выснову, што полацкае войска мусіла мець дастатковую колькасць вояроў, каб упарта, хоць і не заўсёды паспяхова супрацьстаяць наўгародскім і паўднёварускім рацям. Такім чынам, яго колькасць мусіла быць прынамсі параўнальнай з колькасцю праціўнікаў. Як думаецца,

---

[252] Лаврентьевская летопись. Ст. 218.
[253] Тамсама. Ст. 172.
[254] Тамсама. Ст. 218

мы не зробім вялікай памылкі, калі вызначым яе ў памеры 3–5 тысяч ваяроў разам з дружынай, воямі, нарманскімі кантынгентамі і саюзнікамі, але без залог гарадоў.

Логіка таксама падказвае, што найвышэйшая колькасць войска на Русі магла ў такім выпадку збірацца менавіта для сумесных выпраў полацкіх і іншых рускіх князёў, такіх як войны ў Панямонні ці паход на торкаў у 1060 г., і дасягаць 11–15 тысяч ваяроў.

## Б) Зброя

Выкарыстанне зброі ў войнах канца X–XI стст. на беларускіх землях працягвала традыцыі ранейшага часу, але таксама належным чынам адпавядала змяненню вайсковай арганізацыі і спосабаў вядзення вайны і іх ус-кладненню.

Пачэснае месца найбольш эфектыўнай і небяспечнай зброі па-ранейшаму захоўваў меч. З-за свайго кошту ён заставаўся прыналежнасцю эліты ўзброеных сіл: князёў, дружыннікаў і заможных гараджан. Больш за тое, паводле археалагічных дадзеных, доля пахаванняў, у якіх былі знойдзеныя мячы, рэзка падае адносна агульнай колькасці пахаванняў са зброяй. Калі з агульнай колькасці пахаванняў, датаваных 900–1025 г., мячы былі знойдзеныя ў 13% магіл, то для пахаванняў 1000–1200 гг. гэтая лічба падае да 6%.[255] Гэты факт яшчэ раз сведчыць аб зніжэнні агульнай ваенізацыі грамадства.

Пастутова змяняўся і сам выгляд мяча. Першая палова XI ст. яшчэ адзначаецца панаваннем каралінгскіх мячоў. Меч другой паловы XI ст. ужо быў лягчэйшым і карацейшым за ранейшыя тыпы. Ягоная даўжыня даходзіла да 86 см супраць 95–100 см у X–першай палове XI стст. Вага складала каля 1 кг супраць 1,5 кг адпаведна. Шырыня зменшылася на 0,5–1,5 см. Дол займаў адну трэць ляза супраць паловы раней. Бяднейшым стала і мастацкае аздабленне мячоў. Усе апісаныя змены маглі быць выкліканыя імкненнем зрабіць вытворчасць мячоў больш таннай.[256] Перамена гэтая не была рэзкай. З аднаго боку, ужо ў X ст. сустракаліся тыпы мячоў, пераходныя да пазнейшых формаў. З другога

---

255 Кирпичников А. Н. *Древнерусское оружие*. Вып. 3. С. 52.
256 Тамсама.

боку, і ў пазнейшых мячоў прасочваліся элементы ранейшых тыпаў.[257]

Меч канца X–XI стст. служыў пераважна для сякучых удараў. Разам з тым фіксуюцца першыя выпадкі яго выкарыстання для ўдараў колючых. Як зазначае А. Н. Кірпічнікаў, першы раз укол мячом у небаявых абставінах згадваецца пад 980 г.[258] пры апісанні падступнага забойства Яраполка двума варагамі.[259] У наступны раз аб планаваным выкарыстанні мяча для колючага ўдару ў абставінах, ужо больш набліжаных да ваенных, гаворыцца пры апісанні паўстання ў Кіеве ў 1068 г. Каб пазбавіць паўсталых кіян магчымага правадыра, дружына параіла Ізяславу Яраславічу забіць Усяслава Полацкага: «посли ко Всеславу атъ призваше лестью ко оконцю пронзуть и мечемъ».[260] Ізяслаў дадаў сабе гонару, адкінуўшы гэты намер. Звяртае на сябе ўвагу той факт, што для нанясення колючага ўдару праз ваконца вязніцы было абрана не даўжэйшае і вастрэйшае кап'ё, але меч. Але часы славы для мяча як колючай зброі былі далёка наперадзе.

Побач з мячамі многія ваяры мелі нажы, якія выкарыстоўваліся ў ролі універсальнага інструменту, рачэй чым зброі.[261]

Вельмі распаўсюджанай зброяй было кап'ё, якое аднолькава часта выкарыстоўвалася як дружыннікамі, так і ваярамі апалчэння.[262] Археалагічныя дадзеныя фіксуюць наяўнасць кап'я ў 50–63% пахаванняў Беларусі і Гдоўшчыны.[263] Некаторыя могільнікі на тэрыторыі Беларусі як, напрыклад, знойдзены каля Заслаўя, насычаныя знаходкамі коп'яў да высокай ступені.[264]

На беларускіх землях у гэты перыяд ва ўжытку знаходзіліся некалькі тыпаў кап'я. Першым з іх быў вядомы нам з нарманскага перыяду ланцэтападобны тып, які, верагодна, і быў занесены на беларускія землі нарманамі. Да 1000 г. наканечнік кап'я гэтага тыпу быў скарочаны ў даўжыню і

---

257 Кирпичников А. Н. *Древнерусское оружие*. Вып. 3. С. 52.
258 Тамсама.
259 Лаврентьевская летопись. Ст. 78.
260 Тамсама. Ст. 171.
261 Кирпичников А.Н. *Древнерусское оружие*. Вып. 1. С. 72.
262 Тамсама. Вып. 2. С. 19.
263 Тамсама. Вып. 3. С. 47.
264 Тамсама. Вып. 2. С. 9.

больш завостраны да канца. Утулка, наадварот, пашырылася і падоўжылася. Такія змены былі абумоўленыя імкненнем лепей прыстасаваць кап'ё да прабіцця металёвых даспехаў. Ланцэтападобныя коп'і зніклі з ужытку каля 1050 г.[265] Яшчэ больш шырокае распаўсюджанне мелі коп'і з падоўжана-трохкутным наканечнікам, якія маглі мець славянскае паходжанне.[266] Пэўнымі асаблівасцямі тыпаў ужываных коп'яў адрознівалася ад рэшты беларускіх земляў Смаленшчына. Так, тут знайшло шырокае выкарыстанне кап'ё з наканечнікам у выглядзе чатырохграннага стрыжня з варонкападобным верхам, званае пікай. Коп'і азначанага тыпу былі запазычаныя Руссю ў качэўнікаў паўднёва-ўсходніх стэпаў,[267] у баявых дзеяннях супраць якіх смаляне бралі чынны ўдзел. Нарэшце, на Смаленшчыне выкарыстоўваліся гарпунападобныя двушыпныя коп'і, якія былі звязаныя з аўтахтонным фіна-угорскім насельніцтвам і маглі ўжывацца як для вайны, так і для палявання.[268] Увогуле, адбывалася паступовая замена шырокіх тыпаў лёзаў на вузкія, што было звязана з развіццём засцерагальнай зброі і неабходнасцю яе пераадолення.[269] Разам з тым, шырокалёзавыя наканечнікі, якія дазвалялі наносіць шырокія і небяспечныя раны, захоўваліся яшчэ доўгі час. Воі апалчэння, якія найчасцей імі карысталіся ў баі, сустракаліся ў асноўным з такімі самымі воямі, якія не былі прыкрытыя засцерагальным узбраеннем.[270]

Як і ў ранейшы перыяд, кап'ё шырока выкарыстоўвалася ў баі пяхотай. У сілу сваёй даўжыні яно было грознай і эфектыўнай зброяй першага ўдару, якая дазваляла дастаць праціўніка і нанесці яму максімальную шкоду перад тым, як звярнуцца да іншых відаў зброі. Узброенае коп'ямі, шчыльна пастроенае войска магло нанесці праціўніку моцны ўдар у атацы і было цяжкапераадольнай перашкодай у абароне.

Новы імпэт развіццю кап'я ў XI ст. дало і хуткае развіццё конніцы, для якой кап'ё стала натуральнай і зручнай зброяй. У адрозненне ад пяхоты, якая па-ранейшаму карыста-

265 Кирпичников А.Н. *Древнерусское оружие.* Вып. 2. С. 9–12.
266 Тамсама. С. 12–13.
267 Тамсама. С. 15–16.
268 Тамсама. С. 17
269 Тамсама. С. 20.
270 Тамсама. С. 21.

лася коп'ямі даўжынёй 180–200 см, конніца мела коп'і, якія дасягалі 360 см у даўжыню.[271] Рускія коннікі XI ст. яшчэ не выкарыстоўвалі таранны ўдар, які ў той час ужо з'явіўся ў Заходняй Еўропе. Удар наносіўся замахам узнятай рукі, якая затым хутка выпростваласся.[272] Але і такі ўдар, што вызначаўся спалучэннем энергіі замаху з энергіяй руху конніка, дазваляў наносіць значную шкоду праціўніку.

Сапернікам кап'я паводле масавасці была сякера. У адрозненне ад кап'я, і тым больш ад мяча, яна была пазбаўлена адцення сакральнасці, прыналежнасці да магутнасці, улады і прэстыжу. Прычын таму было дзве. Найперш, у канцы X–XI ст. сякера была зброяй пераважна сацыяльных нізоў, што выразна адрознівала іх ад мечаносных і кап'еборных князёў і дружыннікаў. Па-другое, універсальны характар сякеры, якая магла быць з такім самым поспехам працоўным інструментам, як і зброяй, зніжаў ступень яе «гераічнасці».[273] Пры гэтым менавіта яна і была той асноўнай працоўнай прыладай вайны, якой карысталася большасць шараговых пяхотнікаў. Па ступені распаўсюджанасці яна трохі пераўзыходзіла кап'ё на паўночным захадзе беларускіх земляў і пакідала яго далёка ззаду ў цэнтры і на поўдні. У Цэнтральнай і Паўднёвай Беларусі доля пахаванняў сякераносцаў дасягае 47–67%.[274]

Асноўнымі тыпамі ўжываных сякер былі па-ранейшаму шыркалязовыя, вузкалязовыя і барадатыя сякеры, якія насіліся на поясе, на шворцы за спіной, альбо папросту цераз плячо.[275] Выкарыстоўваліся і сякеры-чаканы, што пацвярджаецца знаходкай чакана ў слаі XI ст. у Ваўкавыску.[276]

У тактычных адносінах сякера была найбольш часта ўжыванай ударнай зброяй пяхоты апалчэння, чарга да якой даходзіла пасля першага капійнага ўдару, калі завязвалася цесная рукапашная сутычка. Аднак сякера не была эфектыўнай зброяй для дзеянняў супраць конніцы. У эпоху шпаркага росту апошняй гэта прадвызначыла адыход сяке-

---

271 Кирпичников А.Н. *Древнерусское оружие.* Вып. 2. С. 9.

272 Тамсама. Вып. 3. 68.

273 Тамсама. Вып. 2. С. 44–45.

274 Тамсама. Вып. 3. С. 49.

275 Ласкавый Г. В. *К истории оружия Белорусского Подвинья в VI–XIII вв.* // Полоцкий летописец. № 1 (2). С. 27–33.

276 Археалогія Беларусі. Т. 3. С. 384.

ры на другі план. Яна ўсё больш саступала месца мячу і кап'ю,[277] хоць і была незаменнай пры абароне і аблозе крэпасцяў. Як лічыць Г. В. Ласкавы, менавіта выкарыстанне сякер было вырашальнам фактарам ва ўзяцці Усяславам Ноўгарада.[278]

На фоне развіцця ўдарнай зброі яскрава бачны заняпад зброі кідальнай. Суліцы (кідальныя коп'і) выкары-стоўваюцца толькі як дапаможная зброя і не маюць вялікага ваеннага значэння.[279]

Пасля рэнесансу X ст. новы заняпад перажываюць лук і стрэлы. Паводле дадзеных А. Н. Кірпічнікава, знаходкі стрэл у пахаваннях XI ст. у паўночна-заходняй Беларусі гранічна рэдкія, у цэнтральнай і паўднёвай Беларусі, а таксама на Смаленшчыне адсутнічаюць цалкам.[280] Падзенне значэння кідальнай зброі можна звязаць з двума фактарамі. Першым з іх з'яўляўся агульны рост значэння рукапашнага бою, у ходзе якога найчасцей і вырашаўся вынік бітваў. Другім была перамена тэатраў ваенных дзеянняў. Калі раней ваяры з беларускіх земляў часта ўдзельнічалі ў паходах на Візантыю і каспійскія краіны, то ў XI ст. большасць баявых дзеянняў вялася імі на сваёй зямлі ці на суседніх тэрыторыях, дзе перасечаная лясістая мясцовасць зніжала эфектыўнасць выкарыстання кідальнай зброі. Усё ж цяжка ўявіць, што некаторыя віды баявых дзеянняў кшталту аблогі крапасных умацаванняў абыходзіліся без стральбы. Хутчэй за ўсё, лук і стрэлы прысутнічалі ў ваярскім узбраенні да той ці іншай ступені. Пахаванні ж, пры ўсёй сваёй каштоўнасці як археалагічнай крыніцы, не заўсёды дакладна адлюстроўваюць сапраўднае становішча. Як трапна заўважыў сам А. Н. Кірпічнікаў, «зброя мёртвых» не заўсёды адпавядае «зброі жывых».[281]

Пошукі спосабаў абараніць ваяра ад варожых удараў прывялі і да далейшага развіцця засцерагальнай зброі, якое выразілася ў яе пацяжэнні. Побач з кальчугай на беларускія землі пранікаюць пласцінкавыя панцыры, у летапісах званыя «бронямі дошчатымі».[282] Найдаўнейшым тыпам пласц-

---

277 Кирпичников А. Н. *Древнерусское оружие.* Вып. 2. С. 45–46.
278 Ласкавый Г. В. *К истории оружия Белорусского Подвинья...* С. 27.
279 Кирпичников А. Н. *Древнерусское оружие.* Вып. 2. С. 23–25.
280 Тамсама. Вып. 3. С. 47–49.
281 Тамсама. Вып. 3. С. 52.
282 Ипатьевская летопись. Ст. 904.

інкавага панцыру на беларускіх землях быў ламелярны, пласцінкі ад якога, датаваныя апошняй чвэрцю XI ст., былі знойдзеныя ў Менску.[283] Панцыр такога тыпу складаўся з падоўжаных простакутных пласцінак, часам з трохкутным выступам на доўгім баку, якія змацоўваліся паміж сабой рамянямі, прапушчанымі ў адтуліны па краях. Даўжыня пласцінак была роўнай 8–10 см, шырыня – 1,5–3 см.[284] Падаснова са скуры ці тканіны не была абавязковай, але часам прысутнічала. Гэта ніяк не ўплывала на спосаб мацавання пласцінак.[285]

Панцыр абараняў ваяра лепей за кальчугу. Змацаваныя разам пласцінкі заходзілі адна на адну, такім чынам у асобных месцах падвойваючы таўшчыню панцыра. Іх выгнуты профіль дапамагаў лепей адбіваць удары варожай зброі.[286] Хаця панцыр больш за кальчугу скоўваў рухі ваяра, але ягоная адносная нягнуткасць мела і станоўчы бок. Ён добра парыраваў драбячае ўздзеянне зброі на косткі ваяра, супраць чаго кальчуга была малаэфектыўнай. Нарэшце, распаўсюджанне панцыра мела і эканамічныя прычыны. Выраб панцырных пласцінак і іх змацаванне патрабавалі меншай кваліфікацыі і рабілі вытворчасць панцыраў прасцейшай і таннейшай.

Ламелярны панцыр быў вынайдзены на Блізкім Усходзе, а ў рымскі час шырока выкарыстоўваўся па ўсім Міжземнамор'і.[287] На беларускія землі ён, магчыма, быў занесены качэўнікамі[288] ў эпоху Вялікага перасялення народаў, чым і тлумачыцца ўжо вядомая нам яго найстарэйшая знаходка на паўднёвай ускраіне Беларусі ў Хатомелі. У канцы X–XI ст. ламелярны панцыр рабіў на Беларусі толькі свае першыя крокі і па масавасці яшчэ не мог спаборнічаць з кальчугай.

Для абароны галавы па-ранейшаму выкарыстоўваліся стажковыя шлемы.[289]

---

[283] Плавінскі М. А. *Засцерагальнае ўзбраенне IX–XIII стст. на тэрыторыі Беларусі.* С. 146–147.

[284] Кирпичников А. Н. *Древнерусское оружие.* Вып. 3. С. 17.

[285] Плавінскі М. А. *Засцерагальнае ўзбраенне...* С. 145.

[286] Кирпичников А. Н. *Древнерусское оружие.* Вып. 3. С. 16.

[287] Козленко А. В. *Военная история античности: полководцы, битвы, оружие.* С. 196.

[288] Кирпичников А. Н. *Древнерусское оружие.* Вып. 3. С. 18.

[289] Плавінскі М. А. *Засцерагальнае ўзбраенне...* С. 148.

Разам з кальчугай ці панцырам і шлемам у камплект засцерагальнага ўзбраення ўваходзіў шчыт. Каля 1000 г. па ўсёй Еўропе атрымаў распаўсюджанне міндалепадобны шчыт, вынайдзены ў Заходняй Еўропе, але часам званы нарманскім.[290] Памеры такога шчыта ваганіся ад паловы да трэцяй часткі чалавечага росту. Вырабляўся ён з дрэва і скуры і затым фарбаваўся. Першапачаткова канструкцыя шчыта ўключала умбон, які знік у пазнейшыя часы.[291] Навіной была канструкцыя дзяржальна, якое складалася з дзвюх скураных петляў, што дазваляла насіць шчыт на левым перадплеччы і вызваліць кісць левай рукі. Яшчэ адзін пас дазваляў вешаць шчыт на плячо.[292] Некаторыя даследчыкі мяркуюць, што эвалюцыя міндалепадобнага шчыта спараджала яго разнастайныя формы. Адной з такіх форм магла быць авальная, што пацвярджаецца знаходкай каменнай фігуркі ваяра XI ст. з Берасця. На шчыце фігуркі таксама намаляваны крыж, што можа сведчыць аб існаванні розных відаў дэкарацыі шчытоў, некаторыя з якіх маглі мець геральдычны характар.[293]

З'яўленне міндалепадобных шчытоў было абумоўлена развіццём ваеннага майстэрства і змяненнем спосабаў бою, прычым асноўную ролю адыграла развіццё конніцы. Міндалепадобны шчыт выкарыстоўваўся найперш коннікамі і функцыянальна быў прыстасаваны для коннага бою. Дзякуючы сваім памерам ён прыкрываў ваяра ад пляча да калена і абараняў яго надзейней за ранейшыя круглыя тыпы. Як зазначае старажытнарускі пераклад «Юдэйскай вайны» Іосіфа Флавія, «щить же дългъ яко минеть ребра коневи».[294] Нарэшце, дзяржальна, якое вызваляла кісць левай рукі, палягчала konніку кіраванне канём, чаго круглы шчыт з простым дзяржальнам таксама не забяспечваў.[295]

У падобным рэчышчы развівалася і ўзбраенне балцкіх плямёнаў. Так, у якасці наступальнай зброі літва карысталася мячамі, баявымі нажамі, сякерамі, коп'ямі, лукамі і

---

[290] Кирпичников А. Н. *Древнерусское оружие*. Вып. 3. С. 37.

[291] • ygulski Z. Jun. *Broń w dawnej Polsce na tle uzbrojenia Europy i Bliskiego Wschodu.* 74.

[292] Polska technika wojskowa do 1500 roku. 62.

[293] Плавінскі М. А. *Засцерагальнае ўзбраенне* ... С. 140–141.

[294] «История Иудейской войны» Иосифа Флавия: Древнерусский перевод. (Flav. Jos., Bell. Iud.) Том I. Москва, 2004. 412в, 27–28. С. 210.

[295] Polska technika wojskowa do 1500 roku. 62.

стрэламі, а таксама прашчамі.[296] Функцыю засцерагальнай зброі адыгрывалі ў асноўным шчыты. Меркаванні даследчыкаў пацвярджаюцца знаходкамі ва ўсходнелітоўскіх курганах мячоў і наканечнікаў коп'яў. Сякеры сустракаюцца радзей у параўнанні з папярэднім перыядам. На змену вузкалёзавым сякерам прыходзяць шырокалёзавыя. Знаходкі умбонаў шчытоў даводзяць ролю шчыта як асноўнага элемента засцерагальнага ўзбраення.[297]

Больш сціплым наборам зброі адрозніваюцца яцвяжскія пахаванні. Знаходкі археолагаў уключаюць наканечнікі коп'яў, баявыя нажы і сякеры.[298] Невялікі выбар зброі кампенсаваўся пастаянным нашэннем некаторых яе відаў, што несумненна дапамагала яцвяжскім ваярам віртуозна ёй валодаць. Так, у склад традыцыйнага яцвяжскага строю ўваходзілі баявыя нажы і сякеры, з якімі яцвяжскі мужчына ніколі не расставаўся.[299]

У цэлым, зброя канца X–XI стст. адлюстроўвала змены ў сучасных ёй вайсковай арганізацыі і ваенным майстэрстве на беларускіх землях. Зніжэнне агульнай ваенізацыі грамадства прывяло да колькаснага скарачэння выкарыстання мячоў. Развіццё конніцы стала прычынай далейшага ўдасканалення формаў коп'яў і з'яўлення міндалепадобных шчытоў. Рост ваеннага значэння рукапашнага бою спрычыніўся да новага заняпаду кідальнай зброі. Сякера зазнала колькасны рост як асноўная зброя апалчэння для рукапашнага бою, але якасна пачала істотна саступаць больш эфектыўным мячам і коп'ям. Нарэшце, імкненне засцерагчы ваяра ад удараў варожай зброі прывяло да ўвядзення ва ўжытак пласцінкавых панцыраў.

### В) Умацаванні і аблога

Урбанізацыя і шырокае будаўніцтва памежных крэпасцяў у канцы X–XI стст. прывялі да новага павышэння ролі фартыфікацыі і спосабаў яе пераадолення ў вядзенні вой-

---

296 Зинкявичюс З. *Восточная Литва в прошлом и настоящем.* С. 28.
297 Археалогія Беларусі. Т. 3. С. 101.
298 Квятковская А. В. *Ятвяжские могильники Беларуси (к. XI–XVIII вв.).* С. 105–116.
299 Тамсама. С. 112–113, 136.

наў. Авалоданне горадам, які ўяўляў сабой цэнтр палітычнага, эканамічнага і духоўнага жыцця акругі вяло да атрымання сталага кантролю над гэтай акругай. Гэта датычылася найперш вялікіх гарадоў, чым і тлумачыцца імкненне да іх захопу. Невялікія ўмацаваныя пункты, якія засноўваліся як памежныя крэпасці і яшчэ не набылі вялікага палітычнага і эканамічнага значэння, тым не менш, адыгрывалі сур'ёзную ваенна-стратэгічную ролю, бо былі пабудаваныя на важнейшых стратэгічных напрамках дзяржаў. Іх узяцце дазваляла праціўніку пераадольваць першы рубеж абароны і перасякаць важнейшыя камунікацыі дзяржавы. Менавіта такі сэнс меў захоп войскамі паўднёварускіх князёў Менска ў 1067. Узяцце менскай крэпасці пакідала Полацкае княства безабаронным перад нападамі з поўдня і адразала яго ад Літвы – адной з крыніц полацкай вайсковай сілы. Нарэшце, нават запланавана часовае заняцце горада, у выніку якога прадугледжвалася толькі яго абрабаванне і знішчэнне, але не ўтрыманне на доўгі тэрмін, мела сваё азначанае месца ў агульнай карціне вайны. Яно разладжвала палітычную сістэму дзяржавы, несла шкоду яе эканоміцы і адцягвала яе сілы ад важнейшых напрамкаў. Авалоданне горадам таксама магло служыць важкім аргументам у палітычным гандлі. Тады яно фактычна насіла характар буйнамаштабнай ваеннай дыверсіі альбо інструменту шантажу. У такой якасці Брачыслаў і Усяслаў выкарыстоўвалі захоп Ноўгарада ў 1021 і 1066 гг.

На гэтай глебе развіваліся дзве ўзаемазвязаныя спаборныя тэндэнцыі: развіццё ўмацаванняў і ўдасканаленне спосабаў іх пераадолення. У апісаны час на беларускіх землях усё яшчэ пераважалі старыя тыпы крэпасцяў: выспавыя, мысавыя і складана-мысавыя. Але пры захаванні старых тыпаў крэпасцяў самі ўмацаванні атрымлівалі далейшае развіццё. Ранейшыя выспавыя і мысавыя крэпасці заставаліся абароненымі адно прыроднымі ўласцівасцямі рэльефу альбо ўмацаваннямі толькі з напольнага боку. Новыя ж выспавыя і мысавыя крэпасці атрымлівалі валы па ўсім перыметры.[300] Існавалі і камбінаваныя тыпы.

Да выспавага тыпу крэпасцяў X–XI стст. адносяцца: узгоркавыя крэпасці Браслаў, Лукомль і гарадзішча Шлосберг

---

300 Носов К.С. *Русские крепости и осадная техника VIII–XVII вв.* С. 13.

(рэшткі Герцыке) у Полацкай зямлі; узгоркавыя гарадзішчы ля вёскі Яршы-Ладыжыцы (рэшткі горада XI–XIII стст. Ладзейніцы) і вёскі Ганіна, а таксама гарадзішчы на балотных выспах ля вёсак Дзерабуж і Жычыцы (рэшткі горада Жыдчычы) у Смаленскай зямлі; узгоркавы Давыд-Гарадок і Залужжа на балотнай выспе ў Тураўскай зямлі; узгоркавыя гарадзішчы Муравельнік ля Слоніма і Новагародак у Панямонні. З іх Браслаў, Герцыке, Ганіна, Давыд-Гарадок і Новагародак былі акружаныя валамі. Ладзейніцы, Дзерабуж, Жыдчычы, Залужжа і Муравельнік штучных умацаванняў не мелі. Лукомль быў акружаны валам з двух бакоў.

У якасці прыкладаў мысавых крэпасцяў можна прывесці: Свіслач, гарадзішчы ля вёсак Цяцерын (рэшткі горада Цяцерын), Гарадзішча, Панізоўе, гарады Лагойск і Кукейнос у Полаччыне; Барадзінскае, Калычоўскае і Чаркасаўскае гарадзішчы, гарадзішчы Оршы і Пацына (адпаведна, рэшткі вядомых гарадоў) у Смаленшчыне; гарадзішчы ў Дубровіцы і в. Гарадзішча ў Тураўшчыне; гарадзішчы ля вёсак Высоцк і Мерачоўшчына ў Панямонні. Большасць з іх былі абароненыя валамі з аднаго напольнага альбо двух бакоў. Чаркасаўскае гарадзішча было абкружанае валам па ўсім перыметры.[301]

З выспавых, мысавых і асабліва складана-мысавых тыпаў крэпасцяў развіўся складаны тып. Ядром складанай крэпасці быў дзядзінец, які будаваўся паводле выспавай ці, часцей, мысавай схемы. Вал і роў аддзялялі яго ад вакольнага горада. Вакольны горад найчасцей уяўляў сабой гандлёва-рамесны пасад, які ўзнік у выніку урбанізацыйных працэсаў і звычайна займаў значную плошчу. Ён быў абаронены штучнымі ўмацаваннямі з напольнага боку ці па перыметры, але звычайна не абараняўся з боку дзядзінца. Адрозненне складанага тыпу ад складана-мысавага палягала ў тым факце, што ўмацаванні вакольнага горада не падпарадкоўваліся рэльефу мясцовасці, а іх план вызначаўся найперш імкненнем абараніць усю плошчу пасаду. Пры гэтым яго ўмацаванні па магчымасці маглі ўзмацняцца натуральнымі перашкодамі.[302]

Класічным прыкладам складанай абарончай сістэмы можна лічыць умацаванні Турава, збудаваныя ў адпаведнасці

[301] Раппопорт П. А. *Военное зодчество западнорусских земель X – XIV вв.* С. 75–98.

[302] Носов К. С. *Русские крепости и осадная техника...* С. 15.

з рэльефам мясцовасці. Старажытны горад знаходзіўся на мысе, абароненым з захаду балоцістай далінай Язды, а з поўначы – ракой Прыпяццю. З паўднёвага ўсходу горад быў прыкрыты глыбокім ровам і валам. Яшчэ адзін роў падзяляў горад на дзве пляцоўкі: дзядзінец і навакольны горад. Пляцоўка дзядзінца ўзвышалася над ірвом навакольнага горада на 6–7 м.[303] Да складанага тыпу крэпасцяў адносіўся і Пінск.

У Полацкай зямлі складаная сістэма ўмацаванняў прысутнічала ў самім Полацку, Віцебску і Друцку. Перанесены са старога месца да зліцця Палаты і Дзвіны полацкі дзядзінец быў абаронены з трох бакоў плынню рэк, а з напольнага боку – ровам.[304] Пасад быў абаронены з напольнага боку сцяной.[305] Дзядзінец Віцебску аддзяляўся ад вакольнага горада валам і ровам. Вакольны горад быў прыкрыты з двух бакоў плынямі Віцьбы і Дзвіны, а з поўначы і ўсходу – верагодна, валам і ровам.[306] Крапасныя ўмацаванні складанага тыпу былі і ў Смаленску.[307]

У той жа час неабходнасць у пашыраным будаўніцтве крэпасцяў выклікае патрэбу ў развіцці сістэм абароны, якія неабавязкова прывязваліся да рэльефу мясцовасці, а будаваліся ў любым зададзеным месцы. Адказам на такую патрэбу было ўзнікненне і развіццё так званых круглых крэпасцяў. Круглыя крэпасці пераважна будаваліся на раўніннай мясцовасці. Форма іхняга плану надавалася ім штучна і не была падпарадкаваная рэльефу. Нават у выпадку, калі крэпасць будавалася на выспе, узгорку ці мысе, будаўнікі імкнуліся да захавання круглай формы. Гэта было выклікана асаблівасцямі вядзення аблогі. Прыкрыццё лініі ўмацаванняў ад варожай атакі ажыццяўлялася пры дапамозе франтальнай стральбы. Круглыя ўмацаванні з адсутнасцю ў іх няправільных выгінаў і вострых рагоў забяспечвалі найлепшыя магчымасці для лінейнага размяшчэння стральцоў і дасягнення аднолькавай шчыльнасці стральбы на любым участку сцяны. Размяшчэнне ж крэпасцяў на раўніне дапамагала

---

[303] Лысенко П. Ф. *Туровская земля IX–XIII вв.* С. 90–91.
[304] Раппопорт П. А. *Военное зодчество западнорусских земель...* С. 94.
[305] Тарасаў С. В. *Полацк IX–XVIII стст.: Гісторыя і тапаграфія.* С. 52–53.
[306] Раппопорт П. А. *Военное зодчество западнорусских земель...* С. 94.
[307] Тамсама. С. 98–99.
[308] Раппопорт П. А. *Военное зодчество западнорусских...* С. 158.

праглядаць мясцовасць далёка навокал і змяншаць верагоднасць із'езду, ці то нечаканага нападу.[308] Яшчэ адной перавагай раўніннага размяшчэння была магчымасць адносна лёгка здабываць ваду з падземных крыніц праз студні.[309]

Першай зямлёй на Русі, якая ўспрыняла тэхналогію будаўніцтва круглых крэпасцяў, была Валынь. Адпаведна, на беларускіх землях першыя круглыя крэпасці ўзніклі ўжо ў X ст. у рэгіёнах, палітычна з Валыннню звязаных (Панямонне) альбо памежных з ёй (заходняя Тураўшчына). Да X–XI стст. адносяцца панямонскія гарадзішчы ля вёсак Санюкі і Індура. Гарадзішча Талерка ля Санюкоў – круглае ў плане, што не адпавядае няправільнай форме ўзгорка, на якім яно знаходзіцца. Яно акружана валам па перыметры. Індурскае гарадзішча мае сваёй асновай круглую пляцоўку на ўзгорку, поўнасцю акружаную валам і ровам з двума ўездамі. Цэнтральная пляцоўка дапаўняецца вакольнай, акружанай авальным у плане валам з адным уездам, побач з якім знаходзіцца яма, магчыма, рэшткі студні. На адным з участкаў вакольнай пляцоўкі знаходзіцца кароткі прамежкавы вал паміж унутраным і знешнім.[310]

На Тураўшчыне знаходзяцца круглыя гарадзішчы ля вёсак Бабка і Белавуша, якія адносяцца яшчэ да X ст. Гарадзішча Замак каля сяла Гарадзец належыць да пераходнага тыпу паміж выспавымі і круглымі крэпасцямі. Будучы дастасаваным да абрысу ўзгорка, яно ўжо мае амаль правільную круглую форму.[311]

У Полацкай зямлі у канцы X–XI стст. яшчэ дамінуюць крэпасці, падпарадкаваныя рэльефу мясцовасці. Некаторыя ўжо маюць правільную геаметрычную форму. Гэта гарадзішча ля вёскі Навасёлкі на Бярозе Дняпроўскай і Заслаўе. Авальную ў плане форму маюць умацаванні Менска на Свіслачы. Выцягнуты абрыс мог дыктавацца намерам дастасаваць крэпасць да мясцовасці і цалкам выкарыстаць незабалочаную пляцоўку. Аднак авальная форма гаворыць аб імкненні выкарыстаць новыя фартыфікацыйныя тэхналогіі і наблізіць план крэпасці да круглага.[312]

---

309 Носов К. С. *Русские крепости и осадная техника...* С. 17.
310 Раппопорт П. А. *Военное зодчество западнорусских...* С. 83–85.
311 Тамсама. С. 76–77.
312 Раппопорт П. А. *Военное зодчество западнорусских...* С. 93.

Да Смаленскай зямлі тэндэнцыя будаўніцтва круглых крэпасцяў у XI ст. яшчэ не дабралася.

На думку даследчыкаў, шырокае распаўсюджанне круглых крэпасцяў у паморскіх і палабскіх славян, у Польшчы і Чэхіі, а таксама іх развіццё ў першую чаргу ў заходніх землях Русі, сведчыць аб іх заходнеславянскім паходжанні. Пры гэтым Тураўская зямля і Панямонне ўспрынялі новую тэндэнцыю праз валынскае пасярэдніцтва даволі рана. Полаччына і Смаленшчына па-ранейшаму давяралі традыцыйным тыпам крэпасцяў, дастасаваных да рэльефу мясцовасці.[313]

Як і ў агульнай тыпалогіі крэпасцяў, у тэхналогіях іх будаўніцтва і асноўных канструктыўных элементах у канцы X–XI стст. суіснавалі простыя старыя і больш развітыя новыя тэхналогіі. Гэта прасочваецца ў асаблівасцях будаўніцтва валоў – асноўнага элементу тагачасных умацаванняў. Валы звычайна насыпаліся з падручнага грунту, якім на беларускіх землях быў пясок. З пяску насыпаныя валы ў Новагародку, Пінску і Давыд-Гарадку. Іх вышыня вагалася ад 2–3 да 5–7 метраў. Вал новагародскага дзядзінца дасягаў 6 м, што перавышала сярэдні паказчык. Стромкасць вонкавага схілу ў сярэднім даходзіла да 30–35% (30% у Новагародку), унутранага – да 25–30%.[314] Унутраны схіл часам апаясваўся гарызантальнай тэрасай альбо брукаваўся каменнем дзеля забеспячэння перасоўвання ваяроў уздоўж вала. Для ўзыходжання на грэбень вала выкарыстоўваліся сабраныя з дрэва альбо выкапаныя ў самім вале лесвіцы.[315]

Каб пазбегнуць абсыпання валоў і павысіць іх трываласць, яны ўмацоўваліся знешнімі і ўнутранымі канструкцыямі. Найбольш простымі з іх былі знешнія канструкцыі. Так, у Давыд-Гарадку вал быў умацаваны з абодвух бакоў агароджай з сасновых калод. Вонкавы схіл таксама падтрымліваўся пастаўленымі вертыкальна бярвеннямі.[316]

Вельмі характэрным тыпам канструкцыі вала для беларускіх земляў быў вал з унутраным драўляным каркасам, які складаўся са зрубаў-гародняў, часам пастаўленых у не-

---

313 Тамсама. С. 195–200.

314 Раппопорт П. А. *Военное зодчество западнорусских...* С. 122, 131–132.

315 Носов К. С. *Русские крепости и осадная техника...* С. 21.

316 Раппопорт П. А. *Военное зодчество западнорусских...* С. 122.

калькі радоў. У першай палове XI ст. зрубы пачалі звязваць паміж сабой у сістэму, толькі вонкавы пояс якой, набліжаны да вонкавага схілу вала, запаўняўся зямлёй. Унутраныя рады зрубаў заставаліся пустымі і маглі выкарыстоўвацца для гаспадарчых і іншых патрэб.[317] Аснова вала са зрубаў-гародняў з дубовых бярвенняў даўжынёй 3,5–4 м была зафіксаваная на гарадзішчы на Менцы.[318] Зрубная канструкцыя выкарыстоўвалася як на рускіх землях, так і ў іх балцкіх суседзяў. Зрубную канструкцыю маюць валы гарадзішча Асотэ, якое ў XI ст. належала да Герцыкскага княства. З напольнага боку яны ўмацаваныя трыма, а з іншых бакоў – двума радамі зрубаў, знешні з якіх запаўняўся зямлёй, а ўнутраныя выкарыстоўваліся пад жытло.[319]

Розныя канструкцыі выкарыстоўваліся для ўмацавання розных участкаў менскага вала. Некаторыя ўчасткі падтрымліваліся са знешняга боку бярвеннямі. Участак вала, блізкі да гарадской брамы, меў сваёй асновай субструкцыю, якая складалася з накатаў бярвенняў, пакладзеных перпендыкулярна восі вала. Гэтыя накаты падтрымлівалі бярвенні, паралельныя восі вала. Такая субструкцыя мае блізкія паралелі у «крацістых» асновах валоў польскіх крэпасцяў IX–X стст., што можа сведчыць аб польскім уплыве.[320]

Нарэшце, для ўмацавальных канструкцый выкарыстоўвалася і каменная кладка. Абарончая сцяна полацкага Вялікага пасаду ўяўляе сабой камбінаваную драўляна-каменную канструкцыю. Каменная кладка складалася з камянёў сярэдняга і буйнога памеру, прамежкі паміж якімі запаўняліся дробнымі камянямі. Яна трымалася ўласнай вагой і з'яўлялася падмуркам для абарончых зрубаў-гародняў, падтрымліваючы іх знешні край. Унутраны іх край утрымліваўся земляной падсыпкай. Зрубы і тут выкарыстоўваліся для гаспадарчых мэтаў.[321]

Для прадухілення абсыпання вала ў роў каля асновы яго вонкавага боку таксама рабілася берма – гарызантальная пляцоўка шырынёй каля 1 м.[322] Самі равы мелі розную пры-

317 Носов К. С. *Русские крепости и осадная техника*... С. 25–26.
318 Археалогія Беларусі. Т. 3. С. 185.
319 Раппопорт П. А. *Военное зодчество западнорусских*... С. 130.
320 Загорульский Э. М. *Возникновение Минска*. Мн., 1982. С. 155–156.
321 Тарасаў С. В. *Полацк IX–XVIII стст*... С. 52–53.
322 Раппопорт П. А. *Военное зодчество западнорусских*... С. 132.

роду. Часам яны ўтвараліся ў выніку выемкі зямлі для насыпкі вала і ў такім выпадку мелі глыбіню, якая прыкладна раўнялася вышыні вала. Пры правядзенні равоў цераз натуральныя прыродныя перашкоды кшталту яроў, памеры іх былі большыя. Штучныя равы мелі сіметрычны профіль. Абодва іх схілы мелі прыкладна аднолькавую стромкасць каля 30–45%. Дно рабілася скругленым. У нізкай мясцовасці будаўнікі крэпасцяў імкнуліся запаўняць равы вадой, часам з дапамогай падвядзення вады з бліжэйшых вадаёмаў.[323] Роў, аднак, не быў абавязковым элементам умацаванняў і не заўсёды прысутнічаў нават у важнейшых крэпасцях. Так, роў не фіксуецца ў Менску на Свіслачы.[324]

Па вяршыні вала праходзіла абарончая сцяна, якая амаль заўсёды была драўлянай. Навукоўцамі выказваецца меркаванне, што пануючым тыпам сцен на рускіх землях у раннім сярэднявеччы былі зрубныя, нягледзячы на беднасць археалагічных дадзеных. Яны складаліся з трохсценных зрубаў-гароднях даўжынёй 3–4 м, пастаўленых побач і злучаных кароткімі папярочнымі сценкамі. Прыкладнае супадзенне даўжыні гароднях асновы вала і сцяны паказвае, што сцяна магла быць працягам зрубнага каркаса вала.[325] Зрубныя канструкцыі сцен зафіксаваныя на гарадзішчы Герцыке.[326]

Сцены мелі сярэднюю шырыню 2–6 м і вышыню 3–5. Верхняй іх часткай была баявая галерэя, званая «забралам» ці «забаролам». З вонкавага боку яна была абароненая брустверам з бярвенняў, у якім былі прарэзаныя байніцы для франтальнай стральбы. Бруствер з аднаго боку і слупы з другога падтрымлівалі над забаролам двухсхільны дах.[327]

Побач са зрубнымі сценамі ў невялікіх ці малазначных крэпасцях ужываліся і архаічныя канструкцыі кшталту частаколу ці слупавых сцен. Слупавыя сцены будаваліся шляхам замацавання гарызантальных бярвенняў у пазах вертыкальных слупоў альбо шляхам іх замацавання паміж папарна пастаўленымі слупамі.[328] Лічыцца, што частакол быў уласцівы ўмацаванням вакольнага горада, якія не прызначаліся

[323] Носов К. С. *Русские крепости и осадная техника...* С. 26.
[324] Загорульский Э. М. *Возникновение Минска.* С. 167.
[325] Носов К. С. *Русские крепости и осадная техника...* С. 26–27.
[326] Раппопорт П. А. *Военное зодчество западнорусских...* С. 136.
[327] Носов К. С. *Русские крепости и осадная техника...* С. 27–30.
[328] Раппопорт П. А. *Военное зодчество западнорусских...* С. 135–136.

для доўгай абароны.[329] Між тым магутныя каменна-драўляныя ўмацаванні полацкага Вялікага пасаду сведчаць аб адваротным.

Неад'емнай часткай крапасных умацаванняў была брама, якая абараняла ўезд у крэпасць. У невялікіх гарадзішчах яна размяшчалася проста на вяршыні вала, што ўскладняла яе цывільнае выкарыстанне. У больш развітых крэпасцях уезд шырынёй 5–8 м праразаўся ў лініі вала. У такіх выпадках брама ўжо была складаным інжынерна-тэхнічным збудаваннем, якое звычайна рабілася ў выглядзе вежы.[330] Вежа гэтая, аднак, выконвала рачэй тэхнічную функцыю канструктыўнага элементу ўмацаванняў, чым пануючай над сцяной баявой пляцоўкі. Для вядзення фланкіруючай стральбы яна не прызначалася і над сценамі не ўзвышалася.[331]

Брама складанай для свайго часу канструкцыі была збудаваная ў другой палове XI ст. у Менску на Свіслачы. Зрубная вежа, рэшткі якой былі знойдзеныя пры раскопках, знаходзілася на ўсходнім канцы вала пры ўездзе ў крэпасць. Э. М. Загарульскі мяркуе, што з заходняга боку ўезду магла знаходзіцца сіметрычная ёй вежа. Брама, такім чынам, магла ўяўляць сабой праезд паміж дзвюма вежамі. Цікава, што ўезд не проста размыкаў непарыўную лінію вала. Канцы вала былі ссунутыя адносна адзін аднаго так, каб пры падыходзе да брамы праціўнік мусіў адкрываць свой неабаронены шчытом правы бок.[332] Падобнае размяшчэнне ўезду было вядома ў іншых рускіх гарадах і ў далейшым атрымала распаўсюджанне ў выглядзе захабаў.

Акрамя надбрамных збудаванняў, іншых вежаў крэпасці таго часу не мелі, калі не лічыць дазорных вышак, вядомых нам толькі гіпатэтычна.

Завяршальнам элементам комплексу ўмацаванняў былі зрубныя студні, размешчаныя ўнутры крэпасці. На беларускіх землях вядомыя рэшткі крапасных студняў на гарадзішчах Муравельнік і ля вёскі Індура. У абодвух выпадках яны знаходзіліся недалёка ад уезду.[333]

---

329 Носов К. С. *Русские крепости и осадная техника...* С. 30–31.
330 Раппопорт П. А. *Военное зодчество западнорусских...* С. 149–150.
331 Носов К. С. *Русские крепости и осадная техника...* С. 31–32.
332 Загорульский Э. М. *Возникновение Минска.* С. 164–167.
333 Раппопорт П. А. *Военное зодчество западнорусских...* С. 154–155.

Хваля ўзвядзення шматлікіх крэпасцяў закранула і балцкія землі. Мы ўжо згадвалі ўмацаваныя цэнтры падпарадкаваных Полацку Кукейноса, Герцыке і Асотэ. У той самы час у XI ст. у перыяд свайго апошняга росквіту ўступілі драўляныя замкі на літоўскіх землях. Паняцце гэтае сінанімічнае паняццю позніх гарадзішчаў (пілякальнісаў).[334] Некаторыя з іх узніклі як цэнтры земляў ці княскія рэзідэнцыі.[335] Разам з тым слабая заселенасць іншых, што асабліва характэрна для ўсходняй Літвы, дазваляе меркаваць аб іх паходжанні ад гарадзішчаў-сховішчаў.[336]

Драўляныя замкі Літвы належалі да выспавага і мысавага тыпаў крэпасцяў. Разам з тым па меры росту іх насельніцтва побач з імі ўзнікалі заселеныя падолы, аналагічныя рускаму вакольнаму гораду. Яны таксама былі абароненыя лініяй умацаванняў.[337] Такім чынам выспавыя і мысавыя крэпасці развіваліся ў складаныя. Падолы фіксуюцца ў 11% гарадзішчаў. Некаторыя замкі былі абароненыя з трох бакоў натуральнымі рубяжамі, а з чацвёртага — валам і ровам. Некаторыя мелі штучныя ўмацаванні па ўсім перыметры.[338] У 6% замкаў зафіксаваныя форбургі — вынесеныя за асноўную абарончую лінію замкнёныя ўмацаванні.[339]

Асноўным элементам умацаванняў драўляных замкаў былі валы вышынёй 3—5 м з унутранага боку і 5—9 м з вонкавага. Схілы валоў умацоўваліся камянямі альбо забітымі ў зямлю драўлянымі палямі, як на гарадзішчы Імпільціс на тэрыторыі сучаснай Літоўскай Рэспублікі. Зрэдку выкарыстоўваліся каркасныя канструкцыі, якія маглі складацца з пакладзеных упоперак вала дубовых бярвенняў, як на гарадзішчы Пуня.[340]

У некаторых выпадках замкі акружаліся невялікімі равамі глыбінёй да 2 м і шырынёй у верхняй частцы да 4 м.[341]

На валах узводзіліся драўляныя сцены вышынёй да 4—5 м. Часцей за ўсё сцены мелі зрубную канструкцыю, хаця

---

334 Zabiela G. *Lietuvos medinės pilys.* Vilnius, 1995. 309, 311.
335 Ibid. 317. Баранаўскас Т. *Вытокі Літоўскай дзяржавы.* С. 107—109.
336 Zabiela G. *Lietuvos medinės pilys.* 312.
337 Ibid. 311.
338 Ibid. 313.
339 Ibid. 311.
340 Ibid. 312—313.
341 Ibid. 313.

знаходкі ямаў для слупоў сведчаць аб выкарыстанні і слупавых канструкцый.[342]

Некаторыя замкі мелі складаныя брамныя збудаванні, цудоўным узорам чаго з'яўляецца гарадзішча Імпільціс. Уваход на гарадзішча вёў праз тунэлепадобную браму даўжынёй 8 м, шырынёй 3 м, і вышынёй 2 м. Сцены тунэля былі складзеныя з двух радоў дубовых слупоў, столь — з падоўжных і папярочных бярвенняў, на якія быў насыпаны слой зямлі.[343] Як і на землях Русі, узвядзенне вежаў, акрамя надбрамных, не практыкавалася.

Для вырашэння пытання водазабеспячэння будаўнікі і абаронцы замкаў будавалі рэзервуары для вады. Адзін з такіх рэзервуараў памерамі 4,5 х 4 м, збудаваны на вільготным месцы, быў знойдзены ў знаёмым нам Апуоле.[344] Складскія памяшканні дазвалялі таксама забяспечыць харчам замкавую залогу, якая налічвала да 100 чалавек, на тэрмін да 2 месяцаў.[345]

Нягледзячы на агульнае развіццё фартыфікацыі, усё ж неабходна прызнаць, што ў канцы X—XI стст. баланс паміж абаронай і аблогай умацаваных пунктаў складаўся не на карысць абароны. Абложныя войскі паспяхова пераадольвалі супраціўленне абаронцаў крэпасцяў як самымі сучаснымі, так і традыцыйнымі спосабамі аблогі.

Самым распаўсюджаным з такіх традыцыйных спосабаў па-ранейшаму быў із'езд, ці нечаканы напад. Летапісы не паведамляюць аб доўгатэрміновых аблогах ці штурмах Ноўгарада Брачыславам і Усяславам ў 1021 і 1066 гг. адпаведна. У абодвух выпадках летапісцы абмяжоўваюцца лаканічным словам «заняў»,[346] што найбольш верагодна сведчыць аб із'ездзе. Менш удалымі спробамі із'езду былі напад Манамаха ў 1077 г. на Полацк, які ён толькі «ожгоша»,[347] а таксама наступны напад Усяслава ў 1078 г. на Смаленск, які ваяўнічы полацкі князь не ўзяў, хоць і «ожьже».[348] Найбольш жа яскравым прыкладам эфектыўнасці із'езду было падзенне перад усё тым жа Манамахам Менска ў 1084 г. Яго ўмацаванні,

---

342 Zabiela G. *Lietuvos medinės pilys.* 313—314.
343 История Литовской ССР. Вильнюс, 1978. С. 16.
344 Zabiela G. *Lietuvos medinės pilys.* 315.
345 Ibid. 315, 317.
346 Лаврентьевская летопись. Ст. 146, 166.
347 Тамсама. Ст. 247.
348 Тамсама. Ст. 248.

перанесеныя пасля разгрому 1067 г. з Менкі на Свіслач, збудаваныя ў набліжаным да круглага плане, абсталяваныя магутнай брамай, зладжанай паводле апошняга слова ваеннай тэхнікі, аказаліся цалкам бездапаможнымі перад нечаканым нападам, у ходзе якога Манамах «изъехахом городъ».[349] Такое лёгкае падзенне Ноўгарада, Менска і іншых першакласных крэпасцяў свайго часу прывяло даследчыкаў да высновы, што «вартавая служба была пастаўленая з рук вон кепска».[350]

Штораз усё большае распаўсюджанне набывала доўгатэрміновая аблога, якая выкарыстоўвалася пры вялікай зацікаўленасці нападнікаў ва ўзяцці крэпасці. Задачамі аблогі былі: блакада горада з мэтай прымусіць абаронцаў да здачы голадам і смагай, а таксама выкарыстанне інжынерных прыстасаванняў для пранікнення ва ўмацаванні. Добрай дэманстрацыяй тагачасных метадаў аблогі была ўдалая спроба Уладзіміра захапіць у 988 г. цэнтр візантыйскіх уладанняў у Крыме Херсанэс (Корсунь). Войска Уладзіміра заняло подступы да горад, перакрыўшы падвоз харчоў і амуніцыі па сушы. Усё ж і пасля гэтага горад працягваў трымацца. Тады Уладзімір загадаў пабудаваць прыспу да гарадской сцяны з намерам праз яе ўварвацца ў горад. Узвядзенне гэтага досыць простага збудавання ўжо сведчыла пра ўзнікненне элементаў інжынернага майстэрства. Але і гэтая небяспека была ліквідаваная гараджанамі пры дапамозе інжынерных метадаў. Яны вывелі падкоп пад прыспу і выносілі зямлю з-пад яе ў горад, што прывяло да яе асядання. Нарэшце, да поспеху аблогі прывяла здрада. Гараджанін выдаў русам месцазнаходжанне вадаправоду, які быў важнай крыніцай водазабеспячэння. Пасля яго пераняцця русамі херсанэсцы вымушаныя былі здацца.[351]

Цалкам рэальнай была і магчымасць здачы Уладзіміра-Валынскага ў 1099 г. Давыду Ігаравічу гараджанамі і залогай з берасцейцаў, пінян і выгашаўцаў, бо абложаныя хацелі сябе «предати не могуще глада терпети», ад чаго іх выратаваў ваявода Святаполка Ізяславіча Пуцята.[352] Пасля із’езду аблога была найбольш распаўсюджаным і эфектыўным спосабам узяцця крэпасцяў у дадзены час.

---

[349] Лаврентьевская летопись. Ст. 248

[350] Носов К. С. *Русские крепости и осадная техника...* С. 34.

[351] Лаврентьевская летопись. Ст. 109.

[352] Тамсама. Ст. 272.

Паступова адваёўваў сабе месца ў арсенале спосабаў пераадолення фартыфікацыі штурм. Менавіта з дапамогай штурму авалодала Менскам у 1067 г. войска Яраславічаў. Як адзначае летапіс, князі «придоша ко Меньску, и Меняне затворишася в граде». «Си же братья взяша Менескъ, и исекоша муже, а жены и дети вдаша на щиты».[353] Але яшчэ далёка не заўсёды штурм прыводзіў да поспеху. Няўдачай завяршыліся штурмы Усяславам Пскова ў 1065 г., нягледзячы на выкарыстанне ўпершыню зафіксаваных у беларускай гісторыі парокаў (абложных машын) супраць пскоўскіх персяў (сцен).[354] Дзейна выкарыстоўваў спосабы штурму пры спробе авалодання Уладзімірам-Валынскім у 1099 г. і Давыд Ігаравіч, войска якога да горада «часто приступаше». Адзін са штурмаў адбыўся «под вежеми», за якімі могуць хавацца штурмавыя навесы. Гараджане і залога актыўна абараняліся. «Овем же бьющим с града, и стреляющим межи собою, идяху стрелы акы дождь». Як бачым, асноўным спосабам штурму было імкненне падавіць праціўніка стральбой. У перастрэлцы загінуў кіраўнік абароны князь Мсціслаў Святаполчыч, які сам страляў па ворагах. «Мстиславу же хотящю стрелити внезапу, оударенъ бысть подъ пазуху стрелою на заборолехъ сквозе дску скважнею, и сведоша и, и на ту нощь оумре».[355] Але і тут штурмы не далі жаданага выніку. Як ужо адзначалася, пасля гібелі Мсціслава абаронцы лічылі галоўнай для сябе небяспекай менавіта аблогу, якая пагражала ім голадам.

Увогуле, перавага аблогі над абаронай часта прымушала абаронцаў здаваць крэпасці ў выпадках, калі нельга было разлічваць на знешнюю дапамогу. Недарэмна авалоданне нават буйнымі гарадамі ў вялікіх войнах канца X—XI стст. часта адбывалася без бою. Можна згадаць, што ўступленне Яраслава ў Кіеў у 1016 і 1019 адбылося мірным чынам. Без бою здалі Баляславу і Святаполку горад у 1018 г. і кіеўскія гараджане. Нягледзячы на магутныя ўмацаванні Полацка, у 1069 г. Ізяслаў Яраславіч папросту «прогна» Усяслава адтуль. Праз два гады такім жа самым чынам Усяслаў «выгна» з Полацка Ізяслававa сына Святаполка.[356] У 1096 г. Алег Свя-

---

353 Лаврентьевская летопись. Ст. 166.
354 Новгородская четвертая летопись. С. 122.
355 Лаврентьевская летопись. Ст. 271—272.
356 Тамсама. Ст. 174.

таславіч са смаленскім войскам, разбіўшы войска Расціслава Уладзіміравіча, мірным чынам заняў Мурам, пасля чаго яму «вдашася» і суздальцы, і растоўцы.[357] Нягледзячы на далейшы рост палітычнага, эканамічнага і ваеннага значэння гарадоў, асновай ваеннай магутнасці дзяржаў заставалася палявое войска.

## Г) Стратэгія і тактыка

Войны канца X–XI стст. вяліся гэтак жа часта і з такой самай лютасцю, як і ў ранейшыя часы. Добрым паказчыкам можа служыць запіс «Повести временных лет» пад 1029 г.: «Мирно бысть».[358] Погляд на мір, як на вартае асобнай згадкі становішча, лепей за любыя апісанні бітваў і аблог паказваў, якой частай з'явай была ў той час для людзей вайна. Усё ж у параўнанні з ранейшым часам яна набывала больш рацыянальны характар, вядома, у межах даступнай для вайны рацыянальнасці. Завяршэнне фармавання трывалых асноў дзяржаўнасці прывяло да выяўлення сталых дзяржаўных інтарэсаў, а з'яўленне з нетраў вайскова-дружыннага слою дзяржаўнага апарату вылучыла людзей, закліканых гэтыя інтарэсы вызначаць і абараняць. На другі план адышлі рабаўніцкія паходы па багацце і славу. Першаступеннае значэнне набылі інтуітыўна вынайдзеныя з'явы ўлады і магутнасці як асноўныя катэгорыі палітычнага жыцця грамадства.

У міждзяржаўных адносінах найважнейшым інтарэсам дзяржавы было нарошчванне ці падтрыманне сваёй абсалютнай ці адноснай магутнасці. Аб абсалютнай магутнасці гаворка ішла ў выпадку перавагі ці роўнасці сіл дзяржавы адносна суседзяў. У такім выпадку дзяржава імкнулася падпарадкаваць суседзяў, прымусіць іх выканаць сваю волю ці дамагчыся палітычных, эканамічных ці культурных саступак. Такім чынам ставілася да Полацкага княства Кіеўская дзяржава і гэтак жа сама паводзілі сябе і Кіеў, і Полацк у дачыненні да балцкіх земляў у Панямонні і Падзвінні. Адносны узровень сваёй магутнасці ў дачыненні да суседзяў імкнуліся захаваць меншыя і слабейшыя дзяржавы, асноў-

[357] Лаврентьевская летопись. Ст. 237.
[358] Тамсама. Ст. 149.

най задачай якіх было імкненне адстаяць *status quo* і не дапусціць паглынання мацнейшымі. Такая лінія паводзін была характэрнай для балтаў у дачыненні да Русі і для Полацка ў дачыненні да Кіева.

Ва ўнутранай палітыцы, дзе асноўнымі дзейнымі суб'ектамі былі розныя групоўкі кіруючых вярхушак, ставілася адзіная мэтадасягненне аднаасобнай улады ў дзяржаве і адхілення ад яе сваіх супернікаў.

Для забеспячэння як знешне, так і ўнутрыпалітычных інтарэсаў часта абіраліся ваенныя сродкі. У адпаведнасці з палітычнымі мэтамі выпрацоўваліся вялікая стратэгія і ваенная стратэгія. Вялікая стратэгія яшчэ знаходзілася ў зародкавым стане, але хуткаму яе развіццю спрыяла тая з'ява, што правіцель быў адначасова і палкаводцам, што дазваляла суцішыць супярэчнасці паміж палітыкай і ваенным майстэрствам. Вялікая стратэгія не павінна была абмяжоўвацца пытаннямі вайны як такой, а мусіла забяспечваць агульны станоўчы вынік вайны. Такім станоўчым вынікам быў мір, заключаны на як мага лепшых умовах.[359] Для гэтага ў рамках вялікай стратэгіі правіцелі інтуітыўна каардынавалі ўсе даступныя ім ваенныя і неваенныя рэсурсы, выкарыстоўваючы «ўсю сілу і моц фінансавага, дыпламатычнага, камерцыйнага і, не апошняга па важнасці, ідэалагічнага ціску».[360] Найбольш актыўна з гэтага арсеналу побач з чыста ваеннымі рэсурсамі правіцелямі канца X–XI стст. выкарыстоўвалася эканамічная моц, тэрыторыя іх дзяржаў і людскія рэсурсы, а таксама палітычныя саюзы.

Ваенная стратэгія канцэнтравалася на дасягненні ваеннай перамогі. У большасці выпадкаў яна прымала простыя формы і зводзілася да спробаў знішчыць войска праціўніка ў генеральнай бітве. Ваенная перамога звычайна пазбаўляла пераможанага магчымасцяў далей адстойваць свае інтарэсы і аддавала ўладу ў рукі пераможцы. Так дасягаліся палітычныя мэты вайны. Прамая стратэгія часта выкарыстоўвалася ў знешніх войнах і амаль заўсёды ў войнах міжусобных, дзе захоп улады ажыццяўляўся выключна праз авалоданне сталіцай ці іншым ключавым горадам, што абмяжоўвала выбар стратэгічных прыёмаў. Напрыклад, *усе* дзеянні ўдзель-

359 Лиддел-Гарт Б. *Стратегия непрямых действий.* С. 403.
360 Тамсама. С. 368–369.

нікаў міжусобнай вайны 1015–1019 гг. зводзіліся да спробаў знішчыць войска праціўніка, каб затым паставіць пад свой кантроль Кіеў.

Разам з тым сярод палітыкаў і палкаводцаў ужо з'явілася разуменне таго, што імкненне выграць вайну ў адной бітве было найменш эфектыўным відам стратэгіі, які патрабаваў канцэнтрацыі ўсіх рэсурсаў для перамогі і хаваў у сабе небяспеку іх поўнай страты і немагчымасці працягу барацьбы ў выпадку няўдачы. Да таго ж, падрыхтоўка да генеральнай бітвы давала магчымасць праціўніку таксама падрыхтавацца да яе належным чынам і сабраць свае рэсурсы ў кулак. Тагачасныя палкаводцы пачыналі разумець, што «прамое наступленне павялічвае ўстойлівасць праціўніка як у фізічным, так і псіхалагічным дачыненні, што прыводзіць да павелічэння сілы яго супраціўлення».[361] У сувязі з гэтым пачалі ўжывацца метады непрамой стратэгіі, якія мелі больш тонкі характар і забяспечвалі агульную перамогу ў вайне з меншым напружаннем рэсурсаў і меншай рызыкай. Непрамая стратэгія зводзілася да дзеянняў у нечаканым для праціўніка кірунку, па лініі найменшага супраціўлення з магчымасцю стварэння пагрозы некалькім аб'ектам адначасова.[362]

Непрамая стратэгія найчасцей выкарыстоўвалася ў войнах з абмежаванымі мэтамі. Часам правіцелі прыходзілі да высновы, што «разгром праціўніка з'яўляецца для яго недадольнай задачай ці не апраўдвае затрачаных намаганняў і што інтарэсы ваеннай палітыкі могуць быць больш надзейна забяспечаныя захопам тэрыторыі, якую ўрад можа захаваць пад сваім кантролем ці выкарыстаць у якасці козыра пры вядзенні мірных перамоваў».[363] Такая стратэгія абмежаваных мэтаў была больш характэрнай для слабейшай дзяржавы ў супрацьстаянні з дзяржавай больш магутнай. Такой стратэгіяй эфектыўна карысталіся полацкія князі ў войнах супраць Кіеўскай дзяржавы. Імі ж выкарыстоўваўся і іншы від стратэгіі абмежаваных мэтаў, сутнасцю якой было «чаканне перамены ў суадносінах сіл, перамены, якой часта дамагаюцца шляхам знясілення сіл праціўніка ў выніку на-

[361] Лиддел-Гарт Б. *Стратегия непрямых действий.* С. 374.
[362] Тамсама. С. 384.
[363] Тамсама. С. 367.

нясення яму дробных уколаў замест рызыкоўных магутных удараў».[364] Такія дробныя ўколы найчасцей прымалі выгляд спусташэння асобных мясцовасцяў з вывадам у палон іх жыхароў. Гэтыя ўдары не з'яўляліся рабаўніцтвам дзеля рабаўніцтва, а рабілі пэўны ўнёсак у дасягненне агульнай мэты вайны: змяненне балансу магутнасці на сваю карысць.

Варта сказаць, што ваенная стратэгія абмежаваных мэтаў з яе дзеяннямі супраць гарадоў, сельскіх мясцовасцяў і мірнага насельніцтва змяншала значэнне чыста ваенных фактараў вялікай стратэгіі і вымушала правіцеляў надаваць большую ўвагу іншым яе фактарам і пралічваць іх асабліва асцярожна. Захоп ці спусташэнне варожых тэрыторый з мэтай атрымання козыру для перамоў, шантажу ці дыверсіі вёў да падобных дзеянняў у адказ з варожага боку. Свае населеныя пункты, землі і насельніцтва станавіліся рэсурсам для своеасаблівага шахматнага «размену» з ворагам. Князі лёгка расставаліся з маёмасцю і жыццём сваіх падданых, калі гэта дапамагала ім дасягнуць агульнай мэты ў вайне. Будучы катэгорыяй досыць суб'ектыўнай, поспех у вайне выглядаў па-рознаму для князя з вышыні яго цераму і селяніна на папялішчы ягонай вёскі. Княскае меркаванне, аднак, звычайна брала верх.

Таксама неабходна адзначыць агульнае панаванне наступальных формаў стратэгіі. Незалежна ад выбару яе прамых ці непрамых відаў, палкаводцы імкнуліся захопліваць ініцыятыву і дзейнічаць наступальна. Нават абарончыя войны з абмежаванымі мэтамі, такія як войны Полацка супраць Кіева, вяліся наступальна, часта з перанясеннем баявых дзеянняў на тэрыторыю праціўніка.[365]

Паколькі імкненне да бою было асноўнай формай стратэгіі, у ходзе войнаў развіваліся стратэгічныя прыёмы, якія дазвалялі ўступіць у генеральную бітву ў спрыяльным становішчы альбо ўскладніць становішча праціўніка. Распаўсюджаным прыёмам было пераразанне камунікацый праціўніка, якое зводзілася да перакрыцця шляхоў падыходу дадатковых вайсковых кантынгентаў. Так, узяцце Яраславічамі Менска ў 1067 г. блакавала злучэнне полацкага войска з літоўцамі, што і магло стаць адной з прычын паражэння

[364] Лиддел-Гарт Б. *Стратегия непрямых действий.*
[365] Разин Е. А. *История военного искусства.* Т. 2. С. 104.

палачан на Нямізе. Пераразанне ліній забеспячэння яшчэ не мела крытычнага значэння, бо сярэдняга памеру арміі XI ст. маглі забяспечваць сябе за кошт рабаўніцтва прылеглых тэрыторый і доўгі час апераваць аўтаномна ад баз.

Яшчэ адным стратэгічным прыёмам было манеўраванне з мэтай вымусіць праціўніка павярнуць фронт. У паходзе са смаленскім войскам на Растоўскую зямлю ў 1096 г. Алег Святаславіч вымусіў Мсціслава Уладзіміравіча ўступіць у бой з ім на рацэ Калокшы з фронтам, павернутым на 90°, гаворка аб чым пойдзе ніжэй.

У сувязі са з'яўленнем складаных стратэгічных прыёмаў адбывалася развіццё і ўскладненне тактыкі. З мэтай паспяховага стратэгічнага манеўравання вялікае значэнне мела дакладнае і своечасовае з'яўленне войска ў прызначаным пункце. Неабходнай умовай гэтага быў хуткі і арганізаваны марш, у ходзе якога конніца звычайна рухалася сухапутнымі шляхамі, а пяхота магла ісці пешшу ці па рацэ на лоддзях, як у паходзе Яраслава ў Мазовію ў 1041 г.[366] ці ў паходзе Яраславічаў і Усяслава на торкаў у 1060 г.[367] Для здабыцця звестак аб праціўніку арганізоўвалася выведка.[368] Каб пазбегнуць нечаканага нападу праціўніка, выстаўлялася варта. У «Павучанні» Уладзімір Манамах раіў сынам: «И сторожи сами наряживаите, и ночь отвсюду нарядивше около вои тоже лязите».[369]

Далейшае развіццё атрымалі і спосабы вядзення бою. Значна ўскладніліся баявыя парадкі войскаў. Замест маналітнага фалангападобнага строю войскі зведалі падзел па фронту і ў глыбіню на асобныя тактычныя адзінкі, кожная з якіх магла выконваць самастойныя баявыя задачы. Перадумовай было ўзрастанне ролі дружыны, прадстаўнікі якой выконвалі функцыі камандзіраў і маглі забяспечыць прафесійнае кіраванне войскамі. Далейшае шпаркае развіццё конніцы адкрыла новыя магчымасці манеўравання тактычных адзінак на полі бою.

Галоўная лінія баявога парадку рускіх войскаў у канцы X–XI стст. звычайна складалася з трох частак: цэнтру, пра-

---

366 Лаврентьевская летопись. Ст. 153.
367 Тамсама. Ст. 163.
368 Разин Е. А. *История военного искусства.* Т. 2. С. 61.
369 Лаврентьевская летопись. Ст. 246.

вага і левага крылаў. У залежнасці ад пастаўленых задач і сітуацыі пяхота і конніца маглі спалучацца розным чынам. Пяхота апалчэння магла знаходзіцца ў цэнтры, тады як конныя княскія дружыны знаходзіліся на флангах. Такі баявы парадак меў сваёй мэтай узмацненне флангаў.[370] Падобны строй забяспечыў перамогу Мсціслава Уладзіміравіча над Яраславам у бітве пры Ліствене ў 1024 г.[371] У іншых выпадках вырашэнне баявых задач магло дасягацца камбінаваным строем пяхоты і конніцы ў кожнай тактычнай адзінцы. У некаторых выпадках конныя атрады маглі спешвацца адпаведна з абставінамі. Падзел войска па фронту дазваляў больш гнутка рэагаваць на дзеянні праціўніка і эфектыўна супрацьстаяць ягоным спробам абысці флангі і, у сваю чаргу, пагражаць ягоным флангам. Ускладненне баявога парадку патрабавала добрага ўзаемадзеяння паміж яго часткамі. У выпадку раз'яднанасці і дрэнна арганізаванага кіравання існавала пагроза паражэння частак войска паасобку. У бітве з полаўцамі пад Трэполем у 1093 г. баявыя парадкі рускіх войскаў складаліся менавіта з трох частак. Пераяслаўскі князь Расціслаў Усеваладавіч займаў цэнтр, тураўскі і кіеўскі князь Святаполк Ізяславіч стаяў на правым крыле, чарнігаўскі князь Уладзімір Усеваладавіч Манамах – на левым. Карыстаючыся адсутнасцю каардынацыі паміж князямі, полаўцы «налегша первое на Святополка и взломиша полкъ его», хаця ён «стояше крепко», і вымусілі ягоныя атрады да ўцёкаў. Затым яны па чарзе разбілі Манамаха і Расціслава, які падчас адступлення ўтапіўся ў рацэ Стугне на вачах брата.[372]

Падзел войска ўглыбіню часам прадугледжваў вылучэнне передавога атрада, задачай якога была разведка боем і па магчымасці расстройванне парадкаў праціўніка да падыходу асноўных сіл. У паходзе на радзімічаў у 984 г. дзеянні атрада пад камандаваннем Воўчага Хваста, высланага Уладзімірам «передъ собою», былі настолькі ўдалымі, што ён разбіў радзіміцкае войска без дапамогі асноўных сіл.[373] Для нанясення вырашальнага ўдару вылучаўся агульны рэзерв, які

---

[370] Разин Е. А. *История военного искусства.* Т. 2. С. 62.
[371] Лаврентьевская летопись. Ст. 148.
[372] Тамсама. Ст. 219–220.
[373] Тамсама. Ст. 83–84.

звычайна знаходзіўся ў засадзе і выкарыстоўваўся для заходу ў тыл праціўніку. Удар атрада Эймунда ў «адкрыты шчыт» (г. зн. у тыл) праціўніку ў бітве пад Любечам у 1015 г. вырашыў яе зыход на карысць Яраслава.[374]

Падзеленае на самастойныя тактычныя адзінкі па фронту і ў глыбіню войска адрознівалася ўстойлівасцю ў абароне, дынамічнасцю, манеўранасцю і здольнасцю нарошчваць сілу ўдару ў атацы. Баі дадзенага часу вылучаліся працягласцю і ўпартасцю. Вырашаліся яны кровапралітнай рукапашнай сутычкай, якая працягвалася да моманту, пакуль адзін з праціўнікаў не расстройваў свае парадкі і не кідаўся наўцёкі. Змаганне кідальнай зброяй перажывала заняпад і вялікага ўплыву на ход бітваў не мела.

Для лепшага разумення ваеннага майстэрства таго часу будзе варта разгледзець яго развіццё ў некаторых войнах XI ст., аб якіх мы ўжо маем дакладныя і падрабязныя звесткі і якія наўпрост звязваюцца з беларускімі землямі. Перш за ўсё, мы звернем нашу ўвагу на **развіццё ваеннага майстэрства ў вайне Святаполка з Яраславам за ўладу ў Кіеве ў 1018–1019 гг.** Мы свядома абралі менавіта гэты перыяд міжусобнай вайны 1015–1019 гг. на Русі па наступных прычынах. Па-першае, у адрозненне ад падзей 1015–1017 гг., якія дапускаюць падвойнае тлумачэнне ў залежнасці ад даверу рускім летапісам ці «Пасме аб Эймундзе», мы валодаем больш ці менш дакладнай інфармацыяй аб ім, заснаванай на несупярэчлівых звестках рускіх летапісаў, Гала Ананіма і Тытмара. Па-другое, перыяд гэты мае найбольшае дачыненне непасрэдна да беларускіх земляў у сувязі з удзелам у барацьбе тураўскага князя Святаполка. Сама бітва на Бугу паміж Святаполкам, ягоным саюзнікам Баляславам і Яраславам, як лічаць беларускія даследчыкі, магла адбыцца каля Берасця.[375]

У 1018 г. барацьба паміж Яраславам і Святаполкам з Баляславам ізноў абвастрылася. У 1017 г. Яраслаў, разбіўшы печанегаў, умацаваў сваю ўладу ў Кіеве. У ходзе кампаніі на захадзе ён беспаспяхова аблажыў Берасце, але, магчыма, здолеў узяць Тураў. Гэтыя падзеі прывялі да памяншэння магчымасцяў Баляслава і Святаполка ўплываць на станові-

[374] Прядь об Эймунде Хрингссоне. С. 109.
[375] Иллюстрированная хронология истории Беларуси. С. 23.

шча на Русі, а таксама тое, што Яраслаў не мог змірыцца са стратай пабужскіх земляў. Каб канчаткова замацаваць за сабой Берасце і дапамагчы свайму зяцю Святаполку сесці на кіеўскі стол і такім чынам паставіць пад свой уплыў рускую палітыку, Баляслаў прадпрыняў паход на Русь. Ягонае войска налічвала 4–5 тысяч ваяроў і складалася з палякаў, немцаў, венграў, печанегаў і тураўцаў. Яраслаў з войскам русі, славен і варагаў агульнай колькасцю 6–8 тысяч рушыў праціўніку насустрач, каб перашкодзіць спусташэнню сваёй тэрыторыі. Абодва войскі ў ліпені 1018 г. сустрэліся на Валыні і спыніліся на розных берагах Буга. Такім чынам, абодва палкаводцы прытрымліваліся прамой стратэгіі і імкнуліся вырашыць вынік вайны ў генеральнай бітве. Больш за тое, Тытмар паказвае, што паміж бакамі існавала дамоўленасць аб уступленні ў бой.[376]

Тым не менш, войскі правялі ў чаканні абапал ракі некалькі дзён да **22 ліпеня**. У гэты дзень паміж ваярамі абодвух бакоў пачалася слоўная сварка. Гал Анонім называе яе завадатарамі слуг і збраяносцаў русінаў, якія сталі абражаць палякаў па прыкладу свайго князя, які напярэдадні назваў Баляслава кабаном.[377] Рускі летапісец ускладае віну на Яраслававага ваяводу Буды, які паабяцаў працяць Баляславу капʼём яго тоўстае чэрава.[378] Так ці іначай, **бітва на Бугу** пачалася з гэтай сваркі.

**Першым яе этапам** была завязка бою. Усе крыніцы пагаджаюцца з тым, што ініцыятыва належала палякам. Паводле Гала Аноніма, польская чэлядзь, не вытрымаўшы абразаў і стральбы ад русінаў, пахапала зброю польскіх рыцараў, якія спалі пасля абеду, пераплыла раку і напала на русінаў. «Повесть временных лет» кажа, што Баляслаў у адказ на абразы першы сеў на каня і перасек раку ўброд. За ім рушылі і ягоныя ваяры. Цяжка аддаць перавагу адной крыніцы, але можна думаць, што калі элемент самавольства і прысутнічаў у дзеяннях палякаў, Баляслаў хутка ўзяў яго пад свой кантроль і ўвёў ход бою ў патрэбнае яму рэчышча. Тытмар прама кажа, што Баляслаў хутка пераправіўся цераз раку, «папрасіўшы саюзнікаў падрыхтавацца і паспя-

---

376 Chron. Tietm. VIII., 31. C. 68.
377 Gall. Anon. 10. C. 40.
378 Лаврентьевская летопись. Ст. 143.

шацца». Польскія ваяры і чэлядзь, якія першымі пераправіліся цераз Буг, выканалі ролю перадавога атрада, які не толькі выведаў боем сітуацыю, але і ўскладніў пастраенне баявых парадкаў русінаў, адразу ж падарваўшы іх шанцы на перамогу.

**Другім этапам бітвы** стаў бой галоўных сіл. Па словах Гала Аноніма, «Баляслаў і ўсё ягонае войска.., пастроіўшыся радамі, навалілася на ворагаў, якія ўцякалі з усіх бакоў; такім чынам, не адна толькі чэлядзь здабыла славу і не адна яна была віноўніцай праліцця крыві». Русіны не здолелі арганізавана сустрэць наступ асноўных сіл палякаў. Яраслаў «не оутягну исполчитися». Поўнасцю баявыя парадкі пастроіць так і не ўдалося. Больш за тое, паколькі, па звестках, Тытмара парадак мусіў складацца з асобных атрадаў, ва ўмовах нечаканага наступу палякаў сувязь і ўзаемадапамога паміж імі была страчана. Русіны саступілі праціўніку «ў першым жа сутыкненні». «Там жа забіта было шмат уцекачоў і невялікая колькасць пераможцаў».[379] Яраслаў з трыма спадарожнікамі ўцёк у Ноўгарад.

Нечаканасць нападу палякаў, удалыя дзеянні іх перадавых сіл і агульная наступальная тактыка дапамаглі ім атрымаць рашучую перамогу. Наадварот, падзел кіеўскага войска па фронту, які мусіў забяспечыць устойлівасць і манеўранасць баявога парадку, у спалучэнні з кепскім камандаваннем і негатоўнасцю да бою прывёў да паражэння русінаў.

Не трацячы часу на спусташэнне краіны, Святаполк з Баляславам рушылі на Кіеў, які і занялі 14 жніўня. Святаполк сеў на кіеўскі стол, Баляслаў жа рушыў дадому, заняўшы чэрвенскія гарады. Тым часам наўгародцы ўтрымалі Яраслава ад уцёкаў у Скандынавію і, сабраўшы сродкі, дапамаглі яму наняць варажскіх ваяроў. З гэтым войскам Яраслаў і рушыў на Кіеў. Хутчэй за ўсё, колькасць ягоных войскаў перасягала колькасць войска Святаполка. Той не мог больш разлічваць на падтрымку Баляслава, які не меў больш інтарэсу да падзей на Русі, дабіўшыся ўсіх сваіх мэтаў. Знясіленая ж доўгімі войнамі паўднёвая Русь пры ўсёй сімпатыі да Святаполка не магла выставіць шмат ваяроў. Таму Святаполк не выступіў насустрач Яраславу, а быў вымуша-

[379] Chron. Tietm. VIII., 31. C. 68.

ны звярнуцца па дапамогу да печанегаў. Апошняя сустрэча праціўнікаў адбылася на рацэ Альце ў пачатку 1019 г. Надзвычай кровапралітная бітва працягвалася ад ранку да вечару. Войскі тройчы сыходзіліся паміж сабой, што сведчыць аб выкарыстанні глыбокіх баявых парадкаў, наяўнасці рэзерваў і добрым узроўні кіравання войскамі з абодвух бакоў. Нарэшце перавага схілілася на бок Яраслава. Войска Святаполка пабегла з поля бою, а сам ён уцёк.[380] Міжусобная вайна завяршылася перамогай Яраслава.

Перамога ў вайне была дасягнутая з дапамогай прамой стратэгіі, скіраванай на вырашэнне агульнага зыходу ў генеральнай бітве. Вынік бітвы вырашаўся колькасцю войскаў, іх вывучкай і стойкасцю, тактычным майстэрствам палкаводцаў і ўдалым камандаваннем. Яраслаў дасягнуў перамогі дзякуючы прыцягненню вялікіх людскіх і эканамічных рэсурсаў Наўгародскай зямлі, нягледзячы на шэраг цяжкіх тактычных памылак і паражэнне ў бітве на Бугу.

У той час як міжкняская барацьба за ўладу ў Кіеве вялася досыць простлінейна і пераможца выяўляўся на палях крывавых бітваў, супрацьстаянне Полацкага княства і Кіеўскай дзяржавы ў XI ст. мела складанейшы характар, які спрыяў выкарыстанню непрамых формаў ваеннага майстэрства. Найдалей сягнула **развіццё стратэгіі ў войнах Усяслава Брачыславіча з Кіеўскай дзяржавай у 1065–1071 і 1077–1078 гг.** Пры дапамозе нестандартных, але надзвычай эфектыўных ходаў Усяслаў дасягнуў сваіх знешнепалітычных мэтаў і забяспечыў бяспеку і мір Полацкага княства на доўгія дзесяцігоддзі. Як мы ўжо адзначалі, знешнепалітычная пагроза Полацкаму княству з боку Кіеўскай дзяржавы ўзнікла пасля смерці ў 1054 г. кіеўскага князя Яраслава Уладзіміравіча, палітыка якога, накіраваная на саюз з Полацкам, забяспечвала прасоўванне інтарэсаў абедзьвюх дзяржаў і агульную бяспеку ў рэгіёне. Трыумвірат ягоных сыноў Ізяслава, Святаслава і Усевалада з канца 1050-х гадоў пачаў праводзіць агрэсіўную знешнюю палітыку з мэтай усталявання сваёй неабмежаванай улады на Русі і падпарадкавання яе суседзяў, аб чым сведчылі падзел Смаленскай зямлі ў 1060 г., паходы на голядзь у 1058 г., солаў у 1060 г. і недапуш-

[380] Лаврентьевская летопись. Ст. 143–144.

чэнне да ўлады ў Ноўгарадзе Расціслава Уладзіміравіча ў 1064 г. Агрэсіўныя памкненні Яраславічаў пагражалі і Полаччыне. Такім чынам, задачай полацкай вярхушкі на чале з Усяславам было захаванне незалежнасці Полацкага княства і падтрыманне балансу сіл з Кіеўскай дзяржавай ва ўмовах надыходзячага знешнепалітычнага крызісу. Як і большасць крызісаў таго часу, ён меў мала шанцаў быць развязаным з дапамогай чыста палітычных сродкаў і хутка перайшоў у ваенную стадыю.

Ва ўмовах тэрытарыяльнай, дэмаграфічнай і вайсковай перавагі Кіева Усяслаў мог прытрымлівацца прамой стратэгіі пазіцыйнай абароны, якая б зводзілася да імкнення даць бой варожаму войску на сваёй тэрыторыі, і абароны крэпасцяў. Аднак сумны досвед Рагвалода сведчыў, што пасіўная прамая стратэгія не вырашала ўскладзеных на яе задач і дазваляла толькі адтэрмінаваць агульнае паражэнне, але не пазбегнуць яго. Другім варыянтам быў пачатак актыўных дзеянняў перад тым, як баланс сіл зменіцца на карысць Яраславічаў, каб прадухіліць іх удар па Полацку. Усяслаў абраў менавіта другі варыянт, ажыццявіўшы стратэгію, выдатна апісаную Бэзілам Лідэл-Хартам. «Неагрэсіўная дзяржава можа дасягнуць сваёй мэты проста прымусіўшы агрэсара адмовіцца ад захопу, пераканаўшы яго, што «гульня не вартая свечак». Перамога такой краіны фактычна дасягаецца расстройствам планаў агрэсіўнага боку на дасягненне перамогі. <...> На першы погляд можа падацца, што абарона з'яўляецца найбольш эканомным метадам вядзення вайны. Але гэта значыць, што давялося б прытрымлівацца пазіцыйнай абароны, якая, як сведчыць досвед гісторыі, служыць надзвычай ненадзейным сродкам. Эканомія сіл і поспех лепш за ўсё забяспечваюцца спалучэннем абарончых і наступальных дзеянняў, заснаваных на высокай рухавасці, якая дае магчымасць наносіць хуткія магутныя контрудары».[381]

Сродкам ажыццяўлення такой стратэгіі быў абраны прэвентыўны ўдар па паўночных уладаннях Кіеўскай дзяржавы. Удар гэты меў абмежаваныя мэты. З яго дапамогай Усяслаў не імкнуўся нанесці рашучае ваеннае паражэнне Яраславічам, што было блізкім да немагчымага. Меркава-

---

381 Лиддел-Гарт Б. *Стратегия непрямых действий*. С. 405–406.

ны ўдар на поўнач мусіў пахіснуць палітычную стабільнасць Кіеўскай дзяржавы, пашкодзіць яе гандлю на волхаўскім адгалінаванні шляху з Вараг у Грэкі і прымусіць яе раздрабіць свае ваенныя рэсурсы на вайну з Полацкам, падаўленнем мяцяжу Расціслава ў Тмутаракані і барацьбой з полаўцамі. Створаныя такім чынам цяжкасці мусілі паслабіць Кіеўскую дзяржаву да ўзроўню, які б зрабіў немагчымым паглынанне ёй Полацка. З ваеннага пункту гледжання ўдар на поўнач палягчаўся вялізнымі памерамі кіеўскіх уладанняў, што рабіла іх эфектыўную абарону амаль немагчымай. Падрыхтоўка яго таксама патрабавала дакладнага ўліку фактараў вялікай стратэгіі у дадатак да стратэгіі ваеннай. Адным з такіх фактараў былі знешнепалітычныя складанасці Яраславічаў на поўдні і паўднёвым усходзе з Расціславам і полаўцамі і іх прыхаваныя ўнутраныя супярэчнасці. Іншым фактарам быў разлік наяўных рэсурсаў Полаччыны, многія з якіх, як, напрыклад, тэрыторыя і насельніцтва, выкарыстоўваліся пасіўна, у якасці разменнай карты, і спусташаліся ворагам у адказ на такія ж дзеянні з боку палачан. Шанцы такой стратэгіі на поспех пацвярджаліся гістарычным досведам Брачыслава, які дамогся ад Яраслава саступкі Віцебска і Усвята пасля ўдалага нападу на Ноўгарад у 1021 г.

Першым крокам Усяслава да ажыццяўлення абранай стратэгіі быў няўдалы напад на Пскоў у 1065 г. Кірунак нанясення ўдару быў абраны ўдала. Паколькі Пскоў быў далёкай паўночна-заходняй перыферыяй кіеўскіх уладанняў, напад на яго быў нечаканым і не прыводзіў Усяслава ў прамое сутыкненне з войскамі Яраславічаў. Як то здараецца, стратэгічная задумка Усяслава не ўдалася з-за ўздзеяння тактычных фактараў: непрыступнасці пскоўскіх умацаванняў і мужнасці абаронцаў. Аднак перамога над наўгародскім войскам на рацэ Чарэсе на зваротным шляху кампенсавала полацкаму князю гэтую няўдачу і стварыла перадумовы для яго далейшых аперацый на поўначы. У наступным годзе ўдар быў перанесены з Пскова на Ноўгарад. У гэтай аперацыі можна вылучыць наступныя моманты развіцця стратэгічнага майстэрства. Па-першае, ізноў адыграў сваю ролю фактар аддаленасці ад ядра Кіеўскай дзяржавы, што дазваляла дзейнічаць нечакана і не ўступаць у прамы кантакт з паўднёварускім войскамі. Па-другое, перанос кірунку ўдару

дазваляў знізіць рызыку сустрэчы з падрыхтаваным ужо праціўнікам. Па-трэцяе, пасля паражэння наўгародцаў на Чарэсе і выгнання імі непапулярнага князя Мсціслава Ізяславіча, Усяслаў мог разлічваць на мінімальнае супраціўленне з іх боку. Узяцце Ноўгарада ў 1066 г. цалкам пацвердзіла ягоныя разлікі. Такім чынам, ударыўшы па паўночнай ускраіне Кіеўскай дзяржавы, Усяслаў нанёс шкоду яе палітычнай сістэме, парушыў нармальнае функцыянаванне эканомікі і пазбавіў яе значнай часткі ваенных рэсурсаў.

У наступным 1067 г. полацкаму князю давялося арганізоўваць абарону сваёй дзяржавы ад прамога наступлення войскаў Яраславічаў, але рабіў ён гэта ўжо ў больш спрыяльных абставінах. Наступныя падзеі яскрава гэта давялі. Спаліўшы Менск, Яраславічы адужалі Усяслава на Нямізе, але рашучай перавагі дабіцца не змаглі. Наадварот, ягонае тактычнае паражэнне павярнулася стратэгічнай перамогай. Зважаючы на цяжкія страты абодвух бакоў, Яраславічы вымушаныя былі пайсці на мірныя перамовы, чаго Усяслаў і дамагаўся. Але ўжо амаль дасягнутая мэта вайны аддалілася на пэўны час. Усяслаў быў арыштаваны Яраславічамі падчас перамоў, вызвалены з кіеўскай турмы воляй народнага паўстання ў 1068 г., зроблены кіеўскім князем і страціў Полацк у 1069 г. У тым жа годзе ён прадпрыняў чарговую ваенную акцыю, якая насіла яскрава непрамы характар. Замест спробы вяртання ў Полацк, Усяслаў у разліку на нечаканасць ізноў атакаваў Ахілесаву пяту Кіеўскай дзяржавы – Ноўгарад, на гэты раз з войскам важан. Пасля паражэння ён быў палонены наўгародцамі, а затым імі адпушчаны ці то з карыслівых разлікаў, ці то з-за нязгоды з яго здрадлівым арыштам Яраславічамі ў 1067 г. Нарэшце, мэта вайны была дасягнутая ў 1071 г. выгнаннем кіеўскага стаўленіка Святаполка Ізяславіча з Полацка, чаму не магло перашкодзіць нават тактычнае паражэнне Усяслава ад Яраполка Ізяславіча пад Галоцічаскам. Пагроза незалежнасці Полацка з боку Кіеўскай дзяржавы была ліквідаваная, а баланс сіл паміж імі захаваўся.

Гэтыя поспехі былі замацаваныя ў ходзе вайны 1077–1078 гг. На гэты раз пагрозы незалежнасці Полацкага княства з боку паслабленай унутранымі звадамі Кіеўскай дзяржавы ўжо бадай не існавала. Ізяслаў і Усевалад Яраславічы,

якія пасля смерці свайго брата Святаслава падзялілі паміж сабой і сваімі сынамі кіеўскія уладанні, сабралі супраць сябе кааліцыю з незадаволеных перадзелам улады князёў Барыса Вячаславіча, Алега і Рамана Святаславічаў. Таму палітычнай мэтай вайны для Усяслава было ўжо не проста захаванне полацкай незалежнасці, але змяненне балансу сіл з Кіеўскай дзяржавай на сваю карысць. Гэтай мэты Усяслаў імкнуўся дасягнуць як ваеннымі, так і палітычнымі спосабамі. Пры абмежаваных палітычных мэтах ваенная стратэгія ізноў звялася да абмежаваных дзеянняў і набыла непрамы характар. Інструментам яе ізноў былі абраныя напады на паўночныя ўскраіны Кіеўскай дзяржавы. Аднак гэта былі ўжо не буйнамаштабныя ваенныя экспедыцыі з мэтай захопу буйных гарадоў, а невялікія, хоць і балючыя спусташальныя паходы. Можна нават меркаваць, што ў агульнай карціне вялікай стратэгіі гэтыя ўласна ваенныя метады адыгрывалі другасную ролю. Яны мусілі выконваць функцыю дыверсій, якія адцягвалі рэсурсы Кіеўскай дзяржавы ад вырашэння найважнейшых праблем з мяцежнымі князямі на поўдні, ад якіх і зыходзіла галоўная пагроза Ізяславу і Усеваладу. Палітычнае спрыянне мяцежным князям было найважнейшым элементам вялікай стратэгіі Усяслава.

Вельмі верагодна, Усяслаў распачаў баявыя дзеянні паходам на Ноўгарад у 1077 г., што прымусіла смаленскага князя Уладзіміра Манамаха, сына Усевалада, рушыць на дапамогу наўгародскаму князю Глебу Святаславічу, а ўлетку разам з бацькам напасці на Полацк. Наступнай зімой Манамах здзейсніў напад на Полацк, папаліўшы вакольны горад, але самога горада не ўзяў. У той самы час Усяслаў даў прытулак князю-выгнанцу Барысу Вячаславічу, затым выправіўшы яго ў Тмутаракань да Рамана Святаславіча. Такім чынам, вялікая частка сіл Яраславічаў была адцягнутая на поўнач, што дазволіла мяцежным князям бесперашкодна сабраць свае сілы, разбіць Усевалада на Сожыцы і ўзяць Чарнігаў. Іх ваенная актыўнасць у спалучэнні з палітычнай падтрымкай Усяслава і ягонымі дзеяннямі супраць Ноўгарада паставілі Яраславічаў на мяжу поўнай катастрофы, ад якой іх выратавала толькі цяжкая перамога на Няжацінай ніве ў 1078 г., здабытая цаной гібелі Ізяслава. Пакуль сілы Яраславічаў былі скутыя на поўдні, Усяслаў з мэтай раз-

віцця дасягнутага поспеху прадпрыняў яшчэ адзін удар, гэтым разам на Смаленск. Горад узяты не быў, але і пагоня Манамаха за Усяславам не дала выніку. Смаленскі князь вымушаны быў абмежавацца спусташэннем полацкіх уладанняў, пасля чаго баявыя дзеянні сціхлі на некалькі гадоў. Беручы пад увагу агульнае паслабленне Кіеўскай дзяржавы, можна зрабіць выснову, што задача змянення балансу сіл на сваю карысць была Усяславам паспяхова дасягнутая. Аб эфектыўнасці ягоных дзеянняў пры вельмі нязначных затратах уласных сіл і рэсурсаў і малым розгаласе можа сведчыць той факт, што ягоныя паходы ў 1077–1078 гг. нават не адзначаны ў летапісах і згадваюцца толькі ў «Павучанні» Манамаха, якому давялося найбольш блізка пазнаёміцца з падступнымі стратэгічнымі прыёмамі полацкага князя.

На працягу наступных 23 гадоў кіравання Усяслава быў зафіксаваны толькі адзін усплёск варожасці паміж Полацкам і Кіеўскай дзяржавай – узяцце і спусташэнне ў 1084 г. Менска Уладзімірам Манамахам. Акалічнасці і падрабязнасці гэтай падзеі нам невядомыя. Можна меркаваць, што па іроніі лёсу спрытны і кемлівы Манамах скарыстаў супраць Усяслава ягоную ж непрамую стратэгію – захоп стратэгічна важнага перыферыйнага пункту з прэвентыўнымі мэтамі.

Вынікам войнаў Усяслава з Кіеўскай дзяржавай стала захаванне незалежнасці Полацка і магчымасць спакойнага ажыццяўлення іншых знешнепалітычных задач, такіх як бесперашкодная экспансія ў Панямонне і Падзвінне. Такая мэта вайны была разумна вызначаная Усяславам, які ўсведамляў абмежаванасць рэсурсаў Полаччыны і не замахваўся на поўную перамогу над Яраславічамі і іх эпігонамі. Дасягненню мэты спрыяла майстэрскае выкарыстанне Усяславам стратэгіі непрамых дзеянняў, якая зводзілася да нападаў на аддаленыя, але стратэгічна важныя пункты Кіеўскай дзяржавы. Гэта дазваляла наносіць праціўніку вялікую шкоду з адносна малым напружаннем рэсурсаў і малымі стратамі і такім чынам вымушаць яго да прыняцця сваіх умоваў міру. Побач з ваеннай стратэгіяй поспехам Усяслава спрыяў і разлік іншых фактараў вялікай стратэгіі, такіх як унутраная нестабільнасць Кіеўскай дзяржавы. Так, умяшальніцтва гэтых фактараў дазволіла Усяславу два разы вызваляцца з палону з-за нязгоды ў лагеры праціўніка і кампен-

саваць ягоныя шматлікія тактычныя няўдачы. Нават нягледзячы на гэта, ягоны ўдзел у паспяховым паходзе на торкаў, перамога на Чарэсе і ўзяцце Ноўгарада дазваляюць меркаваць не толькі аб ягоным стратэгічным таленце, але і аб неа-спрэчным тактычным майстэрстве.

Характэрныя асаблівасці развіцця ваеннага майстэрства ў XI ст. выяўляе **паход Алега Святаславіча ў Мурамскую і Растоўскую землі ў 1095–96 гг.** Кампанія гэтая адбывалася ўдалечыні ад беларускіх земляў, але склад войскаў Алега дазваляе казаць аб яе прыналежнасці да падзей беларускай ваеннай гісторыі. Чарнігаўскае войска Алега не магло не ўключаць ураджэнцаў радзіміцкіх земляў сучаснай паўднёва-усходняй Беларусі, якія тады знаходзіліся ў складзе Чарнігаўскага княства. Акрамя таго, чынны ўдзел у паходзе бралі смаленскія воі, узятыя Алегам у свайго брата Давыда, які сядзеў у той час у Смаленску.[382]

Падзеі той вайны былі выкліканыя чарговым абвастрэннем барацьбы рускіх князёў за пануючае становішча ў Кіеўскай дзяржаве. Пасля смерці апошняга з сыноў Яраслава — кіеўскага князя Усевалада ў 1093 г. кіеўскі стол дастаўся Святаполку Ізяславічу, нашчадку старэйшай галіны роду. Да гэтага часу раздробленасць дзяржавы зайшла ўжо вельмі далёка, лесвічная сістэма дзейнічала кепска, і асобныя галіны Яраславічаў паспелі сцвердзіцца ў сваіх землях. У імкненні дамагчыся росту сваёй магутнасці коштам суседзяў князі вялі амаль бесперапынную барацьбу паміж сабой, звяртаючы мала ўвагі на фармальны аўтарытэт кіеўскага князя, які цяпер мог прэтэндаваць толькі на становішча першага з роўных. Уладзімір Усеваладавіч Манамах і ягоныя сыны трымалі кантроль над Пераяслаўскай, Растоўскай і Наўгародскай землямі. Яны варагавалі з сынамі Святаслава Яраславіча, спадчынным уладаннем якіх былі Чарнігаўская і Мурамская землі. Варажнечу распальваў той факт, што пасля перамогі на Няжацінай ніве ў 1078 г. Чарнігаў да 1094 г. належаў Манамаху, які быў вымушаны саступіць яго Алегу.[383] Святаполк Ізяславіч у гэтай барацьбе балансаваў паміж абедзьвюма групоўкамі.

---

382 Лаврентьевская летопись. Ст. 236.
383 Тамсама. Ст. 226.

У 1095 г. у суадносінах сіл паміж групоўкамі адбыліся новыя змены. Давыд Святаславіч не быў прыняты наўгародцамі, але заняў смаленскі стол. Сын Манамаха Мсціслаў з Растова перайшоў у Ноўгарад, а другі яго сын Ізяслаў, які княжыў у Курску, захапіў у Святаславічаў Мурам. Баланс сіл змяніўся на карысць Манамаха і яго сыноў. У наступным годзе ён і Святаполк Ізяславіч выклікалі Алега Святаславіча Чарнігаўскага ў Кіеў з мэтай заключэння пагаднення аб агульным упарадкаванні Русі. Разумеючы, што такое пагадненне было б для яго вельмі невыгодным, Алег ганарліва адмовіўся. Уладзімір і Святаполк абвінавацілі яго ў змове з полаўцамі і іншых варожых намерах і рушылі супраць яго на Чарнігаў. Адчуваючы недастатковасць сіл для паспяховай барацьбы, 3 мая 1095 г. Алег пакінуў Чарнігаў і накіраваўся да Старадуба, дзе і быў абложаны саюзнікамі. Спробы штурму горада прынеслі страты абодвум бакам. Калі становішча ў горадзе стала цяжкім, Алег пагадзіўся на перамір'е з умовай ісці да брата ў Смаленск, а затым у Кіеў, каб заключыць агульны мір.[384] Смаляне не прынялі Алега, відаць, баючыся Манамаха, але далі яму вояў, і ён рушыў у Мурамскую зямлю ў Разань.[385] Тым часам на Паўднёвую Русь абрынулася палавецкае нашэсце,[386] якое скавала сілы Манамаха і Святаполка і дало Алегу магчымасць бесперашкодна разгарнуць свае сілы для дасягнення сваёй палітычнай мэты – вяртання сваіх спадчынных уладанняў.

Рашэнне Алега перанесці асноўны цяжар барацьбы ў Мурамскую зямлю можа тлумачыцца найперш яго імкненнем пазбегнуць прамога сутыкнення з такім першакласным палкаводцам як Манамах, пад камандаваннем якога было спрактыкаванае і загартаванае войска і на перамогу над якім спадзявацца было цяжка. Па-другое, ваенныя дзеянні на поўдні падчас палавецкага нашэсця маглі разглядацца як удар у спіну ўсёй Русі і садзеянне полаўцам, зносіны з якімі ўжо стварылі Алегу кепскую рэпутацыю. Гэта магло зрабіць Алега ізгоем у вачах рускага грамадства і пазбавіць яго саюзнікаў. Наадварот, паход у Мурамскую зямлю дазваляў бы яму нанесці ўдар у слаба абароненае месца ўладанняў Усе-

384 Лаврентьевская летопись. Ст. 229–230.
385 Тамсама. Ст. 231, 236.
386 Тамсама. Ст. 231–232.

валадавічаў, вярнуць частку сваіх земляў і стварыць добры плацдарм для адваявання Чарнігава.

Падрыхтаваўшыся, у верасні 1095 г. Алег падышоў да галоўнага горада зямлі Мурама. Ізяслаў Уладзіміравіч выступіў насустрач са шматлікім войскам, сабраным з растоўцаў, суздальцаў і белаазёрцаў. Ад мірных прапаноў Алега ён адмовіўся і пастроіў свае баявыя парадкі на полі перад горадам. Адбылася лютая бітва, у якой Ізяслаў загінуў. Ягоная смерць дэмаралізавала войскі, якія сталі шукаць паратунку ва ўцёках. Пры згодзе гараджан Алег увайшоў у Мурам, а затым без бою пераняў Суздаль і Растоў, такім чынам авалодаўшы Мурамскай і Растоўскай землямі.[387] Адна з мэтаў паходу была дасягнутая.

Тым часам супраць Алега выступіў наўгародскі князь Мсціслаў Уладзіміравіч. Ён запатрабаваў у Алега ачысціць Растоўскую зямлю, але разам з тым, кіруючыся асабістай сімпатыяй да свайго стрыечнага дзядзькі, абяцаў хадайнічаць за яго перад Уладзімірам Манамахам і дабіцца заключэння міру паміж імі. Алег жа, па словах летапісца, ужо скіраваў свае намеры і на захоп Наўгародскай зямлі і таму адмовіў Мсціславу. Замест гэтага ён стаў з войскам ля Растова, выслаўшы на верагодны напрамак руху Мсціслава старожу пад камандаваннем свайго брата, разанскага князя Яраслава. Мсціслаў дзейнічаў падобным чынам, выслаўшы наперад старожу пад камандаваннем Дабрыні Рагуілавіча. У сутыкненні старожаў Дабрыня ўзяў верх. Яраслаў прыбег да Алега і далажыў яму аб набліжэнні праціўніка. Не наважваючыся прыняць бой, Алег адступіў ад Растова да Суздаля, загадаў спаліць горад і рушыў далей да Мурама. Па ягоных слядах у Суздаль прыйшоў і Мсціслаў.[388]

Далей Алег узяўся за падрыхтоўку рашучай бітвы супраць Мсціслава. Перш за ўсё, ён «с лестью» папрасіў у Мсціслава міру з мэтай паслаблення яго пільнасці. Мсціслаў на мір пагадзіўся і распусціў дружыну на пастой па навакольных вёсках. Гэта адкрыла Алегу магчымасць для нечаканага нападу, што прама супярэчыла няпісаным маральным правілам вядзення вайны, але паставіла яго ў выгоднае становішча. Затым Алег выступіў з Мурама ў кірунку Суздаля. Ён

---

[387] Лаврентьевская летопись. Ст. 236–237.
[388] Тамсама. Ст. 237–238.

разлічваў, што непадрыхтаванаму да бітвы Мсціславу застанецца толькі ратавацца ўцёкамі, і таму спыніўся на рацэ Клязьме, не даходзячы да Суздаля. Аднак Мсціслаў не разгубіўся. На працягу аднаго дня ён здолеў сабраць дружыну, а на працягу наступнага – наўгародскіх, растоўскіх і белаазёрскіх вояў і выстраіў свае баявыя парадкі перад Суздалем насупраць Алегавых. Праціўнікі прастаялі чатыры дні, не рашаючыся пачаць бітву, калі прыйшла вестка, што Манамах накіраваў на дапамогу Мсціславу свайго іншага сына Вячаслава з полаўцамі. На наступны дзень, па прыходзе Вячаслава Алег зразумеў, што прамаруджваннем змарнаваў сваю перавагу і вырашыў пачаць бой.[389]

Гэтаму папярэднічаў яшчэ адзін яго стратэгічны манеўр з мэтай пачаць бітву ў больш выгодным становішчы. Алег наступаў на Суздаль з боку Мурама, г. зн. з паўднёвага ўсходу. Між тым летапіс кажа, што бітва адбывалася на рацэ Калокшы, якая працякае на захад ад Суздаля, і што перад тым, як уступіць у сутыкненне, Мсціслаў і наўгародцы «перешедъ пожаръ».[390] Гэта значыць, што Алег змяніў кірунак свайго марша у бок Калокшы. Не выключана, што Алег здзейсніў хуткі марш з паўднёва-ўсходніх да паўднёва-заходніх ваколіц Суздаля, прымусіўшы Мсціслава з войскам павярнуць фронт на 90 градусаў і прайсці па папялішчы горада ці адной з прылеглых вёсак, што мусіла знізіць гатоўнасць Мсціслава да бою.

У такіх абставінах **29 лютага 1096 г.** пачалася **бітва на Калокшы**. Баявая лінія Алега складалася з двух палкоў. Сам ён камандаваў левым, камандаванне правым даручыўшы Яраславу. Войска ягоных праціўнікаў складалася з трох палкоў. Мсціслаў з наўгародцамі і растоўцамі сам стаў у цэнтры супраць Алега, даручыўшы полк левай рукі Вячаславу. Полк правай рукі пад камандаваннем полаўца Кунуя таксама прызначаўся для дзеянняў супраць Алега і, верагодна, заступаў за край яго левага флангу, што кажа аб колькаснай перавазе Мсціслава. Баявы парадак Мсціслава у адпаведнасці з агульнапрынятай на Русі ваеннай практыкай, уяўляў змяшаны строй пяхоты і конніцы. Так, Мсціслаў даў падмацаванне з пяхоты палавецкай конніцы Кунуя. Ён так-

---

389 Лаврентьевская летопись. Ст. 239.
390 Тамсама. Ст. 239–240.

сама «вдасть» яму «стягъ Володимерь». Гэта аказала дэмаралізуючае ўздзеянне на Алега і ягоных вояў, якія маглі думаць, што ім давядзецца змагацца з самім Манамахам.

Змест **першага этапу бітвы** склала франтальнае сутыкненне войскаў. «И ссєдоша с коней Новгородци, и ссступишася на Кулачьце, и бысть брань крепка». Спешванне наўгародцаў, відаць, аказалася вельмі ўдалым тактычным прыёмам і дало ім жаданую перавагу, бо больш чым праз сто год, у бітве 1216 г. з растоўцамі і суздальцамі на Ліпіцы яны ў абгрунтаванне свайго жадання спешыцца спасылаліся перад Мсціславам Удалым на досвед бітвы на Калокшы.[391] Неўзабаве баявое шчасце пачало схіляцца на бок Мсціслава. «И нача одалати Мстиславъ». Але вынік бітвы яшчэ не быў вырашаны.

У ходзе **другога этапу бітвы** полк Кунуя нанёс удар у тыл Алегаваму войску. «И виде Олегъ, яко поиде стягъ Володимерь, нача заходити в тылъ его». Сам па сабе ўдар у тыл яшчэ не быў фатальным для Алега, але панічны страх перад магчымай прысутнасцю Манамаха вымусіў яго да ўцёкаў. «И оубоявъся побеже Олегъ и одоле Мстиславъ».[392]

Алег уцёк ад Мсціслава да Мурама, дзе пакінуў Яраслава, затым да Разані, адкуль рушыў далей. Тым не менш, Мсціслаў не стаў паўторна адбіраць у Святаславічаў Мурамскую зямлю, а абмежаваўся заключэннем міру з мурамцамі і разанцамі і вярнуўся да Суздаля і Ноўгарада. Любецкі з'езд князёў 1097 г. замацаваў Чарнігаўскую і Мурамскую землі за Святаславічамі, але паклаў канец іх прэтэнзіям на Растоўскую і Наўгародскую землі і аддаў у рукі Манамаха Смаленск, усталяваўшы новую хісткую раўнавагу сіл на Русі.[393]

Алегу ўдалося дамагчыся звароту да становішча, блізкага да перадваеннага. Аднак гэта было дасягнута, хутчэй, агульным знясіленнем бакоў і збегам палітычных абставін, чым удалым выкарыстаннем вайны ў якасці інструменту палітыкі. Добрыя стратэгічныя хады Алега зводзіліся на нішто яго цяжкімі памылкамі. За нестандартным па задумцы і бліскавічным па выкананні адваяванні Мурамскай зямлі замест лагічнага наступу на спадчынную Чарнігаўшчыну

---

[391] Новгородская первая летопись. С. 56.
[392] Лаврентьевская летопись. Ст. 240.
[393] Тамсама. Ст. 240, 256–257.

адбылася авантурная спроба захопу Растоўскай і Наўгародскай земляў, яўна неадпаведная наяўным сродкам і таму няўдалая. Удалыя спробы Алега прымусіць Мсціслава знізіць пільнасць і рассеяць сілы, а таксама ягоныя цікавыя манеўры пад Суздалем былі змарнаваныя ягонай нерашучасцю, якая дала Мсціславу шанц злучыцца з Вячаславам. У дачыненні да Мсціслава прыцягваюць увагу ягоная аператыўнасць, удалае кіраванне войскамі і майстэрскае выкарыстанне сцяга Манамаха для дэзінфарміравання і дэмаралізацыі праціўніка.

У цэлым, ваеннае майстэрства канца X–XI стст. адлюстроўвала палітычныя памкненні характэрных для таго часу буйных раннесярэднявечных дзяржаў: Полацкага княства, Кіеўскай дзяржавы і іншых. Войны спрыялі дасягненню імі знешнепалітычных мэтаў, якія звычайна выражаліся ў імкненні павысіць узровень сваёй магутнасці коштам суседзяў. Дасягненне гэтых мэтаў звычайна ажыццяўлялася з дапамогай прамой стратэгіі, скіраванай на дасягненне вырашальнай перамогі над праціўнікам у генеральнай бітве. Разам з тым развіваліся непрамыя формы стратэгіі, якія выкарыстоўваліся пераважна ў войнах з абмежаванымі мэтамі. Тактычнае майстэрства зведала з'яўленне складаных баявых парадкаў, падзеленых па фронту і ў глыбіню, і развіццё ўзаемадзеяння пяхоты і конніцы як асноўных родаў войскаў.

Кніга IV.

# Перыяд міжусобных войнаў (1102–1200 гг.)

## *Раздзел 1.*
# Гісторыя войнаў

XII стагоддзе стала часам бліскучага заходу Русі Рурыкавічаў і Рагвалодавічаў. Па велічэзных, але няўклюдных гмахах Кіеўскай дзяржавы і Полацкай зямлі пабеглі трэшчыны, уздоўж якіх абедзве дзяржавы распаліся на мноства драбнейшых утварэнняў. Хаця тое стагоддзе і выявіла нямала выдатных прыкладаў палітычнага майстэрства, высокага мастацтва вайны і вышыні чалавечага духу, але агульная плынь падзей няўхільна вяла грамадства да палітычнага крызісу.

Прычын таму было шмат. З развіццём улады, заканадаўства і дзяржаўнага апарату асобныя часткі раннесярэднявечных дзяржаў сталі ператварацца ў самадастатковыя дзяржаўныя арганізмы. Маючы кампактную тэрыторыю і больш ці менш аднароднае насельніцтва, яны ўяўлялі сабой ўрадлівую глебу для эфектыўнага самастойнага кіравання, а пасталелыя мясцовыя эліты былі гатовыя гэтае кіраванне забяспечыць. Геапалітычнае становішча розных земляў Русі цягнула іх да вядзення знешняй палітыкі ў розных кірунках і пераследавання адрозных інтарэсаў. Эканамічнае развіццё давала ім ладную ступень аўтаркіі. Рост уласнай сельскагаспадарчай вытворчасці і рамёстваў паслабляў залежнасць земляў адна ад адной і ад старых гандлёвых шляхоў паміж Балтыкай, Каспіем і Чорным морам. Нарэшце, у кожнай зямлі этнічны склад насельніцтва меў свае выразныя рысы, якія сягалі яшчэ ў племянную эпоху і адрознівалі яго ад насельніцтва іншых земляў.

Перш за ўсё, пералічаныя фактары штурхалі асобныя часткі Кіеўскай дзяржавы і Полацкай зямлі да пошуку самастойнасці ад сваёй метраполіі. Па-другое, новаўзніклыя дзяржаўныя ўтварэнні паводзілі сябе ў адпаведнасці з асноўным прынцыпам міжнародных адносін: адстойванне ўласных інтарэсаў і павелічэнне сваёй магутнасці коштам

іншых дзяржаў. Нарэшце, у імкненні здабыць намінальнае першынство сярод суседзяў асобныя дзяржавы спрабавалі авалодаць стольным горадам сваёй метраполіі, каб ператварыць гэта ў маральную перавагу над імі. Тры гэтыя тэндэнцыі вялі да распальвання вялікай колькасці ваенных канфліктаў.

Гэтаму спрыялі і формы, у якіх праходзіла палітычнае жыццё беларускіх земляў. Увасабленне дзяржаўнасці ў постаці князя ўзмацняла суб'ектыўны фактар у палітыцы. Князь па-ранейшаму ў вялікай ступені знаходзіўся пад кантролем паспольства, пранікаўся інтарэсамі зямлі, якой кіраваў і стаяў на іх варце. Але разам з тым князі мелі свае ўласныя мэты і ў пагоні за імі праводзілі авантурную і своекарыслівую палітыку. Яшчэ адна праблема палягала ў тым, што дамоўна-прававыя механізмы, якія рэгулявалі адносіны паміж князямі, былі распрацаваныя слаба і выкарыстоўваліся бессістэмна.

На працягу XI ст. асновай міжкняскіх дачыненняў на Русі служыла вынайдзеная Уладзімірам лесвічная сістэма, якая прадугледжвала атрыманне яго сынамі той ці іншай зямлі ў кіраванне ў адпаведнасці з прынцыпам старшынства. Старэйшыя Уладзіміравічы атрымлівалі ў кіраванне больш важныя землі. Па смерці аднаго з сыноў іншыя пасоўваліся на прыступку наверх за кошт вызваленага стала. Верхняй прыступкай лесвіцы быў Кіеў. Яраслаў скарыстаў гэтую ж сістэму ў дачыненні да сваіх сыноў. Па смерці бацькі Яраславічам даводзілася прытрымлівацца яе больш ці менш пільна, бо парушэнне пагражала міжусобнай вайной за спадчыну. Тым не менш, ім ужо давялося мець справу з праблемай наяўнасці многіх князёў некалькіх пакаленняў, а знайсці ўдзел кожнаму з іх было справай нялёгкай. Гэта прывяло да з'яўлення князёў-выгнанцаў, якія звычайна перахоўваліся на ўскраінах Русі ці ў суседніх краях і былі заўсёды гатовыя прэтэндаваць на сталы, на якія яны маглі мець нейкае права ці не мець яго ўвогуле. Нягледзячы на шматлікія выпадкі парушэнняў, сістэма праіснавала даволі доўга. Ці не апошнім яскравым яе праяўленнем стала адмова ў 1093 г. Уладзіміра Манамаха заняць кіеўскі стол на карысць Святаполка, прадстаўніка старэйшай галіны роду Яраславічаў. Рудыменты ж яе існавалі і ў пазнейшыя часы.

Але згаданыя тэндэнцыі да адасаблення земляў ад Кіева вялі да ўсё большага зрошчвання інтарэсаў мясцовага паспольства і прышлага князя, што штурхала князёў да спроб замацавання на мясцовых сталах і ператварэння земляў у іх спадчынныя ўладанні – вотчыны. Княская ратацыя стала выглядаць на анахранізм, і ўжо Любецкі з'езд 1097 г. замацаваў прынцып спадчыннага трымання кожным князем сваёй зямлі. Але вызначыць, што было чыім, аказалася нават складаней, чым разабрацца ў няпростых хітрасплятаннях лесвічнай сістэмы. У найбольшай ступені новая сістэма засноўвалася на старых лініях падзелу Русі паміж трыма Яраславічамі. Нашчадкі Ізяслава маглі прэтэндаваць на Кіеў, Тураў і Валынь, нашчадкі Святаслава – на Чарнігаў і Мурам, і нашчадкі Усевалада – на Пераяслаўль і Растоў. Разам з тым Святаполку Ізяславічу даводзілася дзяліць Валынь з прадстаўнікамі малодшых ліній Яраславічаў, а Уладзіміру Усеваладавічу Манамаху ўдалося пасадзіць сыноў на княжанне ў Ноўгарадзе і Смаленску. Статус некаторых земляў так і застаўся цьмяным. Паводле іроніі лёсу, ці не ў найбольшай ступені гэта закранула Кіеў. Кіеў па-ранейшаму разглядаўся як стольны горад Русі, і валоданне ім надавала намінальнае першынство сярод іншых князёў. Як паказалі пазнейшыя падзеі, Святаславічы і Усеваладавічы *de facto* адмовіліся прызнаваць яго спадчынным уладаннем Ізяславічаў і спарадычна спрабавалі скарыстаць у яго дачыненні прынцып старшынства, распаўсюджваючы яго і на Тураў з Уладзімірам-Валынскім. Гэта прыводзіла да перыядычных успышак барацьбы за Кіеў, досыць бессэнсоўных з пункту гледжання суадносін рызыкі, затрачаных сіл і чыстага палітычнага выніку. Таксама і Смаленск, у якім па факту трывала і непадзельна панавалі Манамах і яго сыны, *de jure* разглядаўся не як асобная зямля, а як намесніцтва кіеўскага князя, на якое мог распаўсюджвацца прынцып старшынства.[1] Спалучэнне прынцыпаў старшынства і спадчыннасці ператварыла Кіеўскую дзяржаву ў рыхлую канфедэрацыю асобных земляў, фармальна аб'яднаных аўтарытэтам Кіева, фактычна ж цалкам незалежных.

Укняжанне Манамаха ў 1113 г. у Кіеве нагадала пра існа-

---

[1] Алексеев Л. В. *Смоленская земля в IX–XIII вв.* С. 197.

ванне яшчэ аднаго прынцыпу падзелу ўладанняў – прынцыпу сілы, які даваў магчымасць не толькі трымаць сваё, але і прыўлашчыць чужое, калі да таго маглі дацягнуцца рукі. Манамах заняў Кіеў у абыход і дынастычна старэйшых Святаславічаў, і спадчыннага прэтэндэнта Яраслава Святаполчыча, а таксама ўзяў пад уладу Тураў і Валынь, на дзесяцігоддзі выключыўшы Ізяславічаў з палітычнай карціны Русі і здабыўшы значную перавагу над Святаславічамі.

Змест полацкай палітычнай гісторыі XII ст., пра якую нам вядома нашмат менш, склала барацьба розных частак Полацкай зямлі за адасабленне ад Полацка, паміж сабой за магутнасць і зноў за кантроль над Полацкам як намінальным цэнтрам зямлі. Барацьба гэтая адбывалася пад сцягамі розных галін роду Усяслава, якія спрабавалі падзяліць ягоную спадчыну на ўсё тых жа прынцыпах старшынства, спадчыннасці і простай сілы.

З гэтага моманту палітычная гісторыя Русі пераўтвараецца ў бесперапынную чараду ваенных канфліктаў розных земляў за адасабленне ад сваіх метраполій і іх барацьбу паміж сабой. На гэтыя аб'ектыўныя працэсы наклаліся суб'ектыўныя памкненні асобных князёў павялічыць свой асабісты ўплыў, дабрабыт і прэстыж, якія таксама рабілі свой унёсак у пажары бясконцых войнаў. Калі вызваліцца ад эмацыйнага ўспрымання падзей таго часу, мы будзем вымушаныя прызнаць іх натуральнасць і лагічнасць, абумоўленасць шматлікімі аб'ектыўнымі і суб'ектыўнымі фактарамі і роднаснасць з падобнымі працэсамі ў іншых краях Еўропы. Філіп Кантамін апісвае становішча ў Францыі пачатку X– сярэдзіне XII стст. наступным чынам. «Кожнае з дзесяткаў і соцень вялікіх і малых княстваў стала цэнтрам незалежнай ваеннай сістэмы, якая валодала побач з асобнымі сродкамі нападу і абароны правам і паўнамоцтвамі абвяшчаць вайну, весці яе і заключаць мір».[2] Гэтыя словы цалкам адпавядаюць і сітуацыі на Русі.

Цалкам рацыянальнае імкненне асобных суб'ектаў палітычных сістэм сярэднявечных дзяржаў забяспечыць свае інтарэсы вяло да крызісу сістэмы ў цэлым. Драбленне краіны на асобныя землі не магло спыніцца на прымальным для

---

2 Контамин Ф. *Война в Средние века.* Санкт-Петербург, 2001. С. 41.

здаровага сэнсу рубяжы самадастатковых вялікіх земляў і пайшло далей, адбіўшыся ў недарэчных сепаратысцкіх памкненнях земляў невялічкіх. Як ізноў заўважае Ф. Кантамін, з канца IX да канца X стст. Францыя прайшла праз тры этапы раздраблення. У іх ходзе дзяржава паслядоўна распалася на: вялікія княствы на чале з князямі; затым на пагі, узначаленыя графамі і віконтамі; і нарэшце на шатэленствы, якія часта складаліся з аднаго замка з акругай.[3] Полацкае княства і Кіеўская дзяржава не дайшлі да такой ступені раздробленасці, але кожны князь невялікага ўдзелу пачуваўся досыць незалежна. Гатоўнасць жа князёў распаліць пажар вайны дзеля любых невялікіх кавалкаў толькі пагаршала агульны палітычны крызіс. Па сваім палітычным таленце і ваенным майстэрстве яны не саступалі князям ранейшых гераічных часоў, а часам пераўзыходзілі іх. Але загнаныя ў рамкі невялікіх княстваў і звязаныя хітраспляценнямі дробязных палітычных камбінацый, яны не маглі належным чынам выкарыстаць свае здольнасці ў інтарэсах сваіх і грамадства і дасягнуць эпічных вяршынь сваіх папярэднікаў. Наяўнасць мноства палітычных суб'ектаў, змешванне кароткатэрміновых эгаістычных і доўгатэрміновых абгрунтаваных інтарэсаў і сутыкненне прынцыпаў старшынства і спадчыннасці пры панаванні прынцыпу сілы ператваралі карціну падзей у сапраўдны хаас. «Адсюль і мноства часцяком нязначных сутычак, аблог, рабункаў, падпалаў, боек і бітваў, аповяд пра якія – штодзённы хлеб тагачасных аналістаў і храністаў».[4] У рэшце рэшт такі ход падзей прымусіў грамадства рускіх земляў шукаць новых, больш дасканалых формаў дзяржаўнага жыцця, у чым узялі ўдзел і суседзі Русі. У дачыненні да беларускіх земляў такім партнёрам стала Літва, якая на працягу стагоддзя выйшла з ценю Полаччыны і ператварылася ў магутны фактар на палітычнай арэне.

Даследаванне і апісанне складанага і часта хаатычнага ходу падзей з'яўляецца цяжкай задачай. Таму мы засяродзімся на выкладзе асноўных ліній паводзін палітычных суб'ектаў, вытлумачальным чынам пачаўшы з Полацкай зямлі.

---

[3] Контамин Ф. *Война в Средние века.* С. 55.

[4] Тамсама. С. 41.

Як спачатку магло падацца, стагоддзе пачалося для Полаччыны вельмі ўдала. Па звестках В. Тацішчава, у 1102 г. Барыс Усяславіч, які і заняў бацькоўскі стол у Полацку, перамог яцвягаў, а затым збудаваў і засяліў Барысаў, магчыма, у тым ліку і яцвягамі.[5] У 1103 г. Давыд Усяславіч узяў удзел у пераможным паходзе вялікай кааліцыі паўднёварускіх князёў на полаўцаў.[6] А ў 1104 г. менскі князь Глеб Усяславіч паспяхова вытрымаў у сваёй сталіцы аблогу злучанага войска Пуцяты, ваяводы кіеўскага князя Святаполка Ізяславіча, ноўгарад-северскага князя Алега Святаславіча і Яраполка, сына пераяслаўскага князя Уладзіміра Манамаха.[7]

Але чарада поспехаў не працягнулася доўга. Ужо ў 1106 г. «победиша Зимегола Всеславичь всю братью и дружины оубиша 9 тысящь».[8] Земгальскае паражэнне значыла не толькі выхад земгалаў з-пад улады Полацка, але і страту кантролю над курамі, шлях у зямлю якіх праходзіў праз Земгалію. Калі Земгалія ў будучыні яшчэ вярнулася пад эгіду Полацка, то куронскія землі былі страчаны назаўсёды. Гэтае паражэнне стала пралогам да серыі нешчаслівых для Полаччыны падзей, якія надоўга падарвалі яе сілы і ўплыў.

Зірнем найперш на Менск, які з усіх полацкіх удзелаў выяўляў найбольшую актыўнасць у два першых дзесяцігоддзі XII ст. Набыўшы самастойнасць ад Полацка і атрымаўшы ў асобе Глеба Усяславіча пастаяннага спадчыннага князя, Менскае княства мусіла вырашаць задачы свайго выжывання, а таксама палітычнага і эканамічнага развіцця. Менск, хоць і з'яўляўся трэцім па велічыні пасля Полацка і Віцебска горадам Полаччыны,[9] меў значэнне найперш як крэпасць на яе паўднёвых рубяжах.[10] Адпаведна, важным рэсурсам яго існавання была эканамічная і людская падтрымка з боку Полацка. Менск быў рачэй ваенным пасяленнем, як палітычным і эканамічным цэнтрам. Невялікая палітычная вага і слабасць эканомікі, выкліканая маланаселенас-

---

5 Татищев В. Н. *История Российская.* Москва–Ленинград, 1963. Т. 2. 12. С. 123.

6 Лаврентьевская летопись. Ст. 277–279.

7 Тамсама. Ст. 280.

8 Тамсама. Ст. 281.

9 Штыхов Г. В. *Города Полоцкой земли.* С. 123.

10 Археалогія Беларусі. Т. 3. С. 229.

цю тэрыторыі, аддаленасцю ад асноўных водных гандлёвых шляхоў і цяжкасцю земляробства на неўрадлівых глебах Меншчыны, рабілі перспектывы Менска вельмі цьмянымі. Адзіным выйсцем з такога становішча была знешняя палітыка, накіраваная на павелічэнне палітычнай і эканамічнай моцы княства шляхам ціску на суседзяў, у тым ліку і ваеннымі сродкамі. Ваяўнічы і непераборлівы ў сродках Глеб быў тым чалавекам, які падыходзіў на ролю генератара і выканаўцы такой палітыкі.

Найпершай мэтай Глеба было палітычнае ўзмацненне Менска адносна суседніх дзяржаў. Гэта магло быць дасягнута шляхам тэрытарыяльнага пашырэння і захопу суседніх земляў, што непазбежна вяло да сутыкнення з Кіеўскай дзяржавай, смаленскія і турава-пінскія ўладанні якой шчыльна прылягалі да Меншчыны. Гэтай мэты немагчыма было дамагчыся, не падтрымаўшы свае палітычныя прэтэнзіі эканамічнымі рэсурсамі. Таму яшчэ адным кірункам дзейнасці Глеба было больш шчыльнае засяленне Меншчыны і выхад да асноўных гандлёвых шляхоў.

Пры выпрацоўцы і правядзенні сваёй палітыкі Глеб выкарыстоўваў тонкі баланс сіл у рэгіёне, які вызначаўся існаваннем шэрагу палітычных саюзаў і застарэлых процістаянняў. Магутным сродкам дыпламатыі для Глеба мог быць ягоны шлюб з Анастасіяй, дачкой Яраполка Ізяславіча, унука Яраслава Мудрага.[11] Шлюб гэты меў свае карані яшчэ ў барацьбе Усяслава з трыма Яраславічамі. Як мы памятаем, у 1073 г. Ізяслаў быў сагнаны Святаславам і Усеваладам з кіеўскага стала.[12] Усяслаў не спудлаваў забіць клін у вострыя супярэчнасці паміж братамі, паладзіўшы з Ізяславам і яго нашчадкамі. Можна сцвярджаць, што менавіта ён быў ініцыятарам шлюбу Глеба з Анастасіяй Яраполкаўнай. Гэты палітычны саюз дастаўся ў спадчыну Усяславічам і Ізяславічам, якія з яго дапамогай супрацьдзейнічалі Святаславічам і Усеваладавічам. Як паказалі пазнейшыя падзеі, Глеб мог разлічваць на ўскосную падтрымку дзядзькі сваёй жонкі, кіеўскага князя Святаполка Ізяславіча, які быў зацікаўлены ў Глебе як сродку ціску на Уладзіміра Усеваладавіча Мана-

---

[11] Ипатьевская летопись. Ст. 492.; Загорульский Э. М. *Генеалогия полоцких князей Изяславичей.* Мн., 1994. С. 10.

[12] Ипатьевская летопись. Ст. 172–173.

маха і іншых сапернікаў.[13] Маглі быць прыёмам дыплама-тыі і сувязі Глеба з Кіева-Пячэрскім манастыром, якому ён прыносіў багатыя ахвяраванні.[14] Сувязі гэтыя былі настолькі блізкімі, што ён стаў адным з нешматлікіх князёў, якія атрымалі гонар быць пахаванымі там.[15]

Іншыя Усяславічы таксама мелі саюзніцкія адносіны з паўднёварускімі князямі. Можна думаць, што Давыд Усяславіч быў адданым саюзнікам чарнігаўскіх Святаславічаў. У летапісным запісе аб паходзе 1103 г. ягонае імя называецца адразу ж за імем чарнігаўскага Давыда Святаславіча.[16] Больш за тое, пры апісанні паходу паўднёвага войска на Менск у 1104 г. летапісец заўважае, што Алег Святаславіч выступаў «поемше Давыда Всеславича»,[17] што наводзіць на думку, што Давыд не быў самастойным князем, а перабываў у Святаславічаў як выгнанец, якога яны маглі скарыстоўваць у якасці свайго прэтэндэнта на полацкія ўдзелы. Пазнейшыя ж падзеі паказалі, што Барыс Усяславіч у сваёй палітыцы арыентаваўся на Манамаха і ягоных сыноў. Збліжэнне Барыса з Манамахам і ягонымі нашчадкамі было трывалым. Хутчэй за ўсё, менавіта ў той час была створана летапісная версія разгледжанай намі легенды пра Рагвалода, Рагнеду і Уладзіміра, якая была прымальным і для Кіева, і для Полацка тлумачэннем іх даўняй варожасці і паказвала ўсіх удзельнікаў тых падзей у рамантычных танах. Знакам прымірэння з Полацкам магло быць і наданне Мсціславам Уладзіміравічам сваёй дачцэ імені Рагнеды, што знайшло адлюстраванне ў назвах населеных пунктаў.[18]

Паўднёварускія князі лічылі выгоднымі для сябе саюзы з Усяславічамі, бо ведалі, што ў выпадку канфлікту тыя маглі адцягнуць на сябе значныя сілы супрацьлеглага боку. Са свайго боку і Усяславічам ва ўнутраных канфліктах было зручна мець за спіной падтрымку таго ці іншага магутнага паўднёварускага князя.

---

[13] Загорульский Э. М. *Возникновение Минска.* С. 15–16.; Алексеев Л. В. *Полоцкая земля.* С. 253–255.

[14] Ипатьевская летопись. Ст. 259.

[15] Житье и хоженье Данила, Русьскыя земли игумена. С. 138.

[16] Лаврентьевская летопись. Ст. 277.

[17] Тамсама. Ст. 280.

[18] Алексеев Л. В. *Смоленская земля в IX–XIII вв.* С. 128.

Узновім карціну падзей. Аблога Менска ў 1104 г., калі Глебу ўдалося прагнаць войскі паўднёварускай кааліцыі, была выклікана нейкімі яго дзеяннямі, якія засталіся па-за ўвагай летапісца. Каб зразумець ход падзей, зазірнем на некалькі гадоў наперад. Пры апісанні падзей 1116 года Іпацьеўскі летапіс паказвае Друцк, Оршу і Копысь як падначаленыя ці саюзныя Глебу гарады.[19] З гэтага вынікае, што свой першы погляд ён звярнуў на Падняпроўе і звязаны з ім вялікі гандлёвы шлях. Да таго часу Друцк быў добра ўмацаванай крэпасцю, якая прыкрывала Менск з усходу і панавала над цячэннем Друці, аднаго з вялікіх прытокаў Дняпра. Орша і Копысь знаходзіліся непасрэдна на Дняпры. Па звестках Устаўнай граматы смаленскага князя Расціслава Мсціславіча ад 1136 г., у Копысі былі перавозы і корчмы,[20] што дазваляла браць мыта з гандляроў, якія кіраваліся гэтым шляхам, а таксама прывабліваць купцоў непасрэдна ва ўладанні менскага князя. Гэта давала добры прыбытак у княскі скарб і ўзбагачала іншыя слаі менскага насельніцтва.

З падпарадкаваннем Друцка, яшчэ аднаго ўдзельнага княства Полаччыны, Глеб не павінен быў мець шмат цяжкасцяў, бо там на яго глядзелі як на законнага прадстаўніка адгалінавання сваёй дынастыі. З Оршай і Копыссю справа ішла іншым чынам. Абодва гарады маглі быць адрэзаныя ад Смаленскай зямлі і перададзеныя Полацкаму княству трыма князямі Яраславічамі яшчэ ў 1060 г. пры Усяславе ў адплату за ўдзел апошняга ў паходзе на торкаў.[21] У такім выпадку, пры падзеле Полацкай зямлі паміж сынамі Усяслава, нашмат лагічней выглядала б іх падпарадкаванне наўпрост Полацку альбо геаграфічна бліжэйшаму Віцебску. Гэта наводзіць на думку, што Глеб мог без асаблівых разваг папросту адабраць гэтыя гарады ў сваіх братоў. Яшчэ адным варыянтам развіцця падзей з'яўляўся іх прамы захоп Глебам у прамежку 1101–1104 гг. у смалян. Так ці інакш, дзеянні ваяўнічага князя былі небяспечнымі для Смаленска, дзе правіў адзін з сыноў пераяслаўскага князя Уладзіміра Манамаха.

---

19 Ипатьевская летопись. Ст. 282–283.
20 Древнерусские княжеские уставы XI–XV вв. Москва, 1976. С. 143.
21 Ермаловіч М. *Старажытная Беларусь*. С. 110–111

Гэта і магло паслужыць прычынай няўдалага паходу 1104 г. Прычынай правалу паходу мог быць як найменей неахвотны ўдзел у ім Святаполка Ізяславіча, які выправіў замест сябе ваяводу і не быў зацікаўлены ў паражэнні Глеба. Доказам патурання Святаполка Глебу можа служыць той факт, што наступны паход супраць Глеба адбыўся толькі ў 1116 годзе, праз тры гады пасля смерці першага. У выніку Глеб застаўся гаспадаром ключавога ўчастка дняпроўскага шляху, наблізіўшыся да дасягнення сваіх палітычных і эканамічных мэтаў.

І ўсё ж якія бы выгоды ні прыносіў збор мыта на Дняпры, уласная вытворчасць маланаселенай, пакрытай збольшага балатамі і лясамі Меншчыны была вельмі слабай. Стагоддзямі выпрабаваным спосабам вырашэння гэтай праблемы быў вывад у палон людзей з іншых тэрыторый і ўладанняў, што Глеб і рабіў з вялікім размахам, стварыўшы своеасаблівую «эканоміку вайны».

У сваім «Павучанні» Манамах кажа аб тым, што Глеб яго «люди заялъ».[22] Гэтае паведамленне адносіцца да нападу Глеба на тады падуладны Кіеву Слуцк у 1116 годзе. «Глебъ бо бяше воевалъ Дреговичи и Случескъ пожегъ».[23] Але напад на Слуцк выклікаў цяжкія для Глеба наступствы. Уладзімір Манамах, які ўзышоў на кіеўскі стол у 1113 годзе, пасля смерці Святаполка, меў сумнеўныя правы на кіеўскі стол, але далёка пераўзыходзіў большасць сучасных яму князёў у розуме і палітычным таленце. Ён разаслаў сваіх сыноў княжыць па розных гарадах і непасрэдна панаваў над большай часткай Кіеўскай дзяржавы, а сваіх сапернікаў князёў Святаславічаў прымусіў трымаць з сабой прыязныя адносіны. Улагодзіўшы ўнутраныя праблемы, Манамах вырашыў раз і назаўсёды вырашыць праблему пагрозы сваім уладанням з паўночнага захаду. Ён накіраваў да Глеба пасольства з суворым асуджэннем і парадай устрымацца ад далейшых варожых дзеянняў.[24] Глеб ганарліва і непрыязна сустрэў паслоў, якім, у сваю чаргу, выказаў пагрозы ў адрас Манамаха: «И не каяшеться о семъ, ни покаряшеться, но

---

22 Лаврентьевская летопись. Ст. 250.
23 Ипатьевская летопись. Ст. 282.
24 Татищев В. Н. *История Российская.* Т. 2. 13. С. 131.

боле противу Володимеру глаголаше, оукаряя и».[25] Пасля правалу пасольства той напрыканцы 1116 года самастойна выправіўся ў паход на Менск разам са сваімі сынамі Яраполкам і Вячаславам, які быў смаленскім князем і меў крэўную зацікаўленасць у вяртанні Оршы і Копысі, а таксама Давыдам Святаславічам чарнігаўскім. У студзені 1117 года войскі Вячаслава ўзялі Оршу і Копысь, а Яраполк і Давыд – Друцк. Пасля гэтага хаўруснікі падступілі да Менска. Глеб напачатку збіраўся адседзецца ва ўмацаваннях горада. Але, убачыўшы, што яны рыхтуюцца да доўгатэрміновай аблогі, ён вымушаны быў разам з сям'ёй і баярамі выйсці з горада і прасіць Манамаха аб літасці.[26] Нягледзячы на відавочнае паражэнне Глеба, два бакі вымушаны былі пайсці на кампраміс. Глеб вырашыў праявіць пакорлівасць і такім чынам захаваць большую частку сваіх уладанняў. Манамах не стаў выпрабоўваць ваенную фартуну і вырашыў замацаваць вяртанне Оршы і Копысі мірным шляхам.

Мір, аднак, не пратрымаўся доўга. У 1119 годзе Глеб ізноў напаў на Смаленскую і Новагародскую землі (незразумела, ці гаворка ішла аб Ноўгарадзе Вялікім, ці Наваградку).[27] Манамах у адказ выправіўся ў паход на Менск, узяў яго, паланіў Глеба і прывёз у Кіеў, дзе той неўзабаве памёр.[28] Меншчына была далучана да Кіеўскай дзяржавы.

Пры ўсёй сваёй энергіі і рашучасці, Глеб дапусціў шэраг памылак, якія дорага каштавалі яму і Менску. Ён пераацаніў свае сілы і выступіў супраць Кіеўскай дзяржавы ў неспрыяльны момант, калі не мог разлічваць на яе ўнутраныя супярэчнасці. На кіеўскім стале сядзеў яго стары вораг Манамах, якому ўдалося падпарадкаваць большасць рускіх земляў. Пры такой неспрыяльнай палітычнай сітуацыі рэсурсы Меншчыны былі занадта малыя, каб можна было разлічваць на ваенную перамогу.

Некалькі наступных гадоў полацкай гісторыі летапісамі не асвятляюцца, і яе рэканструкцыя можа быць толькі гіпатэтычнай. Мы прапануем сваю версію, якая таксама застаецца толькі гіпотэзай, але можа прадставіць лагічнае тлу-

---

25 Ипатьевская летопись. Ст. 282.
26 Тамсама. Ст. 282–283.
27 Ермаловіч М. *Старажытная Беларусь*. С. 169–170.
28 Ипатьевская летопись. Ст. 285.

мачэнне наступных падзей рубяжа 1120-х–1130-х гг., калі Полацк ізноў вынырвае ў летапісах з цемры маўчання. Як паведамляе Тацішчаў, у 1121 г. «Уладзімір, князь вялікі, быў з дзецьмі сваімі ў Смаленску для разгляду нязгод і ўтаймавання полацкіх князёў і некаторых іншых распарадкаў».[29] Згадаем, што ў 1102 г. полацкім князем быў Барыс, а ў 1128 г. летапіс называе на гэтым стале ўжо Давыда Усяславіча.[30] Выкажам меркаванне, што «нязгоды» 1121 г. і былі часам перамены князя на полацкім стале. Калі ўспомніць, што Давыд быў верагодным стаўленікам Святаславічаў, становіцца зразумелым, чаму ж стары Манамах сам рушыў у Смаленск. Сцверджанне саюзніка яго старых ворагаў Святаславічаў на стале дзяржавы, якая была яго даўнім лютым ворагам, пэўна ж патрабавала неадкладных захадаў! Таксама можна думаць, што прычынай падзення Барыса былі паражэнні Глеба ў 1117 і 1119 гг. Барыс не згадваецца пры іх апісанні, што дае падставу думаць, што ён прыняў у той час спрыяльны для Кіева нейтралітэт і ніяк не дапамог свайму брату. Такая лінія паводзін Полацка патрабавала нейкай узнагароды, у якасці якой Барысу можна было спадзявацца на Оршу і Копысь. Аднак гарады дасталіся Смаленску. Незадаволеныя гэтым палачане, у якіх ужо набірала моц веча, і маглі памяняць Барыса на Давыда, менш арыентаванага на Кіеў.

Але смаленскія захады Манамаха не былі паспяховымі, што і прывяло да наступнага развіцця падзей. Манамах памёр у 1125 г., пакінуўшы Кіеўскую дзяржаву свайму сыну Мсціславу. Перад Мсціславам ізноў паўстала праблема забеспячэння спакою дзяржавы ад варожасці полацкіх князёў, якія «вобласці, дадзеныя братам і сынам яго, бесперарыўна нападаючы, пустошылі».[31] Як лічыць П.П. Талочка, іх намерам было адваяванне Менска і Друцка. Цікавым з'яўляецца і ягонае меркаванне аб непасрэднай нагодзе іх ваенных дзеянняў, якое пацвярджае нашу версію аб чарнігаўскіх сувязях Давыда Усяславіча. На ягоную думку, штуршком для полацкіх князёў стаў поспех Усевалада Ольгавіча, які ў

[29] Татищев В. Н. *История Российская.* Т. 2. 13. С. 134.
[30] Ипатьевская летопись. Ст. 293.
[31] Татищев В. Н. *История Российская.* Т. 2. 14. С. 139.

1127 г. супраць любога права выгнаў свайго дзядзьку Яраслава Святаславіча з Чарнігава, прымусіўшы таго задаволіцца мурамскім княжаннем. Абложаны Мсціславам у Чарнігаве, ён, тым не менш, дабіўся заключэння міру на сваіх умовах. Мір стаў вялікім палітычным і маральным паражэннем для Мсціслава, які цяпер вымушаны быў цярпець у Чарнігаве хітрага і небяспечнага ворага, а таксама парушыў крыжацалавальную клятву Яраславу.[32]

У далейшым саюз з чарнігаўскімі Святаславічамі, асабліва з сям'ёй Ольгавічаў, не раз дапаможа полацкім князям, але цяпер ён аказаў ім дрэнную паслугу. Мсціслаў вырашыў разрубіць полацкі вузел і з гэтай мэтай у 1128 г. арганізаваў грандыёзную ваенную выправу, якой мала можна знайсці роўных у раннесярэднявечнай гісторыі. Ён накіраваў на Полацк сілы амаль усёй Русі. У кампаніі ўзялі ўдзел Вячаслаў з Турава, Андрэй з Уладзіміра, Усеваладка з Гародна, Вячаслаў Яраславіч з Клецка, якія павінны былі ісці на Заслаўе (Ізяслаўль). Пасля ўзяцця Лагойска з імі злучыўся Ізяслаў Мсціславіч. Расціслаў Мсціславіч са Смаленска рушыў на Друцк. Мсціслаў таксама вымусіў ісці ў паход Усевалада Ольгавіча, простым і эфектыўным чынам вырашыўшы два пытанні. Ён адначасова ўзмацніў свае войскі і не пакінуў у тыле верагоднага полацкага саюзніка. Надаўшы яму ці то ў падмацаванне, ці то ў нагляд за ім Івана Вайцішыча з торкамі, Мсціслаў накіраваў іх на Стрэжаў. Сам ён як вялікі і магутны ўладар застаўся ў Кіеве, адкуль ажыццяўляў агульнае кіраўніцтва. Пасля упартай, але кароткай абароны заслаўцы здалі горад, але не пазбеглі рабунку. Палачане яшчэ маглі спадзявацца на арганізаванае супраціўленне, але калі пад Неклачам з'явілася наўгародскае войска на чале з Усеваладам Мсціславічам, стала ясна, што іх справа была прайгранай.[33]

Каб пазбегнуць спусташэння і дасягнуць палітычнага рашэння канфлікту, яны ахвяравалі сваім прачарнігаўскім князем. «И тако Полочане сътснувшеси выгнаша Давыда, и съ сынъми поемше Рогъволода идоша къ Мстиславу, просяще и собе князем, и створи волю ихъ Мстиславъ, и по-

[32] Толочко П. П. *Нащадки Мономаха*. Київ, 1972. С. 36.
[33] Ипатьевская летопись. Ст. 292–293.

имше Рогволода ведоша и Полотьску».[34] Рагвалод, сын вядомага сваёй пракіеўскай арыентацыяй Барыса Усяславіча, быў прымальнай кандыдатурай для абодвух бакоў. Але і Барыс не знік з далягляду. Магчыма, ён быў рэгентам і дарадцам пры сваім сыне і нават не страціў фармальны тытул полацкага князя. Прынамсі, так яго называе летапіс у апошнім аб ім паведамленні: у 1129 г. «преставися князь Полотьскыи Борисъ».[35]

Са смерцю Барыса рассыпалася і хісткая раўнавага палітычных сіл у Полацку. Не маючы за спіной бацькі, малады і слабы Рагвалод, відаць, падпаў пад уплыў полацкага баярства і веча альбо проста пад прымусам выконваў іх волю, цяпер ужо насуперак волі Мсціслава. У 1130 г. Рагвалод і іншыя полацкія князі парушылі крыжацалаванне Мсціславу, якое прадугледжвала ваенную дапамогу супраць полаўцаў.[36] Адмова была зроблена ў гранічна грубай форме, чым Мсціслаў быў страшэнна абражаны.[37] Больш за тое, замест дапамогі яны ўчынілі напад на землі братоў Мсціслава. Пасля перамогі над полаўцамі ён выслаў сваіх ваявод на Полацк, не сустрэўшы супраціўлення ад палачан, якія ізноў дзеля ўласнай бяспекі ахвяравалі князямі. Полацкія князі былі дастаўленыя ў Кіеў, дзе Мсціслаў публічна абвінаваціў іх у злачынствах і выслаў у Візантыю да імператара Іаана Камніна.[38] Высланы былі Давыд з двума сынамі, Расціслаў, Святаслаў, а таксама Рагвалод-Васіль і Іван Барысавічы.[39] На полацкі стол быў пасаджаны сын Мсціслава Ізяслаў. Расправа з Полацкай зямлёй была завершана ў 1131 ці 1132 гг. паходам Мсціслава з сынамі, Ольгавічамі і Усеваладам Гарадзенскім на полацкага данніка — Літву. Саюзнікі спустошылі край, але страцілі шмат кіеўскіх вояў, якія адсталі ад асноўных сіл і былі атакаваныя літоўцамі.[40]

Падзеі 1116—1119 і 1128—1132 гг. сталі сапраўднай палітычнай катастрофай для Полацкай зямлі і вылучаных з яе

---

[34] Лаврентьевская летопись. С. 299.
[35] Ипатьевская летопись. Ст. 293.
[36] Тамсама. Ст. 293.
[37] Тамсама. Ст. 303.
[38] Татищев В. Н. *История Российская.* Т. 2. 14. С. 142.
[39] Ипатьевская летопись. Ст. 304.
[40] Тамсама. Ст. 294.

княстваў. Яны паказалі неадпаведнасць амбіцый полацкіх і менскіх князёў рэсурсам, якія засталіся ў іх руках, а таксама няроўныя суадносіны сіл са знешнепалітычнымі сапернікамі. Вынікам стала падзенне Полаччыны на ўзровень другараднай зямлі Русі, што не магла і параўнацца з магутнымі Чарнігавам, Смаленскам, Ноўгарадам ці Суздалем. Хаця катастрофа мела палітычны характар, бо ваенныя спусташэнні дасягалі мінімальнай ступені, але нанесшы ўдар па маральным духу палачан, так важным на вайне, яна значна падарвала і ваенную моц Полаччыны. Для саміх палачан і мянян яна разбурыла іх упэўненасць у сваіх сілах, а ў вачах сапернікаў прыцьміла іх славу «няміласцівых на кровапраліцце» і пагрозлівых ваяроў, якой палачане былі абавязаны многімі перамогамі. Дзесяцігоддзі спатрэбіліся ім, каб вярнуць арэол былой славы.

У 1132 г. памёр вялікі Мсціслаў. Пасля ягонай смерці драбленне дало магчымасць кожнай зямлі Русі ісці сваім шляхам пры захаванні толькі намінальнага адзінства. Пераемнік Мсціслава на кіеўскім стале Яраполк Уладзіміравіч замяніў на полацкім стале Ізяслава Мсціславіча на Святаполка Мсціславіча. Адчуўшы слабіну Кіева, палачане не марнавалі часу, каб сказаць аб ім: «Лишается насъ», і абраць на княжанне Васілька Святаславіча, бацька якога быў у выгнанні ў Візантыі. Ізяслава Мсціславіча тады ж лёс закінуў на княжанне ў Менску, Тураве і Пінску.[41] Фармальная незалежнасць Полацка была адноўленая, але да былой магутнасці было яшчэ далёка. Пакуль што палачанам даводзілася быць дапаможнай сілай ва ўсобіцах іншых князёў і першапачаткова трымаць бок Манамахавічаў супраць Ольгавічаў. Як падае Наўгародскі першы летапіс, у 1137 г., а верагодней, у 1138 г., у палачан было нямір'е з наўгародцамі, якія выгналі свайго князя Усевалада Мсціславіча, а замест яго ўзялі Святаслава Ольгавіча.[42] У 1139 г. яны разам з Яраполкам Уладзіміравічам хадзілі пад Чарнігаў на Усевалада Ольгавіча.[43]

У 1140 г. адбылася радасная для Полацкай зямлі падзея. З візантыйскага зняволення вярнуліся Рагвалод і Іван Ба-

---

41 Лаврентьевская летопись. Ст. 302.
42 Новгородская первая летопись. С. 25, 210.
43 Ипатьевская летопись. Ст. 301.

рысавічы,[44] што доўгі час «з пахвалой служылі» ў войску, якое змагалася супраць сарацын.[45] У гэты час візантыйскі імператар Іаан Камнін правёў шэраг кампаній з мэтай пашырэння і ўмацавання ўсходніх межаў імперыі. У 1132 г. ён адваяваў у турак Кастамон у Пафлагоніі, а ў 1134 г. — Гангры і сцвердзіў сваю ўладу да ракі Галіс. У 1136 г. ён падпарадкаваў сабе Кілікію, выйшаўшы на межы ўладанняў крыжаносцаў у Сірыі. У 1137 г. Іаан прымусіў антыяхійскага князя Раймонда прызнаць над сабой яго вярхоўную ўладу, а ў 1138 г. разам з крыжаносцамі з Антыёхіі і Эдэсы зрабіў паспяховы рэйд супраць мусульман у Сірыі.[46] Гэтыя кампаніі былі адным з апошніх значных поспехаў візантыйскай знешняй палітыкі ў Малой Азіі. У якіхсьці з іх прымалі ўдзел і полацкія князі.

У тым жа 1140 г. памяняліся месцамі фартуны Манамахавічаў і Ольгавічаў. Пасля смерці Яраполка Уладзіміравіча кіеўскі стол заняў ягоны брат Вячаслаў, але быў імгненна выгнаны адтуль падступным Усеваладам Ольгавічам. Адпаведным чынам памянялася і палітыка Полацкага княства. Тады ж палачане прапусцілі праз свае ўладанні выгнанага з Ноўгарада Святаслава Ольгавіча.[47] У 1143 г. саюз паміж Полацкам і Ольгавічамі быў замацаваны шлюбам паміж Святаславам Усеваладавічам і дачкой Васілька Святаславіча. Не драмаў і Ізяслаў Мсціславіч, які ажаніў сваю дачку з Рагвалодам Барысавічам, аднавіўшы гэтым шлюбам традыцыйны саюз Манамахавічаў з сям'ёй Барыса Усяславіча.[48] Барацьба паўднёварускіх князёў за ўплыў на Полацк працягвалася, і неўзабаве перавага ізноў аказалася на баку Манамахавічаў, бо наступным полацкім князем стаў якраз Рагвалод.

Пакуль сам Полацк быў уцягнуты ў палітычныя камбінацыі паўднёварускіх князёў, дзёрзкая спроба аднаўлення магутнасці ўсёй Полацкай зямлі была задумана і здзейсне-

---

[44] Ипатьевская летопись. Ст. 303. Алексеев Л. В. *Полоцкая земля.* С. 265.

[45] Татищев В. Н. *История Российская.* Т. 2. 14. С. 142.

[46] Акоминат, Никита. *Никиты Хониата История, начинающаяся с царствования Иоанна Комнина.* (Nicetas Acom.). Санкт-Петербург, 1860. Т. 1. 1—12. С. 1—61.; Успенский Ф. И. *История Византийской империи, XI—XV вв.* Москва, 1997. С. 147—155.

[47] Ипатьевская летопись. Ст. 302—303, 307.

[48] Тамсама. Ст. 313—314.

на з Менска. У летапісах няма звестак, дзе знаходзіліся Глебавы сыны Расціслаў, Валадар і Усевалад, пакуль Менск быў пад кіеўскай уладай. Адным з верагодных месцаў іх перабывання была Літва, даўні даннік Полацка. Пасля распаду Полаччыны на асобныя княствы васалітэт некаторых літоўскіх князёў дастаўся ў спадчыну Менску ў сілу яго геаграфічнай блізкасці. Магчымасць такога развіцця падзей пацвярджаецца тым, што менавіта ў Літве пазней перахоўваўся і збіраў свае сілы Валадар падчас нашэсця полацкага войска.[49] Яшчэ адным бяспечным месцам для Глебавічаў магла быць Польшча. Падставай для гэтага меркавання служыць факт шлюбу Валадара з Рыкісай, дачкой польскага караля Баляслава Крываротага. Шлюб гэты адбыўся каля 1135 г.[50]

Глебавічы вярнуліся да ўлады ў Менску дзесьці пасля 1135 г., калі кіеўскі стаўленік Ізяслаў Мсціславіч выехаў з Менска і затым атрымаў княжанне ва Уладзіміры-Валынскім, больш у Менск не вярнуўшыся.[51] Па смерці Мсціслава Уладзіміравіча Кіеўская дзяржава не мела дастаткова сіл, каб утрымаць у падпарадкаванні здаўна варожы ёй Менск. У 1144 г. Расціслаў Глебавіч пад сцягамі Усевалада Ольгавіча браў удзел у паспяховым паходзе на Уладзіміра Валадаравіча Галіцкага, што стала выпрабаваннем менскай зброі на вастрыню пасля доўгага перапынку перад вялікімі здзяйсненнямі.

Сумны досвед Глеба паказаў, што экспансія ў паўднёвым і ўсходнім кірунках магла быць небяспечнай для Менска, аж да страты самой незалежнасці. Таму нашмат больш перспектыўнай выглядала мэта авалодання Полацкам. У выпадку поспеху гэта магло аднавіць ранейшую магутнасць Полацкай зямлі, але пад уладай Глебавічаў. У далейшым ваяўнічыя князі маглі скарыстацца рэсурсамі ўжо аб'яднанай зямлі для далейшай экспансіі. Для ажыццяўлення гэтай мэты Расціслаў і Валадар мелі добрыя шанцы. У іх ме-

---

49 Ипатьевская летопись. Ст. 496.

50 Bo Lindwall. Konung Erik XIV:s antavla i fjorton generationer // Site «Nättidningen RÖTTER», http://www.genealogi.se/ – At: http://www.genealogi.se/erik.htm – 18.10.2004.; Красивая кожа. // Джаксон Т. Н. *Исландские королевские саги о Восточной Европе (середина XI – середина XIII вв.).* Москва, 2000. С. 167.

51 Лаврентьевская летопись. Ст. 302.

ліся законныя падставы, каб прэтэндаваць на ўладу ў Полацку як нашчадкі Усяслава Чарадзея. А падзеі ў Полацку далі ім для гэтага добрую нагоду.

У 1151 годзе палачане пазбавілі ўлады князя Рагвалода Барысавіча. Таму, мусіць, далася ў знакі ягоная сувязь з кіеўскімі Манамахавічамі, бо выгнаны быў ён якраз тады, калі кааліцыя Юрыя Даўгарукага і Святаслава Ольгавіча чорнай хмарай насоўвалася на Мсціславічаў: Ізяслава Кіеўскага і Расціслава Смаленскага. Палачане запрасілі на княжанне Расціслава Глебавіча і папрасілі заступніцтва ў Святаслава. Юры і Святаслаў былі разбітыя, але палачан ніхто не кранаў, і яны засталіся пры сваім. Менскі князь бяскроўным шляхам стаў гаспадаром Полацка і аб'яднаў пад сваёй уладай большую частку Полаччыны. Рагвалода пасадзілі ў вязніцу ў Менску.[52]

У Полацку Глебавічы паводзілі сябе не як часовыя шукальнікі прыгод. Наадварот, яны збіраліся трывала замацавацца ў сталіцы Полаччыны і забяспечыць інтарэсы ўсёй зямлі. Аб іх імкненні аднавіць полацкі ўплыў у Падзвінні і наладзіць цесныя сувязі з балтыйскімі краінамі, аб чым сведчыць заключэнне шлюбу паміж Соф'яй Валадараўнай і дацкім каралём Вальдэмарам Кнутсанам у 1154 годзе.[53] Магчыма, шлюб гэты суправаджаўся фармальным пагадненнем альбо маўклівай згодай аб падзеле сфер уплыву. Да дацкай сферы, бясспрэчна, былі аднесеныя куры, бо сагі паведамляюць нам аб захопе Валадаравым зяцем Вальдэмарам Куроніі і перамогах ягонага сына Крыстафора над куронскімі піратамі.[54] У 1161 г., калі Глебавічаў ужо не было ў Полацку, даны ўзялі куронскі замак у Паланзе.[55] З полацкага боку, натуральна, найбольшую цікавасць выклікала Земгалія, страчаная ў 1106 г. Існуе верагоднасць, што яна была вернутая пад полацкі кантроль дзесьці ў гэты час, бо Генрых Латвійскі пры апісанні падзей 1201 г. паказвае Земгалію пад уладай полацкага князя.[56]

---

52 Ипатьевская летопись. Ст. 431–446.

53 Красивая кожа // Джаксон Т. Н. *Исландские королевские саги о Восточной Европе (середина XI – середина XIII вв.)*. С. 167, 180.

54 Сага о Кнютлингах // Джаксон Т. Н. *Исландские королевские саги о Восточной Европе (середина XI – середина XIII вв.)*. С. 242.

55 Baranauskas T. *Lietuvos valstybės ištakos*. 262.

56 «Хроника Ливонии» Генриха. (Далей: Heinrici Chronic. Lyvon.). V, 3

Але княжанне Расціслава не працягнулася доўга. У хуткім часе Рагвалод быў выпушчаны з вязніцы па патрабаванні Юрыя Даўгарукага,[57] а ў 1158 годзе ён з дапамогай Святаслава Ольгавіча сцвердзіўся ў Друцку. Спробы Расціслава ўзяць Друцк былі няўдалымі, і ён заключыў з Рагвалодам мір, замацаваўшы яго крыжацалаваннем і перадачай Рагвалоду некалькіх воласцяў. Цікава, што Рагвалод вяртаўся ў Полацк пры дапамозе сваіх старых ворагаў, з якімі здолеў неяк дамовіцца. Расціслаў жа, наадварот, павёў палачан на Тураў у дапамогу Ізяславу Давыдавічу. Пасля правалу паходу адносіны Расціслава з полацкім вечам значна пагоршыліся. Расціслаў не стаў выпрабоўваць лёс. Ён сабраў дружыну і выехаў у Менск, па дарозе рабуючы полацкія землі і гонячы за сабой людзей і быдла. Рагвалод вярнуўся на полацкі стол. Цяпер канфлікт паміж Менскам і Полацкам мог быць вырашаны толькі вайной.[58]

У 1159–1161 гг. Рагвалод зрабіў тры паходы на Менскае княства, а паміж гэтымі кампаніямі за падтрымку сваіх прэтэнзій на полацкі стол у 1160 г. адплаціў Святаславу Ольгавічу пасылкай полацкага войска на Ушчыж. Нягледзячы на прыцягненне вялікіх вайсковых сіл (у першым паходзе акрамя палачан бралі ўдзел смаляне, наўгародцы і пскавічы), адзіным ягоным поспехам быў часовы захоп Заслаўя. У выніку ён вымушаны быў заключыць чарговы мір з Расціславам, змацаваўшы яго цалаваннем крыжа. Але Валадар крыжа не цалаваў, бо ён «ходяше под Литвою в лесех».[59]

У гэты момант Валадар выступае наперад. Мужны і рашучы, як ягоныя дзед, бацька і брат, Валадар меў і дадатковыя якасці, якія дапамаглі яму дабіцца вялікіх перамог. Гэта былі яго выключнае ваеннае майстэрства, упартасць і здольнасць стойка ператрываць цяжкі час, каб дачакацца свайго шанцу і паспяхова скарыстаць яго. Сваёй пастаццю Валадар нагадваў дзеячоў кшталту Піра, Гая Марыя ці Януша Радзівіла. Лёс не паспрыяў ім у дасягненні далёкіх палітыч-

---

// Матузова В. И. Назарова Е. Л. *Крестоносцы и Русь. Конец XII в. – 1270 г.* Тексты, перевод, комментарий. Москва, 2002. С. 109.

57 Татищев В. Н. *История Российская.* Москва-Ленинград, 1964. Т. 3. 20. С. 62.

58 Ипатьевская летопись. Ст. 491–496.

59 Тамсама. Ст. 496, 505, 509, 512.

ных мэтаў, але даў шмат прасторы, каб поўнасцю праявіць ваенныя таленты і заслужыць рэпутацыю геніяў вайны.

У 1162 г. Рагвалод здзейсніў чарговы паход на Меншчыну. Гэтым разам ён быў скіраваны супраць Валадара, а не Расціслава. Можна меркаваць, што Расціслаў да гэтага часу памёр, а Валадар пераняў у яго ўладу над Менскам. Пры набліжэнні войскаў Рагвалода ён засеў ва ўмацаваннях Гарадца і не стаў уступаць у бой, адчуваючы колькасную перавагу супраціўніка. Але ўначы ён учыніў нечаканую вылазку з горада з літвой і дашчэнту разграміў полацкае войска. Баючыся расправы ад палачан за ганебнае паражэнне, Рагвалод не пасмеў вярнуцца ў Полацк. Веча абрала новым князем Усяслава Васількавіча.[60] Адбіўшы пагрозу з боку Полацка, Менск і сам мог пагражаць сваёй былой сталіцы і прэтэндаваць на панаванне ва ўсёй Полаччыне. У 1167 г. Валадар рушыў на Полацк. Усяслаў выступіў насустрач. У бітве Валадар некалькімі раптоўнымі атакамі разбіў полацкае войска і заняў Полацк, а веча прызнала яго законным князем. Усяслаў уцёк у Віцебск да князя Давыда Расціславіча.[61]

Пасля такой рашучай перамогі менскі князь мог лічыць сябе гаспадаром большай часткі Полаччыны. Але справа не была завершанай, пакуль у Віцебску сядзелі ягоныя праціўнікі, якія да таго ж чакалі сабе ў дапамогу смаленскага князя Рамана Расціславіча. Таму ён неадкладна выступіў на Віцебск. Падчас паходу ўначы ўзнялася страшэнная бура, якая напалохала і поўнасцю дэмаралізавала ваяроў Валадара. Яны палічылі гэта за благі знак і запатрабавалі весці іх назад. Адступленне перайшло ва ўцёкі і скончылася рашучым паражэннем мянян. Усяслаў вярнуўся на княжанне ў Полацк.[62] Так няўдала скончылася смелая спроба менскіх князёў дабіцца панавання над Полаччынай.

Прычынай няўдачы ізноў была неадпаведнасць наяўных рэсурсаў пастаўленым мэтам, а таксама неспрыяльнае знешнепалітычнае становішча. Хаця можна заўважыць, што Расціслаў і Валадар падышлі да намечаных мэтаў бліжэй за свайго бацьку Глеба і пры больш удалым спалучэнні знешнепалітычных камбінацый вынік барацьбы мог быць іншым.

---

[60] Ипатьевская летопись. Ст. 519.

[61] Тамсама. Ст. 526.

[62] Тамсама. Ст. 526–527.

Пасля няўдачы ў барацьбе за Полацк Менск надоўга схаваўся ад актыўнага ўдзелу ў знешняй палітыцы за лясамі і балотамі, але можна меркаваць, што барацьба за Полацк прынесла Менску пэўныя станоўчыя вынікі. Яго ўзрослая ваенная моц магла эфектыўна стрымліваць агрэсіўныя памкненні суседзяў, а назапашаныя матэрыяльныя каштоўнасці сталі значным дадаткам да патэнцыялу княства для далейшага развіцця. Спустошаны мянямі і выратаваны смалянамі Полацк, наадварот, быў адкінуты ў барацьбе за аднаўленне сваёй магутнасці яшчэ на дзесяцігоддзі.

Што праўда, пры засяроджанасці на ўнутраных справах, менскія князі пільна адсочвалі падзеі навокал, і мы маем яшчэ некалькі ўрыўкавых паведамленняў аб іх актыўнасці ў XII ст. У 1167 г. сувязь паміж Ноўгарадам і Кіевам, перанятая смаленскімі і полацкімі князямі, была адноўленая праз Вячку і Валадара,[63] у якіх можна ўгадаць менскіх князёў. Пад 1182 г. Тацішчаў згадвае ўсплёск барацьбы за Берасце паміж Уладзімірам Валадаравічам Менскім і Васількам Яраполкавічам Драгічынскім. Васілька, узяўшы сабе ў дапамогу палякаў, разбіў Уладзіміра на Бугу і заняў Берасце. Уладзімір жа ў саюзе з палачанамі вярнуўся на Буг, пасля дзевяці дзён ярасных штурмаў узяў Берасце, затым разбіў Васілька з палякамі на Нуры і спустошыў Падляшша. Мазавецкі князь Лешак адваяваў Падляшша, выгнаў Уладзіміра за Буг. За Уладзімірам, аднак, засталося Берасце. Потым жа магутны валынскі князь Раман Мсціславіч адваяваў у палякаў і Падляшша.[64] Даволі таямнічае паведамленне не пацвярджаецца іншымі рускімі крыніцамі, але знаходзіць паралелі ў польскіх хроніках. «Вялікая хроніка» аб Польшчы расказвае аб узяцці ў 1182 г. польскім каралём Казімірам Справядлівым Берасця і наступнай яго перамозе над галічанамі, валынцамі, полаўцамі і яцвягамі на чале з Усеваладам Белзскім, у выніку якой той утрымаў захопленыя землі і пасадзіў на галіцкае княжанне свайго пляменніка.[65] Вінцэнты Кадлубек таксама паведамляе аб захопе Казімірам Берасця, а таксама Перамышля, Драгічына і Уладзіміра-Валынскага з іх абласцямі. Пры апісанні перамогі Казіміра ў

[63] Новгородская первая летопись. С. 220.

[64] Татищев В. Н. *История Российская.* Т. 3. 22[31]. С. 127–128.

бітве над Усеваладам Кадлубек дадае, што белзскі князь выступаў з «адборнымі найманымі войскамі».[66]

Звесткі гэтыя вымагаюць крытычнага разгляду. Мы не можам адкінуць іх як вымысел, бо паходзяць яны з незалежных адна ад адной крыніц. Польскія крыніцы цалкам пацвярджаюць першую частку звестак Тацішчава аб узяцці палякамі Берасця і паражэнні русінаў у бітве. Хутчэй за ўсё, яны апісваюць рэальную вайну за авалоданне Берасцем і Падляшшам паміж Польшчай і Руссю, падобную да той, што адбывалася ў XI ст. Таксама падаецца лагічным, што з рускага боку асноўнай зацікаўленай сілай выступалі галічане і валынцы. У той жа час, хаця каментатары Кадлубека дапускаюць асабісты інтарэс у змаганні з палякамі Уладзіміра Менскага, унука караля Баляслава Крываротага па сваёй маці Рыкісе,[67] імкненне менскага князя захапіць далёкія ад яго Берасце і Падляшша з мінімальнымі шанцамі ўтрымаць захопленае выглядае малаверагодным. Магчыма, ключом для разумення падзей паслужыць згадка Кадлубекам найманых атрадаў. Крывавая слава мянян рабіла іх жаданым кантынгентам у любым тагачасным войску. Уладзімір мог быць проста наняты Усеваладам Белзскім за наяўныя грошы альбо долю ў здабычы, як то часта адбывалася паміж князямі ў Сярэднявеччы. Пацярпеўшы першапачатковае паражэнне на Бугу, ён мог вярнуцца з падмацаваннямі, захапіць Берасце, разбіць Васільку з палякамі і, выканаўшы ўмовы пагаднення з Усеваладам, спакойна вярнуцца дадому з прыбыткам. Наяўнай інфармацыі недастаткова, каб перайсці ад гіпотэз да дакладных высноў, але можна цалкам пагадзіцца з У. Т. Пашутам у тым, што ў выніку ўсіх падзей Перамышль, Уладзімір, Берасце і Драгічын Польшчы падпарадкаваныя не былі.[68]

У Полацку ж ізноў адбылася перамена напрамкаў знешняй палітыкі. Чарнігаўскі ўплыў у Полацку ўпаў на доўгі

---

[65] «Великая хроника» о Польше, Руси и их соседях. XI–XIII вв. (Далей: Chronic. Polon. Maior.). 39. Москва, 1987. С. 122–123.

[66] Хроника магистра Винцентия Кадлубка. (Далей: Vinc. Kadl.). IV. 8, 14–15 // Щавелева Н. И. *Польские латиноязычные средневековые источники.* Москва, 1990. С. 105–107.

[67] Щавелева Н. И. *Польские латиноязычные средневековые источники.* С. 129.

[68] Пашуто В. Т. *Внешняя политика Древней Руси.* С. 161.

час, а смаленская дапамога палачанам супраць Валадара ізноў кінула іх у абдымкі Манамахавічаў, гэтым разам Расціслава Мсціславіча Смаленскага і ягоных сыноў. Але гэтыя сяброўскія абдымкі імгненна ператварыліся ў жалезныя абцугі. Смаленскія князі разглядалі Полаччыну як залежную ад сябе зямлю. У час ваенных канфліктаў яны гарантавалі яе бяспеку, але ў сваю чаргу выкарыстоўвалі як рэзервуар вайсковай сілы і не саромеліся саджаць у полацкіх удзелах сваіх князёў. Ужо ў 1165 г. на віцебскім стале сядае Давыд Расціславіч,[69] што значыла і фактычны, і намінальны пераход гэтага княства пад уладу смаленскага князя.

Знешнепалітычнае становішча Полаччыны вярнулася да ўзроўню 1130-х гг., калі яна вымушана была следаваць у рэчышчы палітыкі іншых земляў і выстаўляць свае вайсковыя кантынгенты для ўдзелу ў войнах за чужыя інтарэсы. Мы ўжо згадвалі ўдзел палачан у ваенных дзеяннях 1167 г. супраць Ноўгарада, адплатай за што было спусташэнне ў 1168 г. полацкай воласці наўгародцамі. Разам са смалянамі палачане ўзялі ўдзел ва ўдалым паходзе на Кіеў, які завяршыўся ўзяццем і разгромам горада ў сакавіку 1169 г. і зменай на кіеўскім стале Мсціслава Ізяславіча на Глеба Юр'евіча. 25 лютага 1170 г. полацкі князь з палачанамі падзялілі горыч цяжкага паражэння пад Ноўгарадам, куды яны хадзілі ў складзе створанай самаўладцам паўночна-ўсходняй Русі Андрэем Багалюбскім вялікай кааліцыі з суздальцаў, смалян, тарапчан, мурамцаў, разанцаў і паўднёварускіх княстваў.[70] У 1173 г., пасварыўшыся з сям'ёй Расціславічаў, Андрэй задумаў пераняць у іх уладу над Кіевам, дзе тады сядзеў Раман Расціславіч. Паход, у які Андрэй «и Полотьскымь князем поити повеле всимь», парушыўшы іх сталы саюз са Смаленскам, скончыўся яго рашучым паражэннем.[71]

Канец 1170-х гг. адзначыўся звадамі паміж сынамі Расціслава Смаленскага. Ваяўнічы Мсціслаў, які стаў наўгародскім князем, у 1178 г. выступіў у паход на Полацк, які быў недарэчна матываваны помстай за разрабаванне Ноўгарада Усяславам. Паход быў спынены па патрабаванні смаленскага князя Рамана Расціславіча, які сувора заўважыў,

[69] Ипатьевская летопись. Ст. 525.
[70] Новгородская первая летопись. С. 33.
[71] Ипатьевская летопись. Ст. 569–578.

што раней за палачан Мсціславу давядзецца мець справу з ім.[72] Разумны і дальнабачны Раман, які часта знаходзіў спосабы дасягаць сваіх палітычных мэтаў без гвалту і кровапраліцця, вядома ж, найперш адстойваў у Полацкай зямлі смаленскія інтарэсы. Разам з тым яго палітыка ў дачыненні да Полаччыны насіла рысы так званай «добразычлівай гегемоніі», якая прадугледжвала адстойванне інтарэсаў падуладных земляў і абарону бяспекі, жыцця і маёмасці іх жыхароў у абмен на лаяльнасць і падтрымку. Гэта і дапамагала яму без вялікіх турбот утрымліваць свой уплыў над Полаччынай. З ягонай смерцю ў 1180 г. стан рэчаў змяніўся карэнным чынам.

Замест Рамана на смаленскім стале сеў своекарыслівы і нягнуткі Давыд Расціславіч, постаці якога мы надамо больш увагі ніжэй. Паколькі на «добразычлівую гегемонію» Полацка больш разлічваць не даводзілася, выгоды няроўнага саюзу са Смаленскам былі вычарпаныя. Паўставала пытанне аб выхадзе з-пад смаленскага ўплыву і вяртанні страчаных на карысць Смаленска ўдзелаў. Віцебск вярнуўся пад уладу полацкага княскага дому явачным парадкам. Надышла чарга Друцка. Натуральным саюзнікам у барацьбе за яго ізноў сталі чарнігаўскія Ольгавічы, нягледзячы на рэпутацыю ненадзейных сяброў, якую яны дзесяцігоддзямі самі сабе стваралі. Яраслаў Усеваладавіч і знакаміты герой «Слова» Ігар Святаславіч з полаўцамі злучыліся з Усяславам Васількавічам, іншымі полацкімі князямі і іх васальнымі лівамі і літоўцамі і рушылі на Друцк, дзе сядзеў Глеб Рагваладавіч. Яны ўхіліліся ад бітвы з Давыдам, што прыйшоў ратаваць горад, і дачакаліся Святаслава Усеваладавіча з наўгародцамі. Давыд не наважыўся біцца з саюзнікамі і вярнуўся ў Смаленск.[73] Саюзнікі спалілі гарадскі астрог і разышліся, не ўзяўшы дзядзінец. Як справядліва лічыць Л. В. Аляксееў, у гэтым не было пільнай патрэбы, бо адступленне Давыда само аддало Друцк назад пад уладу Полацка.[74]

Друцкая аблога паклала сімвалічны канец залежнасці Полацка ад Смаленска, але сутыкненні паміж абедзьвюма дзяржавамі працягваліся, а памежныя княствы траплялі пад

[72] Ипатьевская летопись. Ст. 608–609.
[73] Тамсама. Ст. 620–621.
[74] Алексеев Л. В. *Полоцкая земля.* С. 282.

уплыў то адных, то другіх. Гэта адбывалася на фоне змены князя ў Полацку. Каля 1186 г. на полацкім стале сеў князь, якога лівонскі храніст Генрых называе Вальдэмарам,[75] а сучасныя даследчыкі атаясамліваюць з Валадарам Васількавічам.[76] У 1186 г. Давыд арганізаваў супраць Полацка вялікі паход з удзелам свайго сына Мсціслава, які быў наўгародскім князем, Васількі Валадаравіча Лагойскага і Усяслава Друцкага. Калі Васілька быў смаленскім саюзнікам у сілу варожасці Глебавічаў да Полацка, то князь памежнага Друцка, відаць, ізноў апынуўся ў залежнасці ад Смаленска. Будучы не ў стане адбіць навалу ваеннымі сродкамі, палачане адвялі яе, сустрэўшы Давыда на мяжы з паклонамі і дарамі, г. зн. так ці інакш пайшоўшы на нейкія саступкі Смаленску.[77]

Магчыма, такой ахвярай стаў Віцебск, бо ў 1195 г. мы бачым яго пад уладай Давыда. Па іроніі лёсу, у той жа год Барыс Друцкі згадваецца як полацкі саюзнік. Відаць, нейкія невядомыя нам дынастычныя ці ваенныя фактары ізноў пераставілі Друцк і Віцебск месцамі пад уладай Полацка і Смаленска. У той год Давыдаў брат, кіеўскі князь Рурык, у бясконцай палітычнай гульні з Ольгавічамі ў адплату за іх адмову ад кіеўскага стала саступіў ім Віцебск, дзе сядзеў Давыдаў зяць. Давыд з зяцем не паспелі перадаць горад Ольгавічам альбо гэты абавязак сабатавалі, бо тыя вырашылі ўзяць сваё сілай. Войска на чале з Алегам Святаславічам злучылася з палачанамі, якімі камандаваў князь Васілька (магчыма, Васілька Брачыславіч).[78] У сакавіку 1196 г. саюзнікі нанеслі смаленскаму войску паражэнне, у чым найвялікшая заслуга належала менавіта палачанам. Алег выклікаў да сябе астатніх Ольгавічаў, каб давяршыць разгром Смаленска, але наступленне было спынена грозным пасланнем ад Рурыка, дзе той пагражаў ударам на Чарнігаў у адказ. Ваенныя дзеянні спыніліся, але трывалы мір так і не наступіў.[79] Немагчыма сказаць дакладна, каму ж урэшце рэшт дастаў-

---

75 Heinrici Chronic. Lyvon. I, 3. C. 52.

76 Загорульский Э. М. *Генеалогия полоцких князей Изяславичей.* С. 15–16.

77 Лаврентьевская летопись. Ст. 403–404.

78 Симеоновская летопись // Полное собрание русских летописей (ПСРЛ). Т. XVIII. Санкт-Петербург, 1913. С. 36–38.

79 Ипатьевская летопись. Ст. 691–694.

ся Віцебск. Не выключана, што ім авалодалі палачане, бо ўтрыманне Віцебска з далёкага Чарнігава выглядае сумнеўным, а ўплыў Смаленска на полацкія справы быў віцебскім паражэннем надоўга знішчаны.[80]

Пакуль Полацкая зямля з пераменным поспехам змагалася за свае ўсходнія межы, карэнным чынам змянілася становішча на яе заходніх рубяжах. Падуладная ёй Літва дасягнула той ступені ўнутранага развіцця, якая падводзіла яе да заснавання ўласнай дзяржаўнасці. Літоўскі вайскова-дружынны слой не меў схільнасці больш цярпець над сабой зверхнасць аслабелай Полаччыны. Затое ён быў схільны да ажыццяўлення самастойнай агрэсіўнай знешняй палітыкі ў форме рабаўніцкіх набегаў. Паводле Т. Баранаўскаса, сімвалічным канцом полацкай улады над Літвой можна лічыць 1183 г., калі літоўцы ўчынілі набег на Пскоў. Як слушна заўважае літоўскі гісторык, гэта быў першы набег, самастойна ажыццёўлены літоўцамі, якія, каб прайсці да Пскова, мусілі ў дадатак парушыць і полацкія межы.[81] Паводле звестак «Слова пра паход Ігараў», каля 1185 г. літоўцы абрынуліся і на саму Полаччыну, нанесшы паражэнне Ізяславу Васількавічу, які загінуў у ходзе ваенных дзеянняў.[82] Цяжкасць паражэння палачан пацвярджаецца знаёмымі нам падзеямі 1186 г., калі яны аказаліся няздольнымі да супраціўлення кааліцыі смалян, наўгародцаў, driучан і лагажан. Магчыма, прычынай таму былі страты ў вайне з літоўцамі.

Аднак Т. Баранаўскас яўна згушчае фарбы, калі кажа аб поўным спусташэнні Полаччыны і гібелі ўсёй Усяслававай дынастыі. Ніводная крыніца не паведамляе нам аб такой ваеннай катастрофе. Полаччыне ўдалося даволі хутка аднавіць свае сілы. У 1191 г. полацкія князі і палачане ў Вялікіх Луках заключылі рэдкі для сябе мір з наўгародцамі, узначаленымі князем Яраславам, і дамовіліся ўзімку рушыць альбо на чудзь (эстаў), альбо на Літву.[83] Памылкова называючы замест чудзі земгалаў, Тацішчаў дадае, што кожны бок пасобку выканаў свае намеры. Так, палачане ажыццявілі па-

---

[80] Алексеев Л. В. *Смоленская земля в IX–XIII вв.* С. 230.
[81] Baranauskas T. *Lietuvos valstybės ištakos*. 263.
[82] Слово о пълку Игореве. С. 172–173.
[83] Новгородская первая летопись. С. 40.

ход на Літву.[84] Наўрад ці яны аднавілі там свой ранейшы ўплыў, але, прынамсі, баланс сіл быў адноўлены. Праз пэўны час старыя сувязі і ўзаемныя інтарэсы пераважылі варожасць, і ў 1198 г. «придоша полочяне съ Литвою на Лукы и пожгоша хоромы, а лучане устерегошася и избыша въ городе». Наўгародцы выправіліся ў паход у адказ, але палачане сустрэлі іх «з паклонам» на возеры Касплі, дзе і быў заключаны мір.[85] Саюз з Літвой, аднак, не пратрываў доўга, бо ўжо ў 1201 г. літоўцы ўварваліся ў полацкую Земгалію і пакінулі яе пры вестках аб уварванні полацкага князя ў Літву.[86] Такім чынам, адносіны Полацка з Літвой у XII ст. перажылі эвалюцыю ад безумоўнага падпарадкавання Літвы Полацку ў першых двух трэцях стагоддзя праз адасабленне Літвы і ўзаемную варожасць у 1180-х – пачатку 1190-х гг. да нетрывалага саюзу на мяжы XII–XIII стст., які перамяжаўся сутыкненнямі.

Яшчэ больш небяспечным для Полацкай зямлі было развіццё падзей у падуладным ёй Ніжнім Падзвінні. У 1184 г. у землі ліваў з Германіі дзеля пропаведзі прыбыў святар-аўгустынец Мейнард. З дазволу полацкага князя ён збудаваў у Ікесколе царкву і пачаў распаўсюджваць хрысціянства сярод ліваў.[87] Але неўзабаве ён выявіў амбіцыі, мала сумяшчальныя з захаваннем полацкай улады над Падзвіннем. У 1186 г. Мейнард быў узведзены рымскім папежам у годнасць біскупа, пасля чаго ад улады духоўнай застаўся адзін крок да прэтэнзій на свецкую ўладу над лівамі. Незадаволены варожасцю ліваў да хрысціянства, у 1193–1194 гг. Мейнард дамогся ад папежа фармальнага абвяшчэння крыжовага паходу на ліваў.[88] Пасля ягонай смерці ў 1196 г. біскупам у Ікесколе быў прызначаны Бертольд, які хутка перайшоў ад пропаведзяў да дзеянняў. Рэкрутаваўшы ў Саксоніі дастатковую колькасць крыжаносцаў, у 1198 г. ён даў бітву лівам. Сам Бертольд загінуў у баі, але спусташэнне крыжаносцамі ліўскіх ніваў вымусіла ліваў скарыцца і прыняць хрост. Так крыжакам удалося атрымаць кантроль над збудаванымі яшчэ

---

[84] Татищев В. Н. *История Российская.* Т. 3. 22[31]. С. 153.
[85] Новгородская первая летопись. С. 44.
[86] Heinrici Chronic. Lyvon. V, 3. C. 109.
[87] Ibid. I, 2–4. C. 52.
[88] Ibid. I, 12. C. 54.

пры Мейнардзе замкамі Ікескола і Гольм.[89] Цяпер узброеная сіла чужынцаў ужо стаяла ва ўмацаваных пунктах на тэрыторыі, якая лічылася полацкай. У тым жа 1198 г. новым біскупам стаў Альберт.[90] У 1200 г. ён ужо наважыўся ўзяць у заложнікі 30 сыноў ліўскіх старэйшын, чым забяспечыў іх пакорлівасць,[91] а таксама забараніў гандаль у старой земгальскай гавані Даўгмале, якой карысталіся як балтыйскія плямёны, так і русіны з літоўцамі.[92] У 1201 г. пры вусці Дзвіны быў заснаваны горад Рыга, які стаў апірышчам біскупскага панавання над Лівоніяй.[93] Стала ясна, што крыжаносцы прыйшлі, каб застацца. Абвешчаны папежам крыжовы паходператвараў усё паўночнаеўрапейскае рыцарства ў патэнцыйную крыніцу вайсковай сілы для лівонскіх біскупаў. Толькі ў 1198 г. Альберт усклаў на Готландзе знак крыжа на 500 чалавек.[94] Пагроза страты Падзвіння стала для Полацка больш чым рэальнай.

Міжнароднае становішча Полацка на рубяжы XII–XIII стст. было заканамерным вынікам яго знешнепалітычнай лініі на працягу ста гадоў. Неразважлівая барацьба з Манамахам і Мсціславам у першай трэці XII ст. прывяла да часовай страты незалежнасці, наступнага палітычнага заняпаду і лавіравання паміж рознымі групоўкамі князёў Русі, саюзы з якімі ўцягвалі Полацкую зямлю ў непатрэбныя ёй войны і марнавалі яе сілы. Калі Усяслаў Брачыславіч маніпуляваў князямі Русі ў сваіх інтарэсах, то ягоныя эпігоны самі былі паслухмянай зброяй у руках кіеўскіх, смаленскіх, суздальскіх і чарнігаўскіх князёў. Першымі зразумелі гібельнасць такой палітыкі менскія князі. Пасля смелых, але няўдалых спроб аб'яднання Полацкай зямлі пад сваім кіраваннем яны адмовіліся ад прэтэнзій на магутнасць, аднак уніклі вялікіх непрыемнасцяў. Полаччына ж працягвала блытацца ў дынастычным павуцінні звад рускіх князёў. Толькі аднавіўшы сваю сілу на ўсходніх рубяжах у 1190-я гг., полацкія князі выпусцілі з рук кантроль над Літвой і Ніжнім

---

89 Heinrici Chronic. Lyvon. II, 1–7. C. 54–57.
90 Ibid. III, 1. C. 108.
91 Ibid. IV, 4. C. 108–109.
92 Ibid. IV, 7. C. 109.
93 Ibid. V, I. C. 109.
94 Ibid. III, 2. C. 108.

Падзвіннем. Таму надыход новага стагоддзя адзначыў для Полаччыны рубеж, за якім яе чакалі тры прынцыпова новыя знешнепалітычныя задачы. Першай было забеспячэнне сваіх інтарэсаў у адносінах з іншымі землямі Русі без марнай траты сіл і рэсурсаў. Другой задачай было ўмацаванне сваіх паўночна-заходніх рубяжоў, адкуль бяспецы Полаччыны пагражала крыжацкая агрэсія. Трэцяй і самай складанай задачай было ўсталяванне стасункаў з Літвой на новай аснове. Вырашэнне альбо невырашэнне гэтых трох задач мусіла вызначыць і лёс Рагвалодавічаў як палітычнай і вайсковай эліты Полацкай зямлі.

Калі Полацкая зямля рана набыла незалежнасць ад Кіеўскай дзяржавы і мусіла абараняць яе ў крывавых войнах, то шлях Смаленскай зямлі да самастойнасці быў нашмат лягчэйшы. Як спелы плод натуральным чынам паказваецца з абалонкі, якая абараняла і гадавала яго доўгі час, а затым распалася, так і Смаленшчына ціха вылучылася з распаўшайся Кіеўскай дзяржавы. Хаця смаленскія князі былі вядомыя як выдатныя ваяры і часта бывалі ў дальніх паходах, асноўнай рысай іх палітыкі было ўменне ставіць на першае месца забеспячэнне інтарэсаў менавіта Смаленскай зямлі і рабіць гэта па магчымасці мірнымі спосабамі. Такая палітыка пазбавіла Смаленскую зямлю ваенных разбурэнняў і дазволіла ёй на працягу ўсяго XII стагоддзя падтрымліваць высачэзны ўзровень магутнасці і ўплыву сярод сваіх суседзяў.

У 1113 г. смаленскім сталом валодаў сын Уладзіміра Манамаха Вячаслаў. У 1116 г. ён з ваяводам Фамой Раціборавічам хадзіў да Даростала ў дапамогу мяцежнаму візантыйскаму царэвічу Леону.[95] Ваярам з беларускіх земляў ізноў давялося пабачыць сіні Дунай, але Леон быў падступна атручаны і паход скончыўся нічым. Па смерці Манамаха і адпаведным перадзеле сталоў у 1125 г. Смаленск дастаўся Расціславу Мсціславічу, які стаяў ля вытокаў магутнасці Смаленскай зямлі і заставаўся яе добрым геніем на працягу больш як сарака гадоў. Свае намаганні ён дзяліў паміж прымнажэннем і ўладкаваннем сваёй зямлі, дзе потым стала замацаваліся і яго сыны, і дапамогай іншым Манамахавічам у барацьбе за дамінаванне ў цэлай Русі. Поспехаў ён

---

95 Ипатьевская летопись. Ст. 284.

дасягнуў і ў адным, і ў другім. Як лічыць Л. Аляксееў, у ходзе барацьбы паміж Манамахавічамі і Ольгавічамі каля 1127 г. ён захапіў у чарнігаўскіх князёў землі паўночных радзімічаў, заклаўшы асновы княскага дамена на Смаленшчыне.[96] Працягваючы свой удзел у антыольгавіцкіх кааліцыях, Расціслаў у 1138 г. разам з палачанамі і прадстаўнікамі іншых рускіх земляў узяў ўдзел у арганізаванай кіеўскім князем Яраполкам Уладзіміравічам блакадзе Ноўгарада, дзе князем быў Святаслаў Ольгавіч,[97] а ў 1139 г. разам з Яраполкавай кааліцыяй хадзіў на Чарнігаў супраць Усевалада Ольгавіча.[98] Далей падзеі прынялі трывожны для Смаленска абрыс, бо Усевалад здолеў захапіць Кіеў у 1140 г. і нават «искаше подъ Ростиславомъ Смоленьска».[99] Аднак Усевалад пераацаніў свае сілы і настроіў супраць сябе не толькі Манамахавічаў, але і бліжэйшых сваякоў. У выніку далейшага развіцця падзей Расціслаў з палком у 1142 г. прайшоў вайной па Ольгавіцкіх уладаннях каля Гомеля.[100] Пагроза Смаленску адпала, і Расціслаў заміры́ўся з Усеваладам, беручы ўдзел у яго паходах 1144 і 1146 гг. на Уладзіміра Галіцкага.[101]

Пасля смерці Усевалада ў 1146 г. кіеўскі стол заняў Ізяслаў Мсціславіч. З гэтага моманту удзел Смаленска ў паўднёварускіх справах актывізаваўся. Прычыны для таго былі важкія. Як кажа Мітрафан Доўнар-Запольскі, разам з Ноўгарадам і Кіевам Смаленск быў неад'емным звяном ажыўленага гандлёвага шляху паміж Балтыйскім, Чорным і Каспійскім морамі, а падтрыманне бяспекі гэтага шляху складала абавязковую ўмову яго эканамічнага працвітання. Тут і палягалі карані намаганняў Расціслава да цеснага саюзу з Кіеўскай зямлёй.[102] Да таго ж, утрыманне разам з саюзнікамі ў сваіх руках лініі Ноўгарад – Смаленск – Кіеў як апорнага слупа Русі дазваляла дабіцца перавагі над іншымі палітычнымі групоўкамі і набыць вялікую ступень кантролю над Руссю. Нельга выключаць і прычыны афектыўнага

96 Алексеев Л. В. *Смоленская земля в IX–XIII вв.* С. 126–127, 198.
97 Новгородская первая летопись. С. 210.
98 Ипатьевская летопись. Ст. 301.
99 Тамсама. Ст. 304.
100 Тамсама. Ст. 311.
101 Тамсама. Ст. 315–317, 319–320.
102 Довнар-Запольский М. *Очерк истории Кривичской и Дреговичской земель до конца XII столетия.* С. 104–105.

характару. Для Расціслава кіеўскі стол меў вялізны маральны аўтарытэт. Ілюзія еднасці Русі была яшчэ жывой, і можна было спадзявацца, што Кіеў можа вярнуць сабе статус не толькі намінальнага, але і рэальнага цэнтру Русі. Гэта і штурхала Расціслава перш на дапамогу Ізяславу ў ягоных спробах утрымаць і узвялічыць Кіеў, а затым і на ўласныя захады да здабыцця кіеўскага стала.

Але Расціслаў таму і меў рэпутацыю выдатнага палітыка, што не збіраўся дасягаць сваіх мэтаў любым коштам. Ён не хацеў ставіць Смаленскую зямлю пад удар варожых полчышчаў ці марнаваць яе рэсурсы для дасягнення выніку дзесьці далёка на поўдні Русі. Расціслаў браўся за паўднёвыя справы толькі пры спрыяльных абставінах. Такія абставіны былі створаныя ўкняжаннем ягонага брата Ізяслава, з якім Расціслава лучылі асабліва блізкія адносіны і ўзаемаразуменне.[103] Ён слушна лічыў, што іх братні дуумвірат мог кантраляваць Русь, калі Расціслаў браў на сябе клопат аб верхніх землях, Ізяслаў жа займаўся ніжнімі. Але і тут Расціслаў не лічыў непрымальным ухіліцца ад удзелу ў барацьбе за Кіеў, калі яркі, але занадта эмацыйны Ізяслаў дапускаў памылкі, якія каштавалі яму стала. У гэтым выпадку смаленскі князь аддаваў перавагу вырашэнню ўнутраных пытанняў Смаленшчыны і звяртаў мала ўвагі на поўдзень. Такую разумную і пралічаную палітыку «выбарачнага ўдзелу» ён пакінуў у спадчыну і сваім сынам.

У саюзе з Ізяславам Расціслаў мусіў процістаяць кааліцыі Ольгавічаў і Юр'я Даўгарукага. У 1147 г. Святаслаў Ольгавіч напаў на падуладны Смаленску маленечкі балцкі востраў – племя голядзь на Протве. Захопленыя людзі былі выведзеныя ў палон, бязвінна апынуўшыся ахвярай бессэнсоўных звад. У тым жа годзе па даручэнні Святаслава полаўцы зваявалі вярхі Угры.[104] Ізяслаў і Расціслаў у адказ зваявалі Чарнігаўскую зямлю.[105] Заключыўшы ў 1148 г. мір з Ольгавічамі і Давыдавічамі, Ізяслаў і Расціслаў выступілі ў паход на Растоўска-Суздальскую зямлю, але Ольгавічы і Давыдавічы іх не падтрымалі і паход праваліўся.[106] Затое Юры Даўга-

---

[103] Довнар-Запольский М. *Очерк истории...* С. 107–108.
[104] Ипатьевская летопись. Ст. 339, 342.
[105] Тамсама. Ст. 357–359.
[106] Тамсама. Ст. 370–372.

рукі сабраў вялізнае войска і нанёс удар на поўдзень. Нягледзячы на нежаданне кіяўлян біцца, Ізяслаў адкінуў памяркоўныя мірныя прапановы Юр'я і даў бой пад Пераяслаўлем. Двухдзённая бітва 22 і 23 жніўня 1149 г. скончылася паражэннем Ізяслава і Расціслава. Апошні быў вымушаны ўцячы ў Смаленск, а Юры сеў на кіеўскім стале.[107]

Расчараванне Расціслава палітыкай Ізяслава праявілася ў тым, што ў наступныя гады ён займаўся амаль выключна ўнутранымі справамі і не ўдзельнічаў у другім узыходжанні Ізяслава на кіеўскі стол у 1151 г. Перамена ў яго настроі выявілася толькі пасля таго, як Ізяслаў пачаў праводзіць больш узважаную лінію. Гэта выразілася ў тым, што ён назваў старога Вячаслава Уладзіміравіча, якому раней учыніў шмат крыўд, сваім бацькам, запрасіў яго на княжанне ў Кіеў і прызнаў за ім намінальнае першынство.[108] Такі падзел улады ў Кіеве значна пашырыў яе падтрымку ў паспалітым людзе, сярод якога Вячаслаў быў папулярны за мяккасць і «просты» нораў. Да двух князёў далучыўся і Расціслаў. Смаленскае войска адыграла ключавую ролю ў адбіцці ад Кіева ў канцы лістапада 1151 г. новага наступлення Юр'я Даўгарукага.[109] Затым задача Расціслава заключалася ў тым, каб на поўначы адцягваць на сябе сілы Юр'я, пакуль Ізяслаў на поўдні вёў паспяховыя кампаніі супраць Ольгавічаў.

У наступныя некалькі гадоў трыумвірат Ізяслава, Вячаслава і Расціслава цешыўся непараўнальным уплывам на справы цэлай Русі. Але ў 1154 г. раптоўна памёр Ізяслаў Мсціславіч. Вячаслаў адразу ж выклікаў Расціслава ў Кіеў, аднак неўзабаве смерць напаткала і яго. Расціслаў заняў кіеўскі стол, але прайграў бітву пад Кіевам Ізяславу Давыдавічу і вымушаны быў вярнуцца на смаленскае княжанне. Па дарозе дадому ён сустрэўся са сваім дзядзькам Юр'ем Даўгарукім, які ў чарговы раз рухаўся на адваяванне Кіева, гэтым разам праз смаленскія ўладанні.[110] Паміж былымі праціўнікамі быў заключаны саюз, але пляменнік з дзядзькам так ніколі і не сталі давяраць адзін аднаму і нават патаемна падтрымлівалі адзін супраць аднаго розныя групоўкі чарні-

---

107 Ипатьевская летопись. Ст. 375–383.
108 Алексеев Л. В. *Смоленская земля в IX–XIII вв.* С. 203–204.
109 Ипатьевская летопись. Ст. 431–441.
110 Тамсама. Ст. 471–477.

гаўскіх князёў. Справа скончылася тым, што Расціслаў адправіў сына Рамана ў дапамогу свайму старому ворагу Ізяславу Давыдавічу на Юр'я ў 1158 г. Разам з тым у смаленскага князя хапала дальнабачнасці і вытрымкі не ўступаць у адкрытае сутыкненне з суздальскім самаўладцам і не дамагацца дарагой і нетрывалай улады над Кіевам. Замест гэтага Расціслаў асцярожна і планамерна распаўсюджваў сваю ўладу ў Верхняй Русі. У 1157 гг. ён дамогся перадачы наўгародскага стала свайму сыну Святаславу, а Новага Торгу – Давыду. У 1158–59 гг. ён падтрымаў Рагвалода Барысавіча ў барацьбе за полацкі стол з Расціславам Глебавічам, у выніку зрабіўшы ўсю Полацкую зямлю за выключэннем Менска сваім пратэктаратам.

Расціслаў зрабіў наступны захад да кіеўскага стала толькі пасля смерці Юр'я ў Кіеве ў 1158 г. і выгнання адтуль Ізяслава Давыдавіча ў 1159 г., хаця гэта і каштавала яму спусташэння смаленскай воласці Ізяславам і полаўцамі ў 1160 г.[111] Сеўшы на стале свайго дзеда, бацькі і брата, ён атрымаў магчымасць заняцца агульнарускімі справамі, перадаўшы смаленскі стол сыну Раману. Расціслава палітыка на кіеўскім стале ўяўляла сабой тонкі баланс паміж забеспячэннем інтарэсаў Смаленшчыны і распаўсюджваннем панавання сваёй сям'і на цэлай Русі. Асцярожны князь дасягаў гэтага, размяркоўваючы рускія ўдзелы паміж сваімі сынамі такім чынам, каб забяспечыць іх узаемную дапамогу і падтрымку і выключыць іх сутыкненні паміж сабой. У той час, як Раман трымаў вотчынны Смаленск, Святаслаў у Ноўгарадзе, Рурык у Оўручы, Мсціслаў у Тарапцы, а Давыд пераходзячы з горада ў горад, утваралі найтрывалейшую кааліцыю, з якой мусіў лічыцца любы іншы прэтэндэнт на ўплыў на Русі. У 1160 г. Расціслаў замацаваў свой уплыў на Чарнігаўшчыне паходам на Ушчыж.[112] Кіеўскі полк Рурыка, смаленскі полк Рамана разам з саюзнымі чарнігаўцамі, палачанамі і галічанамі аддалі горад пад кантроль саюзнага Расціславу Святаслава Ольгавіча. У 1165 г. Давыд Расціславіч сеў у Віцебску, што ператварала гэты ўдзел са смаленскага пратэктарату ў смаленскае ўладанне. У далейшым Давыд

[111] Ипатьевская летопись. Ст. 508
[112] Тамсама. Ст. 508–509.

атрымаў ва ўдзел Вышгарад на Кіеўшчыне, які на доўгія гады стаў асноўным апорным пунктам аперацый Расціславічаў на поўдні, адкуль яны маглі падтрымліваць саюзных кіеўскіх князёў і пагражаць Кіеву ў выпадку заняцця тамтэйшага стала кімсьці варожым.[113] У 1167 г. Раман Расціславіч прыняў удзел у разгроме Валадара Глебавіча, паставіўшы полацкіх князёў пад свой поўны кантроль. Не забываючыся на агульнарускія інтарэсы, у тым жа 1167 г. Расціслаў даслаў аб'яднаныя войскі многіх князёў з удзелам Рурыка, Мсціслава і Давыда для аховы ад полаўцаў гандлёвых караванаў на Дняпры пад Каневам.[114] На працягу свайго кіравання Расціслаў не толькі ўпэўнена трымаў у сваіх руках уладу над значнай часткай Русі, але і заклаў асновы магутнасці сваіх сыноў.

Расціслаў памёр 14 сакавіка 1167 г., пакінуўшы па сабе добрую памяць магутнага ваяра, разумнага правіцеля і заступніка сваёй Смаленшчыны. Сыны працягнулі ягоную справу, абачлівай палітыкай адстойваючы свае інтарэсы. Смаленскі стол захаваў Раман, а кіеўскі стол Расціславічы пакінулі Мсціславу Ізяславічу. Мір з ім доўга не пратрымаўся. Мсціслаў заключыў саюз з наўгародцамі, якія выгналі ад сябе Святаслава Расціславіча. У адказ смаляне разам з палачанамі і суздальскім князем Андрэем Багалюбскім блакавалі зносіны наўгародцаў з Кіевам.[115] Калі Расціславічы не адчувалі за сабой досыць сілы і права дабівацца Кіева па смерці бацькі, то цяпер саюз з магутным Андрэем надаў ім упэўненасці. 1168 г. быў адзначаны грандыёзным паходам кааліцыі Рамана, Рурыка, Давыда і Мсціслава Расціславічаў, Мсціслава Андрэевіча, палачан, разанцаў і мурамцаў на Кіеў. Войскі саюзнікаў сабраліся ў Вышгарадзе і пасля трохтыднёвай аблогі 12 сакавіка 1169 г. узялі Кіеў. Упершыню за доўгія гады міжусобных войнаў узяцце слаўнай сталіцы суправаджалася такой непараўнанай жорсткасцю з боку саміх жа русінаў. Горад быў бязлітасна абрабаваны і часткова спалены. Паўночныя ваяры не пашкадавалі нават цэркваў. Многіх кіяўлян засеклі падчас уварвання, а шмат было выведзена ў палон.[116] Падзенне Кіева зрабіла незабыўнае

---

113 Алексеев Л. В. *Смоленская земля в IX–XIII вв.* С. 215.
114 Ипатьевская летопись. Ст. 527–528.
115 Новгородская первая летопись. С. 32.
116 Ипатьевская летопись. Ст. 544–545.

ўражанне на сучаснікаў. Яно адзначыла не толькі заняпад яго рэальнай палітычнай моцы, але і падзенне яго славы і аўтарытэту, на якім уплыў Кіева яшчэ трымаўся, у вачах усёй Русі.

Адпаведным чынам змянілася і паўднёвая палітыка Расціславічаў. Пацвердзіўшы ў чарговы раз сваю сілу і ўплыў на агульнарускія справы, яны яшчэ менш ахвотна, чым іх бацька, сталі прадпрымаць захады да кантролю над былой сталіцай Русі. Не адмаўляючыся цалкам ад актыўнага ўдзелу ў паўднёварускіх справах, яны пераважна абапіраліся на сузор'е сваіх паўднёвых гарадоў: Вышгарада, Оўруча і Белгарада. Займаць Кіеў яны лічылі патрэбным толькі ў выпадку збегу ўсіх спрыяльных абставін. Гэтым самым быў зроблены яшчэ адзін крок да канчатковага афармлення Смаленскай зямлі і іншых удзелаў у самастойныя дзяржавы і развітання са спадчынай Кіеўскай дзяржавы.

Падзенне Кіева пакінула на Русі два асноўных цэнтры прыцягнення сілы: Расціславічаў і Андрэя Багалюбскага. Першапачаткова паміж імі ўсталяваліся прыязныя адносіны. Пасля кіеўскай кампаніі Раман і Мсціслаў Расціславічы разам з суздальцамі, мурамцамі, разанцамі і палачанамі хадзілі на Ноўгарад, але пацярпелі там цяжкае паражэнне. Неўзабаве папсаваліся і адосіны з Андрэем. У 1173 г. у выніку складаных перыпетый Раман Расціславіч сеў на кіеўскім стале. Але Андрэй цяпер патрабаваў у Расціславічаў выдачы людзей, нібыта вінаватых у атручэнні яго брата Глеба. Напаткаўшы адмову, ён загадаў братам ачысціць Кіеў, Вышгарад і Белгарад. Раман у працяг традыцыйнай лініі па-добраму сышоў з Кіева, але іншыя браты былі менш схільныя да кампрамісаў. Разышоўшыся па сваіх гарадах, яны сустрэлі вялізнае войска Андрэя пад камандаваннем ягонага сына Юр'я, што складалася з прадстаўнікоў мала не ўсёй Русі, якая дрыжала перад грознай воляй суздальскага ўладара. Андрэй вымусіў ісці на Кіеў нават Рамана. Усё ж у выніку геаічнай абароны Мсціславам Расціславічам Вышгарада і наступных ваенных дзеянняў на Дняпры ў верасні 1173 г. суздальцы пацярпелі паражэнне і вымушаныя былі адступіць.[117]

---

[117] Ипатьевская летопись. Ст. 572–578.

Расціславічы ізноў ухіліліся ад кантролю над Кіевам і толькі затым паспрабавалі вырашыць праблемы шляхам перамоў, папрасіўшы ў Андрэя згоды на вяртанне Рамана на кіеўскі стол. Згода не спатрэбілася, бо Андрэй быў забіты ў выніку баярскай змовы, і Раман мог ізноў бяскроўна вярнуцца ў Кіеў. Княжанне ягонае там працягнулася да 1176 г., калі дасланыя ім войскі пацярпелі паражэнне ад полаўцаў пад Растоўцам. Адной з прычын паражэння быў факт спазнення Давыда Расціславіча на поле бою. Святаслаў Усеваладавіч Чарнігаўскі імгненна скарыстаўся гэтым як нагодай, каб запатрабаваць у Рамана выгнання Давыда з Вышгарада. Раман адмовіўся, і ў паветры ізноў запахла вайной. Тады кіеўскі князь, як і раней, выйшаў з горада і накіраваўся да Белгарада. Святаслаў заняў Кіеў. Расціславічы ж пачалі рыхтавацца да баявых дзеянняў. Пачуўшы аб гэтым, Святаслаў пачаў адступленне, якое перайшло ва ўцёкі.[118] Вайна магла працягвацца бясконца, але Раман ізноў праявіў дальнабачнасць і вытрымку. «Раман, разважыўшы дастаткова, што вялікае княжэнне Кіеўскае нічога больш акрамя толькі адной назвы не мела, князі ўжо ні за што яго не лічылі і ўсе роўнымі быць яму меліся, а гарадамі і воласцямі, якія здаўна ўласна да яго, як Пераяслаўль, Драўляне і да Луцка належалі, усе іншыя князі завалодалі і ніякіх прыбыткаў і войскаў, акрамя Кіева, не засталося, і толькі дзеля гэтага імені многа так крыві льецца і дзяржава спусташаецца, дзеля таго вырашыў, варожасці ўнікаючы, саступіць яго Святаславу, які так зацята яго дамагаецца. І даслалі яму сказаць ад усёй брацці: «Мы не хочам больш варагаваць, але шукаючы міру і спакою Рускай зямлі, аддаем табе Кіеў».[119]

Намінальны цэнтр Русі дастаўся Святаславу, рэальная ж улада над ёй – Расціславічам. Гэты факт нязменна прыводзіў Ольгавіча ў ярасць. У 1180 г. заклапочаны тым, што Расціславічы могуць перашкодзіць яму ў барацьбе з растова-суздальскім князем Усеваладам Юр'евічам, Святаслаў вырашыў дзейнічаць на апярэджанне. Ён паспрабаваў захапіць Давыда Вышгарадскага падчас палявання, але той паспеў уцячы да Рурыка. Рурык стаў збіраць сілы супраць

[118] Ипатьевская летопись. Ст. 603–605.
[119] Татищев В. Н. *История Российская.* Т. 3. 28[30]. С. 114–115.

Ольгавічаў на поўдні, а Давыд накіраваўся ў Смаленск. Па дарозе ён даведаўся аб смерці брата Рамана і заняў смаленскі стол.[120] Чарнігаўцам у саюзе з усёй Полацкай зямлёй удалося адагнаць яго ад Друцка, але ў іншым Смаленская зямля пацярпела вельмі мала. Тым часам на поўдні Рурыку ўдалося дамагчыся перамогі над саюзнымі Усеваладу полаўцамі. Мір быў заключаны на ранейшых умовах: Святаслаў атрымаў Кіеў, Рурык – рэшту Кіеўшчыны. Пазней мір быў змацаваны шлюбамі двух сыноў Святаслава з князёўнамі Манамахавага роду. Ізноў Ольгавічам не ўдалося зрабіць нічога супраць жалезнай хваткі Расціславічаў на Русі. Што яны ні прадпрымалі, расклад сіл вяртаўся да ранейшага становішча, як зачараваны! Усталяваная Расціславам знешнепалітычная сістэма прадэманстравала проста звышнатуральную моц і жыццяздольнасць! Выкарыстоўваючы Кіеў як разменную манету ў гульні супраць Ольгавічаў, Давыд і Рурык выратавалі ад разбурэння свае землі, захавалі рэсурсы і магутнасць і забяспечылі свае доўгатэрміновыя інтарэсы.

Цікава адзначыць, што на палітычную сцэну выходзіла новая сіла, якая была яшчэ менш зацікаўленай у правядзенні Смаленскам актыўнай палітыкі на поўдні. Гэтай сілай было смаленскае веча. Калі Расціславічы мала даражылі Кіевам, але захоўвалі ў Паўднёвай Русі пастаянную прысутнасць, смаленскае паспольства было і зусім схільным да таго, каб абмежавацца абаронай выключна сваіх бліжніх рубяжоў і засяродзіцца на ўнутраных справах. Пасля паражэння ноўгарад-северскага князя Ігара Святаславіча ад полаўцаў у 1185 г. Святаслаў Усеваладавіч выклікаў Давыда Расціславіча з войскам на абарону стратэгічных рубяжоў Русі. Давыд і смаляне дайшлі да сумнавядомага Трэполя на Стугне, калі полаўцы аблажылі Пераяслаўль. Святаслаў загадаў Давыду рушыць на паратунак гораду, але войска ўзбунтавалася. Маўляў, дайшоўшы да Кіева, яно задачу выканала, а іншай бітвы шукаць не варта. Відавочна, смаляне ўсё больш дбалі пра інтарэсы толькі сваёй зямлі і ўсё менш цікавіліся справамі агульнарускімі.[121]

Тым не менш, у пазнейшыя гады свайго княжання Давыд перайшоў да агрэсіўнай антыольгавіцкай палітыкі. Гэ-

---

120 Ипатьевская летопись. Ст. 614–618.
121 Тамсама. Ст. 647.

тым самым ён пайшоў супраць натуральнай тэндэнцыі засяроджвання на мясцовых інтарэсах, якая ахапіла большасць рускіх земляў. Больш за тое, ён парушыў і ўсталяваную яго бацькам і братам Раманам практыку вырашэння знешнепалітычных праблем па магчымасці мірным чынам. Вынікі атрымаліся не самымі лепшымі. Ужо ў 1190 г. Давыд меў са Святаславам Усеваладавічам нейкія спрэчкі з-за памежных тэрыторый.[122] Пасля смерці Святаслава ў 1194 г. становішча абвастрылася яшчэ больш. Рурык Расціславіч заняў Кіеў і наладзіў там урачыстую сустрэчу Давыду. Браты адчулі сябе на вяршыні магутнасці і вырашылі з гэтага напоўніцу скарыстацца. Мала таго, што цяпер яны валодалі і Кіевам, яны захацелі нейтралізаваць нават патэнцыйныя пагрозы сабе. Яны запатрабавалі ў Ольгавічаў адмовіцца ад любых прэтэнзій на Смаленск і Кіеў у будучыні. Калі ў дачыненні да Смаленска гэта выглядала лагічна, то гісторыя Кіева пасля распаду Кіеўскай дзяржавы ўяўляла сабой суцэльныя перамены князёў розных фамілій на кіеўскім стале ў адпаведнасці з правам старшынства. Зразумела, такога права ў будучыні Ольгавічы пазбавіцца не хацелі і пагаджаліся на адмову ад Кіева толькі пры жыцці цяперашніх князёў, але не іх дзяцей. У 1195 г. Рурык прапанаваў ім у якасці кампенсацыі Віцебск, але па нейкіх прычынах Ольгавічы захацелі ўзяць горад сілай. Далейшыя падзеі прывялі да апісанага намі віцебскага паражэння Давыда.[123] У дадатак смаленскія ўладанні былі спустошаныя саюзнікам Ольгавічаў Раманам Уладзіміравічам. Давыд разам з Рурыкам і Усеваладам Юр'евічам у адказ ваяваў падуладных Чарнігаву вяцічаў. Вынікі вайны былі для смаленскага князя несуцяшальнымі. Ольгавічы заключылі патрабаваную дамову, але без працягу яе на наступныя пакаленні. Але і такі сціплы вынік быў дасягнуты цаной значных ахвяр. Смаленская зямля, што раней рэдка цярпела ад нашэсцяў, цяпер сама спазнала цяжар вайны. Па заканчэнні гэтай вайны, 23 красавіка 1197 г., Давыд Расціславіч памёр.[124]

Падсумоўваючы знешнепалітычную гісторыю Смаленскай зямлі ў XII ст., мы можам па праву назваць яе адной з

---

122 Голубовский П. В. *История Смоленской земли.* Киев, 1896. С. 283.
123 Ипатьевская летопись. Ст. 688–693.
124 Ипатьевская летопись. Ст. 702–706.

найшчаслівейшых земляў тагачаснай Русі. Дасягнуўшы магутнасці і ўнікнуўшы вялікіх страт, яна была абавязана гэтым палітычнаму таленту сваіх князёў. Здабыўшы самастойнасць без барацьбы са сваёй метраполіяй, Смаленшчына нават патрапіла скарыстоўваць Кіеў як складнік знешнепалітычных камбінацый, закліканы забяспечваць яе інтарэсы. Расціслаў, Раман і да пэўнай ступені Давыд разглядалі спакой і заснаваны на гандлі эканамічны росквіт свайго краю ў якасці прыярытэту. Кіеўскія землі яны разглядалі як пярэдні край абароны, якім можна было завалодаць пры спрыяльных абставінах, але які выгодна было аддаваць саперпікам у якасці разменнай карты, каб пакінуць за сабой рэальную ўладу і ўплыў у рэгіёне. Пакуль смаленскія князі прытрымліваліся такой палітыкі, яны былі здольныя адужаць любую пагрозу звонку. Моц Ольгавічаў узрастала і падала. Тыраны з растоўскіх і суздальскіх земляў прыходзілі з вялікімі арміямі толькі каб праз кароткі час ганебна адкаціцца назад. Расціслаў жа і ягоныя сыны нязменна заставаліся важнейшым элементам палітычнага ландшафту ключавога для іх Прыдняпроўя. Прадуманасць і эфектыўнасць гэтай палітыкі стала яшчэ больш яскравай, калі Рурык і Давыд адмовіліся ад яе і ўступілі ў барацьбу за Кіеў дзеля прывідных дынастычных інтарэсаў. Для Смаленскай зямлі вынікам былі ваенныя паражэнні, страта кантролю над Полаччынай, падзенне ўплыву ў Ноўгарадзе і спусташэнне ўласных земляў. Нельга перабольшваць маштабы гэтых няўдач. Нават і пасля іх Смаленшчына заставалася ў зеніце сваёй славы і была роўнай любому саперніку. Аднак можна пагадзіцца з П. Галубоўскім і Л. Аляксеевым у тым, што Давыд Расціславіч пакінуў зямлю сваім наступнікам у горшым стане, чым прыняў яе ад Рамана.[125] Характэрныя для Русі XII ст. крызісныя палітычныя з'явы хоць і не ахапілі Смаленскую зямлю, але закранулі яе. Галоўнай знешнепалітычнай задачай смаленскіх эліт на будучыню было пераадоленне гэтых з'яў і захаванне ўзроўню сваёй магутнасці.

Шлях, якім рушыла Тураўская зямля, не быў падобны ні да полацкага, ні да смаленскага. На працягу цэлых ста

---

[125] Алексеев Л. В. *Смоленская земля в IX–XIII вв.* С. 230. Голубовский П. В. *История Смоленской земли.* С. 289.

гадоў, да смерці ў 1113 г. Святаполка Ізяславіча Тураўская зямля ўтульна пачувалася ва ўлонні ўладанняў кіеўскіх князёў. Як зямля, якая найбліжэй прылягала да Кіеўшчыны, Тураўшчына пры Уладзіміры, Яраславе, Ізяславе і Святаполку кіравалася старэйшым сынам кіеўскага князя і знаходзілася ў прывілеяваным становішчы. Тэрыторыя Тураўскай зямлі ў гэты перыяд прыкладна адпавядала ранейшай племяннной тэрыторыі дрыгавічоў, раскінуўшыся ад Дняпра на ўсходзе да падляшскіх земляў па Бугу на захадзе.

Разам з тым прыналежнасць кіеўскім князям стала прычынай нявызначанага прававога статусу Тураўшчыны. З аднаго боку, яе паходжанне ад старога племяннога княжання, тэрыторыя і палітычная роля ў Русі давалі ёй права лічыцца такой жа самастойнай зямлёй, як і любая іншая. Сталае панаванне ў зямлі дынастыі Ізяслава Яраславіча было добрым аргументам на карысць прынцыпу спадчыннага ўладання. Гэта падкрэслівалася і тым фактам, што і ў часы княжання ў Кіеве Святаслава і Усевалада Яраславічаў Тураў заставаўся за Ізяслававым родам.[126] З іншага боку, Тураў мог разглядацца як прыдатак Кіеўскай зямлі і не лічыцца самастойнай зямлёй. У такім выпадку на яго распаўсюджваўся прынцып старшынства. Таму разам са зменамі вялікіх князёў на кіеўскім стале, па іх волі з рук у рукі мусіў пераходзіць і Тураў, што ішло насуперак інтарэсам мясцовай знаці і паспольства. Кожная з гэтых дзвюх пазіцый выкарыстоўвалася рознымі палітычнымі групоўкамі ў сваіх мэтах. Як тое вядзецца, перамагаў пункт гледжання таго, на чыім баку была сіла. А сіла ў першай палове XII ст. была не на баку спадчынных прэтэндэнтаў Ізяславічаў.

Адразу ж па заняцці кіеўскага стала ў 1113 г. Уладзімір Манамах пазбавіў дзейнага і энергічнага Яраслава Святаполчыча тураўскага княжання, пакінуўшы яму толькі Уладзімір-Валынскі. Яраслаў мог яшчэ спадзявацца заняць кіеўскі стол пасля смерці Манамаха, але калі стала ясна, што той збіраецца перадаць уладу ў рукі сваім сынам, у 1117 г. наважыўся на ўзброенае выступленне. Абложаны ва Уладзіміры, ён быў вымушаны прызнаць вяршэнства Манамаха над сабой, але доўга такога становішча не вытрымаў

---

[126] Лысенко П. Ф. *Туровская земля IX–XIII вв.* С. 255.

і на наступны год уцёк у Венгрыю.[127] У 1123 г. ён вярнуўся да Уладзіміра з вялізным войскам палякаў, чэхаў, венграў і сваіх валынскіх саюзнікаў, аднак двое палякаў працялі яго кап'ём, калі ён рабіў рэкагнасцыроўку мясцовасці вакол горада.[128] Пасля ягонай гібелі Тураў на доўгі час аказаўся пад уладай Манамахавічаў, а Ізяславічы аказаліся на перыферыі рускай палітыкі. Іх прадстаўнікі ўтрымаліся толькі на паўночнай ускраіне Тураўскай зямлі, у Клецку (Клечаску), дзе ў 1128 г. сядзеў сын Яраслава Святаполчыча Вячаслаў.[129]

Пасля смерці Уладзіміра Манамаха і чарговага перадзелу княскіх сталоў у Тураве апынуўся Вячаслаў Уладзіміравіч. У 1128 г. ён удзельнічаў у кааліцыйным паходзе на Полацкую зямлю. Пасля смерці Мсціслава Уладзіміравіча ён у садружнасці з братам Юр'ем і Андрэем прымусіў наступнага кіеўскага князя Яраполка Уладзіміравіча аддаць яму Пераяслаўль, вывеўшы адтуль Ізяслава Мсціславіча. У Пераяслаўлі, аднак, Вячаслаў не ўтрымаўся і ў 1134 г. вярнуўся ў Тураў, выжыўшы адтуль... Ізяслава Мсціславіча![130] Нядзіўна, што на працягу доўгіх гадоў затым Ізяслаў усялякім чынам заціскаў свайго дзядзьку і не прызнаваў яго законных правоў на кіеўскі стол. Пасля смерці Яраполка ў 1139 г. Вячаслаў паспрабаваў сесці на кіеўскі стол, але быў сагнаны з яго хітрым і спрытным Усеваладам Ольгавічам.[131] Гэтая няўдалая спроба не паспрыяла дружалюбным адносінам Вячаслава з іншымі рускімі князямі ў будучыні.

Ужо ў 1142 г. Усевалад ужыў у дачыненні да Тураўшчыны прынцып старшынства і заявіў аб яе прыналежнасці да Кіева. «Посла Всеволодъ ис Киева на Вячьслава, река: «Седеши во Киевьскои волости, а мне достоить. А ты поиди в Переяславль отциноу свою». Вячаслаў падпарадкаваўся і сышоў, а Тураў дастаўся Святаславу Усеваладавічу. Усеваладавы браты Ігар і Святаслаў адчулі сябе абойдзенымі. Як кажа летапіс, «и бысть братьи его тяжко сердце». Усевалад вырашыў кампенсаваць іх за кошт нованабытай Тураўскай зямлі і прапанаваў ім Берасце, Драгічын, Чартарыйск і Клецк.

[127] Ипатьевская летопись. Ст. 284–285.
[128] Тамсама. Ст. 287–288.
[129] Тамсама. Ст. 292.
[130] Ипатьевская летопись. Ст. 294–295.
[131] Тамсама. Ст. 302–304.

Гэта іх не задаволіла, і яны вырашылі самі паклапаціцца аб сабе, адшукаўшы адабраўшы ў Вячаслава Пераяслаўль. Там браты Ольгавічы пацярпелі паражэнне і вымушаныя былі вярнуцца да Усевалада і шукаць з ім пагаднення. У выніку Ігару дасталіся Юр'еў, Рагачоў і Гарадзец, Святаславу – Клецк і Чартарыйск, а Уладзіміру і Ізяславу Давыдавічам – Ушчыж, Берасце і Драгічын.[132] Гэта быў чорны дзень тураўскай гісторыі, калі паблякла слава старой дрыгавіцкай зямлі. Землі Пабужжа, Падняпроўя, Паўднёвага Палесся і паўночных дрыгавічоў ужо не належалі Тураву. Пад яго кантролем засталася толькі цэнтральная частка былой дрыгавіцкай воласці.

Гэтыя падзеі былі адной з нагод, якія далей падштурхнулі паспольства Тураўскай зямлі да ўсведамлення сваіх інтарэсаў і імкнення да дзяржаўнай самастойнасці. Ужо ў тым самым 1142 г. па дамоўленасці з Усеваладам у Тураў вярнуўся Вячаслаў Уладзіміравіч, які гэтую зямлю ўжо добра ведаў і прымаў яе інтарэсы як свае. Смерць Усевалада Ольгавіча ў 1146 г. стала яму сігналам да дзеяння. Ён імгненна заняў Рагачоў, Берасце, Клецк і іншыя адарваныя ад Тураўшчыны гарады. Магчыма, гэтая акцыя і скончылася б поспехам, але Вячаслаў захапіў і Уладзімір-Валынскі, дзе пасадзіў свайго пляменніка. Захоп Уладзіміра справакаваў рэакцыю з боку Ізяслава Мсціславіча, які тым часам заняў кіеўскі стол. Ён накіраваў на Вячаслава Расціслава Мсціславіча Смаленскага і былога тураўскага князя Святаслава Усеваладавіча. Тураў быў заняты, а князем там быў зроблены Яраслаў Ізяславіч. У палон былі выведзеныя тураўскі біскуп Акім і пасаднік Жыраслаў Яванкавіч, што сведчыць аб мясцовай падтрымкай дзеянняў Вячаслава, якія не былі індывідуальнай княскай авантурай, а служылі інтарэсам усёй зямлі.[133] Крыху запознена ў параўнанні з іншымі землямі Русі Тураўшчына таксама ступіла на шлях адасаблення, праявамі чаго былі: імкненне да замацавання на тураўскім стале асобнай княскай дынастыі і правядзенне незалежнай ад Кіева палітычнай лініі. Чалавек, які гэтую палітыку праводзіў, аднак аказаўся не зусім удалым выбарам для такой

---

132 Ипатьевская летопись. Ст. 310–312.
133 Тамсама. Ст. 330.

задачы. Мяккі, «просты» і схільны да кампрамісаў Вячаслаў Уладзіміравіч, хоць і меў сімпатыю да Турава, не здолеў супрацьстаяць ціску сваіх старых сапернікаў Святаславічаў, асабліва іх ольгавіцкай лініі, а таксама сваіх пляменнікаў Мсціславічаў і вымушаны быў адмовіцца ад сваіх намераў.[134] Тураў застаўся пад уладай Кіева.

Між тым час для Тураўшчыны выцякаў. Прынцып старшынства імкліва адыходзіў у гісторыю. Землі Русі літаральна на вачах станавіліся вотчынамі розных галін княскіх родаў. Зямля, якая не паспела заявіць аб сваіх прэтэнзіях на самастойнае дзяржаўнае жыццё і абзавесціся ўласнай дынастыяй, рызыкавала падпасці пад уплыў суседзяў, якія б ставіліся да яе як да безнадзейнай перыферыі і выкарыстоўвалі як разменную манету. Ілюстрацыяй да гэтага былі падзеі 1149 г., якія датычыліся той самай Тураўскай зямлі. У тым годзе пасля перамогі Юр'я Даўгарукага над Мсціславічамі і яго-нага ўкняжання на кіеўскім стале ў Кіеў быў выкліканы Уладзімір Давыдавіч Чарнігаўскі. Тут жа неадкладна ягоны стрыечны брат і Юр'еў саюзнік Святаслаў Ольгавіч прад'явіў яму тэрытарыяльныя патрабаванні. «Держиши отчину мою. И тогда взя Курескъ и с Посемьемь и Сновскую тисячу оу Ислава, и Слоучьскъ, и Клечьскъ, и вси Дрегвиче».[135] Браты «тако ся оуладивше», але сам гэты невялічкі эпізод, як невялічкае люстэрка, ярка адбіў агульную тэндэнцыю спадчыннага замацавання земляў на Русі. Святаслаў, які авалодаў некаторымі дрыгавіцкімі землямі ў выніку недарэчнага пагаднення з Усеваладам у 1142 г., ужо называў іх сваёй вотчынай і заяўляў на іх прэтэнзіі Ізяславу, які меў на іх гэтак жа мала права! Больш за тое, ён ужо без ценю сораму дамагаўся ўсіх дрыгавіцкіх земляў! Пры такім развіцці падзей Тураўская зямля рызыкавала быць проста разабранай на часткі ў выніку дынастычных спрэчак. У 1154 г. падчас свайго кароткага знаходжання на кіеўскім стале Расціслаў Мсціславіч ізноў аддаў Тураў і Пінск Святаславу Усеваладавічу.[136] Неўзабаве Юры Даўгарукі, пераняўшы Кіеў, аддаў Тураў сыну Барысу,[137] не забыўшыся ўзнагародзіць

---

[134] Довнар-Запольский М. *Очерк истории Кривичской и Дреговичской земель до конца XII столетия.* С. 116–118.

[135] Ипатьевская летопись. Ст. 384.

[136] Тамсама. Ст. 471.

Святаслава Ольгавіча Мазыром. Пасля смерці Юр'я Барыс захаваў Тураў, але Кіеў і, адпаведна, вярхоўная ўлада над Тураўскай зямлёй дасталіся Ізяславу Давыдавічу. Становішча выглядала трывожна.

Паратунак з'явіўся ў выглядзе прадстаўніка дынастыі, якая доўгі час ужо не фігуравала сярод волатаў рускай палітыкі, але даўняя памяць пра якую жыла на Тураўшчыне. У 1158 г. у Тураве як *deus ex machina* з'явіўся сын смелага Яраслава Святаполчыча Юры і сеў на стол сваіх дзедзіч. Дзе бавіўся ён дзесяцігоддзі пасля смерці бацькі, сказаць цяжка. М. Доўнар-Запольскі лічыць, што ён валодаў Берасцейшчынай і вярхоўямі Прыпяці.[138] П. Лысенка дапускае магчымасць таго, што ён быў служылым князем.[139] Ва ўсялякім разе, у зямлі ён быў прыняты як законны і жаданы князь. А праціўнікаў было нямала. Наколькі важнае значэнне надаваў адваяванню Турава Ізяслаў Давыдавіч, паказвае склад кааліцыі, якая выступіла супраць мяцежнага Яраславіча: Яраслаў Луцкі, Яраполк Андрэевіч, галічане, Рурык Расціславіч са смалянамі, Уладзімір Мсціславіч, палачане, на ўдзел якіх у гэтай вайне мы звернем асаблівую ўвагу ніжэй, і качэўнікі-бярэндзічы. Пад горадам адбываліся жорсткія сутычкі. Акрамя вылазак Юры рабіў Ізяславу пастаянныя прапановы аб міры, але той хацеў неадменна дабіцца вяртання Турава і Пінска. Нечаканае падзенне коней ад пошасці вымусіла саюзнікаў кінуць аблогу і вярнуцца дадому.[140] Усё ж тураўцам рана было святкаваць перамогу. У 1160 г. яны адбілі наступленне кааліцыі валынскіх князёў Мсціслава Ізяславіча, ягонага брата Яраслава і Яраполка Андрэевіча. Прастаяўшы пад горадам тры тыдні, валыняне мусілі адступіць.[141] Толькі ў 1162 г. Расціслаў Мсціславіч, ужо вялікі князь кіеўскі, заключыў з Юр'ем мір.[142] Мір гэты тураўскага князя быў замацаваны і распаўсюджаны на іншыя лініі Манамахавічаў шлюбам Малфрыды Юр'еўны з Усеваладам, сынам Яраслава Ізяславіча ў 1167 г.[143]

---

137 Ипатьевская летопись. Ст. 479.
138 Довнар-Запольский М. *Очерк истории Кривичской...* С. 119.
139 Лысенко П. Ф. *Туровская земля IX–XIII вв.* С. 258–259.
140 Ипатьевская летопись. Ст. 491–492.
141 Тамсама. Ст. 510.
142 Тамсама. Ст. 520.
143 Тамсама. Ст. 527.

З вяртаннем на тураўскі стол Ізяславічаў самастойнасць Тураўскай зямлі аформілася канчаткова. З укняжаннем уласнай дынастыі піраміда дзяржаўнай будовы Тураўшчыны набыла завершаны выгляд. Тое, што не ўдалося мяккасардэчнаму Вячаславу Уладзіміравічу, ажыццявіў прадпрымальны Юры Яраславіч. У яго і яго спадкаемцаў хапіла кемлівасці, каб усвядоміць абмежаванасць рэсурсаў зямлі, якая страціла вялікую частку тэрыторыі і насельніцтва, і таму абмежавацца ўтрыманнем свайго і не спакушацца цяжкадасягальнымі мэтамі. Тураўскія князі не праводзілі ў адносінах да суседзяў агрэсіўнай палітыкі і нават не спрабавалі адваяваць страчаныя землі. Паслядоўна і настойліва яны займаліся ўнутранымі справамі зямлі, у знешніх пытаннях абмяжоўваючыся следаваннем у рэчышчы палітыкі мацнейшай на канкрэтны момант княскай групоўкі. Распад зямлі на асобныя ўдзелы, які адбыўся дзесьці паміж 1167 і 1174 гг., не суправаджаўся ўнутранымі войнамі, а абагульненне летапісцам розных прадстаўнікоў дынастыі пад назвай князёў тураўскіх і пінскіх дае падставы думаць аб іх мірных узаемаадносінах і каардынацыі іх знешняй палітыкі.[144]

З аднолькавай паслухмянасцю князі Тураўскай зямлі абаранялі Паўднёвую Русь ад полаўцаў і пустошылі яе па загаду іншых рускіх князёў. У 1162 г. Святаполк Юр'евіч хадзіў на полаўцаў з Мсціславам Ізяславічам. У 1167 г. Глеб Юр'евіч па загаду Расціслава Мсціславіча ўдзельнічаў у канеўскай варце. У 1171–1172 гг. Святаполк разам з выгнаным Мсціславам Ізяславічам удзельнічаў у ягоных кампаніях супраць Кіева. У 1173 г. князі тураўскія, пінскія і гарадзенскія былі ў дасланым Андрэем Багалюбскім на Расціславічаў войску. Нарэшце Мсціслаў Гарадзенскі, Яраслаў Пінскі і Глеб Юр'евіч Дубровіцкі падзялілі са Святаславам Усеваладавічам і Рурыкам Расціславічам славу бліскучай перамогі над полаўцамі ў 1183 г.[145] У адплату тураўскія князі атрымлівалі спрыянне магутных уладароў Русі ў вырашэнні ўнутраных праблем. Адразу ж пасля заключэння міру паміж Юр'ем Яраславічам і Расціславам Мсціславічам у 1162 г. вялікае войска, якое складалася з атрадаў Рурыка Расціслава-

144 Лысенко П. Ф. *Туровская земля IX–XIII вв.* С. 261.
145 Ипатьевская летопись. Ст. 628–633.

віча, Святаслава і Яраслава Усеваладавічаў, Алега Святаславіча, крыўскіх (відаць, полацкіх) князёў і Святаполка Юр'евіча, хадзіла на Слуцк супраць Уладзіміра Мсціславіча. Апошні вымушаны быў саступіць Слуцк і аддаць сябе пад уладу Расціслава Мсціславіча, які даў яму Трэполь.[146] Такім чынам, лаяльнасць кіеўскаму князю вельмі хутка акупілася адваяваннем раней страчанага Слуцка.

Не здабыўшы вялікай магутнасці і выбітнага становішча паміж іншых рускіх земляў, тураўскія князі ў XII стагоддзі асцярожнай палітыкай згоды з мацнейшымі захавалі мір, бяспеку і дабрабыт сваёй зямлі. Гэтую ж лінію паводзін яны працягнулі і ў наступнае стагоддзе. Пры змяненні знешнепалітычнага раскладу сіл у рэгіёне Тураўская зямля была патэнцыйным саюзнікам для ўзнікаючых прэтэндэнтаў на гегемонію.

Перш чым перайсці да разгляду ваеннай гісторыі Літвы і яцвягаў, варта сказаць некалькі словаў пра заселеныя русінамі панямонскія землі, якія межавалі непасрэдна альбо нават цераз палосна з яцвяжскімі і літоўскімі тэрыторыямі. У XII ст. яны заставаліся на другім плане ваенных і палітычных перыпетый, але ўжо ішлі па шляху палітычнага і эканамічнага развіцця, які вывеў іх на першыя ролі ў падзеях стагоддзя наступнага. Паколькі дзяржаўная арганізацыя панямонскіх рускіх земляў мела свае карані ў падтрыманай полацкімі і кіеўскім князямі каланізацыі, князі панямонскіх гарадоў працягвалі падтрымліваць цесныя сувязі з метраполіяй, захоўвалі ёй вернасць і без пярэчанняў выстаўлялі свае вайсковыя кантынгенты для сумесных кампаній. Князі Гародні (Горадна), вядомыя па летапісных звестках з 1116 г., знаходзіліся ў сферы палітычнага ўплыву кіеўскіх, а затым валынскіх князёў. Гарадзенскі князь Усеваладка на загад Мсціслава Уладзіміравіча Кіеўскага прыняў удзел у паходзе на Полацкую зямлю ў 1128 г. і ў карнай экспедыцыі ў Літву ў 1131 г. Ягоныя дзеці Барыс і Глеб падзялілі славу кааліцыйнай перамогі над Уладзімірам Галіцкім у 1144 г. У 1168, 1170 і 1184 гг. гарадзенскія ваяры бралі ўдзел у змаганні з полаўцамі.[147] Дзякуючы сваёй аддаленасці ад асноўных цэн-

[146] Ипатьевская летопись. Ст. 521.
[147] Гісторыя Беларусі. Т. 1. С. 210–211.

траў палітычнага жыцця Русі, Панямонне пазбегнула многіх знясільваючых міжусобіц, але самастойнай сілай яшчэ не стала.

У той час, як палітычнае развіццё земляў Русі ўступіла ў перыяд крызісу, землі Літвы і яцвягаў толькі яшчэ стаялі на парозе ўзнікнення дзяржаўнасці. Суседства з Полацкай зямлёй і кіеўскімі ўладаннямі служыла паскаральнікам унутрыпалітычных працэсаў на балцкіх землях і з'яўлення аддзеленай ад рэшты грамадства ўлады. Асновай узнікаючай улады служыў вайскова-дружынны слой на чале з князямі.

Дакладны час афармлення літоўскай дзяржаўнасці вызначыць цяжка. Тагачасныя летапісы і хронікі мала звяртаюць увагі на Літву і яцвягаў, якія рэдка выходзяць з ценю Русі. Т. Баранаўскас, абапіраючыся на апісанне ўнутранага ладу «каралеўства» Нецімера і дадзеныя аб інтэнсіўным будаўніцтве драўляных замкаў у якасці княскіх рэзідэнцый, лічыць, што XI ст. было часам узнікнення Літоўскага княства на аснове аднайменнай зямлі аўкштайцкага культурнага арэалу.[148] Мы можам прызнаць блізкасць Нецімеравага «каралеўства» да таго, што трапляе пад азначэнне дзяржавы. Пры гэтым слабасць ці адсутнасць культурнага слою ў многіх драўляных замках гаворыць аб іх большай блізкасці да ранейшых гарадзішчаў-сховішчаў, чым да княскіх рэзідэнцый. Вылучэнне і спецыялізацыя ўлады не выглядаюць настолькі яскравымі. Калі працягваць аналогію з Руссю ці з любой іншай раннесярэднявечнай дзяржавай, нам здаецца, што больш выразным паказчыкам спеласці дзяржаватворчых працэсаў з'яўляецца актывізацыя ваеннай дзейнасці. Паколькі асноўнымі функцыямі ўлады на золку дзяржаўнасці з'яўляецца абарона грамадства ад знешніх ворагаў і, наадварот, памнажэнне магутнасці і багацця шляхам агрэсіі супраць суседзяў, індыкатарам трываласці ўлады можа быць дасягнуты ёй узровень вайсковай арганізацыі, дастатковы як для абароны сваёй зямлі, так і для наступальных дзеянняў. Таму паспрабуем выкарыстаць актывізацыю ваенных дзеянняў балтаў супраць іх суседзяў як паказчык станаўлення іх дзяржаўнасці. Гэты ж паказчык можа быць ужыты і для вызначэння ранніх цэнтраў яе ўзнікнення.

---

148 Baranauskas T. *Lietuvos valstybės ištakos*. 259.

Яшчэ ў XI ст. мы бачым балцкія землі ўцягнутымі ў барацьбу з Полацкам і Кіевам. Гэтыя войны насілі выразна абарончы характар і не маглі яшчэ сведчыць аб дастатковым узроўні літоўскай і яцвяжскай вайсковай арганізацыі. Такое становішча захавалася і на пачатку XII ст. У 1112 г. «Ярославъ ходи на Ятвязь сынъ Святополчь и победи я».[149] Але, відаць, сіла супраціўлення яцвягаў вырасла, і дасягнутую перамогу спатрэбілася замацаваць, бо ў наступным годзе «ходи Ярославъ сынъ Святополчь на Ятьвягы второе и победи я».[150] Да гэтага ж часу адносяцца першыя ненадзейныя звесткі аб наступальных ваенных дзеяннях з боку літоўцаў. Гал Анонім паведамляе нам аб ваенных дзеяннях польскага караля Баляслава III Крываротага супраць прусаў у пачатку XII ст.[151] Тэадор Нарбут дадае, што ў няўдалым нападзе прусаў на Мазовію ў 1112 г. удзельнічалі і літоўцы.[152] Выключаць магчымасць гэтага нельга, але, ведаючы вольнае абыходжанне Нарбута з фактамі, залішне давяраць яго наму паведамленню таксама не варта.

У другой чвэрці XII ст. літоўцы і яцвягі ўжо становяцца сілай, здольнай уплываць на зыход міжусобных войнаў паміж князямі Русі і Польшчы. У якасці прыкладу можна яшчэ раз згадаць паход Мсціслава Уладзіміравіча на Літву ў 1131 г. Мсціслаў не мог лічыць пакарэнне Полацкай зямлі скончаным, пакуль не быў нанесены ўдар Літве як асноўнаму полацкаму васалу і крыніцы яго вайсковай сілы. Сам гэты факт гаворыць аб многім. Яшчэ больш уражвае і падкрэслівае ўзрослую моц Літвы той факт, што, нягледзячы на спусташэнне сваёй тэрыторыі кіеўскім войскам, літоўцы былі ў стане аказаць годнае супраціўленне і разбіць адзін з кіеўскіх палкоў, у той час як палачане мусілі здацца Мсціславу без бою.

Важным фактарам сілы яцвягаў і літоўцаў быў іх саюз з прусамі, з чым даводзілася лічыцца і польскім, і рускім правіцелям. У 1145 г. Усевалад Ольгавіч накіраваў сваіх братоў Ігара і Святаслава па іх жа просьбе ў дапамогу кракаўскаму князю Уладзіславу супраць ягоных братоў Баляслава і

[149] Ипатьевская летопись. Ст. 273.
[150] Лаврентьевская летопись. Ст. 289.
[151] Gall. Anon. II, 42. III, 24. С. 132.
[152] Narbutt, Teodor. *Dzieje starożytne narodu litewskiego*. Wilno, 1838. Т. 3. 279–280.

Мешка. Баляслаў з Мешкам вымушаныя былі заключыць мір, аддаўшы Уладзіславу некалькі сваіх гарадоў, а Ігару Ольгавічу – Візну ў Мазовіі.[153] Не будзем забывацца, што ў 1142 г. Ігару ўжо дасталіся некалькі ўдзелаў Тураўскай зямлі, якая прылягала да яцвяжскіх земляў з паўднёвага ўсходу. Перадача яму Візны, якая ляжала паміж прускімі і яцвяжскімі землямі, забяспечвала сям'і Ольгавічаў сувязь з балцкімі плямёнамі і магчымасць з іх дапамогай умешвацца ў польскія справы. Менавіта гэта і было зроблена ў 1146 г., калі русіны і прусы забяспечылі Уладзіславу перамогу над ягонымі братамі. Перамога, аднак, аказалася кароткатрывалай і для Уладзіслава, які неўзабаве ўцёк у Германію, і для Ольгавічаў. Смерць Усевалада Ольгавіча аддала кіеўскі стол Ізяславу Мсціславічу, які ўжо ў 1147 г. дапамог Баляславу IV Кучараваму войскамі ў яго паходзе супраць прусаў.[154] Такім чынам, калі Ольгавічы падтрымлівалі з прусамі і яцвягамі сяброўскія адносіны, то Манамахавічы былі зацікаўленыя ў іх паслабленні. У 1149 г. ужо Ізяслаў звярнуўся да Баляслава па дапамогу ў барацьбе за Кіеў, з якога быў толькі што выгнаны Юр'ем Даўгарукім. Баляслаў з братам Індрыхам (Генрыхам) рушылі ў паход, але Мешка вымушаны быў застацца ў Польшчы «стеречи земли своея от Прус».[155] Як адзначае У. Т. Пашута, «для польскіх князёў яцвяжская пагроза заставалася, як відаць, суворай рэальнасцю».[156] Падзеі ў прускіх і яцвяжскіх землях былі важным чыннікам і рускай палітыкі, паколькі аказвалі ўплыў нават на зыход барацьбы за Кіеў.

Літоўскія атрады ўзялі годны ўдзел і ва ўжо закранутых намі войнах паміж рознымі галінамі рускіх княскіх родаў, а таксама іх барацьбе са знешнімі ворагамі. Пад 1158 г. летапіс адзначае саюз менскага князя Валадара Глебавіча з Літвой, на лясным памежжы якой ён збіраў сілы для барацьбы з Рагвалодам Барысавічам. Саюз гэты і ўдзел літоўцаў у ваенных прадпрыемствах Валадара ў вялікай ступені спрычыніліся да паражэнняў, нанесеных ім палачанам у 1162 г. пад Гарадцом і ў 1167 г. на Дзвіне. Пасля заканчэння

---

[153] Ипатьевская летопись. Ст. 318.
[154] Пашуто В. Т. *Внешняя политика Древней Руси.* С. 155.
[155] Ипатьевская летопись. Ст. 385.
[156] Пашуто В. Т. *Внешняя политика Древней Руси.* С. 155.

гэтага этапу міжусобных войнаў у Полацкай зямлі літоўцы засталіся яе даннікамі і адзначыліся ў пераможным паходзе полацкіх і чарнігаўскіх князёў супраць Давыда Расціславіча Смаленскага на Друцк у 1180 г. У 1182 г. летапіс згадвае яцвягаў у складзе войскаў Усевалада Белзскага ў яго вайне з Польшчай за землі Пабужжа.

Удзел у такіх буйных кампаніях наступальнага характару важка сведчыць аб высокай ступені вайсковай арганізацыі Літвы і яцвягаў у той час, што магло быць дасягнута толькі пры дзяржаўным уладкаванні грамадства. Таму мы можам лічыць, што другая і трэцяя чвэрці XII ст. былі часам, калі ўнутраная эвалюцыя літоўскіх і яцвяжскіх земляў пры паскараючым ўплыве з боку Полаччыны і іншых земляў Русі дазволіла ім зрабіць скачок ад ваеннай дэмакратыі да раннесярэднявечнай дзяржавы.

Наступны крок у развіцці балцкіх земляў быў зроблены ўжо не ўнутры, а вонкі. Скарыстаўшыся з паслаблення Русі, Літва парвала ланцугі данніцкай залежнасці ад яе і перайшла да самастойнай агрэсіўнай знешняй палітыкі. Сімвалічнай датай здабыцця Літвой самастойнасці можа лічыцца 1183 г., калі «бишася пльсковици съ Литвою, и много ся издея зла пльсковицемъ».[157] Першая самастойная кампанія літоўцаў супраць Пскова, ажыццёўленая праз тэрыторыю Полацкай зямлі, былога гегемона Літвы, была пралогам для іх далейшых ваенных поспехаў. Каля 1185 г. надышла чарга і Полаччыны, па якой былыя полацкія даннікі прайшліся агнём і мечам, аб чым з сумам кажа «Слова пра паход Ігараў»: «И Двина болотом течет оным грозным полочаном под кликом поганых. Един же Изяслав, сын Васильков, позвони своими острыми мечи о шеломы литовскыя, притрепа славу деду своему Всеславу, а сам под чрълеными щиты на кроваве траве притрепан литовскыми мечи. Исхыти юна кров, а тьи рек: «Дружину твою, княже, птиц крилы приоде, а звери кровь полизаша». Не бысть ту брата Брячислава, ни другаго – Всеволода. Един же изрони жемчюжну душу их храбра тела чрес злато ожерелие. Унылы голоси, пониче веселие, трубы трубят городенскии».[158] Літоўцы не абмяжо-

---

157 Новгородская первая летопись. С. 37.

158 Слово о пълку Игореве, Игоря, сына Святъславля, внука Ольгова. С. 173.

ўваліся нападамі на Русь. Зімой 1184–1185 гг. яны, «спустошыўшы Лівонію, вельмі многіх вывелі ў палон».[159] Вынікам гэтага набегу было тое, што Мейнарду ўдалося пераканаць ліваў даць згоду на будаўніцтва замкаў Ікескола і Гольм для абароны ад літоўцаў.

Гэтымі паспяховымі набегамі Літва заявіла не толькі аб сваёй дзяржаўнай самастойнасці, але і аб прэтэнзіях на ролю аднаго з магутных чыннікаў міжнародных адносін у рэгіёне. Неўзабаве, аднак, пераможнае шэсце балцкіх дружын па рускіх землях сустрэла перашкоды. Князі розных земляў незалежна адзін ад аднаго ацанілі літоўскую і яцвяжскую пагрозу і ажыццявілі захады для яе спынення. Ачуняўшы ад паражэнняў, палачане ўжо ў 1191 г. заключылі саюз з Ноўгарадам і здзейснілі паход на Літву. Літоўскую і яцвяжскую небяспеку добра ўсведамлялі і на поўдні. У 1190 г. у паход на Літву выправіўся Рурык Расціславіч Оўручскі, які «пошелъ на Литву и бысть в Пинески оу тещи своея и оу шюрьи своея тогда, бо бяше свадба Ярополча, и бсть тепло, и стече снегъ, и не лзе бо имъ доити земли ихъ, и възвратишася въ свояси».[160] У 1193 г. Рурык паўтарыў сваю спробу, але Святаслаў спыніў яго няшчырымі ўгаворамі: «Брате и сватоу, ажь ты идешь из очины своея на свое ороудье, а язъ паки идоу за Днепръ своих деля ороудеи, а в Роускои земли кто ны ся останеть?»[161]

Тое, што не ўдалося зрабіць Рурыку, ажыццявіў іншы рускі князь. Зімой 1196–1197 гг. валынскі князь Раман Мсціславіч рушыў на яцвягаў «отомыщиваться бяхоуть бо воевали волость его». «И тако Романъ вниде в землю ихъ, они же могоучи стати противоу силе его и бежаша во свои тверди, а Романъ пожегъ волость ихъ, и отомъстився возвратися во свояси».[162] Яшчэ раней Раманаў меч зведала Літва. Аб гэтых падзеях, якія адбываліся ў першай палове – сярэдзіне 1180-х гг., кажа «Слова пра паход Ігараў»: «Многи страны – Хинова, Литва, Ятвязи, Деремела и Половци – сулици своя повъргоша, а главы своя подклониша под тыи

---

[159] Heinrici Chronic. Lyvon. I, 5. С. 53.
[160] Ипатьевская летопись. Ст. 672.
[161] Тамсама. Ст. 676.
[162] Тамсама. Ст. 702.

мечи харалужныи».[163] Але маштаб ягоных дзеянняў супраць балтаў быў нашмат большым, чым простая помста за набег. Раман цвяроза ацэньваў сур'ёзнасць пагрозы з боку ваяўнічых яцвягаў і Літвы. Таму ён не абмяжоўваў свае дзеянні ваеннымі акцыямі, але імкнуўся вырваць самыя карані набегаў і пазбавіць балтаў магчымасці наносіць шкоду яго землям. Валынскі князь выводзіў літоўцаў і яцвягаў у палон на землі Паўднёвай Русі і сілай саджаў іх на зямлю, прымушаючы займацца сельскай гаспадаркай. Жорсткае абыходжанне валынскага гаспадара дало такі плён, што літоўская фальклорная традыцыя захавала памяць аб аграрных эксперыментах Рамана на многія стагоддзі. У прыватнасці, польскі храніст XVI ст. Мацей Стрыйкоўскі (праўда, блытаючыся ў падзеях і прыпісваючы барацьбу з Літвой Раману Расціславічу) перадае прымаўку, якая існавала сярод літоўцаў: «Рамане, Рамане! Ліхам сябе корміш, Літвою арэш!»[164] Звесткі гэтыя пацвярджаюць і перапісчыкі Іпацьеўскага летапісу, характарызуючы Рамана як чалавека, які «Литвою оравъ».[165]

Русь была не адзіным бар'ерам на шляху балцкіх набегаў. Не лепшым чынам склалася для яцвягаў сітуацыя на заходнім напрамку. У 1192–1193 гг. супраць іх выступіў польскі кароль Казімір Справядлівы. Цяпер яцвягі, ці, як іх называюць польскія хронікі, «палешане», «народ надзвычай жорсткі, жахлівейшы за любога лютага звера» і слаўны сваімі набегамі на суседзяў, мусілі цярпець спусташэнне сваёй зямлі польскім войскам. Перш за ўсё Казімір накіраваў свой удар на драгічынскага князя, саюзніка яцвягаў. «Замкнёны ў сценах горада, які з'яўляецца сталіцай княства і называецца Драгічын, князь аказаўся настолькі ўціснуты нягодамі аблогі, што не толькі здаўся паводле закону, але і прыняў умовы вечнага рабства».[166] Калі польскае войска ўварвалася затым у яцвяжскія землі, іх насельнікі хаваліся ў самых цяжкадаступных месцах і не прымалі бітвы. Каб змусіць іх да пакорлівасці, «жытлы іх Казімір знішчыў

---

163 Слово о пълку Игореве, Игоря, сына Святъславля, внука Ольгова. С. 172.

164 Stryjkowski M. *Kronika Polska, Litewska, Żmódska i wszystkiéj Rusi.* Warszawa, 1846. Tom I. VI, 1. 202.

165 Ипатьевская летопись. Разночтения из Ермолаевского списка. С. 83.

166 Vinc. Kadl. IV. 19. С. 108.

паходнямі, рассек ударамі дроцікаў і мячоў, і пасля таго як усё згарэла, найзнатнейшыя людзі ўсёй правінцыі паляшан з узнятымі рукамі і нахіленымі шыямі ўпалі да ног Казіміра, молячы пашкадаваць рэшткі радзімы і іх жыццё».[167] Казімір атрымаў ад яцвягаў запэўненні ў пакорлівасці і абяцанні выплаты даніны і з перамогай вярнуўся дадому.

Поспехі літоўцаў і яцвягаў аказаліся нетрывалымі. Карыстаючыся нязгодамі паміж удзельнымі князямі, яны маглі спустошыць асобныя ўдзелы той ці іншай зямлі. Разам з тым сіл літоўцаў і яцвягаў відавочна не ставала, каб ажыццявіць паспяховы набег на Полаччыну ці Валынь, калі мясцовым князям удавалася пераадолець узаемныя супярэчнасці і выступіць адзіным фронтам. Больш за тое, набегі правакавалі ўдары польскіх і рускіх правіцеляў у адказ, што наносіла вялікую шкоду палітычнай магутнасці, эканоміцы і дэмаграфіі балцкіх земляў. Менавіта такіх вынікаў дасягнулі ваенныя акцыі 1192 і 1196 гг. І вайскова-дружынны слой, і паспольства ў Літве і Ятвязі яўна разлічвалі на іншае. Логіка развіцця іх ранняй дзяржаўнасці патрабавала не проста набегаў на суседнія землі, але сапраўднай экспансіі, аналагічнай той, якую ажыццяўляла Русь у IX–X стст., і накіраванай на падпарадкаванне суседзяў і пашырэнне свайго ўплыву і магутнасці. Каб дасягнуць такога выніку, літоўскія і яцвяжскія князі мусілі прытрымлівацца больш вытанчанай палітыкі. Толькі абапіраючыся на саюзы з асобнымі землямі Русі супраць іншых палітычных сіл рэгіёну, яны маглі кампенсаваць слабасць сваіх рэсурсаў і дасягнуць поспеху.

Такім натуральным саюзнікам для Літвы быў былы яе сеньёр – Полацкая зямля. У саюзе з ёй літоўцы маглі ажыццяўляць паспяховыя набегі на наўгародскія землі і Смаленшчыну, абрабаванне і палітычнае паслабленне якіх было выгодным і для Літвы, і для Полацка. Важным фактарам саюзу быў геаграфічны. У выпадку пагоні полацкія ўладанні былі шчытом, які надзейна прыкрываў літоўцаў ад помсты іх ахвяр. Знакам павароту палітычнай лініі Літвы быў вядомы нам ваенны саюз 1198 г., у рамках якога літоўцы і палачане спустошылі Вялікія Лукі. Мы таксама маем цьмяныя звесткі Рыфмаванай хронікі аб сумеснай аперацыі палачан

[167] Chronic. Polon. Maior. 43. C. 127.

і літоўцаў каля 1200 г. супраць крыжаносцаў у Лівоніі пад Кукейносам:

Здарылася ў хрысціян у Лівоніі
У той час бітва.
Яе літоўцы пачалі,
З іншага боку рускі атрад
Да Кокенгузена на поле прыйшоў.
Смерцю там трэба было заплаціць:
Трыста хрысціян там ляжаць засталіся.
І ў паганцаў таксама
Шмат мёртвых засталіся на полі.[168]

Аднак трываласць полацка-літоўскага саюзу не варта перабольшваць. Літоўскія вайсковыя правадыры былі яшчэ далёкімі ад выкшталцонай дыпламатыі і пралічанага вызначэння доўгатэрміновых мэтаў сваёй палітыкі. Як і ў выпадку нарманскіх уладароў Русі IX—X стст., любая магчымасць удалага набегу і хуткага ўзбагачэння магла лёгка пераважыць усе палітычныя меркаванні, а ўчорашні саюзнік мог ператварыцца ў ахвяру. Ва ўсялякім разе, наступны набег на Ноўгарад літоўцы ўчынілі ўжо без палачан, таксама, мусіць, без дазволу прайшоўшы праз іхнія ўладанні. У 1200 г. «Ловоть възяша Литва и до Налюця, съ Белее до Свинорта и до Ворча середу; и гнашася новгородьци по нихъ и до Цьрнянъ, и бишася с ними, и убиша Литвы мужь 80, а новгородьць 15,.. а полонъ вьсь отяша, а избъткъ убежаша».[169] У 1201 г. годзе літоўцы ўзнялі меч ужо непасрэдна супраць полацкіх уладанняў. «Спусціўшыся ўніз па Дзвіне, яны з вялікім войскам накіраваліся ў Земгалію. Аднак, пачуўшы яшчэ да ўварвання туды, што кароль Полацкі прыйшоў з войскам у Літву, яны кінулі земгалаў і паспешліва рушылі назад».[170]

Кантраст паміж вынікамі самастойных ваенных акцый Літвы і праведзеных у саюзе з палачанамі кідаецца ў вочы. Параўнанне паміж спусташэннем Вялікіх Лук і цяжкім ударам па крыжаносцах у Лівоніі з аднаго боку і паражэннем

---

168 Ливонская «Старшая» рифмованная хроника. (Livländische Reimschronik.). 503—511 // Матузова В. И. Назарова Е. Л. *Крестоносцы и Русь.* С. 70.

169 Новгородская первая летопись. С. 45.

170 Heinrici Chronic. Lyvon. V, 3. С. 109.

ад наўгародцаў і хуткім адступленнем з Земгаліі з іншага, было яўна не на карысць апошніх падзей. Разумелі гэта і літоўскія князі. Ранняя літоўская дзяржаўнасць мела ваенізаваны характар і мусіла развіваць сябе праз экспансію на суседнія землі. Гэтая задача была галоўнай для літоўскай знешняй палітыкі ў канцы XII ст. Аднак яе вырашэнне стрымлівалася недастатковай наяўнасцю эканамічных і людскіх рэсурсаў, а таксама сілай яе бліжэйшых суседзяў. Каб пераадолець гэтую неадпаведнасць, літоўскія князі мусілі лепей дастасаваць сваё неаспрэчнае ваеннае майстэрства да вырашэння палітычных задач, а таксама падмацаваць збройную сілу заключэннем палітычных саюзаў.

Увогуле, калі мы кінем уважлівы позірк на кожную з даследаваных намі палітычных адзінак, — Полацкую, Смаленскую, Тураўскую землі, Літву і яцвягаў, — то ясна ўбачым, што кожная з іх жыла ў канцы XII ст. у стане нейкага пералому, які праходзіў паміж развітаннем з мінулым і чаканнем новага. Для палачан, смалян і тураўцаў гэта было развітаннем са спадчынай старой Русі, якая зжыла сябе як палітычнае ўтварэнне і паступова адыходзіла ў цемру стагоддзяў. Адыход гэты быў, аднак, доўгім, цяжкім і пакутлівым. У сілу многіх прычын князі працягвалі крывавую барацьбу за аднаўленне адзінай Кіеўскай дзяржавы ці панаванне на яе аскепках. Нават для Полацкай зямлі, якая вызвалілася ад кіеўскага панавання яшчэ ў пачатку XI ст., XII стагоддзе было кіевацэнтрычным. Палітыка полацкіх князёў была альбо накіраванай супраць Кіева з мэтай захавання сваёй незалежнасці, альбо падпарадкаванай Кіеву ці іншай пануючай на той час у Русі палітычнай групоўцы. У апошнім выпадку гэта рабілася ў выглядзе вымушанага кампрамісу з-за нястачы ў Полаччыны дастатковых сіл для барацьбы. Тады полацкім князям даводзілася весці сваіх ваяроў, каб змагацца пад чужымі сцягамі і за чужыя інтарэсы. У рознай ступені ўдзельнічалі ў войнах на тэрыторыях былой Кіеўскай дзяржавы і Смаленшчына з Тураўшчынай. Бясконцая варажнеча і звады не прынеслі карысці ніводнай з трох гэтых земляў.

Занятыя звадамі паміж сабой, з позіркам, пастаянна звернутым да Кіева, рускія князі не заўважылі, як на іх паўночна-заходняй перыферыі ўзнікла новая сіла, гатовая змагац-

ца з імі за ўплыў і магутнасць у рэгіёне — ваяўнічыя яцвягі і Літва. Але і Літва з яцвягамі, унутраная сіла якіх патрабавала выйсця ў выглядзе экспансіі суседніх земляў, пасля бліскучага пачатку ў 1180-х гг. сутыкнуліся з перашкодамі ў выглядзе моцных яшчэ рускіх княстваў і недахопу ўласных рэсурсаў. Таму і балцкія князі мусілі накіраваць стыхійную энергію набегаў у патрэбнае рэчышча, каб забяспечыць поспех сваёй экспансіі.

Пытанні, якія стаялі перад кожнай з дзяржаў, не абмяжоўваліся патрэбнасцю проста пераасэнсаваць сваё ранейшае становішча і пераставіць націск у выпрабаваных напрамках знешняй палітыкі. Сітуацыя на знешнепалітычнай арэне рэгіёну ўскладнілася з'яўленнем новых дзейных сіл, якія былі патэнцыйна смяротнай пагрозай для ўжо існуючых там дзяржаў. Адной з такіх сіл былі крыжаносцы ў Падзвінні. Сама ідэя крыжовага паходу з мэтай распаўсюджвання каталіцкай версіі хрысціянства не пакідала надзеі на спакойнае жыццё ні русінам-схізматам, ні паганцам-літоўцам. У тэорыі крыжовы паход мусіў скончыцца толькі з абарачэннем у правільную веру ўсіх няверных, на практыцы ж ён мог скончыцца на тым рубяжы, ня якім дазвалялі наяўныя рэсурсы. А рэсурсамі крыжаносцаў былі неверагодная моц папскага стала і шматлікае ваяўнічае заходнееўрапейскае рыцарства. Таму крыжовая небяспека была болей чым рэальнай для Полацка, Літвы, а потым і Валыні з Берасцем, Драгічынам і яе іншымі пабужскімі ўладаннямі. Па гэтай прычыне дзяржавы на беларускіх землях мусілі не толькі паасобку вызначыць шляхі вырашэння сваіх знешнепалітычных праблем. Яны мусілі таксама выпрацаваць узаемапрымальную мадэль адносін, якая б не толькі дазваляла ім эфектыўна вырашаць праблемы ў стасунках паміж сабой з дапамогай саюзаў ці стрымлівання, але і ў патрэбных выпадках выступаць адзіным фронтам супраць знешняй небяспекі.

Такое становішча пералому паміж старым і новым вымушае нас думаць, што гістарычнае значэнне XII стагоддзя заключалася не ў ягоных падзеях саміх па сабе. XII ст. было рыцарсцвенным і бліскучым, але ў той жа час хаатычным і сумбурным. Перапоўненая войнамі, ягоная дзея пакідала ўражанне рачэй таптання на месцы, чым руху наперад і

збірання праблем рачэй, чым іх вырашэння. Таму мы не зробім вялікай памылкі, калі ацэнім гэты перыяд гісторыі беларускіх земляў не столькі па ягоных падзеях, як па тым становішчы, у якое ён па-ставіў Полацкую, Смаленскую, Тураўскую землі і Літву з яцвягамі, і па тых падмурках, якія ён збудаваў для вырашэння ім жа створаных праблем. Аб гэтым і пойдзе гаворка ў наступнай частцы даследавання.

## *Раздзел 2.*
## Уплыў вайны на развіццё грамадства

### А) Ваенны фактар у палітычным развіцці грамадства

На першы погляд, наша імкненне разглядаць XII ст. у асноўным як пралог да наступных падзей можа падацца дзіўнаватым. Гэта выглядае як дэтэктыў з ужо вядомым канцом, бо такія падзеі XIII ст., як утварэнне Вялікага Княства Літоўскага, барацьба з крыжакамі, паступовае праяўленне абрысу будучай Беларусі, дрэйф земляў Русі ў розныя бакі пасля ваенных катастроф сярэдзіны стагоддзя, апісаныя даследчыкамі вельмі падрабязна. Прыгледзеўшыся, мы заўважым, што падабенства да заканчэння дэтэктыва сапраўды прысутнічае. Мы бачым герояў і ў асноўных рысах ведаем іх учынкі, але карані і матывы іх дзеянняў вядомыя слаба, бо, захапіўшыся развязкай падзей, тыя, хто даследаваў XIII ст., менш увагі звярталі на іх завязку. Часта робяцца спробы асэнсаваць найважнейшыя працэсы грамадскага развіцця беларускіх земляў у XIII ст. зыходзячы з семантычнага тлумачэння пэўнай фразы ў летапісе і звесці іх да механічнага набору асобных ваенных і палітычных падзей, якія склаліся пэўным чынам, але пад уплывам выпадковых фактараў маглі скласціся цалкам адрозна, як шкельцы ў калейдаскопе. Гісторыя набывае выпадковы і суб'ектывізаваны характар, залежны ад адвольных учынкаў дзейных асоб і збегу абставін. Будучы аддаленымі на светлавыя гады ад гістарычнага дэтэрмінізму, мы усё ж мусім прызнаць, што падзеі XII ст. ужо праторылі рэчышчы, у якіх персанажам XIII ст. даводзілася дзейнічаць, і да пэўнай ступені прадвызначылі лініі іх паводзін. Таму будзем ласкава прасіць чытача не крыўдаваць на нас за незавершанасць нашага дэтэктыва. Справа гэтая была зроблена яшчэ да нас, і мы толькі спрабуем трошкі дапамагчы майстрам заканчэння разабрацца з завязкай.

Перш за ўсё, нас, вядома ж, будзе цікавіць палітычнае развіццё беларускіх земляў і вайна як дэманічны элемент палітыкі, які з аднолькавай сілай можа дапамагчы сваім гаспадарам дасягнуць чаканых мэтаў ці выйсці з-пад кантролю і іх знішчыць. Асноўным палітычным працэсам XII ст. на той частцы беларускіх земляў, якая належала да Полацкага княства і Кіеўскай дзяржавы, было драбленне існуючых дзяржаў на асобныя ўдзелы. На шэраг удзелаў распалася Полаччына. З Кіеўскай дзяржавы выдзеліліся Смаленская і Тураўская землі, з якіх у меншай ступені Смаленшчына і ў большай Тураўшчына таксама зведалі працэс драблення. З'ява гэтая адбывалася натуральна і нагадвала працэсы ў іншых краінах Еўропы. Развіццё дзяржаўнай інфраструктуры на прасторах Русі рабіла магчымай і мэтазгоднай аўтаномію асобных земляў у супрацьвагу вялізным і няўклюдным раннесярэднявечным дзяржавам, якія страцілі эфектыўнасць і не адпавядалі запытам грамадства. Поспехі мясцовай гаспадаркі ў спалучэнні з яе натуральным характарам стваралі эканамічны падмурак самадастатковасці асобных земляў. Аб'ектыўныя памкненні земляў да самастойнасці знаходзілі прыхільную рэакцыю з боку князёў. Ранейшая сістэма часовага прызначэння князя для кіравання асобнай зямлёй з наступнай ратацыяй рабіла іх становішча нетрывалым і ненадзейным. Укняжанне ў асобнай зямлі і магчымасць перадачы свайго стала ў спадчыну значыла замацаванне іх статуса і задавальненне асабістых амбіцый. Спалучэнне аб'ектыўных патрэбнасцяў земляў і суб'ектыўных імкненняў князёў прывяло да распаду Полацкага княства і Кіеўскай дзяржавы і замацавання на мясцовых сталах асобных дынастый, а войны за адасабленне склалі значную частку падзей палітычнай гісторыі. На этапе заваявання самастойнасці ўнутрыпалітычнае становішча розных полацкіх удзелаў, Смаленскай і Тураўскай земляў характарызавалася супадзеннем інтарэсаў князя, мясцовай знаці і паспольства і адсутнасцю вялікіх канфліктаў паміж імі. Ваенныя акцыі звычайна праходзілі пры актыўным удзеле народнага апалчэння. У гэтай сувязі дастаткова прыгадаць мужную абарону Глебам Усяславічам Менска ў 1104 і 1117 гг. пры падтрымцы насельніцтва, народную падтрымку ваенных мерапрыемстваў Расціслава Мсціславіча Смаленскага ці су-

меснае адстойванне Юр'ем Яраславічам і тураўцамі незалежнасці сваёй зямлі ў 1158 г.

Сітуацыя неўзабаве змянілася. Замацаванне асобных адгалінаванняў Рагвалодавічаў і Рурыкавічаў на мясцовых сталах прывяло да таго, што князі пачалі разглядаць свае землі як «вотчыны», то бок як нейкую дадзенасць, якой вольна было распараджацца паводле свайго жадання. Князі перасталі разглядаць сябе як урадоўцаў, пастаўленых да ўлады са згоды паспольства зямлі дзеля абароны яе інтарэсаў. Дзяржаўны апарат у асобе князёў і іх дружын набываў самадастатковасць і пераследаваў у першую чаргу свае ўласныя інтарэсы. Гэтая тэндэнцыя знайшла выражэнне ў бясконцых войнах паміж князямі з мэтай пераразмеркавання ўдзелаў, памнажэння сваёй магутнасці і ўплыву, набыцця матэрыяльных каштоўнасцяў. Міжкняская барацьба набыла дынастычную форму. Змаганне ішло за інтарэсы княскіх сем'яў, а не земляў. Прэтэнзіі на той ці іншы стол грунтаваліся на прынцыпах старшынства ці спадчыннасці, абумоўленых не інтарэсамі зямлі, а асабістымі роднаснымі адносінамі паміж адгалінаваннямі княскіх родаў. Саюзы паміж князямі часта заключаліся ў форме дынастычных шлюбаў, што пры вызначэнні напрамкаў знешняй палітыкі прыводзіла да перавагі асабістых сувязяў над грамадскімі інтарэсамі. У выніку палітыка на Русі набыла характар найскладанейшага хітраспляцення саюзаў і варожасці паміж шматлікімі адгалінаваннямі княскіх родаў. Другараднага канфлікту з-за перыферыйнага горада магло быць дастаткова, каб прывесці ў рух усю палітычную сістэму Русі з непрадказальнымі наступствамі.

Важным фактарам, які дазваляў князям весці сваю палітыку такім адвольным і эгаістычным чынам, было набыццё імі эканамічнай самастойнасці. XII ст. было часам росту княскай «вотчыны» ў вузкім сэнсе гэтага слова. Калі пад «вотчынай» у шырокім сэнсе разумелася ўся падуладная князю зямля, якой ён кіраваў па спадчынным прынцыпе, «вотчына» ў вузкім сэнсе зводзілася да дамена князя. Дамен быў княскай уласнасцю, а статус ягоных насельнікаў ужо насіў рысы асабістай залежнасці ад князя. Такім чынам, у дамене ўжо можна ўбачыць зародак феадальнай будовы грамадства, якая атрымала развіццё ў пазнейшыя стагоддзі.

Існавалі розныя шляхі ўзнікнення княскага дамена і яго

далейшага росту. Першапачатковы дамен, відаць, уяўляў сабой абшчынную зямлю, прадастаўленую князю дзеля пракорму яго і ягонай сям'і, як то было ў Смаленскай зямлі.[171] Далей ён мог пашырацца як мірным, так і гвалтоўным шляхам. Першы шлях ішоў праз асваенне ці набыццё незанятых земляў, якіх пры невялікай шчыльнасці насельніцтва было шмат на беларускіх землях і іншых землях Русі.[172] Меншую, але таксама важную ролю адыгрывала гвалтоўнае пашырэнне дамена, што таксама добра прасочваецца на прыкладзе Смаленскай зямлі. Адным спосабам гвалтоўнага пашырэння было прыўлашчванне князем заваяваных земляў. Значная частка даменіяльных уладанняў смаленскіх князёў знаходзілася ў землях паўночных радзімічаў, захопленых Расціславам Мсціславічам у чарнігаўскіх Ольгавічаў. Для замацавання гэтых земляў за сабой смаленскі князь заснаваў там гарады Мсціслаў (Мсціслаўль) і Рослаў (Расціслаўль).[173] Як можна заключыць на падставе Статуту Расціслава 1136 г., княскі дамен развіваўся і ў цэнтральнай частцы Смаленскай зямлі.[174] Гэты працэс адбываўся ўжо іншым спосабам – спосабам гвалтоўнага падпарадкавання вольных абшчыннікаў.[175] Менавіта аб такіх дзеяннях кажа ў сваім пасланні мітрапаліт Клімент Смаляціч: «Да скажю ти сущих славы хотящих, иже прилагают дом к дому и села к селом, изгои же и сябры, и бърти, и пожни, ляда же и старины».[176] Дамены пашыраліся і на іншых беларускіх землях, аб чым сведчыць пажалаванне ўдавой Глеба Усяславіча Анастасіяй Яраполкаўнай Кіева-Пячэрскаму манастыру пяці сёл з людзьмі.[177]

Маюць рацыю тыя даследчыкі, якія кажуць аб нязначнасці княскага землеўладання ў агульнай карціне грамад-

---

171 Алексеев Л. В. *Смоленская земля в IX–XIII вв.* С. 125.

172 Фроянов И. Я. *Киевская Русь: Очерки социально-экономической истории* // Фроянов И. Я. *Начала русской истории. Избранное.* Москва, 2001. С. 420–423.

173 Алексеев Л. В. *Смоленская земля в IX–XIII вв.* С. 126–127.

174 Древнерусские княжеские уставы XI–XV вв. С. 141–145.

175 Алексеев Л. В. *Смоленская земля в IX–XIII вв.* С. 130–131.

176 Клімент Смаляціч. *Послание, написано Климентом митрополитом Руским Фоме Презвутеру, истолковано Афонасиемь Мнихом* // Анталогія... С. 33.

177 Ипатьевская летопись. Ст. 493.

скага ладу Русі XII ст. Усё ж нават і на нязначнай ступені развіцця дамен быў у стане забяспечыць пэўную эканамічную самастойнасць князя ад знаці і паспольства падуладнай яму зямлі і праводзіць сваю палітыку без аглядкі на іх думку. Варта кінуць хуткі позірк на прыроду даменіяльнай гаспадаркі і мэты, якім яна служыла. Высновы, да якіх пры вывучэнні гэтага пытання прыйшоў І. Фраянаў, будуць вельмі цікавымі для нас. Як высвятляецца, асноўнай галіной даменіяльнай гаспадаркі была жывёлагадоўля, і больш спецыфічна конегадоўля, якая развівалася вельмі шпаркімі тэмпамі ў параўнанні з земляробствам. Як зазначае расійскі гісторык, «войны «бес перестани» патрабавалі зброі і коней».[178] «Князям давялося заняцца конегадоўляй для ваенных патрэб». Выснова гэтая адкрывае нам сапраўднае значэнне развіцця княскага дамена ў XII ст. і ўнёсак, які яно зрабіла ў палітычную і ваенную гісторыю. Дамен быў часткова народжаны вайной і для вайны ж і выкарыстоўваўся. Папросту кажучы, уласная гаспадарка князёў стала іх своеасаблівым ваенна-прамысловым комплексам, які дазваляў ім эканамічна падтрымліваць свае ваенныя мерапрыемствы і пастаўляў ім некаторыя віды неабходных рэсурсаў, у прыватнасці баявых коней. З'яўленне і пашырэнне княскіх даменаў было адным з фактараў, якія далі князям магчымасць распачынаць войны на ўласны страх і рызыку. Нядзіўна, што гісторыя XII ст. была насычанай вялікімі і малымі войнамі настолькі, што любы яе пераказ нязменна заблытвае нашчадкаў у гушчары падзей і робіць вельмі цяжкім адсочванне іх асноўных ліній.

Тым часам, занятыя міжусобнымі войнамі і звадамі князі адарваліся ад сваіх земляў ва ўсіх сэнсах гэтага слова. Набыўшы самастойнасць ад грамадства, яны сталі гэтаму грамадству менш патрэбнымі, але страта пачуцця рэчаіснасці не дазволіла ім гэта хутка зразумець. Калі ў XI ст. у сваіх памкненнях да стварэння завершанай і эфектыўнай сістэмы палітычнай арганізацыі грамадства Полацкага княства і Кіеўскай дзяржавы звярталіся да князёў і дружын, то ў XII ст. засяроджанне князёў на міжусобных войнах вымусі-

178 Фроянов И. Я. *Киевская Русь: Очерки социально-экономической истории.* С. 384.

ла грамадства асобных земляў да развіцця інстытуту самакіравання ў выглядзе аднаўленага веча. Стары-новы палітычны інстытут, які чакаў князёў па іх вяртанні дадому з бясконцых войнаў, часта быў для іх непрыемным сюрпрызам. Не адзін князь зведаў на сабе цяжкую руку народнага прадстаўніцтва.

Веча XII ст. было спадкаемцам народных сходаў перыяду ваеннай дэмакратыі, але ўжо даўно не ўяўляла сабой сходу ўсіх вольных і ўзброеных мужчын дадзенага грамадства. Яно мела характар ужо не агульны, а прадстаўнічы. Тэрытарыяльная арганізацыя грамадства проста фізічна не дазваляла ўсім вольным абшчыннікам, раскіданым па вялізных абшарах, прымаць удзел у прыняцці рашэнняў. Фактычна абмеркаванне і вырашэнне надзённых спраў абмяжоўвалася насельніцтвам стольнага горада зямлі, якому абавязаны былі падпарадкоўвацца і іншыя гарады зямлі, званыя прыгарадамі. Больш за тое, даследаванні паказваюць, што памер тых плошчаў, на якіх праводзіліся зборы веча ў рускіх гарадах, не дазваляў сабраць там нават і ўсіх мясцовых жыхароў.[179] Гэта вядзе нас да думкі, што веча складалася толькі з прадстаўнікоў канцоў ці іншых тэрытарыяльных адзінак горада, якія і мусілі выражаць волю агульнай масы грамадства. Іншым пытаннем было, наколькі яны гэтую волю сапраўды выражалі. Даследчыкі разыходзяцца ў ацэнках сацыяльнага характару веча, але мы выкажам асцярожнае меркаванне, што вечавыя прадстаўнікі ў асноўным паходзілі з верхніх слаёў грамадства. Гэта была земская знаць, якая вяла сваё паходжанне ад старой родавай невайсковай знаці, старэйшыя дружыннікі, якія па нейкіх прычынах разарвалі сувязі з княскай службай, а таксама ўзбагацелыя гандляры і рамеснікі. Калі мы маем рацыю, то веча мела характар да пэўнай ступені арыстакратычны. Веча было формай альтэрнатыўнай арганізацыі грамадства ў супрацьвагу княскай уладзе. Арыстакратычны ж яго характар яшчэ і ўзмацняў супярэчнасць з княскай уладай, што імкнулася да самаўладства. Аднаўленне веча дало магчымасць земскай знаці ўзяць рэванш за сваё паражэнне на досвітку дзяржаўнасці.

---

[179] Данилевский И. Н. *Древняя Русь глазами современников и потомков (IX–XII вв.).* С. 96.

Магчымасць была тым больш рэальнай, што інтарэсы большасці грамадства заўважна разыходзіліся з княскімі. Занятыя ўласнымі інтарэсамі князі хацелі ваяваць. Рэшта люду хацела мірна займацца ўласнай справай. Мы ўжо заўважалі, што індывідуальныя межы свету для чалавека XI ст. звузіліся ў параўнанні з рамантычным нарманскім перыядам. Пра XII ст. мы можам сказаць, што свет з пункту гледжання асобнага чалавека сціснуўся яшчэ больш да памераў адной зямлі ці нават маленькага ўдзельнага княства. Развіццё натуральнай гаспадаркі дазваляла большасці насельніцтва забяспечваць сваё існаванне, не пакідаючы далёка родныя мясціны. Вядома, усюдыісныя гандляры па-ранейшаму везлі тавары ў дальнія краіны, але яны больш не бралі на сябе функцыі рабаўнікоў і заваёўнікаў, як тое было раней. Вайна шкодзіла і натуральнай гаспадарцы, і гандлю. Ваенныя дзеянні знішчалі вёскі і нівы. Палітычныя ўскладненні пагражалі гандлёвым аперацыям. У гэтым сэнсе паказальныя падзеі 1161 г. Выгнанне з Ноўгарада князя Святаслава Расціславіча штурхнула ягонага бацьку, які ў той час княжыў у Кіеве, на рэпрэсіі супраць наўгародскіх гасцей у адказ. «И повеле изоимати Новгородци, и оуметати е оу Пересеченьскыи погребъ, и въ одину ночь оумре ихъ 14 мужи».[180] Можна ўявіць, наколькі натхняла купцоў да вядзення спраў перспектыва ў адну ноч нечакана сканаць у халодным склепе на чужой зямлі з-за недарэчных палітычных перыпетый!

У веча, якое складалася з такіх гандляроў ці прадстаўляла іх, былі важкія падставы быць незадаволенымі бесперапыннымі княскімі войнамі. Між тым, нягледзячы на далейшую прафесіяналізацыю вайны, разлічваць на перамогі ў значных кампаніях сіламі адной толькі дружыны без удзелу народнага апалчэння князі не маглі. Адпаведна яны мусілі перакладаць не толькі пасіўную, але і актыўную нагрузку вядзення ваенных дзеянняў на плечы шырокіх мас насельніцтва, што спараджала шматлікія канфлікты паміж князем і вечам. Вядома ж, многія з гэтых канфліктаў дыктаваліся прычынамі выключна ўнутранымі, але мы засяродзімся на тых, што былі выкліканыя войнамі ці іншымі знешнепалітычнымі нагодамі.

---

[180] Ипатьевская летопись. Ст. 510–511.

Як тое адбывалася з многімі іншымі тэндэнцыямі гістарычнага развіцця, першай з беларускіх земляў гэтую сцяжыну выпрабавала Полацкая зямля. Пазнейшыя беларуска-літоўскія летапісы XVI ст. адносяць узнікненне моцнага веча на Полаччыне да часоў князя Барыса. «И пануючы ему в Полоцку был ласкав на подданные свои и дал им волность вечем ся судити и в звон звонити, и по тому ся справовати, як у Великом Новегороде и Пъскове».[181] Звесткі гэтыя могуць мець рацыю, бо ў пэўнай ступені засноўваюцца на вуснай фальклорнай традыцыі, якая магла данесці да нашчадкаў даволі дакладнае ўяўленне аб інстытуце народнага прадстаўніцтва. Першым зафіксаваным выпадкам канфлікту паміж полацкім князем і вечам былі ўжо вядомыя нам падзеі 1128 г., калі палачане «выгнаша» князя Давыда Усяславіча пад пагрозай наступаючых кіеўскіх войскаў. Нагодай для гэтага магла быць неразважлівая антыкіеўская палітыка Давыда, які не ўлічыў перавагу сіл Кіеўскай дзяржавы над Полацкам і такім чынам падставіў зямлю пад удар варожых войскаў.

Наступным разам веча выявіла сваю незадаволенасць князем у 1151 г., калі палачане «яша... Рогъволода Борисовича князя своего и послаша Меньску». Успомнім, што Рагвалод быў жанаты з дачкой Ізяслава Мсціславіча Кіеўскага, і менавіта ў 1151 г. княжэнне апошняга апынулася пад пагрозай нашэсця Юр'я Даўгарукага і Святаслава Ольгавіча Чарнігаўскага. Такім чынам, адной з прычын падзення Рагвалода была яго невыгодная для Полацка знешнепалітычная лінія, арыентаваная на кіеўскіх Манамахавічаў.

Падобны лёс чакаў і яго стрыечнага брата Расціслава Глебавіча Менскага, саперніка і пераемніка Рагвалода на полацкім стале. Абставіны страты ім полацкага княжання і роля ў іх ваеннага фактару заслугоўваюць асобнага разгляду. Як вядома, у 1158 г. у Полацку адбыўся мяцеж супраць Расціслава, які скончыўся яго ўцёкамі ў Менск і аднаўленнем на полацкім стале Рагвалода Барысавіча. Але летапіс не кажа, па якой прычыне палачане задумалі злое супраць Расціслава. Паспрабуем супаставіць мяцеж з іншымі тагачаснымі падзеямі полацкай гісторыі. У тым жа 1158 г. палачане

---

[181] Летопись Рачинского // ПСРЛ. Т. 35. Москва, 1980. С. 147.

ў складзе вялікай кааліцыі хадзілі ў паход на Тураў супраць Юр'я Яраславіча. Самая працяглая аблога ў гісторыі старажытнай Русі, якая цягнулася дзесяць тыдняў, скончылася нічым. Пачаўся мор сярод коней і саюзнікам давялося разысціся па дамах. Пры апісанні гэтых падзей летапіс асабліва вылучае палачан, якія падзялілі дрэнную славу рабаўнікоў і марадзёраў з качэўнікамі-бярэндзічамі. Бярэндзічы паваявалі мясцовасць ля Пінска і забраліся за Прыпяць. «Полчане пришедше к Турову пожгоша села около его».[182] Відаць, «подзвігі» іншых удзельнікаў паходу параўнацца з гэтым не маглі, бо летапіс пра іх не згадвае. Чаму ж менавіта палачане аказаліся найбольш жорсткім кантынгентам у саюзным войску? Адказ можа палягаць у тым простым меркаванні, што мэты паходу пасавалі ім менш за ўсіх іншых удзельнікаў. Полацкае княства не мела рэальных інтарэсаў на Тураўшчыне. Увесь паход мог ажыццяўляцца з мэтай пашырэння менскіх уладанняў Расціслава і Валадара Глебавічаў, якія межавалі з Тураўшчынай, альбо з надзеяй на ваенную здабычу, большая частка якой непазбежна дасталася б таксама Расціславу. Для полацкага апалчэння ўдзел у гэтай авантуры сэнсу не меў. Наадварот, стаянне пад горадам на працягу 10 (!) тыдняў у эпоху, калі вынік гаспадарчага сезону і само эканамічнае выжыванне люду часта залежалі ад кароткага прамежку часу, нанесла палачанам сур'ёзную шкоду, якую яшчэ ўскладніла і падзенне коней. Натуральна, што рабункам Тураўшчыны яны імкнуліся кампенсаваць свае страты і даць выйсце сваёй ярасці. Па вяртанні дадому ярасць гэтая звярнулася супраць Расціслава як завадатара ўсёй авантуры. Бессэнсоўны і няўдалы паход каштаваў князю стала.

Падобныя з'явы бачым мы і ў Смаленскай зямлі, хаця веча было там заўважна слабейшым за полацкае і выйшла на палітычную арэну пазней. Першай яго праявай стала звяржэнне са смаленскага стала Яраполка Раманавіча ў 1174 г. і замена яго Мсціславам Расціславічам.[183] Цікавай праявай нязгоды смалян з княскай палітыкай быў славуты бунт смаленскага войска ў 1185 г. супраць Давыда Расціславіча ля Трэполя ў паходзе дзеля абароны поўдня Русі ад полаў-

182 Ипатьевская летопись. Ст. 491.
183 Тамсама. Ст. 598.

цаў. Падабенства паводзін войска да практыкі народнага самакіравання, як яно ажыццяўлялася ў самім Смаленску, падкрэсліваецца словамі летапісца аб тым, што «Смолняне же почаша вече деяти». Пажаданні смалян зводзіліся да патрэбы засяродзіцца на ўнутраных справах зямлі і іх незацікаўленасці ў паўднёварускіх справах, няхай сабе і такіх традыцыйна важных, як абарона Русі ад полаўцаў. «Мы дошли до Киева, даже бы была рать, билися быхом. Нам ли иное рати искати, то не можем оуже ся есмы изнемогле».[184] Гучныя скаргі смалян дасягнулі княскага вуха, і паход быў спынены. Як змяніўся час! У 1095 г. смаляне без асаблівых ваганняў далі вояў прышламу чарнігаўскаму князю Алегу Святаславічу для адваявання далёкай Мурамшчыны. Праз дзевяноста год яны ўзбунтаваліся супраць свайго спадчыннага князя, каб не ўдзельнічаць у абароне Русі ад полаўцаў, што лічылася несумненным грамадзянскім і рэлігійным абавязкам для жыхароў былой Кіеўскай дзяржавы. Кантраст гэтага ўчынку смалян з ранейшым часам асабліва падкрэсліваецца тым фактам, што неабходнасць у іх далейшым руху на полаўцаў на паратунак Пераяслаўлю была выкліканая страшным паражэннем Ігара Святаславіча, якое зрабіла ашаламляльнае ўражанне на сучаснікаў. Аднак мясцовыя інтарэсы і антываенныя настроі для смалян пераважылі ўсе іншыя меркаванні.

Нейкі сур'ёзны канфлікт паміж Давыдам Расціславічам і смаленскім вечам адбыўся ў 1186 г., калі «въстань бысть Смоленьске промежи князьмь Давыдомь и смолняны, и много головъ паде луцьшихъ муж».[185] Невядома, ці мела гэтае супрацьстаянне цікавыя для нас ваенныя ці знешнепалітычныя карані, але праз дзесяць гадоў смаляне дакладна выявілі незадавальненне ваеннымі прадпрыемствамі Давыда. У 1196 г. пасля прайгранай бітвы за Віцебск палонныя смаляне расказалі чарнігаўцам, што «братья их не добре с Давыдом».[186] Як бачым, і смаляне праз веча як прадстаўнічы інстытут выказваліся на карысць засяроджвання на мясцовых справах і асцярожнай знешняй палітыкі, арыентаванай на захаванне бяспекі Смаленскай зямлі. Праз гэта яны ўсту-

---

184 Ипатьевская летопись. Ст. 647.

185 Новгородская первая летопись. С. 38.

186 Ипатьевская летопись. Ст. 692.

палі ў канфлікт з князямі, якія імкнуліся да агрэсіўнай і часам авантурнай знешняй палітыкі. Канфлікты гэтыя набывалі вострыя формы беспарадкаў і бунтаў, хаця такой вастрыні, як у Полацкай зямлі, у Смаленшчыне яны не дасягнулі.

Такім чынам, становішча, якое склалася на беларускіх землях да канца XII ст., можа быць ахарактарызавана як палітычны крызіс. Крызіс гэты быў выкліканы спадчынным замацаваннем княскіх дынастый на сталах асобных княстваў і земляў і правядзеннем імі своекарыслівай і агрэсіўнай дынастычнай знешняй палітыкі, якая ішла ўпоперак інтарэсаў земскай знаці і шырокіх слаёў грамадства. Такая палітыка ставіла пад пагрозу знешнюю бяспеку беларускіх земляў і выклікала шматлікія ўнутраныя пратэсты. Неабходна сказаць, што крызіс гэты сам па сабе не насіў усеабдымнага характару і не пагражаў паралюшам усёй палітычнай сістэмы. Рачэй, ён меў «верхавінную» прыроду і зводзіўся да адрыву кіруючага вайскова-дружыннага слою на чале з князямі ад інтарэсаў паспольства і фактычнага правалу ў выкананні гэтым слоем сваіх функцый па абароне грамадства. У большай ступені крызісныя з'явы паразілі Полацкую зямлю, у меншай – Смаленскую і Тураўскую. Цяжка не пагадзіцца з выказаным на гэты конт меркаваннем В. Е. Данілевіча. «Міжкняская палітыка за ўвесь гэты перыяд можа быць ахарактарызавана як палітыка эгаізму; найпершы клопат кожнага князя заключаўся ў павелічэнні ўласных уладанняў, і ўсё прыносілася яму ў ахвяру: земскі мір, сваяцкія сувязі. [...] Высылка ў Царград прымусіла Усяславічаў зразумець усю марнасць барацьбы з кіеўскімі князямі, і па вяртанні з высылкі яны адразу ж змянілі палітыку ў дачыненні да апошніх. Здавалася б, што цяпер яны атрымалі поўную магчымасць зблізіцца з зямлёй і ўмацаваць сваё становішча, але яны і не падумалі пра гэта. Зразумеўшы сваё бяссілле і немагчымасць павялічваць свае ўладанні за кошт суседніх земляў, яны абмежавалі поле дзейнасці толькі Полацкай зямлёй, але затое цяпер яны напоўніцу выявілі сваю эгаістычную палітыку – імкненне любым коштам павялічыць свае ўладанні. [...] Нягледзячы на тое, што змаганне вялося ў асноўным з дапамогай дружын, але зямля ад яго цярпела, а гэта выклікала ў земстве незадавальненне князямі, якое яшчэ больш узрастала з-за таго, што Усясла-

вічы пастаянна ўцягвалі ў свае ўнутраныя справы іншыя рускія землі. Імкненне да павелічэння ўладанняў даводзіла Усяславічаў да таго, што не даражылі нават прыхільнасцю паспольства да іх, а гэта ў сваю чаргу прывяло да таго, што насельніцтва Полацкай зямлі перастала даражыць сваімі князямі і звыкла да іх перамены пры найменшым незадавальненні імі».[187]

Сапраўды, грамадства беларускіх земляў імкнулася адужаць узніклы крызіс натуральным шляхам маніпуляцыі рознымі княскімі групоўкамі і адбору з іх найбольш эфектыўных і паспяховых у выкананні сваіх функцый. Пры іншых умовах гэты далёка не катастрафічны крызіс мог быць гэткім чынам поўнасцю пераадолены. Аднак сітуацыя была больш складанай з-за прысутнасці знешніх фактараў, якія скарачалі час, на працягу якога дадзеныя праблемы маглі быць вырашаныя толькі з прыцягненнем унутраных рэсурсаў. Ва ўмовах менавіта знешнепалітычнага паслаблення Полацкай зямлі і іншых беларускіх земляў такім фактарам было з'яўленне на знешнепалітычнай арэне рэгіёну новых дзейных сіл: Літвы і крыжаносцаў.

Літва ж і яцвягі ў гэты час таксама перажывалі пэўны знешнепалітычны крызіс. Пасля шэрагу гучных ваенных перамог над пскавічамі, лівамі і палачанамі ў 1180-я гг. яны сутыкнуліся з трывалым супраціўленнем рускіх земляў і пацярпелі шэраг паражэнняў у 1190-я гг. Такі паварот падзей меў свае наступствы і для ўнутранага развіцця літоўскага і яцвяжскага грамадстваў. Сцверджанне Г. Лаўмянскага аб тым, што станаўленне літоўскай дзяржаўнасці адбывалася выключна праз знешнюю экспансію,[188] здаецца нам занадта катэгарычным. Як у апошнія гады пераканаўча даводзяць літоўскія гісторыкі, карані літоўскай дзяржаўнасці трэба шукаць найперш ва ўнутраных працэсах у літоўскім грамадстве. Аднак нельга адмаўляць і таго, што знешняя экспансія паслядоўна з унутранага развіцця вынікала і была яго натуральным працягам. Можна сказаць, што знешняя экспансія была адным са спосабаў існавання раннесярэд-

---

[187] Данилевич В. Е. *Очерк истории Полоцкой земли до конца XIV столетия.* Киев, 1896. С. 201–202.

[188] Lowmiański H. *Studja nad początkami społeczeństwa i państwa Litewskiego.* Tom II. 237–238, 350–351.

нявечных дзяржаў і Літва не была тут выключэннем. Асабліва важнай экспансія была для кіруючага дружыннага слою, для якога вайна была асноўным заняткам. Вайна спрыяла нарошчванню дружынай палітычнай магутнасці, эканамічнага дабрабыту і ўрэшце рэшт замацоўвала набыццё ёй улады як першага інстытута дзяржаўнасці. Таму заслон, які рускія землі паставілі на дарозе літоўскай экспансіі стаў той грэбляй, якая магла замарудзіць і працэсы ўнутранага развіцця ў Літве. Ваяўнічыя літоўскія дружыны маглі нанесці вялікія спусташэнні і шкоду Полаччыне, Пскоўшчыне ці Валыні, але не маглі прэтэндаваць на рэальную ўладу над імі. Наяўныя рэсурсы былі занадта малымі для дасягнення гэтай мэты. Калі Літва не магла адужаць Полаччыну і іншыя рускія землі ў сутыкненні наўпрост, то перад яе правадырамі стаяла задача знайсці іншае прымальнае рэчышча для сваёй ваяўнічай энергіі.

Паспрабуем акрэсліць шляхі выхаду з крызіснай сітуацыі, якія адкрываліся перад Полацкай зямлёй, Літвой і іншымі дзяржавамі рэгіёну. Найперш згадаем, што становішча, якое склалася, было далёка не ўнікальным у гісторыі. Аналы чалавецтва ведалі шмат выпадкаў суіснавання паміж развітымі дзяржавамі, якія мінулі зеніт сваёй магутнасці, і іх агрэсіўнымі суседзямі, якія толькі былі на досвітку ўласнай дзяржаўнасці. Кароткі позірк на такія выпадкі дазволіць нам скарыстацца пэўнымі аналогіямі. У якасці аднаго з прыкладаў такога суіснавання можна прывесці адносіны паміж Рымскай імперыяй і суседнімі германскімі народамі. Як і любая аналогія, параўнанне паміж Рымам і германцамі, з аднаго боку, і Полацкай зямлёй і Літвой з іншага, не вельмі дакладнае. Крызіс Рыма і экспансія германцаў мелі пад сабой іншыя, уласцівыя свайму часу і абставінам прычыны. Але па-за дэталямі, агульная карціна ўзаемадзеяння развітай і магутнай, але заняпалай дзяржавы з маладымі і агрэсіўнымі народамі мае дастатковае падабенства з прадметам нашага даследавання і таму дазваляе правесці пэўныя паралелі.

Падзеі гісторыі Рыма і германцаў выдатна задакументаваныя і даследаваныя ў сусветнай гістарыяграфіі, таму спынімся на іх коратка. Пачынаючы з другой паловы II ст. Рымская імперыя ўступіла ў эпоху палітычнага крызісу, што

характарызаваўся жорсткай міжусобнай барацьбой прэтэндэнтаў на імператарскую ўладу, якія прадстаўлялі розныя рэгіянальныя, сацыяльныя і дынастычныя групоўкі. Вядзенне шматлікіх міжусобных і знешніх войнаў адбівалася ў росце вагі рымскай арміі ў палітычным жыцці імперыі. Пры гэтым мы не пойдзем супраць ісціны, калі ўжывем слова «армія» ў множным ліку. Прынцып добраахвотнай вербоўкі, упершыню ўведзены Гаем Марыем на мяжы II і I стст. да н. э. прывёў да масавага прытоку ў войска маламаёмасных грамадзян, якія атрымлівалі плату за службу. Усё ў большай ступені такое войска было асабіста адданым свайму палкаводцу і матэрыяльна залежным ад яго, пры гэтым паступова трацячы сацыяльную сувязь з паспольствам. Таксама такое войска часта станавілася асабістай арміяй таго ці іншага палкаводца і служыла яму вернай апорай у міжусобнай барацьбе.[189] Упершыню гэтая з'ява праявілася ў грамадзянскіх войнах I ст. да н. э., а ў войнах I–III стст. яна стала асноўным фактарам, які вырашаў вынік палітычнай барацьбы. Перыяд другой трэці III ст. стаў вядомы пад назвай «эпохі салдацкіх імператараў» і адзначыўся бесперапыннымі і бессэнсоўнымі войнамі прэтэндэнтаў на рымскі стол з дапамогай падкантрольных ім армій. Разам з тым рымскія арміі паступова трацілі эфектыўнасць у справе абароны імперыі ад знешніх ворагаў. Даследчыкі адзначаюць, што паслабленне Рыма перад знешняй пагрозай было выклікана не так крызісам унутранай арганізацыі, у чым імперыя якраз мела велізарную перавагу перад варварскімі суседзямі, як палітычнымі прычынамі, а менавіта памяншэннем сацыяльнага базісу ўлады.[190] Памяншэнне гэтае ў сваю чаргу вяло да ваеннай слабасці і выклікала патрэбу ў пошуку новых спосабаў вайсковай арганізацыі.

Зніжэнне эфектыўнасці рымскай абароны ішло поруч з нарастаннем варварскай пагрозы на паўночнай мяжы імперыі, якая ішла па Рэйне і Дунаі. Пасля смерці ў 117 г. імператара Траяна, апошняга вялікага заваёўніка ў гісторыі Рыма, імперыя вымушана была перайсці да стратэгічнай абаро-

---

[189] Кардини Ф. *Истоки средневекового рыцарства.* С. 150–151.

[190] Корсунский А. Р. *Гюнтер Р. Упадок и гибель Западной Римской империи и возникновение германских королевств (до середины VI в.).* Москва, 1984. С. 198–199.

ны. Спакойныя дзесяцігоддзі II ст. абарваліся з пачаткам у 166 г. Маркаманскай вайны з кааліцыяй германскіх і іншых плямён на Дунаі. Аднак пры ўсёй шкодзе, якую наносілі варвары рымскім правінцыям, ім не ўдавалася дабіцца вырашальнай перамогі над Рымскай імперыяй і прарваць яе ўмацаваную мяжу-лімес. Нягледзячы на страты, рымлянам пад камандаваннем імператара Марка Аўрэлія ўдалося стрымаць маркаманаў і іх саюзнікаў і мірам 180 г. адстаяць дунайскую мяжу.[191] Нават у найзмрачнейшым для імперыі III ст. імператарам Галіену, Клаўдыю II і Пробу ўдалося разбіць готаў, якія ў 230—270-я гг., падобна бурлівай плыні, каціліся па Балканах[192] і марскімі набегамі апярэдзілі вікінгаў больш чым на 500 гадоў. Такім чынам, і варварам, якіх унутранае развіццё штурхала на экспансію прастораў Рымскай імперыі, даводзілася ў дадатак да набегаў шукаць больш дзейсныя формы гэтай экспансіі.

Калі Рымскую імперыю немагчыма было скрушыць у прамым сутыкненні, многія варварскія правадыры і іх ваяры абіралі натуральную лінію паводзін і далучаліся да інстытутаў імперыі, у першую чаргу арміі. Па меры пашырэння імперыі патрэба ў вайсковай сіле расла, і горад Рым з Італіяй ужо не маглі пастаўляць дастатковую колькасць рэкрутаў. Ужо ў эпоху Рэспублікі многія легіёны набіраліся з правінцыялаў. Следам за правінцыяламі ў армію рушылі варвары. Працэс варварызацыі войска ўзмацніўся і ў сувязі з тым, што эканамічны росквіт імперыі ў I—II стст. змяншаў у Італіі і правінцыях колькасць ахвотных да рызыкоўнай вайсковай службы. Перш, варвары ўліваліся ў рымскую легіённую арганізацыю паасобку, засвойвалі ўзоры рымскага ваеннага майстэрства і ўвогуле ўпісваліся ў вайсковую сістэму імперыі. З паступовым адставаннем гэтай сістэмы ад надзённых патрэб абароны дзяржавы яна змянялася, засвойваючы менавіта варварскія ўзоры.[193] Легіёны адыходзілі ў мінулае, а ім на змену на службу ў армію прымаліся цэлыя варварскія атрады.[194] У канцы IV ст. сучаснікі папракалі імпе-

---

191 Козленко А. В. *Военная история античности: полководцы, битвы, оружие.* С. 228—229.

192 Тамсама. С. 109.

193 Кардини Ф. *Истоки средневекового рыцарства.* С. 151—155.

194 Дельбрюк Г. *История военного искусства.* СПб., 1994. Т. 2. С. 182—185.

ратара Грацыяна тым, што ён забыўся на старую рымскую доблесць і аддаваў перавагу найманым атрадам аланаў замест выпрабаваных легіёнаў.[195] Распаўсюджанне атрымаў інстытут федэратаў-варварскіх плямён, якім было дазволена пасяліцца на рымскай тэрыторыі ў абмен на нясенне вайсковай службы.

Такое развіццё сітуацыі ў цяжкія для імперыі часы, калі ўнутраны палітычны крызіс дапаўняўся знешняй пагрозай з усіх бакоў, дало падставу тагачасным пісьменнікам і прамоўцам казаць аб тым, што варвары былі адзінымі, хто ўзняў зброю у абарону Рыма, калі самі рымляне адмовіліся гэта рабіць. У многіх войнах I—V стст. варварам, якія рушылі на імперыю пад сваімі баявымі значкамі, супрацьстаялі варвары пад рымскімі сцягамі. Найяскравейшым прыкладам гэтага было славутае пабаявішча на Каталаўнскіх палях у 452 г., дзе гуны, остготы і гепіды пад камандаваннем Аціллы былі разбітыя вестготамі, франкамі, аланамі, бургундамі і саксамі пад камандаваннем «апошняга вялікага рымляніна» Аэцыя.[196] Адыграўшы важную ролю ў абароне Рыма ад знешніх ворагаў, варвары да пэўнай ступені ахоўвалі і асабістыя правы і вольнасці рымлян ад уціску прагнілага ўраду і драпежных ваяўнічых узурпатараў, якія мала адрозніваліся ад знешніх ворагаў. Рымскія тэрыторыі пад патранатам асобных варварскіх правадыроў станавіліся своеасаблівымі выспамі вольнасці, дзе маглі знайсці прытулак роспачныя рымляне. Па словах пісьменніка V ст. Сальвіяна, «яны [уцекачы-рымляне] ідуць на службу да готаў ці бакаўдаў, ці да якіх-небудзь іншых варвараў, што пануюць паўсюль, і не каюцца ў сваім учынку». «Яны болей жадаюць жыць вольна, носячы імя рабоў, чым быць рабамі, захоўваючы адно толькі вольнае імя. Перш імя рымскага грамадзяніна высока цанілася і дорага куплялася; цяпер жа ад яго адмаўляюцца, бо яно зрабілася пагарджаным і агідным».[197]

---

195 Дельбрюк Г. *История военного искусства*. С. 188—190.

196 Козленко А. В. *Военная история античности*... С. 168—169.

197 Сальвиан. *Рассуждение современника-очевидца о причинах падения Западной Римской империи (около 450 г.)*. (Salv. Massil. De Gubernatione Dei.). V, 4—9 // История средних веков. От падения Западной Римской империи до Карла Великого. (476 — 768 гг.). Составитель М. М. Стасюлевич. (Далей: История средних веков...). Москва – Санкт-Петербург, 2001. С. 70—71.

Далёка не ўсе рымляне, аднак, былі задаволеныя масавым пранікненнем варвараў у імперыю. «Ганебна для нас тое, што дзяржава наша, якая мае такое шматлікае насельніцтва, перадае гонар вядзення вайны іншаземцам, перамогі якіх няслвяць нас нават у тым выпадку, калі яны нам прыносяць карысць», лямантаваў рытор IV–V стст. Сінесій.[198] З ім быў згодны хрысціянскі паэт IV ст. Прудэнцый, які казаў, што рымляне адрозніваюцца ад варвараў, як людзі ад быдла. Аднак альтэрнатывы ўзаемадзеянню двух элементаў ужо не было. Ва ўмовах унутранага крызісу, калі рымская эліта не толькі не была здольнай яго вырашыць, але сама ж была адной з яго прычын, адбываўся натуральны працэс яе выцяснення з палітычнага жыцця. Паточаныя знутры заганамі свайго грамадства і ўплеценыя ў павуцінне рэгіянальных і сацыяльных супярэчнасцяў, рымляне саступалі сваё месца энергічным *homo novus*'ам, псіхалагічна і сацыяльна мабільным выхадцам з варварскіх народаў, якія не баяліся ўносіць жыццядзейныя імпульсы ў застаялую імперскую палітыку. Яны хутка праходзілі шлях ад чужынца да носьбіта рымскай славы і ад простага легіянера да імператара. Такую кар'еру зрабіў ужо ў пачатку III ст. сын гота і аланкі Максімін Фракіец. Далей яе паўтарылі Філіп Араб, Галерый, Макісімін Дая, Магненцый і іншыя.[199]

Але няправільна было б казаць, што Рым быў толькі статычным матэрыялам для творчых варвараў, мэтай для рабаўніцтва для варвараў варожых і кар'ерным полем для варвараў саюзных. Як грамадства непараўнальна больш развітае Рым прапанаваў суседнім народам распрацаваную палітычную сістэму, высокаразвітую эканоміку, выкшталцоную культуру і заканадаўства. Ён раскінуў перад варварамі гатовыя ўзоры, паводле якіх яны і маглі будаваць далей сваю цывілізацыю. Ужо Цэзар сваім хваткім позіркам заўважыў той уплыў, які аказваў Рым нават на тыя народы, якія яшчэ не былі яму падуладнымі: «Што ж датычыцца галаў, то блізкасць рымскіх правінцый спрыяе развіццю ў іх дабрабыту і новых патрэб».[200]

---

198 Цыт. паводле Дельбрюк Г. *История военного искусства*. Т. 2. С. 186.

199 Федорова Е. В. *Люди императорского Рима*. Москва, 1990. С. 263, 269, 285, 290, 325.

200 Caesar. Bell. Gall. VI, 24 // Записки... С. 120.

У выніку такога ўзаемадзеяння ўяўна падзеленыя дунайска-рэйнскай мяжой Рым і варвары на самой справе стварылі складаную дуалістычную мадэль суіснавання. Яшчэ да падзення Рымскай імперыі абодва элементы гэтай сістэмы залежалі адзін ад аднаго, аказвалі ўзаемны ўплыў і актыўна пераймалі дасягненні адзін у аднаго. Як заўважаюць А. Карсунскі і Р. Гюнтэр, «у рэшце рэшт, пагадненне аказвалася непазбежным».[201] Больш за тое, на думку Ф. Кардзіні гаворка ішла «аб доўгім і знясільваючым працэсе інфільтрацыі і асіміляцыі, узаемнага прыцягнення і адштурхоўвання». «Рабіць адрозненне паміж «Раманіяй» і «Готыяй» мае сэнс хіба з пункту гледжання гістарыяграфічнага тэарэтызавання. Што ж датычыцца гістарычных працэсаў, якія ахоплівалі перыяд V–VI стст., як і той крыві, што цякла ў жылах галоўных дзейных асоб эпохі, то мае значэнне толькі адзін факт – новае аб'яднанне, сінтэз народаў, які з цягам часу прывядзе да стварэння новай цывілізацыі».[202]

Пасля падзення Заходняй Рымскай імперыі ў V ст. гэта прывяло да стварэння на яе тэрыторыі так званых варварскіх каралеўстваў, якія спалучалі ў сваім дзяржаўным ладзе і вайсковай арганізацыі як рымскія, так і варварскія элементы. У найбольшай ступені рымска-варварскі дуалізм адлюстроўвалі Остгоцкае каралеўства ў Італіі і Вестгоцкае каралеўства ў Іспаніі і Галіі са сталіцай у Тулузе. Паколькі прычынай пранікнення варвараў у імперыю была яе ваенная слабасць, на рымскія землі яны прыходзілі ў якасці вайсковай сілы: альбо як абаронцы імперыі, альбо як яе заваёўнікі. Адпаведна, у такой дуалістычнай сістэме варварскі элемент непазбежна насіў ваенны характар, пакінуўшы грамадзянскія сферы рымлянам. Варвары канчаткова выцеснілі няздольных выконваць свае функцыі рымлян у якасці палітычнай эліты і вайсковага слою. Пры гэтым яны ўсялякім чынам клапаціліся аб стварэнні трывалай лініі пераемнасці паміж імперскай дзяржаўнасцю і сваёй уладай. Остгоцкі кароль Тэадорых Вялікі (493–525 гг.) разглядаўся ўсходнерымскімі імператарамі як рымскі магістрат, якому ў кіраванне была

---

201 Корсунский А. Р. *Гюнтер Р. Упадок и гибель Западной Римской империи и возникновение германских королевств...* С. 43.

202 Кардини Ф. *Истоки средневекового рыцарства.* С. 169.

перададзена асобная правінцыя.[203] Сам ён не аспрэчваў гэтай прававой асновы сваёй улады нават на вяршыні магутнасці, а фактычна лічыў сябе пераемнікам заходнерымскага імператара. У яго вачах Італія заставалася *res publica romana*, якая супрацьстаяла варварскім народам.[204] Таму, як адзначае Ф. Кантамін, «Тэадорых на законных падставах узначаліў рымскае войска, якое, праўда, складалася выключна з германцаў, бо рымляне былі выгнаныя адтуль».[205] Усё ж не трэба перабольшваць ступень знікнення рымскіх ваенных традыцый. Нягледзячы на пераважнае панаванне варвараў у войску, рымская вайсковая арганізацыя і ваеннае майстэрства праглядалі праз пазнейшыя наслаенні. Вядомы ў вестготаў, бургундаў і франкаў інстытут графа горада, які спалучаў у сваёй асобе ваенную і грамадзянскую ўладу, меў як рымскія, так і варварскія карані. Захаваўся стары рымскі звычай выдачы грашовых падарункаў ваярам, да якога звярнуўся вестгоцкі кароль Аларых II перад бітвай пры Вуе ў 507 г.[206]

У грамадзянскай сферы рымскія і варварскія элементы таксама суіснавалі, хаця ў сілу колькаснай перавагі рымскага насельніцтва ў Італіі і гала-рымскага ў Галіі, тут перавага належала рымскаму элементу. У Остгоцкім і Вестгоцкім каралеўствах рымляне займалі высокія пасады ў дзяржаўным апараце, а ў судаводстве захоўвала сілу рымскае права, якое аказала ўплыў і на развіццё германскага права.[207]

Вынікам стала становішча, якое ў большай ці меншай ступені задавальняла абодва бакі. Паплечнік Тэадорыха вялікага рымлянін Касіядор казаў: «Ведучы вайну, яны (готы – *Я. Н.*) абараняюць інтарэсы ўсяго грамадства». «Яны бяруць на сябе ратную працу дзеля дабра ўсіх. Пакуль гоцкая армія ваюе, рымлянін можа жыць мірна».[208] Варварскія каралі хутка ператварыліся з шукальнікаў славы ў дзяржаўных мужоў і

---

203 Контамин Ф. *Война в Средние века.* С. 25.

204 Корсунский А. Р. *Гюнтер Р. Упадок и гибель Западной Римской империи и возникновение германских королевств...* С. 180–181.

205 Контамин Ф. *Война в Средние века.* С. 25.

206 Тамсама. С. 26.

207 Корсунский А. Р. *Гюнтер Р. Упадок и гибель Западной Римской империи и возникновение германских королевств...* С. 49–53, 182–187.

208 Цыт. паводле: Контамин Ф. *Война в Средние века.* С. 27.

пачалі дамагацца сваіх мэтаў і абараняць інтарэсы грамадства не толькі ваеннымі, але і мірнымі сродкамі, часам выяўляючы добрыя дыпламатычныя таленты. Спачатку іранічную ўсмешку, а затым захапленне выклікае чытанне працытаванага Касіядорам ліста Тэадорыха Вялікага да франкскага караля Кладавея, якое ілюструе пераўтварэнне ліхога бадзяжнага правадыра варвараў у мудрага ўрадоўца: «Бог злучае каралёў святымі сувязямі дзеля таго, каб на іх міралюбівых адносінах засноўваць пажаданы спакой народаў. [...] Каралі ўступаюць у сваяцтва дзеля таго, каб нацыі, падзеленыя паміж сабою, маглі мець адну волю, і каб праз гэтыя сувязі, як праваднікі згоды, аб'ядноўваліся думкі народаў».[209] Гоцкія каралі запомніліся сучаснікам і нашчадкам не толькі як абаронцы сваіх краін, але і як падтрымальнікі ў іх унутранага парадку і працвітання, аб чым сведчыць ліст таго самага Тэадорыха да намесніка правінцыі Северыяна, у якім кароль патрабуе захаваць насельніцтва ад залішніх падаткаў і забяспечыць яму правы суд.[210] Апафеозам пахвалы варварскаму каралеўству, у якім злучыліся рымская і варварская плыні, стала паэма гала-рымскага арыстакрата V ст. Сідонія Апалінарыя, у якой той апісвае двор вестгоцкага караля Эўрыка. Той самы Сідоній, які асуджаў саступку Арверна (сучасн. Клермон-Феран) готам як верны крок да заняволення тамтэйшых жыхароў, пісаў: «І ты, рымлянін, цячэш сюды, прасіць аб дапамозе, і працягваеш рукі да Эўрыка, каб супрацьпаставіць яго сілы фалангам скіфскіх краін, калі Вялікая Мядзведзіца пагражае табе збянтэжаннем». «Так, адной прысутнасцю Марса, які пануе на гэтых берагах, магутная Гарона заступаецца за абмялелы Тыбр».[211]

---

209 Кассиодор, Марк. *Внешние отношения нового варварского правительства в Италии (начало VI в.).* (*Письмо Тедодриха Великого к Клодовею, королю франков).* (Cassiod. XII Libri Variar.) III, 4 // История средних веков... С. 245.

210 Кассиодор, Марк. *Общий характер нового варварского правительства в Италии (начало VI в.).* (*Из письма Тедодриха Великого к правителю провинции Севериану ).* (Cassiod. XII Libri Variar.) V, 14 // История средних веков... С. 243–245.

211 Сидоний Аполлинарий. *Двор вестготских королей в Галлии. (Из переписки современников).* (Sidon. Apoll.). II, 8, IX // История средних веков... С. 408.

Вернемся цяпер з цёплых прастораў Італіі і Галіі ў беларускія пушчы і зробім належныя высновы з нашага экскурсу ў гісторыю Рыма і варвараў, у які мы выправіліся зусім не дарэмна. Мы ўжо адзначылі аналогію знешнепалітычных сітуацый паміж Рымам і германцамі, з аднаго боку, і Руссю (найперш Полацкай зямлёй) і Літвой з іншага. Калі прыгледзецца, то мы заўважым, што і развіццё сітуацыі ішло падобным чынам. Шчыльнае ўзаемадзеянне Полацкай зямлі і Літвы ў XII ст. рухалася ў знешнепалітычным і ваенным рэчышчы і было выклікана крызісам кіравання на землях Русі, які ў Полацку дасягнуў наймацнейшай ступені. Тады як цывілізацыя Русі ў цэлым працягвала сваё паступальнае развіццё, сістэма яе палітычнага кіравання зайшла ў тупік. Крызісныя з'явы знайшлі сваё развіццё ў знешнепалітычнай і ваеннай сферах. Занятыя бясконцымі звадамі паміж сабой і з іншымі князямі Русі, полацкія князі мелі пастаянную і пільную патрэбу ў вайсковай сіле. Між тым вольнае насельніцтва Полаччыны ўсё ў меншай ступені было надзейнай крыніцай яе папаўнення. З эканамічнага пункту гледжання, поспехі эканомікі, развіццё вытворчасці і абмену рабілі людзей больш зацікаўленымі ў мірных занятках, чым у ваенных выправах. З пункту гледжання палітыкі, бессэнсоўныя дынастычныя спрэчкі князёў мелі мала дачынення да інтарэсаў простага люду і не знаходзілі водгуку ў яго сэрцах. Заклікі князёў да зброі выклікалі апатыю ці нават актыўнае супраціўленне, як гэта адбылося з палачанамі ў 1158 г. Нават спакайнейшая Смаленшчына зведала выпадкі супраціўлення насельніцтва ваеннай актыўнасці Давыда Расціславіча ў 1186 і 1196 гг. Цяжар вядзення вайны ўсё больш прыпадаў на прафесійных ваяроў-дружыннікаў. Аднак пры ўсёй прафесіяналізацыі ваеннай справы дружына была занадта малалікай і нязначнай для вядзення буйных кампаній. Узнікла патрэба ў сіле, якая кампенсавала б змяншэнне апалчэння, што сціскалася, нібы тая шагрэневая скура.

У Полацкай зямлі такой сілай сталі дружыны і апалчэнні падуладных літоўскіх земляў. Можна думаць, што з XI ст. полацкае войска ўключала літоўскія кантынгенты. Паколькі вайсковая служба літоўцаў для Полацка не насіла прафесійны характар і з'яўлялася іх калектыўнай павіннасцю, то малаверагодна, што літоўцы далучаліся да полацка-

га войска індывідуальна. Рачэй, яны змагаліся пад полацкімі сцягамі ў складзе сваіх атрадаў і пад камандаваннем сваіх князёў. Яны не ўключаліся ў структуру ўласна полацкай вайсковай арганізацыі і з'яўляліся элементам, хутчэй, знешнім, чым унутраным. З цягам часу становішча змянілася. Падзенне ролі народнага полацкага апалчэння прывяло да адпаведнага росту значэння літоўскіх атрадаў. Ужо пры апісанні бітвы Валадара Глебавіча з Рагвалодам Барысавічам пад Гарадцом у 1162 г. летапісец называе ў складзе войска Валадара толькі літву, не згадваючы ўласна менскія атрады. Літоўцы адыгралі важную ролю ў аблозе Друцка ў 1180 г., паходзе на Ноўгарад у 1198 г. і на роўных з палачанамі змагаліся з крыжаносцамі пад Кукейносам каля 1200 г. Апошняя бітва паказвае, наколькі спрыяла полацка-літоўскаму ваеннаму супрацоўніцтву наяўнасць агульнага небяспечнага ворага ў выглядзе нямецкіх крыжаносцаў у Падзвінні. Па урыўкавых звестках летапісаў і хронік цяжка меркаваць, наколькі шчыльна літоўцы ўпісаліся ва ўласна полацкую вайсковую арганізацыю і якую кар'еру пад полацкімі сцягамі зрабілі военачальнікі літоўскага паходжання, аднак адмаўляць іх велізарную ролю ў вядзенні Полацкай зямлёй у XII ст. знешніх і міжусобных войнаў немагчыма. Таксама паражэнні, нанесеныя літоўцамі Полаччыне каля 1185 г., ясна паказалі, наколькі важна мець літоўцаў у якасці прыяцеляў, а не ворагаў.

Але і Полаччына недарэмна прыцягвала да сябе позіркі з Панямоння. За некалькі стагоддзяў існавання ў складзе Кіеўскай дзяржавы і як самастойная дзяржава Полацкая зямля набыла складаную палітычную структуру, стварыла заканадаўства высокага ўзроўню, дабілася значных поспехаў у эканоміцы і культуры. Усе гэтыя набыткі полацкай цывілізацыі маглі быць выкарыстаныя і выкарыстоўваліся Літвой у яе грамадскім развіцці. Паказчыкам полацкага ўплыву на працэсы, якія адбываліся ў літоўскім грамадстве, можа служыць ужо згаданае намі будаўніцтва ўздоўж межаў Літвы з Полаччынай драўляных замкаў, якія былі асяродкамі палітычнага жыцця Літвы. Як піша Г. Лаўмяньскі, на Русі «ўжо існавала гатовая для здабывальнікаў дзяржаўная арганізацыя».[212] Безумоўна,

---

212 Lowmiański H. *Studja nad początkami społeczeństwa i państwa Litewskiego.* Tom II. 350.

польскі гісторык можа перабольшваць ролю знешніх фактараў у станаўленні літоўскай дзяржаўнасці, але цяжка сумнявацца ў тым, што суседства з Полаччынай было моцным яе каталізатарам. Таксама прысутнасць у літоўскай мове эканамічнай тэрміналогіі, запазычанай са старажытнарускай ці старабеларускай мовы, сведчыць аб пераняцці літоўцамі ў русінаў пэўных спосабаў гаспадарання.[213]

У любым выпадку, літуанізацыя ўзброеных сіл Полацкай зямлі і цывілізацыйны ўплыў Полаччыны на Літву адзначылі пераход іх адносін на прынцыпова новы ўзровень. Літва была для Полацка нашмат цікавейшай за простую крыніцу вайсковай сілы. Полацк быў для Літвы чымсьці большым за простае поле для вайсковай кар'еры ці тэрыторыю для рабаўніцтва. Полацк і Літва сталі своеасаблівымі «Раманіяй» і «Готыяй», якія не так ужо рэзка і адрозніваліся адна ад адной і мелі добрую магчымасць для сумеснага існавання. Больш за тое, Полацкае княства было толькі невялікай часткай «Раманіі», якая хутчэй за сваіх суседзяў прайшла шлях самастойнага развіцця і таму раней аказалася гатовай да новага супрацоўніцтва. Патэнцыял для ўдзелу ў гэтым працэсе на «раманскім» баку мелі і іншыя землі Русі.

Супрацоўніцтва ў палітычнай і ваеннай сферы вяло да паступовага і частковага выцяснення старога полацкага вайскова-дружыннага слою літоўцамі. Князі з дынастыі Рагвалодавічаў, якія завязлі ў дынастычных спрэчках і распачыналі з-за гэтага бясконцыя войны, ужо не маглі належным чынам выконваць свае функцыі: ажыццяўленне палітычнай улады ў інтарэсах паспольства, абарону краю і падтрыманне ўнутранага парадку. Наадварот, у многіх выпадках менавіта яны ўяўлялі сабой пагрозу бяспецы краю. Таму патэнцыйная замена іх ваяўнічымі князямі літоўскага паходжання была крокам, які палягчаў вырашэнне гэтых пытанняў. Паколькі палітыка таго часу мела ў вялікай ступені дынастычны характар, замена Рагвалодавічаў, цесна звязаных шлюбнымі і сваяцкімі сувязямі з рознымі адгалінаваннямі Рурыкавічаў, адным ударам разрубала павуцінне, што ўцягвала Полаччыну ў чужыя ёй войны. Разам з тым падобная замена не мела негатыўным чынам адбіцца на шматлікіх

---

213 Пашуто В. Т. *Образование Литовского государства.* Москва, 1959. С. 257–258.

дружынніках сярэдняга і ніжэйшага слою, якія былі надзейнай апорай князёў любой дынастыі і трывалай асновай усяго войска.

Супрацоўніцтва ў грамадзянскай сферы значыла захаванне полацкіх палітычных, эканамічных і культурных узораў, якія маглі б развівацца больш бяспечным чынам пад аховай больш здольнага і эфектыўнага літуанізаванага вайсковага слою. У цэлым, XII ст. падвяло Полацкую зямлю і Літву да мяжы ўтварэння таго, што можна назваць аналагам варварскага каралеўства на тэрыторыі былой Рымскай імперыі, якое спалучала б у сабе цывілізацыйныя дасягненні аднаго боку з маладой ваеннай моцай другога. Ці адбылося гэта, і як развівалася сітуацыя ў далейшым, паказвае гісторыя XIII ст.

### Б) Ваенны фактар у эканамічным развіцці грамадства

Разбуральная прырода войнаў XII ст. аказала адпаведны ўплыў і на эканоміку беларускіх земляў. Для дадзенага часу ўжо не быў характэрным такі ўнёсак вайны ў развіццё эканомікі краю, як для папярэдніх стагоддзяў. Перш за ўсё, войны ўжо не былі тым фактарам, які адкрываў новыя гандлёвыя шляхі. Далёкія паходы саступілі месца лакальным баявым дзеянням, якія, наадварот, былі праклёнам для гандлю. У якасці прыкладу можна прывесці арышт у 1161 г. Расціславам Мсціславічам у Кіеве наўгародскіх купцоў і іх гібель у склепе альбо закрыццё крыжаносцамі ў 1200 г. земгальскай гандлёвай гавані Даўгмале. Па-другое, мінула эпоха рабаўніцкіх паходаў рускіх дружын на багатыя суседнія краіны, якія звычайна завяршаліся вяртаннем дадому з багатым выкупам ці нарабаваным майном. Цяпер войны вяліся ў асноўным паміж блізкімі суседзямі, і рабаўніцкі паход з аднаго боку выклікаў акцыю помсты ў адказ, у выніку чаго страты неслі абодва бакі. Нарэшце, з развіццём вытворчасці і абмену вайна траціла сваё становішча самага прыбытковага занятку. Таму шырокія масы насельніцтва былі больш схільныя займацца мірнай справай, чым ваяваць.

Усё ж і ў такіх умовах існавалі аматары і ўмельцы лавіць здабычу ў мутнай вадзе, якія пераварочвалі абставіны на сваю карысць. Адным з іх быў добра вядомы нам менскі

князь Глеб Усяславіч. Уласная вытворчасць маланаселенай, пакрытай збольшага балатамі і лясамі Меншчыны, была вельмі слабай. Каб кампенсаваць гэтую слабасць, Глеб выкарыстаў стагоддзямі выпрабаваны спосабываду ў палон людзей з іншых тэрыторый і ўладанняў. Рабіў ён гэта з вялікім размахам, вылучыўшыся нават сярод жорсткіх сярэднявечных уладароў. Паводле Тэадора Нарбута, ён неаднаразова нападаў на літоўскія і рускія землі з мэтайываду палону. Гэтыя напады суправаджаліся спусташэннямі і зверствамі. Акрамя рассялення палонных на сваіх землях, Глеб і ягоныя баяры займаліся продажам іх у рабства. Гэты гандаль быў пастаўлены на шырокую аснову і прыносіў вялікія прыбыткі. Цэнтрам гандлю рабамі стаў Друцк.[214] Цяжка сказаць, наколькі дакладна Нарбут пераказваў звесткі сваіх крыніц і ці не занадта змрочнымі фарбамі намаляваў ён партрэт Глеба ў сваім эмацыйным аповедзе. Тым не менш, ягоныя словы пацвярджаюцца сведчаннем тагачаснай крыніцы – «Павучання» Уладзіміра Манамаха, дзе той ясна кажа, што Глеб яго «люди заялъ».[215] Гэтае паведамленне адносіцца да нападу Глеба на Слуцк у 1116 г.[216] Горад быў бязлітасна спалены, а жыхары выведзеныя ў палон. Гэткім чынам менскаму князю ўдавалася засяляць бязлюдныя землі свайго княства і атрымліваць імгненную выгоду ад гандлю жывым таварам. У дадатак ягоныя паходы суправаджаліся адкрытым рабункам іншых матэрыяльных каштоўнасцяў. Ладная частка прыбыткаў накіроўвалася на ўтрыманне войска і фінансаванне далейшых ваенных акцый. За паўтысячагоддзя да славутага правадыра найманых полчышчаў Валенштэйна Глеб паспяхова ажыццявіў сумнавядомы прынцып: «Вайна корміць вайну». Пасля паражэння Глеба яго падданым давялося самім выпрабаваць на сабе наступствы такой «эканомікі вайны». Узяўшы ў 1117 г. Друцк, Яраполк Уладзіміравіч перасяліў яго жыхароў у адмыслова збудаваны для гэтага горад Жэлдзі.

Пэўны плён такое рабаўніцтва усё ж такі прыносіла. Прыкладам служыць той жа Менск. Войны XII ст., многія з якіх былі для Менска паспяховымі, прыносілі неблагую

214 Narbutt T. *Dzieje starożytne narodu litewskiego*. T. 3. 270–273.
215 Лаврентьевская летопись. Ст. 250.
216 Тамсама. Ст. 291.

здабычу, павялічваючы агульны дабрабыт насельніцтва. Паказчыкам гэтага служыць шпаркае развіццё горада, культурны слой якога павялічыўся з 60–80 см у XII ст. да 2 м у XIII ст.[217] Але пры ўсіх выгодах такая лінія развіцця была вельмі небяспечнай і будучыня эканомікі была не за ёй.

Іншым чынам склалася становішча на літоўскіх і яцвяжскіх землях. Як грамадствы ваеннай дэмакратыі, дзе амаль кожны мужчына быў і ўзброеным ваяром, Літва і яцвягі былі крэўна зацікаўленыя ў ажыццяўленні рабаўніцкіх паходаў як самастойна, так і пад сцягамі суседніх рускіх княстваў. Асабліва добрыя магчымасці для гэтага як полацкі васал мела Літва. У выніку ўдачы літоўцы вярталіся дадому са здабычай, а ў выніку няўдачы маглі асабліва не баяцца помсты ахвяр нападу, бо былі геаграфічна прыкрытыя полацкай тэрыторыяй. Нават калі праціўнік дасягаў панямонскіх лясоў, літоўцы былі ў стане аказаць належнае супраціўленне, як у 1131 г. Па афармленні літоўскай раннесярэднявечнай дзяржаўнасці ў сярэдзіне XII ст. аб'яднанне ваенных рэсурсаў дазволіла літоўцам перайсці да больш буйнамаштабных ваенных мерапрыемстваў. Яны ўжо ажыццяўляліся незалежна ад Полацка. Сам Полацк мог быць іх ахвярай, як тое адбылося каля 1185 г. Фактычна паходы літоўцаў у 1183 г. на Пскоў, у 1184–85 гг. на Земгалію, каля 1185 г. на Полацк і ў 1198 г. разам з палачанамі на Ноўгарад адыгралі ролю, падобную той, якую адыгралі для Русі паходы на Візантыю ў IX–X стст. Яны былі тыповай для раннесярэднявечнай дзяржавы з'явай. Нароўні з вытворчасцю і абменам гэтыя войны былі жыццёва важнай галіной эканомікі і паспрыялі накапленню матэрыяльнага дабрабыту. Паколькі асноўныя выгоды ад вядзення гэтых войнаў трапілі ў рукі вайскова–дружыннай вярхушкі, гэта спрыяла іх маёмаснаму выдзяленню з рэшты грамадства.

### В) Уплыў вайны на развіццё духоўнай культуры

Войны XII ст. аказалі свой уплыў і на культурны краявід грамадства беларускіх земляў. Гэта датычылася фармавання набору пэўных ідэй і стэрэатыпаў паводзін, якія існавалі

217 Археалогія Беларусі. Т. 3. С. 194.

ў грамадстве. Як і раней, адным з лідзіруючых стваральнікаў і носьбітаў такіх стэрэатыпаў стаў вайскова-дружынны слой на чале з князямі. Замацаваўшы сваё становішча на вяршыні палітычнай іерархіі і ўтварыўшы дастаткова адасоблены ад рэшты грамадства сацыяльны слой, князі і дружына развілі карпаратыўную культуру, якая нагадвала культуру заходнееўрапейскага рыцарства і візантыйскай знаці.

Культура гэтая натуральным чынам увабрала ў сябе пласты, напрацаваныя ў папярэднія стагоддзі. Князь ці дружыннік XII ст. яшчэ разглядаў сябе як спадкаемца вікінгаў IX–X стст., які шэрым воўкам рыскаў па прасторах Русі, шукаючы багацця і славы. Адначасова ён імкнуўся прытрымлівацца грамадзянскага ідэалу XI ст., асвечанага хрысціянствам: ваяра-заступніка слабых, абаронцы святой царквы і роднага краю. Аднак аддаленне князёў і дружыны ад рэшты грамадства адбілася і на новых культурных стэрэатыпах, якія мусілі адлюстроўваць іх вышэйшае становішча адносна іншых слаёў насельніцтва. Стэрэатыпы гэтыя вылучаліся падкрэсленай выкшталцонасцю і самазахапленнем. Цяпер ваяру недастаткова было праявіць звярыную смеласць берсерка ці прасветленую стойкасць абаронцы слабых. Сам чын праяўлення смеласці ці іншых высакародных якасцяў мусіў адпавядаць не толькі этычным, але і эстэтычным нормам і мець дасканалую, завершаную форму, якая магла служыць і дыдактычным прыкладам, і пекным сюжэтам для літаратуры і мастацтва.

Такая выкшталцонасць часта дасягала сваёй мэты і ўражвала як сучаснікаў, так і нашчадкаў. Згадаем ганарлівы адказ полацкіх князёў Мсціславу Уладзіміравічу на ягонае патрабаванне прыбыць да яго для паходу супраць полаўцаў у 1130 г. Як перадае гэты адказ Тацішчаў, полацкія князі заявілі Мсціславу: «Ты з Баняком Шалудзяком здаровы бывайце абодва і разбірайцеся паміж сабой самі, а мы маем чым дома заняцца».[218] Мсціслаў быў страшэнна абражаны. Падобныя задзірлівыя ўчынкі служылі прыкладам смелага супрацьстаяння мацнейшаму праціўніку і натхнялі пазнейшыя пакаленні полацкіх князёў на вядзенне самастойнай палітыкі.

---

[218] Татищев В. Н. *История Российская.* Т. 2. 14. С. 142.

Яшчэ далей пайшлі магутныя і самаўпэўненыя сыны Расціслава Смаленскага ў супрацьстаянні з Андрэем Багалюбскім у 1173 г. У ходзе барацьбы за Кіеў суздальскі самаўладзец адправіў да братоў сотніка Міхна з загадам ім пакінуць Кіеў і прылеглыя землі. Але ён натрапіў на моцных праціўнікаў. Адважны Мсціслаў Расціславіч «не оуполошитися никто же, но токъмо Бога единого блюстися». Таму ён «повеле Андреева посла емьше постричи голову передъ собою и бороду». «Рекъ ему иди же ко князю и рци ему: «Мы тя до сихъ местъ акы отца имели по любви, аже еси сь сякыми речьми прислалъ не акы кь князю, но акы кь подручнику и просту человеку, а что оумыслилъ еси, а тое деи, а Богъ за всемъ». Мусіць, найвялікшай радасцю для Расціславічаў было даведацца, што іхняя бравада прывяла да жаданага выніку і балюча ўкалола суздальскага князя. «Андреи же то слышавъ от Михна и бысть образъ лица его попуснелъ».[219] Варта звярнуць увагу на той факт, што адной з прычын такой водпаведзі Мсціслава Андрэю быў зварот апошняга да князёў Расціславічаў як да простых людзей. Таму тырада Мсціслава мела адной са сваіх мэтаў сцверджанне княскага статусу і годнасці.

Побач са смеласцю і дзёрзкасцю ў княскім і дружынным асяроддзі цанілася і высакароднасць, якая дыктавала шляхетнае абыходжанне з роўнымі сабе людзьмі, нават калі тыя з'яўляліся ворагамі. Такія паводзіны былі рачэй ідэалам, чым штодзённай практыкай, але знайшлі адлюстраванне ў крыніцах таго часу, як, напрыклад, учынак полацкага князя Васількі Святаславіча ў 1138 г. У гэтым годзе выгнаны наўгародцамі князь Усевалад Мсціславіч праязджаў ля Полацка. Адносіны паміж двума князямі былі няпростымі. У 1128 г. Усевалад на чале наўгародскіх атрадаў прымаў удзел у арганізаваным Мсціславам Уладзіміравічам наступленні на Полацк. Тыя падзеі прывялі да высылкі ў 1130 г. у Візантыю некаторых полацкіх князёў, у тым ліку Святаслава, бацькі Васількі. Тым не менш, «Василько Полотскии, Всеволоду идущу мимо Полотска, сам выеха к нему, проводи его съ честию, не забыв заповеди божия, забы злобу отца его, что бяше сотворил всему роду его: вшедшу ему в руце

219 Ипатьевская летопись. Ст. 572–573.

его к нему, ничто же о нем лукавно помысли, яко же подобаше по человечеству, но и кресть межи собою целоваста, яко не поминати что ся деяло преж сего, и на всеи правде, и тако и добре и проводи».[220] Высакародны ўчынак, які не можа не выклікаць захаплення нават праз стагоддзі.

Падобнага кшталту ўчынкі маглі выклікаць самапавагу саміх князёў і ўхвалу з боку іншых людзей. Увекавечаныя ў летапісных мініяцюрах, яны перажылі стагоддзі і данеслі да нашчадкаў узоры рыцарсцвенных паводзін. Аднак пры ўсім сваім знешнім бляску такія паводзіны выклікалі ў грамадстве неадназначны адказ. Па-першае, пляцоўкай для дэманстрацыі княскай смеласці і шляхетнасці найчасцей служылі менавіта войны, якія ў XII ст. часта былі разбуральнымі, бессэнсоўнымі і самадастатковымі. Паспалітаму люду, які ад гэтых войнаў цярпеў найбольш, цяжка было захапляцца шляхетнасцю, назіраючы яе праз дым пажараў. Па-другое, лішне казаць, што захапленне формай часам вяло да разыходжання са здаровым сэнсам. Адказ Рагвалодавічаў Мсціславу прывёў да новага нашэсця кіеўскіх войскаў на Полаччыну, якога пры іншых абставінах можна было пазбегнуць. Расціславічам, пасля таго, як яны адпрэчылі Андрэя, давялося падмацоўваць свае словы сілай зброі, што прывяло да буйнога выбуху ваенных дзеянняў.

Па гэтых прычынах пісьмовыя крыніцы XII ст. зафіксавалі два вобразы вайны, ваяроў і ўласцівых ім стэрэатыпаў паводзін, што склаліся ў тагачаснай культуры. Адзін належаў самім жа князям і іх дружыннікам. Вайна разглядалася як шляхетны і годны занятак, ваяры — як прывілеяваны, сацыяльна і маральна вышэйшы за рэшту грамадства слой, а іх паводзіны — як узор высакароднасці і прыклад для пераймання. Іншыя слаі насельніцтва, аддаючы належнае князям і дружыне як абаронцам краю ад знешніх ворагаў, мелі аб іх больш складанае ўяўленне. Вайна часта была навязаным ім злом, князі і дружыннікі-своекарыслівымі рабаўнікамі, а іх паводзіны — праявай марнай пыхі.

Такі складаны погляд на вайну і ваяроў адбіўся ў літаратурных помніках свайго часу. Іх аўтары належалі да адукаваных слаёў насельніцтва, але на старонках іх твораў быў

[220] Псковская 3-я летопись // Псковские летописи. Выпуск второй. Москва, 2000. С. 76–77.

чутны і голас паспалітых гараджан і сялян. Да гонару кніжнікаў XII ст., яны рэдка скочваліся ў апалагетыку, а стараліся непрадузята адзначыць як светлыя, так і цёмныя рысы ў асобах тагачасных ваяроў. Яны не вагаліся распавесці як пра смеласць і мудрасць таго ці іншага князя, так і пра яго лютасць, ганарлівасць і іншыя заганы.

Не будзем закранаць такіх выключных асоб, як усеагульны ўлюбёнец Расціслаў Мсціславіч Смаленскі ці люты і ваяўнічы Глеб Усяславіч Менскі. Звернемся да тыповых для XII ст. княскіх постацяў і прасочым, які след яны пакінулі пасля сябе ў культурнай традыцыі і як паўплывалі на развіццё вобраза ваяра XII ст. у вачах сучаснікаў і нашчадкаў. Такой постаццю для нас будзе Давыд Расціславіч Смаленскі, жыццё і палітычная кар'ера якога не былі адзначаныя ні бліскучымі поспехамі, ні катастрафічнымі паражэннямі, а маральныя якасці не вылучаліся ні вялікай цнотай, ні надзвычайнымі заганамі. Яго рэльефны і супярэчлівы партрэт глядзіць на нас са старонак Іпацьўскага летапісу і «Слова пра паход Ігараў».

Сярэднявечная летапісная традыцыя была мала схільнай да біяграфічнай інфармацыі. Найбольшая ўвага апісанню асобы гістарычнага дзеяча звычайна надавалася ў некралогу. Мае свой некралог пад 1197 г. у Іпацьеўскім летапісе і Давыд. Нават у параўнанні з князямі бясспрэчна большага маштабу Давыдаў некралог вылучаецца даўжынёй і мноствам ухвальных эпітэтаў. Давыд быў «образомъ лепъ всею добродетелью оукрашенъ, благонравенъ, христолюбивъ, любовь имея ко всемъ». «Ово же правяшеть души своеи и переже молитвени прележашеть, манастыря набдя, и черньци оутешивая, и вси игоумены с любовью приимая, и взимая у нихъ благословение, и мирскыя церкви набдя, и всь святительскыи чинъ достоиною честью чтя». «Бе бо крепокъ на рати всегда, бо тосняшеться на великая дела злата и сребра не сбираеть, но даеть дроужине, бе бо любя дроужиноу, а злыя кажня, якоже подобаеть царемь творити».[221] У некралогу смаленскі князь выглядае як увасабленне найлепшых якасцяў, патрэбных мужу і ваяру: багабойнасці, харобрасці і правасуддзя. Усё ж некралог пакідае ў чытача дзіўны аса-

[221] Ипатьевская летопись. Ст. 705.

дак і ўражанне пэўнай няшчырасці летапісца, як быццам той проста не хацеў казаць аб нябожчыку нічога, акрамя добрага, і хаваў за нагрувашчаннем пахвалы іншыя пачуцці. Як адзначае Л. Аляксееў, аўтар некралога выкарыстаў у адносінах да Давыда стандартную формулу, якая ўжывалася раней, і не паклапаціўся напоўніць яе канкрэтным зместам.[222] Такі фармальны падыход наўрад ці сведчыць аб існаванні ў летапісца цёплых пачуццяў да Давыда.

Падобнае ўражанне робяць і тыя радкі «Слова», дзе згадваецца Давыд. На першы погляд, аўтар «Слова» мае наконт Давыда высокае меркаванне і звяртаецца да яго і брата Рурыка, сярод іншых князёў як да абаронцаў Русі ад знешніх ворагаў: «Ты, буй Рюриче, и Давыде! Не ваю ли вои злачеными шеломами по крови плаваша? Не ваю ли храбрая дружина рыкают, аки тури, ранены саблями калеными, на поле незнаеме? Вступита, господина, въ злата стремень за обиду сего времени, за землю Рускую, за раны Игоревы, буего Святъславлича!»[223] Здавалася б, аўтар схіляецца перад сілай князёў-братоў і імкнецца заахвоціць іх да помсты полаўцам за паражэнне Ігара Святаславіча Ноўгарад-Северскага. Аднак кідаецца ў вочы тая акалічнасць, што невядомы кніжнік абраў напамін аб нейкіх старых паражэннях, якія скончыліся для дружыннікаў Давыда і Рурыка крывёй і ранамі як даволі дзіўны спосаб заахвочвання князёў. Ён нібыта не верыў у іх добрую волю і хацеў падштурхнуць іх у паход папрокам. Далей – болей. Аўтар горка зазначае раз'яднанасць братоў: «Сего бо ныне сташа стязи Рюриковы, а друзии Давыдовы, нъ розно ся им хоботы пашут, копиа поют».[224] На фоне непрыхаванага захаплення аўтара іншымі князямі становіцца ясна, што за паэтычнымі радкамі стаіць пачуццё нейкай яго затоенай крыўды на Расціславічаў.

Што ж было яе прычынай? Разбіраючы гэтае пытанне, Б. А. Рыбакоў прыйшоў да высновы, што згаданай бітвай, у якой дружыннікі плавалі сваімі шлемамі па крыві і рыкалі ад шабельных ран, было паражэнне русінаў ад полаўцаў пад Растоўцам у 1176 г., адным з галоўных віноўнікаў якога быў

[222] Алексеев Л. В. *Смоленская земля в IX–XIII вв.* С. 229–230.
[223] Слово о пълку Игореве. С. 172.
[224] Тамсама. С. 173.

менавіта Давыд, бо спазніўся на поле бою.[225] Такія паводзіны вышгарадскага князя выклікалі страшэннае абурэнне сучаснікаў. Чарнігаўскі князь Святаслаў Усеваладавіч пасля паражэння пад Растоўцам аспрэчыў уладу Расціславічаў над Кіеўскай зямлёй з-за страты імі маральнага аўтарытэту. Ён рашуча заявіў Раману Расціславічу Кіеўскаму: «Брате, я не ищю подъ тобою ничего же, но рядъ нашь такъ есть: оже ся князь извинить, то въ волость, а моужь оу головоу, а Давыдъ виноватъ».[226] Старая гісторыя ўспомнілася аўтару «Слова» пасля паражэння Ігара ў 1185 г., калі мяцеж смаленскага войска не дазволіў Давыду прыйсці на дапамогу іншым рускім князям. У выніку полаўцы стварылі небяспеку для Пераяслаўля і ўзялі Рымаў. Нашэсце іх суправаджалася вялікімі ахвярамі.

Ужо другі раз Давыд быў вінаваты ў той шкодзе, якую нанеслі Русі знешнія ворагі, і кніжнік не мог яму гэта дараваць. Пры гэтым размова не ішла толькі аб адсутнасці ваеннага таленту ці мудрасці, неабходнай, каб кіраваць людзьмі. Галоўнай праблемай было тое, што хранічная няздольнасць Давыда сустрэць полаўцаў у баі ішла поруч з яго найактыўнейшым удзелам у міжусобных войнах, якія наносілі Русі неверагодную шкоду. На памяць адразу ж маглі прыйсці яго шматлікія кампаніі супраць палачан, чарнігаўцаў і суздальцаў. Пры ўсёй адасобленасці княстваў Русі адно ад аднаго войны паміж імі ў адрозненне ад барацьбы з полаўцамі было вельмі цяжка апраўдаць маральна. Невыкананне Давыдам яго непасрэднага княскага абавязку па абароне краю ад знешніх ворагаў разам з дробязным адстойваннем своекарыслівых інтарэсаў у барацьбе з суседзямі і выклікалі яго асуджэнне кніжнікам. Можна пагадзіцца з Б. Рыбаковым у тым, што для аўтара «Слова» вышгарадскі і смаленскі князь стаў увасабленнем «разброду сярод князёў» і «гранічнага эгаізму асобных палкаводцаў».[227]

Такім супярэчлівым і застаўся Давыд Расціславіч на старонках «Слова» і летапісаў: здольны дзяржаўны дзеяч, які ўтрымаў у руках Смаленскую зямлю ў няпросты час, і дро-

---

225 Рыбаков Б. А. *Отрицательный герой «Слова о полку Игореве»* // Культура Древней Руси. Москва, 1966. С. 240–241.

226 Ипатьевская летопись. Ст. 603–604.

227 Рыбаков Б. А. *Отрицательный герой «Слова о полку Игореве»*. С. 239.

бязны эгаіст, гатовы разварушыць міжусобную вайну на цэлай Русі дзеля ўласнай выгоды; добры палкаводзец, які меў пераменны поспех у міжусобных войнах, але не абараніў Русь ад полаўцаў; патэнцыйны герой, які так і не стаў героем.

Як сонца ў кропельцы вады, у асобе Давыда адлюстроўваецца вобраз князёў і дружыны, які зафіксавала літаратура XII ст. Адчуўшы сваю карпаратыўную еднасць, ваяры добра пашчыравалі над выпрацоўкай выкшталцоных узораў паводзін і маралі, якія сталі пэўным дасягненнем тагачаснай культуры. З дапамогай такіх стэрэатыпаў паводзін ваяры імкнуліся прышчапіць іншым слаям грамадства стаўленне да сябе як да вышэйшай прывілеяванай групы. Паспольства, аднак, успрыняло новыя ўзоры дружыннай культуры дваіста. Яно прыхільна глядзела на праяўленні харобрасці і шляхетнасці там, дзе гэта ішло ў рэчышчы выканання князямі і дружынай іх асноўнай функцыі па абароне грамадства. Праз летапісцаў і кніжнікаў яно аддало належнае князям і дружыне на старонках літаратурных твораў. Разам з тым на тых самых старонках прыхавана ці адкрыта асуджаліся пыха, эгаізм, лютасць і непатрэбная ваяўнічасць, якія былі адваротнымі бакамі той самай дружыннай культуры і сведчылі аб адрыве князёў і дружыны ад паспольства. Менавіта таму ўсё тое ж «Слова» адначасова ўтрымлівае і асуджэнне князёў за іх бясконцыя звады, і ўзнёслую пахвалу ім за абарону свайго краю. З'яўленне новых культурных узораў і іх прыняцце альбо непрыняцце рознымі групамі насельніцтва адлюстроўвала адчуванне грамадствам крызісных з'яў і пошукаў выйсця з іх.

# *Раздзел 3.*
# Ваеннае майстэрства Полацкай, Смаленскай і Тураўскай земляў, Літвы і яцвягаў у 1102–1200 *гг.*

### А) Вайсковая арганізацыя

Калі ў XI ст. раннесярэднявечная вайсковая арганізацыя на землях Полаччыны, Смаленшчыны і Тураўшчыны дасягнула вяршыні свайго развіцця, то XII ст. было часам яе паступовага заходу і разлажэння. Складныя часткі вайсковай арганізацыі захавалі свае ранейшыя формы княскай дружыны, апалчэння і нерэгулярных саюзных атрадаў. Разам з тым сутнасць іх, падточаная знутры крызіснымі з'явамі, заўважна змянілася. Княская ўлада набывала самадастатковы характар, усё больш адрывалася ад паспольства, губляла кантакт з ім і яго падтрымку. Дружына ўсё менш выконвала свае непасрэдныя функцыі па абароне грамадства і ўсё больш ператваралася ў інструмент своекарыслівай княскай палітыкі. Масы гарадскога і вясковага насельніцтва, якія з'яўляліся асновай апалчэння, выяўлялі ўсё больш цікавасці да мірных заняткаў і ўсё менш цікавасці да вайны. У паход ішла толькі частка баяздольнага люду, якую таксама ўсё цяжэй было мабілізаваць да ўдзелу ў нямілых іх сэрцу княскіх міжусобіцах. Узніклы недахоп узброенай сілы кампенсаваўся за кошт прыцягнення кантынгентаў падуладных ці саюзных народаў. У адносінах да Полацкага княства такім народам была Літва. Дзякуючы сваёй сіле літоўцы хутка пераўтварыліся з васалаў у полацкім войску ў раўнапраўных саюзнікаў, а затым і прэтэндэнтаў на месца Рагвалодавічаў і іх дружыннікаў у структуры полацкага грамадства.

Найперш звернем нашу ўвагу на дружыну, якая па-ранейшаму складалася са старэйшай і малодшай. Характар узаемаадносін старэйшай дружыны, прадстаўленай баярамі,

з князем паступова змяняўся. Адносіны, пабудаваныя на асабістай сувязі, адыходзілі ў мінулае. Як адзначаюць даследчыкі, баяры асядалі на зямлі, якую атрымлівалі ад князя ў кармленне[228] альбо самастойна захоплівалі, ператвараючыся з княскіх сяброў-паплечнікаў у яго васалаў. У абмен яны мусілі несці княскую службу і выстаўляць на вайну свае ўласныя ўзброеныя дружыны. Баярскі васалітэт быў яшчэ далёкім ад феадалізму. Па-першае, кармленні, якія былі асноўнай формай княскіх пажалаванняў баярам, не прадастаўлялі права ўласнасці на зямлю і не накладалі залежнасці на яе насельнікаў. Кармленні былі рэнтай, якую свабоднае насельніцтва выплочвала князю ці баярыну за выкананне адміністрацыйных, судовых і ваенных функцый у інтарэсах усяго грамадства.[229] Гэта ніяк не нагадвала класічнай леннай сістэмы, аснову якой складала «ператварэнне ваяроў у васалаў праз пажалаванне ім зямельных уладанняў (лен)».[230] Зародкамі феадалізму былі толькі ўласнасць на самавольна захопленую і новаасвоеную зямлю і залежны статус яе жыхароў. Прыкладам такога землеўладання могуць служыць замкі, якія былі цэнтрамі прыватнаўласніцкіх земляў. Замак Вішчын у сучасным Рагачоўскім раёне, калі меркаваць па знойдзенай там віслай пячатцы героя вайны 1173 г. з Андрэем Багалюбскім Мсціслава Расціславіча Харобрага, належаў яму ці камусьці з ягоных васалаў.[231] Замак у Мсцібаве Ваўкавыскага раёну, верагодна, належаў у канцы XII – пачатку XIII стст. валынскаму баярыну Мсцібогу.[232] Аднак у XII ст. такое княскае і баярскае землеўладанне было яшчэ вельмі нязначным і ўяўляла кроплю ў моры свабодных абшчын.[233] Па-другое, асабістыя адносіны паміж князем і баярамі былі моцна паслабленыя, але не зніклі канчаткова. Баяры не жылі побач з князем, але заставаліся яго бліжэйшымі дарадцамі і паплечнікамі і часта з'язджаліся да яго

---

228 Фроянов И. Я. *Киевская Русь: Очерки социально-политической истории.* С. 546.

229 Тамсама. С. 395.

230 Дельбрюк Г. *История военного искусства.* Т. 3. С. 7.

231 Загорульский Э. М. *Вищинский замок XII–XIII вв.* Мн., 2004. С. 144–145.

232 Раппопорт П. А. *Военное зодчество западнорусских земель X–XIV вв.* С. 86.

233 Фроянов И. Я. *Киевская Русь: Очерки...* С. 424.

для абмеркавання і вядзення спраў. Яны ўдзельнічалі ў большасці ягоных прадпрыемстваў і дзялілі з ім перамогі і паражэнні.[234] Менавіта ў такой якасці паказвае летапіс дружыннікаў Расціслава Глебавіча ў 1158 г. Незадаволеныя князем палачане пачалі збіваць ягоную дружыну, і з дружынай жа разам Расціслаў уцёк у Менск.[235] З вышэйсказанага вынікае, што старэйшая дружына феадальным войскам ці феадальнай сацыяльнай з'явай яшчэ не была. Разам з тым развіццё васальных адносін у супрацьвагу асабістым дружынным адносінам ужо было крокам у бок феадалізму.

У большай ступені можна пагадзіцца з меркаваннем аб феадалізацыі малодшай дружыны.[236] На працягу XII ст. малодшыя дружыннікі не станавіліся паўнапраўнымі васаламі. Яны няўхільна ператвараліся з княскіх сяброў і паплечнікаў ва ўзброеных слуг, якіх мы можам параўнаць з заходнееўрапейскімі міністэрыяламі. Адлегласць паміж сацыяльным статусам старэйшага і малодшага дружынніка ўзрасла. Як адзначае І. Фраянаў, да канца XII ст. крыніцы пачалі адрозніваць «бояр думающих» і «мужей хоробрствующих».[237] Падрабязная рэдакцыя «Рускай Праўды», якая адносіцца да 20–30-х гг. XII ст., паказвае статус дружынных отракаў роўным статусу такіх слуг, як конюх ці кухар.[238] Але поўнага выцяснення дружынных адносін феадальнымі не адбылося і ў малодшай дружыне. У XII ст. крыніцы па-ранейшаму вылучаюць у складзе дружыны дзецкіх, якія мелі статус асабіста вольных людзей. Пры апісанні тых жа полацкіх падзей 1158 г. летапіс называе дзецкага, які папярэдзіў Расціслава аб падрыхтоўцы замаху на яго. Калі зварот служыць паказчыкам характару сацыяльных адносін паміж людзьмі, то зварот дзецкага да Расціслава «княже» з'яўляецца зваротам вольнага дружынніка да правадыра дружыны, але ніяк не слугі да гаспадара. Таму хаця феадальныя адносіны і ўкараняліся ў малодшай дружыне на працягу XII ст., але да

---

234 Фроянов И. Я. *Киевская Русь: Очерки...* С. 549.
235 Ипатьевская летопись. Ст. 495.
236 Разин Е. А. История военного искусства. Т. 2. С. 140.
237 Фроянов И. Я. *Киевская Русь: Очерки...* С. 551.
238 Пространная Русская Правда (по Троицкому списку второй половины XIV в.) // Тихомиров. М. Н. *Пособие для изучения Русской Правды.* Москва, 1953. С. 90.

канца стагоддзя яна так і не паспела набыць цалкам феадальны характар і захавала шмат архаічных дружынных рысаў.

Варта таксама трохі падрабязней спыніцца на пытанні развіцця васалітэту ў XII ст. і звязаным з гэтым ускладненнем вайсковай арганізацыі. У XI ст. дружына аднаго князя складалася з яго ўласнай малодшай дружыны і прыведзеных ягонымі старэйшымі дружыннікамі кантынгентаў. Узброеныя сілы адной зямлі складаліся з войска князя, які кіраваў у стольным горадзе, і іншых падначаленых яму князёў. Піраміда васалітэту была нескладанай. На яе вяршыні знаходзіўся старэйшы князь, кіеўскі ці полацкі. Яго васаламі былі ўласныя старэйшыя дружыннікі і падначаленыя князі, якія былі ягонымі бліжнімі сваякамі. У тых былі ўласныя васалы-дружыннікі. Найдаўжэйшая лесвіца такой піраміды складалася з трох прыступак: старэйшы князь – малодшы князь – старэйшы дружыннік малодшага князя. Драбленне Полацкага княства і Кіеўскай дзяржавы ў XII ст. і разгалінаванне княскіх родаў прывяло да з'яўлення мноства невялічкіх княстваў і дробных князёў, якія знаходзіліся ў вельмі складаных дачыненнях са старэйшымі князямі і паміж сабой. Дачыненні гэтыя будаваліся іерархічна і прымалі характар адносін паміж кіруючым сюзерэнам і падначаленым васалам. Найстарэйшай формай васалітэту была генеалагічная, заснаваная на падпарадкаванні малодшага па ўзросту князя старэйшаму, сына – бацьку, пляменніка – дзядзьку, малодшага брата – старэйшаму. Паступова развіваўся і палітычны васалітэт, які выражаўся ў наданні воласці старэйшым князем малодшаму альбо сімвалічным прыняццем малодшым князем з рук старэйшага той воласці, якой ён ужо валодаў.[239] Замацаванне такіх адносін суправаджалася цырыманіялам, які мы бачым пры заключэнні міру на ўмовах васалітэту паміж Глебам Усяславічам Менскім і Уладзімірам Манамахам у 1117 г.: «Глебъ же вышедъ из города съ детми и съ дружиною, поклонися Володимеру и молвиша речи о мире, и обещася Глебъ по всему послушати Володимера». «Володимеръ же омиревъ Глеба, и наказавъ его о всемъ вдасть ему Менескъ».[240] Такім чынам, сюзе-

---

[239] Фроянов И. Я. *Киевская Русь: Очерки...* С. 533–541.

[240] Ипатьевская летопись. Ст. 283.

рэн надаваў васалу воласць, васал жа браў на сябе ў дачыненні да сюзерэна абавязак вайсковай службы і абяцаў слухацца яго ва ўсім. На гэткім фундаменце часам будаваліся даволі доўгія лесвіцы васальных адносін. Напрыклад, у 1173 г. Андрэй Багалюбскі вымусіў Рамана Расціславіча Смаленскага як свайго васала рушыць у паход на Кіеў. У паходзе таксама бралі ўдзел «вси» полацкія князі. Да 1180 г. полацкі князь Усяслаў Васількавіч займаў у дачыненні да Рамана Расціславіча васальнае становішча. Іншыя ж полацкія князі былі ўжо васаламі Усяслава. Яны вялі на Кіеў сваіх васальных дружыннікаў. Гэта значыць, што ў паходзе 1173 г. васальная лесвіца складалася ўжо з пяці прыступак.

Лесвіцы такія былі хісткімі. Васальнае права на беларускіх землях было распрацавана нашмат горш, чым у заходнееўрапейскіх дзяржавах ці Іерусалімскім каралеўстве крыжаносцаў у Палесціне. Ды і тыя мінімальныя прававыя нормы ўвесь час адступалі перад асабістымі інтарэсамі князёў, якія гатовы былі парушаць клятвы і мяняць сюзерэнаў у залежнасці ад перамен палітычнай сітуацыі. Глеб парушыў свае клятвы ўжо ў 1119 г. і ўчыніў напад на ўладанні свайго сюзерэна. Сюзерэны таксама далёка не заўсёды былі надзейнымі заступнікамі сваіх васалаў. У гэтай сувязі мы можам згадаць Святаслава Ольгавіча Чарнігаўскага, да якога палачане звярнуліся па заступніцтва ў 1151 г. пры звяржэнні Рагвалода Барысавіча. Але ў 1158 г. Святаслаў кінуў палачан і Расціслава і стаў на бок Рагвалода. Таму, хаця кожны васал мусіў выступаць на вайну на загад сюзерэна, войска, якое ўключала шматлікія васальныя кантынгенты, было цяжкім да збору і ненадзейным на полі бою.[241] Паказальнай у гэтым сэнсе была нязгода паміж Расціславам Мсціславічам Смаленскім і ягоным пляменнікам і васалам Мсціславам Ізяславічам Пераяслаўскім, якія ў 1154 г. марна спрабавалі абараніць Кіеў ад наступаючых войскаў Ізяслава Давыдавіча Чарнігаўскага, сына Юр'я Даўгарукага Глеба і саюзных ім полаўцаў. Баявыя дзеянні яшчэ толькі абмяжоўваліся перастрэлкай цераз раку, а дасведчанаму Расціславу пры адным поглядзе на цьму полаўцаў стала ясна, што шанцаў на перамогу няма. Ён паспрабаваў прапанаваць Ізясла-

[241] Разин Е. А. *История военного искусства.* Т. 2. С. 140.

ву мір з перадачай таму Кіева ад сябе і Пераяслаўля ад Мсціслава. Аднак пляменніку і васалу смаленскага князя не спадабалася перспектыва пазбавіцца свайго стала. У ярасці ён заявіў Расціславу: «Да ни мне будет Переяславля, ни тобе Киева». Сказаўшы гэта, «повороти конь Мьстиславъ подъ собою с дружиною своею отъ стрыя своего». Вывад Мсціславам сваёй дружыны з поля бою (хаця пазней, мяркуючы па звестках летапісу, ён вярнуўся ў строй) дазволіў полаўцам узмацніць ціск на Расціслава. Пасля ўпартай, але безнадзейнай двухдзённай бітвы дзядзька і пляменнік былі разбітыя і мусілі ўцякаць з Кіева.[242]

Пры ўсёй ненадзейнасці, аднак, разумнай альтэрнатывы дружынным атрадам у XII ст. не было. Дружына працягвала быць і целам вайны. Больш за тое, яе якасная і колькасная ўдзельная вага ў агульным складзе войска пастаянна расла. Па-першае, з развіццём тактыкі конніца канчаткова набыла значэнне вядучага роду войскаў.[243] Цяжкаўзброеная конніца, поўнасцю аснашчаная камплектам наступальнай і засцерагальнай зброі, была асноўнай ударнай сілай любой арміі на беларускіх землях. У сілу эканамічных і сацыяльных прычын галоўная роля ў камплектаванні цяжкой конніцы належала менавіта дружыне. Пры высокім кошце зброі толькі багаты чалавек, якімі былі князі і баяры, мог забяспечыць сябе і сваіх дружыннікаў поўным яе наборам. Выкарыстанне цяжкай зброі ў баі патрабавала добрага ёй валодання, якога ізноў жа мог дасягнуць толькі прафесійна падрыхтаваны ваяр-дружыннік на княскай службе, вызвалены ад клопату па сваёй эканамічнай падтрымцы. Па-другое, у перыяд бесперапынных войнаў толькі прафесійная дружына знаходзілася ў стане баявой гатоўнасці і магла неадкладна выступіць у паход, у які апалчэнне ісці не магло з-за гаспадарчай занятасці ці не хацела з-за адмоўнага стаўлення да княскіх авантур. Васальныя дружыны былі ненадзейнымі, аднак уласныя отракі і дзецкія былі галоўнай апорай князя. Па гэтых прычынах асноўнай фігурай войнаў XII ст. быў цяжкаўзброены конны дружыннік.

Роля вояў апалчэння ў дадзены час якасна знізілася. Яно ўсё ж працягвала заставацца значнай часткай вайсковай ар-

---

[242] Ипатьевская летопись. Ст. 474–475.

[243] Кирпичников А. Н. *Древнерусское оружие*. Вып. 3. С. 60–61, 65.

ганізацыі і колькасна пераважала княскія дружыны. Гарадское апалчэнне зведала ўскладненні ў сваёй структуры ў сувязі з хуткай урбанізацыяй і ростам гарадскога насельніцтва. Апалчэнне аднаго горада па-ранейшаму называлася тысячай. Кіраваў ёй тысяцкі, якога прызначала веча ці іншая земская ўлада. Разам з тым гарадскі пасад, ці канец, які цяпер налічваў больш жыхароў, выстаўляў ужо не сотню, а цэлы полк, які быў наступнай пасля тысячы арганізацыйнай адзінкай войска і кіраваўся ваяводам. Некалькі вуліц выстаўлялі сотню на чале з соцкім, адна вуліца, – верагодней за ўсё, дзесятак на чале з дзесяцкім.[244] Адзінкі гэтыя колькасна не адпавядалі сваім назвам і налічвалі людзей меней за намінальную колькасць. «Дзесяткі», «сотні» і «тысячы» былі паняццем арганізацыйным, але не арыфметычным. Не да канца вывучаным з'яўляецца пытанне аб арганізацыі сельскага апалчэння. І. Я. Фраянаў прытрымліваецца думкі, што, паколькі горад быў адміністрацыйным цэнтрам зямлі, то і сельскія кантынгенты далучаліся да гарадскіх соцень.[245]

Апалчэнне ўжо даўно не было сукупнасцю ўсіх баяздольных мужчын. У залежнасці ад абставін і сур'ёзнасці ваеннай пагрозы выкарыстоўваліся разнастайныя нормы мабілізацыі насельніцтва. Звесткі аб такіх нормах у Полацкай, Смаленскай і Тураўскай землях не захаваліся, але мы можам скласці аб іх гіпатэтычнае ўяўленне, беручы ў якасці прыкладу Наўгародскую зямлю. Пры падабенстве сацыяльнага ладу і прыродных умоваў Полаччына, Смаленшчына, Тураўшчына і іншыя землі Верхняй Русі не павінны былі значна адрозніваецца ў гэтым сэнсе ад Ноўгарада. У Наўгародскай зямлі адзінкай адліку апалчэння была «саха», г. зн. гаспадарка з колькасцю зямлі, якую маглі ўзараць тры чалавекі ўключна з гаспадаром на трох конях. Пры звычайнай норме мабілізацыі дзесяць сох выстаўлялі аднаго коннага ваяра. Пры павышанай ваеннай пагрозе адзін ваяр выстаўляўся ад чатырох сох. Для маламаёмасных жыхароў дзейнічала норма, пры якой два чалавекі рыхтавалі на вайну трэцяга.[246] Падобныя нормы маглі гіпатэтычна існаваць і ў Полаччыне, Смаленшчыне і Тураўшчыне.

---

244 Разин Е. А. *История военного искусства.* Т. 2. С. 148.
245 Фроянов И. Я. *Киевская Русь: Очерки...* С. 678–679.
246 Разин Е. А. *История военного искусства.* Т. 2. С. 147–148.

Апалчэнне мусіла падпарадкоўвацца князю як вярхоўнаму кіраўніку ўсіх узброеных сіл зямлі. На практыцы ж у атмасферы канфліктаў паміж князем і вечам у XII ст. апалчэнне часта было поўнасцю аўтаномнай арганізацыйнай і баявой адзінкай, якая падпарадкоўвалася прызначанаму вечам тысяцкаму галоўнага горада зямлі. Раз'яднанасць дружыны і апалчэння была сур'ёзнай слабасцю армій беларускіх земляў. Можна згадаць, што адной з прычын паражэння Усяслава Васількавіча і палачан ад Валадара Глебавіча ў 1167 г. была адсутнасць сувязі паміж княскай і земскайársткамі войска на паходзе. Нязгоды паміж Давыдам Расціславічам і смалянамі маглі негатыўна паўплываць на баявы дух смаленскага войска перад Віцебскай бітвай у 1196 г.

Апалчэнне не было аднародным па ўзбраенні і баявых якасцях. Побач з багатымі гараджанамі, якія былі ў стане набыць поўны камплект узбраення і рушыць у паход на кані, у апалчэнні прысутнічалі бяднейшыя воі. Багаты земскі баярын выступаў у паход конна, меў шлем, кальчугу і шчыт і быў узброены мечам, кап'ём і па неабходнасці сякерай, паліцай, суліцамі і лукам. Звычайныя воі ішлі пешымі, а іх узбраенне магло абмяжоўвацца шчытом, сякерай і кап'ём. Зусім жа бедныя воі не мелі нічога, акрамя суліц.

Захавалі сваё значэнне залогі гарадоў, якія камплектаваліся з прафесійных ваяроў і ў залежнасці ад памеру і характару горада падпарадкоўваліся вечу альбо князю.

Закрануўшы мабілізацыйныя нормы пры зборы апалчэння, мы ўшчыльную падышлі да пытання аб колькасці ўзброеных сіл на беларускіх землях у XII ст. Нам не давядзецца даследаваць гэтае пытанне з нуля, бо мы маем прысвечаны яму грунтоўны артыкул Г. В. Ласкавага. Грунтуючыся на ацэнцы прыкладнай шчыльнасці насельніцтва беларускіх земляў у 3–4 чалавекі на км², даследчык вызначае колькасць насельніцтва Полацкай зямлі ў канцы XI–XIII стст. у 270–350 тыс. чалавек і 68–70 тыс. баяздольных мужчын. Беручы за аснову норму мабілізацыі аднаго з чатырох баяздольных мужчын і прапарцыянальную колькасць дружыннікаў, Г. В. Ласкавы вызначае колькасць узброеных сіл Полаччыны ў 17–17,5 тыс. апалчэнцаў і 3,4–3,5 тыс. дружыннікаў. Падлікі колькасці дружыннікаў пацвярджаюцца плошчай археалагічна даследаваных гарадоў, гарадкоў і замкаў, памножанай

на ўмоўную норму шчыльнасці дружыннікаў ва ўмацаваных пунктах, якая раўнялася 50 чалавек на адзін гектар. Колькасць кантынгентаў ліваў і літвы ў розных выпадках вагалася ад некалькіх соцень да паўтара дзесятка тысяч. З гэтым узгадняецца колькасць страт палачан у земгальскай экспедыцыі 1106 г., якая, згодна з летапісам, склала 9 тысяч дружыны.[247]

Калі дэмаграфічныя дадзеныя заслугоўваюць даверу, падлікі Г. В. Ласкавага сапраўды прадстаўляюць даволі дакладную лічбу колькасці насельніцтва, здольнага насіць зброю. Між тым лічба гэтая паказвае толькі патэнцыйных ваяроў і не з'яўляецца тоеснай лічбе ваяроў, якія падлягалі мабілізацыі і тым больш сапраўды рушылі ў паход. Норма аднаго з чатырох баяздольных мужчын,[248] з якой беларускі даследчык зыходзіць пры вызначэнні колькасці людзей, што падлягалі мабілізацыі, падаецца моцна завышанай. Тлумачыцца гэта тым, што звесткі аб пскоўскай норме мабілізацыі XV ст. аднаго чалавека ад чатырох сох інтэрпрэтуюцца недакладна. Як мы бачылі вышэй, адна саха намінальна налічвала не аднаго, а трох дарослых мужчын, і значыць, норма мабілізацыі была ўтрая ніжэй. Больш за тое, з больш ранняга наўгародскага досведу відаць, што прызыў ад чатырох сох быў чымсьці надзвычайным. Пры звычайнай норме аднаго чалавека ад дзесяці сох у войска прызываўся толькі адзін з трыццаці баяздольных мужчын. Такім чынам, мабілізацыі ў Полацкай зямлі падлягала не больш за 2,3 тысячы чалавек у звычайных выпадках і 5–6 тысяч у выпадку павышанай ваеннай пагрозы.

Яшчэ больш цікава паразважаць над тым, колькі ж чалавек сапраўды траплялі ў войска і ўдзельнічалі ў баявых дзеяннях. Праблема забеспячэння прызыву ў войска была балючым месцам дзяржавы на ўсім працягу чалавечай гісторыі. Асаблівую ж цяжкасць яна ўяўляла для раннесярэднявечных дзяржаў з іх слабым дзяржаўным апаратам, які недакладна ўяўляў колькасць і рассяленне насельніцтва. Для параўнання, праваліліся шматлікія спробы складання каралямі Францыі каралінгскай эпохі рэкруцкіх спісаў. Ненашмат

---

[247] Ласкавы Г. В. *Да пытання аб арганізацыі і складзе ўзброеных сіл Полацкай зямлі ў канцы XI – пачатку XIII стст.* С. 14–16.

[248] Тамсама. С. 12.

лепшым было стано-вішча ў Англіі XIV ст. Непрыемным адкрыццём для караля Эдуарда III і парламента стала тое, што рыцарскіх ленаў у краіне аказалася нашмат менш, чым меркавалася.[249] Можна думаць, што Полацкай, Смаленскай ці Тураўскай землям з іх мізэрным дзяржаўным апаратам было яшчэ цяжэй падлічыць колькасць баяздольнага насельніцтва, вызначыць ваеннаабавязаных і мабілізаваць іх.

Яшчэ больш за тэхнічныя цяжкасці збору войска перашкаджалі палітычныя і эканамічныя фактары, якія прымушалі ваеннаабавязаных ухіляцца ад мабілізацыі ці сабатаваць дзейнасць войска ўжо на паходзе з дапамогай мяцяжоў і хваляванняў. Першай такой прычынай была нязгода паспольства з князем. Простыя людзі і земская знаць небеспадстаўна лічылі князя ўрадоўцам, пасаджаным на стол дзеля кіравання ў інтарэсах усёй зямлі. У выпадку нязгоды з распачатай ім вайной яны не вагаліся выказаць свой пратэст. Калі ў 1158 г. Рагвалод Барысавіч зрабіў спробу адняць уладу ў Полацкай зямлі ў Расціслава Глебавіча, да яго імгненна далучыліся ўсе дручане і частка палачан.[250] Лішне казаць, што ўрадавае полацкае войска, якое Расціслаў павёў на Друцк для падаўлення мецяжу Рагвалода, недалічылася гэтых людзей і было моцна такімі ўнутранымі супярэчнасцямі паслабленае.

Не спрыялі збору войска і эканамічныя фактары. Як заўважае Г. Дэльбрук, у каралінгскай Францыі найцяжэйшым элементам ваеннай павіннасці для сялян было прыцягненне для службы каня. Гэта было тым большым цяжарам для сялянскіх гаспадарак, чым часцей коні гінулі ў баявых дзеяннях. Многія сяляне коней наогул не мелі і заворвалі свае землі з дапамогай валоў ці кароў. У такіх абставінах яны проста адкупаліся ад ураду натуральнымі ці грашовымі ўнёскамі. Вайсковая павіннасць ператваралася ў прыхаваны падатак.[251] Падобная праблема існавала і на беларускіх землях. Масавая гібель коней на вайне зафіксавана крыніцамі. Абмяркоўваючы магчымасць прыцягнення сялянскіх коней для паходу супраць полаўцаў на вайсковай нарадзе ў 1103 г., дружыннікі тураўскага і кіеўскага князя Святаполка Ізясла-

---

[249] Дельбрюк Г. *История военного искусства.* Т. 3. С. 10–12.
[250] Ипатьевская летопись. Ст. 493–494.
[251] Дельбрюк Г. *История военного искусства.* Т. 3. С. 11.

віча падкрэслівалі небяспеку гэтай меры для гаспадаркі смердаў.[252] У 1158 г. конскі мор абрынуўся на кааліцыйнае войска з удзелам палачан і смалян, якое асаджала Тураў і Пінск.[253] Вынікам быў выбух марадзёрства з боку кааліцыі і наступны мяцеж палачан супраць Расціслава. Там, дзе рады не мог даць дзяржаўны апарат Каралінгаў, мала шанцаў на поспех было і ў Рагвалодавічаў і Рурыкавічаў. Каралінгі мусілі задаволіцца выплатай падатку замест службы. Князі ж беларускіх земляў, напэўна, проста цярпелі масавае нез'яўленне вояў у паход.

Нарэшце, утрымаць сярэднявечнае войска было яшчэ цяжэй, чым сабраць.[254] Выправы кшталту дзесяцітыднёвага стаяння пад Туравам у 1158 г. патрабавалі добрага матэрыяльнага забеспячэння, арганізаваць якое ў XII ст. было няпроста. Наадварот, доўгатэрміновая адсутнасць дарослых мужчын з конямі наносіла вялікую шкоду сельскай гаспадарцы зямлі, якая такое войска выстаўляла.

Існавалі і праблемы са зборам прафесійных дружыннікаў. Прычынай была згаданая ненадзейнасць васальных кантынгентаў. Князь мог давяраць сваім отракам і дзецкім, але ў дружынах сваіх васалаў упэўненасці ў яго не было. У залежнасці ад палітычных абставін і ўласных інтарэсаў васалы прыходзілі на дапамогу з усімі наяўнымі сіламі, маглі ўхіліцца ад удзелу ў вайне на баку сюзерэна ці зусім перайсці на бок ворагаў. Выгнаўшы Расціслава Глебавіча з полацкага стала ў 1158 г., Рагвалод Барысавіч рушыў на яго менскія ўладанні і ўладанні ягоных васалаў. Першай яго мэтай было Заслаўе, дзе княжыў брат Расціслава Усевалад. Нягледзячы на сваяцтва, Усевалад не стаў абараняць горад. «Всеволодъ же бе имя великую любовъ къ Рогъволоду, и на ту любовъ надеяся ехавъ к Рогъволоду поклонися».[255] Здрада справе свайго брата прынесла Усеваладу пэўныя выгоды. Ён страціў Заслаўе, але атрымаў у княжанне Стрэшын. Такая праблема была тыповай для сярэднявечных армій. Лаяльнасць васалаў сюзерэнам у Заходняй Еўропе таксама вагалася ад вялікага энтузіязму да пошуку нагоды для адмовы

---

[252] Лаврентьевская летопись. Ст. 277.
[253] Ипатьевская летопись. Ст. 492.
[254] Контамин Ф. *Война в Средние века.* С. 326.
[255] Ипатьевская летопись. Ст. 496.

ад удзелу ў паходзе ці фармальнага і неахвотнага выканання сваіх васальных абавязкаў. Выснова наша будзе простай: у войнах XII ст. на беларускіх землях бралі ўдзел нашмат менш людзей, чым магло ці мусіла быць прызванымі ў войска.

Выснова гэтая дазваляе праліць іншае святло і на звесткі аб стратах палачан у земгальскай экспедыцыі, калі земгалы «дружины оубиша 9 тысящь».[256] Зразумела, што пад словам «дружына» летапісец у дадзеным выпадку разумеў усё войска, якое ўключала і дружыну, і апалчэнне, бо нават па самых шчодрых ацэнках Полаччына не мела такой колькасці княскіх дружыннікаў. З гэтага вынікае, што «тысячы» палачан былі апалчэннямі асобных удзелаў Полаччыны, пра якія мы казалі вышэй. Яны ўяўлялі сабой арганізацыйныя адзінкі і ў арыфметычным вылічэнні былі далёкімі ад сапраўдных тысяч. Нават у пазнейшыя часы гарадскія тысячы не налічвалі больш за некалькі соцень чалавек.[257] Пры гэтым зразумела, што полацкая «тысяча» была большай за віцебскую ці друцкую ў сілу большай колькасці насельніцтва. Такім чынам, дзевяць удзельных апалчэнняў, пра якія ідзе гаворка, наўрад ці налічвалі больш за 4,5—5 тысяч чалавек разам, і гэта толькі ў выпадку агульнага ўздыму ваяўнічасці і добра праведзенага збору войска. Да апалчэння далучаліся дружыны ўдзельных князёў. Ступень іх мабілізацыі была высокай, але, улічваючы, што такія князі, як Глеб Менскі, маглі ўхіліцца ад удзелу ў паходзе, не перавышала 2—2,5 тысячы.[258] Агульная колькасць войскаў у земгальскім паходзе магла дасягаць 6,5—7,5 тысяч чалавек. У іншых паходах колькасць войскаў была яшчэ меншай. Лічбы гэтыя даюць нам прыкладную велічыню, з якой можна параўноўваць колькасць войскаў і Смаленскай ці Тураўскай земляў.

Таксама не варта літаральна ўспрымаць тэрмін «оубиша», які пры такіх колькасных выкладках значыў бы поўнае вынішчэнне полацкага войска. Гэта неверагодна для Сярэднявечча, калі бітвы звычайна завяршаліся малой крывёй.[259] Больш лагічным было б вытлумачыць словы летапіс-

---

[256] Лаврентьевская летопись. Ст. 281.

[257] Разин Е. А. *История военного искусства*. Т. 2. С. 273.

[258] Ласкавы Г. В. *Да пытання аб арганізацыі і складзе ўзброеных сіл Полацкай зямлі ў канцы XI — пачатку XIII стст*. С. 16.

[259] Разин Е. А. *История военного искусства*. Т. 2. С. 174.

ца так, што земгалы ўшчэнт разбілі сілы полацкага войска, што складалася з дзевяці земскіх апалчэнняў і княскіх дружын. Тады страты, нават большыя за палову ад агульнага складу войска, склалі да 4 тысяч ваяроў апалчэння і дружын. Зрэшты, і гэта было вялікай стратай, якая мусіла моцна падарваць абарона-здольнасць Полацкай зямлі. Гэтым фактам можа тлумачыцца прыпыненне полацкімі князямі вядзення актыўнай знешняй палітыкі і збліжэнне са сваімі адвечнымі сапернікамі – кіеўскімі князямі. Няўдзел у гэтым паходзе Глеба Менскага таксама тлумачыць той факт, што яму ўдавалася ажыццяўляць ваенную актыўнасць тады, калі іншыя Усяславічы рабіць гэтага не маглі.

Князі разумелі важнасць колькаснага фактару на вайне і імкнуліся кампенсаваць недастатковае выкарыстанне ўнутраных рэсурсаў за кошт знешніх кантынгентаў. Паўднёваруская князі звярталіся па дапамогу да полаўцаў, полацкія ж князі вялі на вайну літоўцаў і ліваў. Мы ўжо закраналі пытанне пастаяннага ўзрастання ролі літоўцаў у полацкім войску на працягу XII ст., таму зараз спынімся на ім вельмі коратка. Для таго каб паспяхова выконваць сваю функцыю, літоўскія кантынгенты, якія складаліся з народнага апалчэння і княскіх дружын, мусілі мець колькасць, параўнальную з колькасцю полацкіх войскаў. Можна думаць, што ў кампаніях кшталту аблогі Друцка ў 1180 г. літоўцы мелі ў полацкім войску значную прысутнасць, але саступалі колькасцю палачанам і прадстаўнікам полацкіх удзелаў. У такіх сумесных выправах, як напад на Вялікія Лукі ў 1198 г. і бітве з крыжаносцамі пад Кукейносам каля 1200 г., колькасць палачан і літоўцаў была прыкладна роўнай. У войску ж Валадара Глебавіча ў 1162 г. пад Гарадцом літоўцы складалі пераважную большасць. Таму мы выкажам меркаванне, што колькасць літоўскіх войскаў, якія ваявалі пад полацкімі сцягамі ці самастойна вялі баявыя дзеянні, складала некалькі тысяч чалавек.

### Б) Зброя

Прафесіяналізацыя вайны ў XII ст. і адпаведнае ўзрастанне ролі дружыны адбіліся і на эвалюцыі зброі. Меч як найбольш эфектыўная зброя свайго часу бесперапынна ўдас-

канальваўся. У дадзены час на беларускіх землях выкарыстоўваліся розныя тыпы мячоў. Мячы з перакрыжаваннем і бронзавай трох- ці пяцічасткавай булавешкай былі адносна лёгкімі і кароткімі і працягвалі традыцыі другой паловы XI ст. Мячы такіх тыпаў былі характэрнымі толькі для Усходняй Еўропы.[260] Сучасныя беларускія даследчыкі вызначаюць тып мячоў з пяцічасткавым навершам як куршскі і кажуць аб яго вытворчасці на куршскіх землях з наступным экспартам у Падзвінне і Падняпроўе. Дадзены тып быў вельмі хутка пераняты і панямонскімі збраярамі з Наваградка, якія ўжо ў першай палове XII ст. распачалі ўласную вытворчасць такіх мячоў.[261]

Са спецыфічна ўсходнееўрапейскімі тыпамі суіснавалі мячы, роднасныя агульнаеўрапейскім раманскім (капетынгскім) узорам. XII ст. стала часам нараджэння доўгага цяжкога мяча даўжынёй да 120 см і вагой да 2 кг з доўгім (да 18−20 см) перакрыжаваннем і часта лінзападобнай ці дыскападобнай булавешкай. Пры павелічэнні даўжыні мяча пытанне зручнага яго ўтрымання вырашалася з дапамогай падаўжэння дзяржальна да 12 см і больш. Дол зменшыўся да памераў вузенькай палоскі.[262]

Змены ў канструкцыі былі выкліканы асаблівасцямі выкарыстання мяча ў баі. Раманскі меч быў сякучай зброяй, прызначанай для пераадолення штораз больш трывалай засцерагальнай зброі: кальчуг, панцыраў, шлемаў і шчытоў. Адсюль ягоная даўжыня і вага. Да павелічэння яго памераў таксама спрычыніўся той факт, што такім мячом карысталіся коннікі, якія ў баі наносілі ўдар з большай адлегласці, чым пехацінцы. Падоўжанае дзяржальна дазволіла не толькі зручней трымаць меч адной рукой, але і секчы аберуч. Аб існаванні такой тэхнікі ўжо ў XII ст. сведчыць іканаграфічны матэрыял. Такім чынам, мячы XII ст. сталі папярэднікамі пазнейшых паўтараручных і дзвюхручных мячоў. Нарэшце, падоўжанае перакрыжаванне прызначалася для парыраван-

---

260 Кирпичников А. Н. *Древнерусское оружие*. Вып. 3. С. 53−54.

261 Плавінскі М. *Адзін з тыпаў сярэднявечных мечаў з тэрыторыі Беларусі* // Гістарычны альманах. Гародня, 2004. Т. 10. С. 201−207. Ласкавый Г. В. *К истории оружия Белорусского Подвинья в VI−XIII вв.* С. 25.

262 Кирпичников А. Н. *Древнерусское оружие.* Вып. 3. С. 52.

ня ўдараў праціўніка і сведчыла аб развіцці майстэрства фехтавання. Раней функцыя парыравання ўдараў ускладалася выключна на шчыт.[263] Аднак доўгі міндалепадобны шчыт, які добра прыкрываў ваяра пры бітве ў страі, быў занадта груваcткім для спрытных рухаў пры конным адзінаборстве. Гэты фактар і прывёў да змен у тэхніцы бою на мячах.

Розныя тыпы мячоў XII ст. узаемна дапаўнялі адны адных і выкарыстоўваліся ў залежнасці ад абставін для бою з розным праціўнікам у розным тактычным становішчы.

Побач з мячамі на беларускіх землях зрэдку выкарыстоўваліся шаблі, аб чым сведчыць знаходка фігуркі конніка з шабляй пры раскопках Вішчынскага замка XII–XIII стст.[264] Шырокага распаўсюджвання яны, аднак, не мелі.[265]

Масавай зброяй сярод дружыннікаў і вояў заставалася кап'ё. На беларускіх землях ва ўжытку былі коп'і падоўжана-трохкутнай і падоўжана-яйкападобнай формы,[266] аналагі якіх былі знойдзеныя пры раскопках на тэрыторыі сучаснай Літоўскай Рэспублікі і Латвіі.[267] Але сапраўдным трыумфатарам XII ст. была чатырохгранная піка.[268]

Распаўсюджанне пікі было звязана з панаваннем цяжкаўзброенай конніцы на тагачасных палях бітваў. Па прычыне пастаяннага паляпшэння даспехаў ранейшы прыём нанясення капійнага ўдару замахам рукі траціў сваю эфектыўнасць. Таму ў XII ст. ён быў выцеснены таранным ударам, які дазваляў сканцэнтраваць усю энергію руху вершніка на кані. Такая тэхніка вымагала большай трываласці кап'я, таўшчыня дрэўка якога ўзрасла з 2,5 см у X ст. да 3,5 см у XII ст.[269] Пры нанясенні тараннага ўдару коннік цвёрда трымаў кап'ё рукой і фіксаваў яго, прыціскаючы локцем

---

263 Кирпичников А. Н. *Древнерусское оружие.* Вып. 3. С. 52, 56.

264 Загорульский Э. М. *Вищинский замок XII–XIII вв.* С. 114.

265 Ласкавый Г. В. *К истории оружия Белорусского Подвинья в VI–XIII вв.* С. 27.

266 Кирпичников А. Н. *Древнерусское оружие.* Вып. 2. С. 12–15.

267 Ласкавы Г. В. *Узбраенне воінаў XII–XIII стст. з феадальных сядзіб-замкаў паўночнага захаду Полацкай зямлі (па матэрыялах раскопак гарадзішчаў Пруднікі і Маскавічы)* // Старонкі гісторыі Беларусі. С. 49.

268 Кирпичников А. Н. *Древнерусское оружие.* Вып. 2. С. 15–17.

269 Тамсама. С. 20.

да боку.[270] Энергія ўдару дазваляла прабіць пікай даспехі праціўніка ці скінуць яго з сядла. У маштабе цэлага бою паспяховая атака самкнутага строю конных капійнікаў магла расстроіць шэрагі ворага і вымусіць таго да адступлення. Таму першы этап коннага бою звычайна зводзіўся да сустрэчнага сутыкнення дружын з коп'ямі ў руках. Дынамічнасць такога бою падкрэсліваецца летапісамі нават у лексіцы. Іпацьеўскі летапіс адзначае, што ў 1173 г. пры абароне Вышгарада Мсціслаў Расціславіч Харобры «сшибеся» з суздальскімі палкамі.[271]

Распаўсюджаным відам зброі блізкага бою былі сякеры. Іх баявая эфектыўнасць далёка саступала мячам ці коп'ям. Папулярнасць сякер тлумачылася іх танным коштам і магчымасцю выкарыстоўваць іх як для ваеннай справы, так і ў гаспадарчых мэтах. Раскопкі гарадзішчаў Пруднікі і Маскавічы паказваюць, што ў Полацкай зямлі выкарыстоўваліся вузка- і шыракалёзавыя сякеры, якія мелі свае адпаведнікі на балцкіх землях.[272]

Нячаста на беларускіх землях выкарыстоўваліся булавы і падобная да іх зброя, хаця сваё месца ў арсенале ваяроў мелі і яны. На гарадзішчы Маскавічы былі знойдзеныя булавы ў выглядзе куба са зрэзанымі рагамі, у Прудніках — шастапёр.[273] Пры раскопках Вішчына ўдалося знайсці бронзавую булаву з чатырма бакавымі пірамідальнымі шыпамі, аточанымі васьмю скругленымі выступамі, свінцовую шарападобную булаву і шарападобны кісцень.[274]

Новы ўздым перажывала кідальная зброя, асабліва лук і стрэлы. Апісваючы аблогу палачанамі Гольма ў 1206 г., Генрых Латвійскі адзначае, што русіны, «звыклыя да стральбы з лукаў, біліся шмат дзён і паранілі многіх на сценах».[275] З гэтых словаў можна заключыць, што майстэрства прыцэль-

---

[270] Кирпичников А. Н. *Древнерусское оружие*. Вып. 3. С. 68.

[271] Ипатьевская летопись. Ст. 576.

[272] Ласкавы Г. В. *Узбраенне воінаў XII–XIII стст. з феадальных сядзіб-замкаў паўночнага захаду Полацкай зямлі.* С. 49–50. Ласкавый Г. В. *К истории оружия Белорусского Подвинья в VI – XIII вв.* С. 27–33.

[273] Ласкавы Г. В. *Узбраенне воінаў XII–XIII стст. з феадальных сядзіб-замкаў паўночнага захаду Полацкай зямлі.* С. 50.

[274] Загорульский Э. М. *Вищинский замок XII–XIII вв.* С. 115–117.

[275] Heinrici Chronic. Lyvon. X, 12. C. 113.

най стральбы з лукаў было высока пастаўлена ў Полацкай зямлі ўжо ў XII ст. Завязка бою з дапамогай інтэнсіўнай стральбы згадваецца ў летапісах пры апісанні баявых дзеянняў пад Вышгарадам у 1173 г. і Друцкам у 1180 г.[276] Рэнесанс бою кідальнай зброяй ізноў быў звязаны з прафесіяналізацыяй ваеннай справы. Стральба з лука ў XII ст. перайшла ад бяднейшых вояроў апалчэння, якія не маглі дазволіць сабе іншай зброі, у рукі адмыслова абвучаных малодшых дружыннікаў.[277] Мэтанакіраваная прыцэльная стральба, якую яны ажыццяўлялі, займала важнае месца ва ўзаемадзеянні розных частак войска ў баі і была неад'емнай часткай складанага арсеналу тактычных прыёмаў барацьбы XII ст. Стральба з лука дазваляла расстроіць баявыя парадкі праціўніка ў палявым баі. Пры аблозе крапасных умацаванняў яна дапамагала падавіць абаронцаў на сценах і адкрыць шлях наступаючым войскам альбо, наадварот, утрымаць іх на адлегласці ад сцен.

Археалагічныя матэрыялы сведчаць аб суіснаванні стрэлаў з гранёнымі бранябойнымі і пляскатымі звычайнымі наканечнікамі. Першыя выкарыстоўваліся для стральбы па цяжкаўзброеным праціўніку, тады як апошнія разлічваліся на паражэнне вояроў без засцерагальнага ўзбраення.[278] Адметным для беларускіх земляў у параўнанні з іншымі землямі Русі было пашыранае выкарыстанне утулкавых наканечнікаў стрэлаў. Асабліва ў гэтых адносінах вылучаліся гарады Панямоння, дзе колькасць знойдзеных утулкавых наканечнікаў вагалася ад чвэрці ці трэці ў Наваградку, Слоніме і Турыйску да 63,7% у Ваўкавыску.[279]

У баі на адлегласці акрамя лука і стрэлаў ужываліся суліцы, якія ўяўлялі сабой кідальнае кап'ё з даўжынёй наканечніка 15–20 см, з якіх 8–12 см прыходзілася на лязо, і дрэўкам даўжынёй 1,2–1,5 м.[280] Цікава, што хаця суліцы былі звычайнай зброяй для Русі, адна з першых згадак аб суліцах у «Слове пра паход Ігараў» звязвае іх з літоўцамі, яцвягамі і

---

276 Ипатьевская летопись. Ст. 576, 621.

277 Ласкавы Г. В. *Узбраенне воінаў XII–XIII стст. з феадальных сядзіб-замкаў паўночнага захаду Полацкай зямлі.* С. 54.

278 Загорульский Э. М. *Вищинский замок XII–XIII вв.* С. 117–119.

279 Археалогія Беларусі. Т. 3. С. 441.

280 Кирпичников А .Н. *Древнерусское оружие.* Вып. 2. С. 23.

дзерамелай.[281] Такім чынам, і тут назіралася збліжэнне тыпаў зброі, ужываных на Русі і ў балтаў. Працэс шчыльнага палітычнага і культурнага ўзаемадзеяння знайшоў сваё адлюстраванне і ў такой галіне матэрыяльнай культуры, як зброя.

Разам з удасканаленнем сродкаў паражэння паляпшалася і засцерагальная зброя, якая станавілася ўсё больш цяжкой і моцнай. Асноўным відам даспехаў для абароны верхняй часткі цела ваяра заставалася кальчуга. Цяпер яна не абмяжоўвалася абаронай тулава. Медальён з Ваўкавыска з выявай святога Дзімітрыя паказвае кальчугу з рукавамі, а гліняная фігурка з Маскавічаў — кальчугу з каптурам для абароны галавы.[282]

Кальчуга, аднак, ужо не заўсёды магла даць рады ў супрацьстаянні з такой новай зброяй, як раманскія мячы, пікі і бранябойныя стрэлы. У большай ступені гэтай задачы адпавядалі пласцінкавыя панцыры, якія ў XII ст. ужо выкарыстоўваліся нароўні з кальчугай, а ў наступным стагоддзі сталі асноўным тыпам даспехаў. Захоўваў пануючыя пазіцыі ламелярны панцыр, а побач з ім увайшлі ва ўжытак мазаічны і лускавы панцыры. У мазаічным панцыры металічныя пласціны прымацоўваліся да скуранай ці тканіннай асновы ўстык.[283] У лускавым —пласціны памерам 6 х 4—6 см прымацоўваліся да асновы адным краем і насоўваліся адна на адну. Сабраны такім чынам панцыр забяспечваў добрую абарону ад сякучых удараў пры лепшай за ламелярны ці мазаічны даспех эластычнасці.[284] Шырокае распаўсюджанне пласцінкавых панцыраў пацвярджаецца, напрыклад, археалагічнымі знаходкамі ў Вішчынскім замку.[285] У некаторых умацаваных пунктах на беларускіх землях ваяры аддавалі перавагу панцырам перад кальчугамі. Такую з'яву можна назіраць у Маскавічах. Маскавіцкія панцыры не мелі рукавоў. У даўжыню яны даходзілі да пояса ці да клубоў. Заднія крысы былі скарочаныя, каб палегчыць пасадку на каня. Г. В. Ласкавы таксама лічыць, што ў якасці спрошчанага варыянта пласцінкавага панцыра мог выкарыстоўвац-

---

281 Слово о пълку Игореве, Игоря, сына Святъславля... С. 172.
282 Плавінскі М. А. *Засцерагальнае ўзбраенне IX—XIII стст...* С. 144.
283 Тамсама. С. 145.
284 Кирпичников А. Н. *Древнерусское оружие.* Вып. 3. С. 18.
285 Загорульский Э. М. *Вищинский замок XII—XIII вв.* С. 120—121.

ца наборны нагруднік.[286]

А. Н. Кірпічнікавым і іншымі навукоўцамі выказвалася думка, што распаўсюджанне пласцінкавых панцыраў у заходніх і паўночна-заходніх рэгіёнах Русі тлумачылася заходнееўрапейскім уплывам і неабходнасцю належным чынам супрацьстаяць цяжкаўзброеным заходнім ваярам.[287] Разам з тым з-пад увагі звычайна выпадае той факт, што як на Захадзе, так і ў родных для пласцінкавага панцыра Візантыі і блізкаўсходніх краінах ён перажываў заняпад.[288] Таму вельмі падобна, што распаўсюджанне пласцінкавага панцыра на Русі ў XII–XIII стст. было з'явай мясцовай. Пры амаль бесперапынным стане вайны такі панцыр пры танным кошце, простай тэхналогіі вырабу і добрых тактычных характарыстыках быў практычным адказам на патрабаванні моманту і ўлюбёнай зброяй многіх ваяроў.

Сярод шлемаў на беларускіх землях надалей пераважалі стажковыя, хаця ва ўжытку былі і сфераканічныя шлемы. Малюнак стажковага шлема на костцы XII ст. з Капыля і верхняя частка звона сфераканічнага шлема XII–XIII стст. адтуль жа паказваюць, што абодва тыпы знаходзіліся ў адначасовым ужытку. Ваўкавыскі медальён, які паказвае стажковы шлем са звонам, нахіленым уперад, сведчыць аб існаванні своеасаблівых варыяцый агульнараспаўсюджаных тыпаў шлемаў.[289] Згаданыя шлемы маглі быць адкрытымі альбо мець паўмаску, якая закрывала вочы і нос.[290] Унікальнай аказалася знаходка ў Слоніме яйкападобнага шлему, звон якога быў сабраны з адной верхняй і чатырох ніжніх пласцін, змацаваных двума абручамі. У ніжнім абручы былі зроблены адтуліны для мацавання барміцы. Наперадзе да яго была прымацавана паўмаска. Шлем мае 23 см ў дыяметры і 17 см у вышыню.[291] Даследчыкі спрабуюць прасачыць яго падабенства да скандынаўскіх, альбо заходнееўрапейскіх

---

286 Ласкавы Г. В. *Узбраенне воінаў XII–XIII стст. з феадальных сядзіб-замкаў паўночнага захаду Полацкай зямлі.* С. 50–52.

287 Кирпичников А. Н. *Древнерусское оружие.* Вып. 3. С. 17.

288 • ygulski Z. Jun. *Broń w dawnej Polsce na tle uzbrojenia Europy i Bliskiego Wschodu.* 74.

289 Плавінскі М. А. *Засцерагальнае ўзбраенне IX–XIII стст. на тэрыторыі Беларусі.* С. 138–139.

290 Ласкавы Г. В. *Узбраенне воінаў XII–XIII стст...* С. 52.

291 Плавінскі М. А. *Засцерагальнае ўзбраенне IX–XIII стст...* С. 139.

шлемаў,[292] але для беларускіх земляў слонімскі шлем пакуль што знаходка адзінкавая і нетыповая.

Ускладненне тактычных прыёмаў і баявая спецыялізацыя ваяроў яскрава адбіліся на развіцці ў XII ст. разнастайных формаў шчытоў, многія з якіх паходзілі ад міндалепадобнага. Адна з ліній яго эвалюцыі вяла да змяншэння памераў і спрамлення верхняга краю.[293] Такімі шчытамі карысталіся як коннікі, так і пяхотнікі. Адрозненне палягала ў тым, што коннікі трымалі шчыт на дзвюх раменных пятлях на перадплеччы, тады як у пехацінцаў адна пятля ўтрымлівалася перадплеччам, а другая – кісцю.[294] Змяншэнне памеру шчыта можна растлумачыць распаўсюджаннем панцыраў і падаўжэннем кальчуг, а таксама развіццём тэхнікі бою на мячах, якая патрабавала больш актыўнага выкарыстання шчыта. Спрамленне верхняга краю, магчыма, было тэндэнцыяй, запазычанай з Заходняй Еўропы, дзе з'яўленне гаршковых шлемаў зменшыла патрэбу ў прыкрыцці твару шчытом.[295]

Шахматная фігурка з Ваўкавыска дазваляе нам убачыць яшчэ адно наваўвядзенне: прадольную рабрыну на шчыце. М. А. Плавінскі мяркуе, што ад шчытоў з прадольнай рабрынай паходзіць павеза, доўгі прастакутны шчыт са скругленымі рагамі з трох вертыкальных палос, цэнтральная з якіх мела жолабападобную форму. У другой палове XII ст. павеза атрымала развіццё ў заходняй і паўночна-заходняй Русі і на балцкіх землях.[296]

Разам з міндалепадобнымі шчытамі выкарыстоўваліся і круглыя. У адрозненне ад круглых шчытоў нарманскага перыяду іх нашчадкі з XII ст. былі меншыя па памерах, мелі пукатую форму і мяккае раменнае дзяржальна замест цвёрдага драўлянага ці металёвага.[297]

Зброя XII ст. была адбіткам агульнага стану спраў у палітычным ладзе грамадства і узроўню ваеннага майстэрства. Прафесіяналізацыя ваеннай справы паспрыяла вылучэнню

---

[292] Археалогія Беларусі. Т. 3. С. 441.
[293] Плавінскі М. А. *Засцерагальнае ўзбраенне IX–XIII стст...* С. 141.
[294] Ласкавы Г. В. *Узбраенне воінаў XII–XIII стст...* С. 52.
[295] Плавінскі М. А. *Засцерагальнае ўзбраенне...* С. 142–143.
[296] Тамсама. С. 141.
[297] Тамсама.

відаў зброі, якія з-за высокага кошту былі даступны толькі князям, дружыне і іншым прадстаўнікам вярхоў грамадства. Складаная тэхніка выкарыстання некаторых відаў зброі ў баі (доўгі меч, піка) вымагала адмысловай падрыхтоўкі, якая таксама была прывілеем князёў і дружыннікаў. У выніку зброя паволі рухалася па грамадскай лесвіцы ўгару, аддаляючыся ад паспольства і набліжаючыся да вярхоў.

З тактычнага і тэхнічнага пункту гледжання развіццё зброі на беларускіх землях у XII ст. было адзначана збліжэннем старажытнарускіх і балцкіх узораў. Развіццё і першых, і апошніх рушыла агульным з Заходняй і Паўночнай Еўропай шляхам, які адзначаўся бесперапынным тэхнічным удасканаленнем сродкаў паражэння і абароны. Удасканаленне адбывалася ў кірунку павелічэння трываласці і цяжкасці зброі. Распаўсюджанне такіх відаў засцерагальнай зброі, як шлемы з паўмаскамі і кальчугі з рукавамі і каптурамі, суправаджалася пашырэннем сродкаў іх пераадолення: доўгіх і цяжкіх раманскіх мячоў, пік і бранябойных стрэлаў. Тэндэнцыя спаборніцтва засцерагальнай і атакуючай халоднай зброі працягнулася і ў наступныя стагоддзі, каб дасягнуць сваёй вяршыні ў познім сярэднявеччы.

### В) Умацаванні і аблога

У XII ст. рост існуючых гарадоў і пастаяннае ўзнікненне новых вялі да бесперапыннага будаўніцтва і ўдасканалення ўмацаванняў. У гэты ж час на гістарычным даляглядзе з'явіўся прынцыпова новы тып умацаванага пункту: прыватнаўласніцкі замак. Замак выконваў функцыі адміністрацыйнага і ваеннага цэнтра пэўнай акругі ў дамене князя ці ягонага васала. Прыкладамі такога замка могуць служыць гарадзішчы у Мсцібаве, Вішчыне і Царковішчы (у суч. Смаленскай вобласці Расійскай Федэрацыі). Апошнія два гарадзішчы могуць прэтэндаваць на атаясамленне з замкам Ваішчына, узятым палачанамі і літвой у 1258 г.[298] Прыватны замак адрозніваўся як ад вялікага горада, так і ад нежылога гарадзішча-сховішча. Па невялікіх памерах і насельніцтве, ваенным характары, а таксама прамому падпарадкаванню

[298] Раппопорт П. А. *Военное зодчество западнорусских земель X–XIV вв.* С. 95.

княскай уладзе ён нагадваў ужо вядомыя нам памежныя ўмацаваныя пункты кшталту Заслаўя, Маскавічаў і Пруднікаў. Адрозненне палягала ў яго прыватнай прыналежнасці. Акалічнасць гэтая прадвызначыла своеасаблівае становішча замкаў у тагачасных войнах. Паколькі войны XII ст. часта мелі верхавінны характар барацьбы паміж князямі за ўладу і багацце, прыватныя ўладанні таго ці іншага князя былі жаданай мэтай для яго праціўнікаў. Здавалася б, у час, калі аблога мела заўважную перавагу над абаронай і нават вялікія гарады часта бывалі захопленымі, маленькія замкі з невялікімі залогамі не мелі надзеі на спакойнае існаванне. Між тым залогі замкаў складаліся з аднароднага кантынгенту залежных ад князя ці асабіста адданых яму ўзброеных слуг і дружыннікаў. У адрозненне ад гарадоў з іх унутранай барацьбой і незадаволенасцю князямі, абложным войскам даводзілася менш разлічваць на добраахвотную здачу ці здраду. Самі ваенныя дзеянні таксама змізарнелі і часта зводзіліся да рабаўніцкіх набегаў невялікімі сіламі. Таму добра ўмацаваны замак меў шанцы вытрымаць аблогу і выканаць ускладзеную на яго функцыю. У час, калі феадальная ўласнасць на зямлю толькі зараджалася, замкі яшчэ не маглі набыць усеагульнага распаўсюджання, але іх эфектыўнасць стварыла перадумовы для павелічэння іх колькасці ў будучыні, калі беларускія землі сталі сапраўднай краінай замкаў.

З тэхнічнага пункту гледжання важным для XII ст. было далейшае пашырэнне круглых у плане ўмацаванняў. У найбольшай ступені гэтая з'ява датычылася новых гарадоў і замкаў, не звязаных старой планіроўкай. Так, гарадзішча у Мсцібаве размешчана на роўнай забалочанай мясцовасці і па форме набліжаецца да правільнага кола. Па перыметры гарадзішча абкружана валам вышынёй каля 5 м з уездам ва ўсходняй частцы. Дыяметр вала – 56 м, а ўнутранай пляцоўкі – 30 м. З паўднёвага і паўднёва-заходняга бакоў, дзе мясцовасць мае больш лёгкадаступны характар, гарадзішча прыкрыта яшчэ адным невысокім валам, абодва канцы якога ўпіраюцца ў балота. Перад валам захаваліся сляды рова.[299]

У XII ст. тэндэнцыя будаўніцтва круглых крэпасцяў дабралася і да Полацкай і Смаленскай земляў. У апошняй круг-

---

[299] Раппопорт П. А. *Военное зодчество западнорусских земель X–XIV вв.* С. 86.

лыя ўмацаванні атрымалі Крычаў, Рослаў і Копысь. Адбылося гэта шляхам адаптацыі ранейшых умацаванняў, якія залежалі ад рэльефу мясцовасці.[300]

Побач з ранейшымі выспавымі і мысавымі крэпасцямі, якія залежалі ад рэльефу, і круглымі, якія будаваліся на роўнай мясцовасці, існавалі прамежкавыя тыпы ўмацаванняў. Адным з такіх тыпаў быў паўкруглы, часткова прывязаны да рэльефу мясцовасці, дзе ўмацаваннямі прыкрываўся толькі напольны бок.[301] Да такога тыпу ўмацаванняў адносіцца гарадзішча ў Вішчыне. Замак знаходзіўся на Дняпры і з боку ракі быў абаронены стромкім берагам і ярамі. З напольнага боку сістэма абароны замка ў XII ст. уключала паўкруглы ў плане вал шырынёй 8–9 м ля асновы і вышынёй да 1,5–1,8 м. Па грэбні вала ішла драўляная сцяна, якая складалася з прылеглых адзін да аднаго трохсценных зрубаў. Не выключана, што сцяна магла быць двух’яруснай і мець баявую галерэю (забрала). Са знешняга боку ўздоўж сцяны ішоў роў.[302]

Разам з агульным планам умацаванняў удасканальваліся і іх асобныя элементы. У XII ст. трывалае месца ў сістэме крэпасцяў занялі дазорныя вежы. Такая вежа прысутнічала ў Давыд-гарадку. Яна знаходзілася на заходнім ускрайку ўмацаванняў, адкуль адкрываўся далёкі агляд. Дыяметр вежы дасягаў 6–8 м. Вежа ў Царковішчы знаходзілася побач з уездам у замак, які таксама з’яўляўся самым высокім месцам для агляду. Зруб вежы меў шасціці сямікутную форму ў плане, меў памер да 6 м і абапіраўся на ўкапаныя ў зямлю слупы.[303] Вежа-данжон была збудаваная ў канцы XII – пачатку XIII стст. і ў цэнтры дзядзінца Мсціслава.[304] Функцыя вежаў, аднак, дазорам і абмяжоўвалася. Для фланкіравання сцен стральбой яны пакуль не выкарыстоўваліся.

Драўляныя канструкцыі па-ранейшаму заставаліся асноўным элементам абарончых збудаванняў, але камень і цэгла таксама патроху ўваходзілі ва ўжытак. Вал гарадзенскага дзядзінца, збудаваны ў XII ст., утрымліваў унутры насцілы з

---

300 Раппопорт П. А. *Военное зодчество западнорусских...* С. 97.
301 Носов К. С. *Русские крепости и осадная техника...* С. 17.
302 Загорульский Э. М. *Вищинский замок XII–XIII вв.* С. 50–60.
303 Раппопорт П. А. *Военное зодчество западнорусских...* С. 140–141.
304 Гісторыя Беларусі. Т. 1. С. 206.

дубовых і сасновых бярвенняў. Па версе вала ішла драўляная сцяна з баявой галерэяй. Участкі сцяны ў найбольш небяспечных месцах, аднак, былі збудаваныя з плінфы а вонкавы бок вала меў каменную абкладку.[305]

Згаданыя новаўвядзенні ў асноўным ішлі ў рэчышчы дасягненняў XI ст. і рэвалюцыі ў фартыфікацыі не зрабілі. Новым было не тое, якія ўмацаванні абаранялі нашы продкі ў XII ст., а якім чынам яны гэта рабілі. Можна сказаць, што калі ў XI ст. яны навучыліся будаваць першакласныя крэпасці, то ў XII ст. яны нарэшце навучыліся імі карыстацца.

Перш за ўсё, былі значна перагледжаны адносіны да вартавой службы. Узрослая пільнасць абаронцаў прывяла да таго, што крэпасці, якія ў XI ст. лёгка падалі перад із'ездам (Менск, Ноўгарад), у XII ст. упарта трымаліся перад пераважаючымі сіламі ворагаў. Па-другое, значна эфектыўней выкарыстоўваліся актыўныя метады абароны. Абаронцы крэпасцяў часта рабілі нечаканыя вылазкі ці нават давалі абложным войскам поўнамаштабны бой у полі пад сценамі. Гэтым самым яны папярэджвалі намаганні праціўніка па падрыхтоўцы штурму ці разгортванню доўгатэрміновай аблогі. У 1162 г. абложаны Рагвалодам Барысавічам Полацкім у Гарадцы Валадар Глебавіч з дапамогай начной вылазкі не толькі прымусіў таго зняць аблогу з крэпасці, але і ўшчэнт разграміў яго войска. У лютым 1170 г. наўгародцы мусілі абараняць свой горад ад вялізнага войска, дасланага Андрэем Багалюбскім. У склад войска акрамя кантынгентаў іншых княстваў Русі ўваходзілі і палачане са смалянамі. Разумеючы, што пры вялікай колькаснай перавазе кааліцыі пасіўная абарона была загадзя пройгрышнай, наўгародцы падрыхтаваліся да абароны актыўнай. Перш за ўсё, яны «устроиша острогъ около города». З дапамогай такога часовага ўмацавання яны стварылі дадатковую перашкоду для аблажнікаў і аднеслі першы рубеж абароны далей ад сцен. Затым яны вывелі ў поле сваё войска пад камандаваннем князя Рамана Мсціславіча і пасадніка Якуна і далі бой сілам кааліцыі. «И приступиша къ граду въ неделю на съборъ, и съездишася по 3 дни въ четвьртыи же день въ среду присту-

[305] Трусаў А. А. Собаль В. Е. Здановіч Н. І. *Стары замак у Гродне XI–XVIII стст.: Гісторыка-археалагічны нарыс.* Мн., 1993. С. 18–21.

пиша силою и бишася всь день и къ вечеру победи я князь Роман съ новгородьци».[306]

Гэтым разам палачане і смаляне былі пераможаныя, але яны таксама ўмела карысталіся актыўнымі метадамі абароны. У 1158 г. Рагвалод Барысавіч, абараняючы Друцк ад Расціслава Глебавіча, «затворися в городе, и бьяхутся крепко, и много от обоих падаху».[307] У выніку Расціслаў быў вымушаны пайсці на мір з Рагвалодам.

Такой узрослай сіле абароны абложныя войскі маглі супрацьпаставіць няшмат, бо із'езд траціў сваю эфектыўнасць, а новыя тэхнічныя сродкі аблогі развіваліся марудна. Пасля эпізадычнага выкарыстання Усяславам пад Псковам у 1065 г. абложныя машыны (парокі) зніклі на паўтара стагоддзя і не ўвайшлі ў шырокі ўжытак раней за першую палову XIII ст.[308] Не было заўважнага руху наперад і ў развіцці ручных відаў кідальнай зброі. Лук толькі-толькі выйшаў на ранейшыя вышыні пасля заняпаду ў XI ст. Арбалеты (самастрэлы) ж і зусім былі вядомыя слаба. Прынамсі, яшчэ ў 1206 г. пры аблозе Гольма арбалетаў палачане не ведалі.[309] У такіх абставінах перадумоў для правядзення ўдалага штурму было мала.

На першы план у якасці метаду ўзяцця ўмацаванняў канчаткова выйшла доўгатэрміновая аблога (абляжанне). Але і тут пазіцыі атакі адносна абароны паслаблі. Па-першае, трымаць войска пад горадам доўгі час было нялёгка. Васальныя атрады былі ненадзейнымі, а земскія апалчэнні доўга ваяваць не хацелі і пагражалі бунтамі. Трохгадовая аблога Свенельдам Перасечана ў 940–942 гг. і шасцімесячнае стаянне Уладзіміра пад Корсунем у 988 г. засталіся ў далёкім мінулым. Па-другое, сама матывацыя да аблогі заўважна знізілася. Пры пастаянных міжусобіцах князям цяжка было разлічваць на дасягненне сталых мэтаў, якія маглі б замацоўвацца захопам гарадоў. Мэты вайны сталі абмежаванымі і зводзіліся да адноснага палітычнага паслаблення праціўнікаў і нанясення ім эканамічнай шкоды. Такіх мэт можна было дасягнуць нападзеннем на неабароненую мяс-

---

306 Новгородская первая летопись. С. 33.
307 Ипатьевская летопись. Ст. 494.
308 Носов К. С. *Русские крепости и осадная техника...* С. 56.
309 Heinrici Chronic. Lyvon. X, 12. C. 113.

цовасць. Аблога ж гарадоў была справай рызыкоўнай і не вартай затрачаных намаганняў. Часам князі не лічылі патрэбным абараняць і свае гарады, калі гэта не супадала з іх палітычнымі мэтамі, прыкладам чаго можа служыць шматразовая адмова Расціслава Мсціславіча Смаленскага і яго сыноў ад барацьбы за Кіеў.

Такія суадносіны абароны і аблогі былі прычынай многіх зафіксаваных летапісамі ў XII ст. выпадкаў перамогі абаронцаў крэпасцяў над аблoжнымі войскамі. У якасці прыкладаў мы можам згадаць абарону Менска ў 1104 і 1158 гг., Гарадца ў 1162 г. і Турава ў 1160 г. У некаторых выпадках пасля пачатку аблогі праціўнікі завяршалі канфлікт мірам, што таксама адзначала фактычную перавагу абароны над атакай. Так адбылося пад Менскам у 1117 і 1161 гг. і Друцкам у 1158 г. У 1180 г. полацка-чарнігаўская кааліцыя ўзяла друцкі астрог і адступіла ад горада. У далейшым Друцк дастаўся палачанам, але з пункту гледжання крапасной вайны падзеі 1180 г. былі перамогай абаронцаў на чале з князем Глебам Рагвалодавічам, якім удалося адстаяць ад сіл магутнай кааліцыі гарадскі дзядзінец. Аднак сапраўдным дыяментам майстэрства абароны крэпасцяў стала абарона ў 1158 г. князем Юр'ем Яраславічам Турава ад войскаў кааліцыі, якая складалася з кіяўлян, галічан, лучан, смалян, палачан і берандзеяў. Яна заслугоўвае асобнай згадкі. Іпацьеўскі леапіс кажа, што Юры «бьяхуть крепко, выходячи из города, и много биваше язвенных». «И многу молбу створиваше Гюрги Ярославичь, высылая из города къ Изяславу, река: «Брате прими мя в любовь к собе». Изяславъ же того не всхоте, но всяко хотяше под нимъ взяти Туровъ и Пинескъ и стояша около города недель 10". Такая ўпартасць каштавала аблoжным войскам дорага. «И бысть моръ в конихъ, и тако не оуспевше ему ничтоже, възвратишася въ свояси, не створше с ним мира, и мнози пеши придоша с тое воины».[310] Першым спосабам абароны Турава былі актыўныя баявыя дзеянні пад горадам, у выніку якіх праціўнікі неслі цяжкія страты. Акрамя таго Юры Яраславіч уздзейнічаў на мараль Ізяслававa войска мірнымі прапановамі, што паслабляла яго баявы дух. Гэта было новай з'явай у развіцці

[310] Ипатьевская летопись. Ст. 492.

ваеннага майстэрства. Вынікам спалучэння стойкасці абаронцаў і іх высокага майстэрства стала адступленне аблажнікаў ад горада. Аблога Турава таксама прадэманстравала небяспеку доўгага стаяння пад крэпасцю для аблажных войскаў, гатоўнасць якіх да вядзення баявых дзеянняў паслаблялася эканамічнымі і маральнымі фактарамі.

Усё ж перавага абароны над атакай была далёка не паўсюднай. Крыніцы зафіксавалі нямала прыкладаў узяцця гарадоў аблажнымі войскамі, з якіх можам прыгадаць узяцце Глебам Усяславічам Менскім Слуцка ў 1116 г., узяцце сынамі Уладзіміра Манамаха Друцка, Оршы і Копысі ў 1117 г. і Менска самім Манамахам у 1119 г.

Не стаяла на месцыы майстэрства фартыфікацыі і на балцкіх землях, аб чым сведчыць адступленне яцвягаў у 1196 г. у свае «цвердзі» пры набліжэнні карнага войска Рамана Мсціславіча Валынскага.

Увогуле, не вельмі паспяховыя дзеянні княскіх войскаў пры аблозе гарадоў, а таксама выпадкі нежадання князёў абараняць падуладныя ім гарады былі адлюстраваннем мэтаў, якія яны ў гэтых войнах праследавалі і, адпаведна, абранай імі стратэгіі. Гарады не заўсёды бывалі канечнай мэтай міжкняскіх войнаў. Яны станавіліся для князёў прыкрай перашкодай для дасягнення іх мэтаў, бо асаджаць іх было цяжка, а абараняць невыгодна. Таму ваенныя дзеянні ўсё больш зводзіліся да рабаўніцкіх набегаў і бітваў у полі. Ва ўдасканаленні і ўзвядзенні ўмацаванняў, а таксама іх мужнай абароне падчас вайны ўсё большая роля належала самому земству. З'ява гэтая падкрэслівала верхавінную прыроду вайны XII ст. і адлегласць паміж князямі з дружынай і рэштай грамадства.

### Г) Стратэгія і тактыка

XII «рыцарсцвеннае» стагоддзе па многіх прыкметах ужо набліжалася да спелага сярэднявечча, якое ў адносінах да развіцця стратэгіі некаторымі аўтарытэтнымі даследчыкамі лічылася змарнаваным часам, патрачаным на хаатычныя сутычкі, рабаўніцтва і двубоі паміж пыхлівымі недысцыплінаванымі рыцарамі-самотнікамі. Думка такая ўзнікла, відаць, з погляду на вынікі бясконцых войнаў паміж шмат-

лікімі ваяўнічымі княствамі. Пераважная большасць ведзеных войнаў не вырашала супярэчнасцяў, якія іх спарадзілі. Сутнасць сістэмы ўзаемаадносін паміж дзяржавамі на беларускіх землях і іх суседзямі заключалася ў яе пастаяннай нестабільнасці. Любая вайна прыводзіла толькі да часовага міру, які неадкладна парушаўся пры змяненні балансу сіл паміж дзяржавамі і іншых фактараў. У такіх варунках нават значны ваенны поспех сапраўды зводзіўся на нішто пераменамі палітычнага становішча. Між тым, хаця замацаваць вынікі перамогі было вельмі цяжка, гэта ніяк не змяншала патрабаванні да яе дасягнення. Больш за тое, пастаяннае вядзенне войнаў на тых самых тэатрах, з тымі самымі праціўнікамі выклікала пільную патрэбу да распрацоўкі адмысловых стратэгічных і тактычных прыёмаў, якія дазвалялі адужаць ворага з падобнай зброяй і роўным узроўнем падрыхтоўкі. Таму палкаводцы XII ст. часта дэманстравалі файныя прыклады ваеннага майстэрства, якія зрабілі б гонар і прадстаўнікам іншых эпох. Той факт, што майстэрства гэтае выкарыстоўвалася для дасягнення дробязных і прывідных мэтаў і не прыводзіла да жаданых вынікаў, ніяк не змяншае іх чыста ваенных заслуг.

Змест войнаў XII ст. складала барацьба асобных валасцей з метраполіямі за самастойнасць і барацьба прыкладна роўных паміж сабой паводле статусу земляў за магутнасць. Войны вяліся з абмежаванымі мэтамі ў адпаведнасці з агульным палітычным становішчам. Абмежаванымі былі і рэсурсы ў іх распараджэнні: неспакойнае ўнутрыпалітычнае становішча, хісткія знешнія саюзы, натуральная аграрная эканоміка, ненадзейныя васальныя кантынгенты і вечавая вольніца апалчэння. У такіх умовах дзяржавы не маглі ажыццяўляць складаныя стратэгічныя камбінацыі і весці доўгатэрміновыя ваенныя кампаніі. Прастор для выкарыстання палітычных і эканамічных фактараў з пункту гледжання вялікай стратэгіі быў моцна сціснуты менавіта з прычыны слабасці гэтых фактараў. Таму пры планаванні і вядзенні вайны асноўны націск натуральным чынам рабіўся на ваеннай стратэгіі як такой. Але недахоп рэсурсаў адчуваўся і тут. Галоўным інструментам вядзення вайны заставаліся княскія дружыны. Нешматлікія, але вельмі мабільныя і выдатна падрыхтаваныя, яны былі найлепш пры-

стасаванымі для хуткіх прамых дзеянняў супраць ваенных ці грамадзянскіх мэтаў. Кампанія, асноўным рэсурсам якой былі дружыны, цягнулася ад некалькіх тыдняў і не больш за некалькі месяцаў. Вынік яе найчасцей вырашаўся адным сутыкненнем з варожым войскам, аблогай горада ці спусташэннем тэрыторыі праціўніка. Такі характар мела вайна кааліцыі палачан і чарнігаўцаў са смалянамі за Друцк у 1180 г. Палачане дасягнулі сваёй стратэгічнай мэты звароту друцкай воласці і паслаблення смаленскіх праціўнікаў шляхам прамога ўдару на Друцк. У выніку баявых дзеянняў яны ўзялі вакольны горад Друцка і прагналі з поля бою войска Давыда Расціславіча Смаленскага, што фактычна аддало Друцк пад іх кантроль.

У некаторых выпадках справа не даходзіла і да вырашальнай бітвы. Простай дэманстрацыі сілы ці спусташальнага нападу на ўладанні праціўніка хапала, каб прымусіць яго прызнаць паражэнне і заключыць мір на сваіх умовах. Гэткім чынам завяршылася вайна паміж палачанамі і кааліцыяй смалян, лагажан, driver і наўгародцаў у 1186 г. Не маючы рэсурсаў для супраціўлення, палачане вымушаныя былі сустрэць наступаючыя войскі з паклонам і прасіць міру. Стратэгічным вынікам вайны было новае паслабленне Полацка і адноснае ўзмацненне Смаленска.

Падобны аскетызм ваеннага майстэрства выклікаў крытыку класікаў ваеннай гісторыі XIX ст. кшталту Ганса Дэльбрука, якія былі выхаваны на аналізе напалеонаўскіх войнаў і абагульнілі іх досвед у ідэалізаваным выглядзе.[311] Войны сярэднявечча ніяк не ўпісваліся ў іх канон, які прадугледжваў вядзенне вайны з дапамогай складаных і прыгожых стратэгічных манеўраў. Манеўры гэтыя вялі да правільнай генеральнай бітвы, у якой праціўнікі дэманстравалі адзін аднаму ўвесь арсенал тактычных прыёмаў. Па выніках бітвы адбываўся чарговы кангрэс, дзе чарадзеі дыпламатыі ў перапынках паміж балямі абменьваліся правінцыямі і герцагствамі, а потым трактатамі аднаўлялі спакой у еўрапейскім канцэрце вялікіх дзяржаў. Пасля заканчэння дзеі яе героі ў ззянні славы адпраўляліся на старонкі падручнікаў гісторыі. Правадыры войскаў XII ст. вырашалі лёс ладнай часткі

[311] Дельбрюк Г. *История военного искусства*. Т. 3. С. 198–202.

кантыненту пад сценамі невялікага драўлянага замка, паклаўшы па некалькі дзесяткаў ваяроў з кожнага боку і абмяняўшыся кароткай хроснай клятвай. Яны не маглі параўнацца з такім бляскам і таму не зарабілі годнай згадкі на старонках адпаведных кніг.

З-пад увагі выпускаецца той факт, што вядзенне кампаній нават у адпаведнасці з прамой стратэгіяй патрабавала дакладнага планавання сваіх дзеянняў і ўліку ўсіх наяўных фактараў. Памылкі ж прыводзілі да цяжкіх наступстваў. Прыкладам такой стратэгічнай памылкі можа служыць кепска падрыхтаваны паход Расціслава і Ізяслава Мсціславічаў супраць Юр'я Даўгарукага ў 1148–1149 гг. У выніку доўгай вайны Ізяслаў заключыў мір з Ольгавічамі і Давыдавічамі і прызначыў Юр'я сваёй наступнай мэтай на шляху да ўсталявання гегемоніі на Русі. Па ягоных разліках, суздальскі князь не мог выстаяць супраць кааліцыі Мсціславічаў, Ольгавічаў і Давыдавічаў. Увосень 1148 г. Ізяслаў і Расціслаў уварваліся ва ўладанні Юр'я ля Ксняціна і пачалі іх пустошыць. Адначасова яны выставілі яму ультыматыўныя ўмовы міру, спадзеючыся на капітуляцыю. Разлік на бліцкрыг быў іх першай стратэгічнай памылкай. Юры адказу не даў, а пачаў рыхтаваць супраціўленне. У чаканні Ольгавічаў і Давыдавічаў браты дайшлі да вусця Малогі. Тут да іх дайшла вестка, што іх саюзнікі не збіраюцца ісці на дапамогу, а стаяць у сваіх вяціцкіх землях, чакаючы выніку барацьбы. Залішняе спадзяванне на дапамогу сваіх нядаўніх ворагаў было другой буйной памылкай Ізяслава і Расціслава. Зразумеўшы марнасць надзей, яны нарэшце пачалі актыўныя дзеянні і дайшлі да вусця Мядзведзіцы. Тым часам мінула зіма і вясновае бездарожжа зрабіла вядзенне вайны немагчымым. Коні правальваліся ў лёд «по чрево». Запозненая высылка наўгародскіх і паўднёварускіх атрадаў для дзеянняў ля Яраслаўля плёну не прынесла. Саюзнікі «комоу куды годно и тако разидошася во свояси». Прамаруджванне, якое стала трэцяй вялікай памылкай братоў, вырвала з іх рук стратэгічную ініцыятыву.

Удару ў адказ не трэба было доўга чакаць. Юры не паўтарыў памылак праціўніка і не стаў марудзіць. Ён хутка сабраў войска і ўварваўся ў падуладныя Святаславу Ольгавічу землі вяцічаў. Ведаючы падступнасць Ольгавіча, ён разу-

меў, што пад пагрозай спусташэння сваіх уладанняў той будзе больш надзейным саюзнікам, чым па хросным цалаванні. Разлік Юр'я апраўдаўся: Святаслаў рушыў з ім на Ізяслава Мсціславіча. У будове адносін з саюзнікамі суздальскі князь таксама стратэгічна перайграў сваіх ворагаў. Нарэшце, калі 22–23 жніўня 1149 г. Юр'евы войскі сышліся пад Пераяслаўлем з Мсціславічамі і іх саюзнікамі, Ізяслаў дапусціў сваю апошнюю памылку, якой Юры ізноў патрапіў скарыстацца. Кіеўскі князь уступіў у бітву насуперак міралюбівым парадам сваіх дружыннікаў і адкрытаму нежаданню кіяўлян біцца з Юр'ем. Пераяслаўцы ж і зусім аказаліся патаемнымі прыхільнікамі суздальскага князя і ўцяклі з поля бою. Маральны дух войска спрычыніўся да цяжкага паражэння Ізяслава і Расціслава.[312] Расціслаў прынамсі здолеў утрымаць Смаленск і выйшаў з вайны без асаблівых страт. Ізяславу ж ягоныя памылкі каштавалі кіеўскага стала. Наадварот, Юры Даўгарукі, які ўмела скарыстаўся з памылак братоў і ўдала арганізаваў контрнаступленне, здолеў дабіцца ўлады над Кіевам і фармальнай гегемоніі над цэлай Руссю. Вынік вайны ізноў падкрэсліў важнасць валодання прыёмамі стратэгічнага майстэрства ў любую эпоху.

Разам з тым калі палкаводцы XII ст. мелі ў сваім распараджэнні дастатковыя рэсурсы і стратэгічную прастору для дзеяння, яны былі ў стане ажыццяўляць складаныя і эфектыўныя стратэгічныя задумкі. Неаднаразова выкарыстоўвалася канцэнтрычнае наступленне на тэрыторыю праціўніка з некалькіх напрамкаў сіламі васальных кантынгентаў. Такая аперацыя патрабавала колькаснай перавагі ў сілах. Ёй папярэднічала доўгая і руплівая палітычная падрыхтоўка з мэтай забеспячэння лаяльнасці і падпарадкавання ўсіх меркаваных удзельнікаў кааліцыі. Канцэнтрычнае наступленне вымушала праціўніка драбіць свае сілы на часткі альбо адкрываць асобныя часткі сваёй тэрыторыі для спусташэння наступаючымі войскамі. У любым выпадку супраціўленне аказвалася паралізаваным, што і прадвызначала перамогу наступаючага боку. Такім чынам дзейнічалі ў 1117 г. войскі паўднёварускай кааліцыі пад камандаваннем Уладзіміра Манамаха супраць Глеба Менскага. Смаленскі кантынгент

312 Ипатьевская летопись. Ст. 369–383.

Вячаслава Уладзіміравіча авалодаў Оршай і Копысем, тады як войскі Яраполка Уладзіміравіча і Давыда Святаславіча ўзялі Друцк. Сам Манамах аблажыў Менск. Пры абмежаваных рэсурсах і велізарнай перавазе нападаючых Глеб не змог абараніць асобныя часткі сваёй воласці. Кепскія камунікацыі і хуткасць нападзення таксама перашкодзілі яму сабраць наяўныя сілы ў адзін кулак. Страціўшы ключавыя гарады і застаўшыся ў абложаным Менску сам-насам з вялізным войскам Манамаха, ён вымушаны быў пайсці на мір і прызнаць васальную залежнасць ад кіеўскага князя. Сапраўдным жа шэдэўрам канцэнтрычнага наступлення была вайна Мсціслава Уладзіміравіча Кіеўскага з полацкімі князямі ў 1128 г., у якой кіеўскі князь найдакладнейшым чынам спланаваў і правёў складаную наступальную аперацыю і прадэманстраваў выдатнае кіраванне войскамі. Падрабязная гаворка аб гэтым пойдзе ніжэй.

Добрым прыкладам непрамой абарончай стратэгіі была абарона смаленскімі Расціславічамі сваіх кіеўскіх уладанняў ад войскаў Андрэя Багалюбскага ў 1173 г. Расціславічы не сталі абараняць сам Кіеў, што, на першы погляд, было самым лагічным выбарам. У войнах 1116–1117 і 1128 гг. наступаючы бок прымушаў абаронцаў драбіць свае сілы. Цяпер жа адбылося наадварот. Замест абароны Кіева Расціславічы падзялілі свае сілы. Рурык зачыніўся ў Белгарадзе, а славуты сваім ваенным майстэрствам Мсціслаў узяўся абараняць Вышгарад. Нападаючы бок быў вымушаны раздрабіць свае сілы для дзеянняў у розных кірунках і марнаваць іх на аблогу гарадоў, ні на крок не набліжаючыся да сталага авалодання Кіеўшчынай. Пакуль Расціславічы захоўвалі свае сілы, суздальцы не маглі пачувацца ў Кіеве спакойна. Тым часам з Луцка да Кіева на дапамогу суздальцам і Ольгавічам з'явіўся Яраслаў Ізяславіч, які і сам быў не супраць сесці ў Кіеве. З Ольгавічамі ён, аднак, не дамовіўся і без вялікіх ваганняў перайшоў на бок Расціславічаў. Калі суздальцы і іх саюзнікі пабачылі аб'яднанае войска Рурыка і Яраслава з валынянамі, і чорнымі клабукамі, яны панічна кінуліся наўцёкі. Шмат людзей патанула пры пераправе цераз Днепр. Затым Расціславічы дамовіліся з Яраславам, аддаўшы яму Кіеў і захаваўшы свае ўладанні і ўплыў.[313]

[313] Ипатьевская летопись. Ст. 575–578.

У большасці выпадкаў, аднак, князі-палкаводцы XII ст. не мелі за спіной вялікіх рэсурсаў, але разумелі, што іхнія саепернікі маюць тую самую Ахілесаву пяту. Гэтым яны і карысталіся, у сваіх планах зыходзячы не са сваёй сілы, а з чужой слабасці. Напрыклад, палкаводцы маглі разлічваць на беспарадкі і мяцяжы ў тыле праціўніка. Ва ўмовах унутрыпалітычнай барацьбы паміж князем і вечам ім неабавязкова было адмыслова распальваць антыкняскія настроі. Небяспечнае набліжэнне варожых войскаў да ключавых цэнтраў зямлі і спусташэнне гаспадарчых угоддзяў магло аўтаматычна выклікаць выбух пацыфісцкіх настрояў насельніцтва і сабатаж княскіх ваенных мерапрыемстваў. Мы можам назіраць у XII ст. шэраг цікавых узораў непрамой стратэгіі, заснаваных на спробах паралізаваць супраціўленне ворага ўздзеяннем на маральны дух насельніцтва.

У 1139 г. Усевалад Ольгавіч Чарнігаўскі захапіў гарады Пасулля. У адказ Яраполк Уладзіміравіч Кіеўскі арганізаваў супраць яго паход, прыкметны для нас удзелам у ім адначасова і палачан, і смалян, і тураўцаў. Пабачыўшы ля Чарнігава незлічоныя палкі саюзнікаў, Усевалад жахнуўся і сабраўся наўцёкі з горада. Тое, што адбылося далей, апісана летапісцам так выразна і эмацыйна, што не можа быць пераказана і заслугоўвае дакладнага цытавання: «И людие Черниговци въспиша къ Всеволодоу: «Ты надеешися бежати в Половце, а волость свою погубиши, то к чемоу ся опять воротишь? Лоуче того останися высокоумья своего и проси си мира. Мы бо ведаемъ милосердие Ярополче, яко не радоуется кровипролитью, но Бога ради въсхощеть мира, то бо съблюдаеть землю Роусьскоую». Всеволодъ же то слышавъ, вниде в ся и поча слати с молбою къ Ярополкоу, прося мира». Міралюбівы Яраполк не стаў упарціцца, і справа завяршылася мірам.[314]

Кемлівы і хітры Ольгавіч не забыў навукі. Ён скарыстаў той самы прыём у паходзе на галіцкага князя Уладзімірку ў 1144 г., у якім бралі ўдзел Расціслаў Мсціславіч Смаленскі, Расціслаў Глебавіч Менскі і шмат іншых князёў. Калі саюзнікі наблізіліся да горада, Уладзімірка пакінуў пануючыя над горадам вышыні і рушыў ворагу насустрач. Войскі

[314] Ипатьевская летопись. Ст. 301–302.

праціўнікаў падзяліла рака Белка. Усевалад загадаў наладзіць гаці і перайсці раку. Уладзімірку гэты манеўр не надта ўсхваляваў. Ён займаў моцныя пазіцыі на забалочанай мясцовасці, дзе весці з ім правільны бой было немагчыма. Між тым Ольгавіч не збіраўся атакаваць Уладзімірку ў лоб. Ён сам заняў вышыні над Галічам з боку Перамышля. Пабачыўшы гэта, галіцкія ваяры пачалі наракаць: «Мы сде стоимы, а онамо жены наша возмоуть». Уладзімірка вымушаны быў прасіць міру, на які Усевалад пагадзіўся на ўмовах прызнання Уладзіміркам васальнай залежнасці ад яго і выплаты выкупу. Паход завяршыўся дзяльбой срэбра паміж саюзнікамі.[315] У гэтым паходзе Усевалад прадэманстраваў сваё ўменне выкарыстоўваць непрамыя спосабы вядзення вайны. Сваім набліжэннем ён выманіў Уладзімірку на балоты, прымусіўшы яго пакінуць горы. Затым пераправай цераз раку ён імітаваў падрыхтоўку да бітвы, а сам зрабіў абыходны манеўр і заняў ключавыя вышыні. Гэтым ён дабіўся хвалявенняў у галіцкім войску і бяскроўным чынам дасягнуў міру.

У сваёй спробе адваяваць полацкі стол у Расціслава Глебавіча ў 1158 г. Рагвалод Барысавіч таксама не мог не ўлічваць незадаволенасці палачан першым. Калі ён заняў Друцк, насустрач яму выйшлі ягоныя полацкія і друцкія прыхільнікі на больш як 300 лоддзях. Наступныя спробы Расціслава авалодаць горадам праваліліся, а затым Рагвалоду і зусім удалося без бою авалодаць Полацкам пасля мяцяжу палачан супраць Расціслава.

Вынікі гэтых перамог не былі трывалымі. Прыніжэнне Усевалада Ольгавіча пад Чарнігавам не прынесла карысці Яраполку Уладзіміравічу. Ольгавіч ачуняў вельмі хутка і ўжо ў 1140 г. сам стаў кіеўскім князем. Але і ён не шмат атрымаў ад бяскроўнай перамогі пад Галічам у 1144 г. Праз два гады Усевалад мусіў адпраўляцца ў новы паход на Галіч, які таксама не прынёс жаданага выніку. Пасля перамогі над Расціславам Глебавічам нядоўга княжыў у Полацку Рагвалод Барысавіч. Пацярпеўшы ў 1162 г. паражэнне ад Расціслававага брата Валадара, ён не вярнуўся ў Полацк ад страху перад вечам. Менавіта палітычная нетрываласць вынікаў зацямніла ў вачах наступных пакаленняў ваенны змест

[315] Ипатьевская летопись. Ст. 314–316.

перамог. Але не варта ігнараваць неаспрэчныя факты. Палкаводцы XII ст. выдатна ўсведамлялі важнасць дасягнення сваіх мэтаў малой крывёй і мінімальнай затратай наяўных рэсурсаў. Таму побач з паўсюдным ужываннем прамой стратэгіі пры магчымасці яны карысталіся і непрамымі метадамі. Яны дзейнічалі ў абыход падрыхтаванай абароны ў літаральным і пераносным сэнсе, знаходзячы прыступныя месцы ў праціўніка як на полі бою, так і ў тыле. Ажыццяўленне такіх стратэгічных задумак, як наступленне Мсціслава Уладзіміравіча Кіеўскага на Полацкую зямлю ў 1128 г., набліжаецца да класічных узораў сусветнага ваеннага майстэрства. Іншыя ж, як паход Усевалада Ольгавіча на Галіч у 1144 г., застаюцца ў гісторыі выкшталцонымі стратагемамі.

Палітычныя мэты Літвы і яцвягаў заключаліся ў арганізацыі экспансіі земляў суседзяў, іх падпарадкаванні і спадарожным гэтаму рабаўніцтве. Мэты гэтыя дасягаліся выкарыстаннем метадаў прамой стратэгіі: засяроджваннем усіх наяўных сіл на вырашальным напрамку і атакуючымі дзеяннямі супраць ворага. Момант для нападу звычайна выбіраўся пры найбольшым паслабленні праціўніка. Такая стратэгія дала плён пры арганізацыі набегаў на Русь і Лівонію ў 1183–1185 гг. і сумесным з палачанамі нападзе на Вялікія Лукі ў 1198 г.

Развіццё тактыкі ў Полацкай, Смаленскай і Тураўскай землях у XII ст. пайшло поруч з развіццём вайсковай арганізацыі. Прафесіяналізацыя ваеннай справы і яе засяроджванне ў руках князёў і дружын адкрыла рэчышча і для прафесійнай спецыялізацыі. У вайсковым асяроддзі вылучаліся групы ваяроў, спецыялізаваныя паводле відаў зброі і тых баявых задач, якія яны выконвалі. А. Н. Кірпічнікаў выдзяляе чатыры такія групы:

1) цяжкаўзброены коннік, які быў абаронены шлемам, кальчугай і шчытом і меў у сваім распараджэнні адно ці два кап'я, суліцы ці лук са стрэламі, меч ці шаблю, кісцень, булаву ці, радзей, баявую сякерку;

2) лёгкаўзброены коннік-стралец, асноўнай зброяй якога быў лук са стрэламі, дапоўнены сякеркай, кап'ём, шчытом і шлемам;

3) цяжкаўзброены пехацінец-капійнік, у арсенале якога былі кап'ё, суліцы, сякера, булава, шчыт і часам меч.;

4) лёгкаўзброены пехацінец-лучнік, акрамя лука і стрэлаў узброены сякерай ці булавой.[316]

Дадамо ад сябе, што выдзяленне цяжкой пяхоты ў асобную групу здаецца не зусім абгрунтаваным для XII ст. Вой апалчэння беларускіх земляў (і іншых земляў Русі) адрозніваўся арыентаванасцю на характэрны для цяжкой пехоты рукапашны бой у шчыльным страі, а не бой кідальнай зброяй. Гэта адрознівала яго ад класічнага лёгкаўзброенага пехацінца эпохі змагання халоднай зброяй (рымскага веліта, балеарскага пращчніка, англійскага лучніка). Але беднасць засцерагальнага ўзбраення, якое часта было прадстаўлена адным шчытом і толькі зрэдку дапаўнялася шлемам і панцырам, не дазваляе кваліфікаваць тыповага воя апалчэння беларускіх земляў як цяжкога пехацінца. Большая частка вояў апалчэння магла трапляць у прамежкавую групу паміж цяжка – і лёгка-ўзброенай пяхотай. Для яе азначэння прымальным можа быць тэрмін «сярэдняя пяхота».

Ваенная спецыялізацыя часта залежала ад сацыяльнага становішча ваяра. Натуральна, што служба ў якасці цяжкаці лёгка-ўзброенага конніка альбо цяжкаўзброенага пехацінца, якая патрабавала адмысловага ўмельства і значных грашовых укладанняў ва ўзбраенне, была прывілеем дружыннікаў ці заможных прадстаўнікоў земства. Беднейшы люд, які не мог дазволіць сабе поўны камплект узбраення і не займаўся ваеннай справай на рэгулярнай аснове, трапляў у склад сярэдняй і лёгкай пяхоты.

Разам з тым у XII ст. ваенная спецыялізацыя знаходзілася яшчэ ў дзіцячым узросце. У залежнасці ад мэтазгоднасці ці абставін ваяры маглі трапляць у склад атрада, дзе пераважалі людзі іншага сацыяльнага паходжання. Арыентуючыся на баявыя абставіны і выкананне баявой задачы, ваяры маглі карыстацца рознымі відамі наступальнага і засцерагальнага ўзбраення і дзейнічаць у розных баявых парадках. «Слова пра паход Ігараў» пралівае святло на падобны выпадак, заўважаючы, што Усевалад Святаславіч Курскі біўся з полаўцамі «забыв чти и живота, и града Чрънигова, отня злата стола, ...свычая и обычая»,[317] гэта зна-

---

[316] Кирпичников А. Н. *Древнерусское оружие*. Вып. 3. С. 61.

[317] Слово о пълку Игореве, Игоря, сына Святъславля, внука Ольгова. С. 169.

чыць не як князь, а як просты вой. Як адзначае А. Н. Кірпічнікаў, «фармаванне каставай ваеннай арганізацыі час ад часу парушалася прыцягненнем у войска народных мас з уласцівай ім «плебейскай» зброяй». «У гэтыя перыяды вайсковае і сацыяльнае становішча прызваных на вайну не заўсёды вызначала іх прыналежнасць да капійнікаў і лучнікаў, конніцы і пяхоты. У летапісах не раз згадваюцца выпадкі, калі коннымі былі «воі», «чорныя людзі», а сярод пешых знаходзіліся заможныя рамеснікі і нават правадыры».[318]

Групы ваяроў адрозніваліся як па колькасці і ўдзельнай вазе ў войску, так і па баявым прызначэнні і якасных паказчыках. Наяўнасць разнастайных відаў узбраення, дасканалае валоданне імі і высокі агульны ўзровень баявой падрыхтоўкі рабіў цяжкую дружынную конніцу найбольш эфектыўнай і грознай на полі бою групай ваяроў. Цяжкая кавалерыя XII ст. прызначалася для нанясення атакуючага ўдару па праціўніку ў шчыльным самкнутым страі. Першы ўдар наносіўся коп'ямі шляхам тараннага ўколу. Бой прымаў выгляд сустрэчнага сутыкнення, якое давала магчымасць спалучыць прабіўную моц колючай зброі з энергіяй паступальнага руху. У ходзе атакі можна было нанесці праціўніку значныя страты і расстроіць яго баявыя парадкі, што было вырашальным для ходу бою. Калі першы ўдар не прымушаў праціўніка ўцякаць, коннікі хапаліся за мячы. Зместам сечы на мячах былі не двубоі асобных ваяроў, а імкненне расстроіць яго парадак і прымусіць да адступлення.[319] Побач з велізарнай ударнай сілай цяжкой конніцы вызначальнай яе рысай была мабільнасць і дынамічнасць. Гэта дазваляла выкарыстоўваць яе не толькі для франтальнага сутыкнення, але і для выканання такіх складаных тактычных манеўраў, як удары па флангах і ў тыл праціўніку. Эфектыўнасць цяжкой конніцы прывяла да яе татальнага панавання на беларускіх і іншых еўрапейскіх палях баёў у XII ст. Сутычка конніцы вырашала зыход бою. У некаторых выпадках князі абмяжоўваліся выкарыстаннем сваіх дружын, не звяртаючыся да паслуг пешых вояў апалчэння. Нават у меншасці цяжкая конніца была асноўнай ударнай сілай армій XII ст.

---

318 Кирпичников А. Н. *Древнерусское оружие*. Вып. 3. С. 62.
319 Тамсама. С. 65.

Легкаконныя стральцы былі новай з'явай для ваеннай справы XII ст. Сваім з'яўленнем яны былі бясспрэчна абавязаныя войнам княстваў Русі з полаўцамі і іншымі качэўнікамі. Не могучы належным чынам даць рады няўлоўным палавецкім атрадам з дапамогай цяжкой конніцы, князі Русі былі вымушаны ўвесці ў склад сваіх войскаў падобным чынам узброеных і абвучаных ваяроў. У дачыненні да беларускіх земляў мы можам прызнаць іх існаванне ў тых княствах, якія побач з іншымі землямі былой Кіеўскай дзяржавы супрацьстаялі полаўцам: Смаленскай зямлі і, магчыма, Тураўшчыне. Да Полацкай зямлі іх распаўсюджанне не дайшло.

Конныя стральцы часта выкарыстоўваліся для завязкі бою. З дапамогай стральбы яны імкнуліся расстроіць парадкі праціўніка і стварыць спрыяльныя ўмовы для атакі сваёй цяжкой конніцы. Менавіта так дзейнічалі стральцы Мсціслава Расціславіча пры абароне ім Вышгарада ад суздальцаў у 1173 г.: «стрельци ихъ и почаша ся стреляти межи собою гонячеся».[320] Убачыўшы вынік іх дзеянняў, Мсціслаў загадаў сваёй дружыне пачынаць атаку. Летапіс паведамляе аб перастрэлцы цераз раку Друць пры супрацьстаянні ў 1180 г. пад Друцкам палачан і чарнігаўцаў з аднаго боку і смалян з другога.[321] Пры ўдалым збегу абставін конныя стральцы маглі не толькі палегчыць задачу сваім паплечнікам, але і самастойна вырашыць зыход бою. Пры вялікай колькаснай перавазе процьма выпушчаных стрэлаў магла вымусіць праціўніка да ўцёкаў. Дзеянні вялікіх колькасцяў палавецкай лёгкай конніцы прывялі да паражэння Расціслава Мсціславіча Смаленскага і ягонага пляменніка Мсціслава Ізяславіча пад Пераяслаўлем у 1154 г.

Лёгкая конніца выконвала баявыя задачы і больш агульнага характару: спусташэнне тэрыторыі праціўніка і пераразанне яго камунікацый. У ходзе баявых дзеянняў пад Кіевам у 1151 г. Юры Даўгарукі і Святаслаў Ольгавіч імкнуліся пазбегнуць бою ў невыгодных умовах з войскамі Расціслава і Ізяслава Мсціславічаў і Вячаслава Уладзіміравіча. З гэтай мэтай яны паслядоўна адступалі на рубяжы, прыкрытыя з фронту натуральнымі перашкодамі. Спачатку войска суздальска-чарнігаўскай кааліцыі адступіла за Руць, затым стала

---

[320] Ипатьевская летопись. Ст. 575.

[321] Тамсама. Ст. 620–621.

за прылеглым возерам, потым за ўзгоркамі, зайшло за Малы Руцец і нарэшце сабралася ізноў перайсці цераз Руць і дачакацца там Уладзіміра Галіцкага. Пабачыўшы гэта, кіеўска-смаленскі трыумвірат вырашыў перакрыць суздальцам шляхі адступлення і «пустиша по них стрельце своя, Черныя Клобукы и Русь, и тако начаша наездити в задъ полковъ, стрелятися с ними, и почаша оу нихъ возы отимати». Пабачыўшы, што «нелзе имъ за Роуть», суздальцы і чарнігаўцы вырашылі прыняць бой у невыгодных для сябе ўмовах і былі ўшчэнт разбітыя.[322] Заслуга ў гэтым належала легкаконным стральцам кіяўлян і смалян.

Апошні эпізод паказвае і арганізацыйную прыроду лёгкай конніцы, якая часткова камплектавалася з саюзных качэўнікаў (чорныя клабукі), часткова – з уласных адмыслова абвучаных дружыннікаў (Русь).

Сярэдняя пяхота апалчэння страціла частку свайго баявога значэння ў параўнанні з XI ст., але яшчэ працягвала актыўна выкарыстоўвацца ў баях. Яна магла амаль цалкам адсутнічаць на полі бою ў невялікіх бітвах паміж князямі і прысутнічаць там у вялікай колькасці ў выпадку значнай ваеннай небяспекі. Сярэдняя пяхота строілася ў шчыльныя баявыя парадкі, прыстасаваныя для рукапашнага бою, і дзейнічала сумесна з конніцай альбо самастойна. Яна магла быць асабліва эфектыўнай у абарончых баях, бо ў адрозненне ад конніцы валодала неабходнай для такога бою ўстойлівасцю. Таксама сярэднія пехацінцы «прыкрывалі тылы, неслі ахоўную і абозную службу».[323]

Нягледзячы на агульны рэнесанс стральбы з лука, заняпад у XII ст. зведала лёгкая пяхота, ўзброеная лукам са стрэламі і суліцамі. Традыцыйна камплектуючыся з беднага люду, яна не магла спаборнічаць з прафесійнымі коннымі дружыннікамі-стральцамі і была імі выцесненая. Лёгкаўзброеныя воі яшчэ маглі па традыцыі прызывацца ў час вялікай небяспекі, але вялікага ўплыву на ход баёў ужо не мелі.

Лёгкія пехацінцы захаваліся на Полаччыне дзякуючы перавагам, якія забяспечвала пяхоце лясістая мясцовасць Полаччыны, але іх арганізацыйная прырода і баявыя зада-

---

322 Ипатьевская летопись. Ст. 435–438.
323 Кирпичников А. Н. *Древнерусское оружие*. Вып. 3. С. 58.

чы таксама змяніліся. Полацкія лёгкія пехацінцы другой паловы XII ст. былі па сваім становішчы малодшымі дружыннікамі, г. зн. прафесійнымі ваярамі. Іх зброяй быў складаны лук, які быў прыстасаваны да баявога ўжытку і патрабаваў адмысловай падрыхтоўкі. Засцерагальнае ўзбраенне складалася з ламелярнага панцыра і, магчыма, шлема.[324] Пешыя стральцы выкарыстоўваліся для завязкі бою, дзеянняў на флангах і ў тыле ворага. Пры аблозе і абароне крэпасцяў яны былі незаменнымі. Менавіта да іх ліку належалі тыя лучнікі, якія з такім умельствам абстрэльвалі сцены Гольма ў 1206 г.

Існаванне спецыялізаваных груп ваяроў і арганізацыя ўзаемадзеяння паміж імі ў баі было галоўнай задачай тактыкі XII ст. Дасягненнем палкаводцаў таго часу стала ўменне размяшчаць па-рознаму спецыялізаваныя групы ваяроў на полі бою для дасягнення канкрэтных задач. Вынікам было павышэнне манеўранасці войскаў, ускладненне агульнай карціны бою і з'яўленне новых тактычных прыёмаў.

Тыповаму бою XII ст. папярэднічала аператыўнае маневраванне з мэтай заняць выгодную пазіцыю. Войска, на баку якога была стратэгічная ініцыятыва і колькасная перавага сіл, імкнулася вымусіць праціўніка да бою і шукала пазіцыі, зручнай для атакі. Для гэтага выкарыстоўвалася лёгкая конніца, якая нападала на флангі і тыл варожай арміі і перараzала ёй шляхі да адступлення. Супраціўны бок, наадварот, імкнуўся заняць моцную абарончую пазіцыю за натуральнай перашкодай, якая б дазволіла дачакацца падыходу падмацаванняў альбо адступіць без страт.

У баі войскі строіліся ў складаны баявы парадак, які меў некалькі ліній. У першай лініі знаходзіліся пешыя ці конныя стральцы. Другая лінія складалася з сярэдняга, правага і левага палкоў. Склад палка паводле родаў зброі з'яўляецца пытаннем спрэчным. Паколькі полк звычайна фармаваўся з кантынгенту адной зямлі, можна думаць, што ён уяўляў змяшаны строй цяжкой дружыннай конніцы і сярэдняй пяхоты апалчэння. Усё ж пры пастаянным узрастанні баявога значэння конніцы тактычныя перавагі рабілі

---

[324] Ласкавы Г. В. *Узбраенне воінаў XII–XIII стст. з феадальных сядзіб-замкаў паўночнага захаду Полацкай зямлі.* С. 54–55.

немэтазгодным яе выкарыстанне ў адным страі з пяхотай. Таму конніца ва ўсё большай ступені цягнулася да размяшчэння на флангах баявога парадку, дзе яна магла ажыццявіць заход у фланг ці тыл ворагу. Гэта магло прыводзіць і да ўтварэння зводных конных палкоў з кантынгентаў розных земляў. Адпаведна, пяхота апалчэння заставалася ў цэнтры. У апошняй лініі размяшчаўся рэзерв з найбольш надзейных і падрыхтаваных дружыннікаў. Лёгкая пяхота апалчэння выкарыстоўвалася для аховы абозу і лагера. Варта зазначыць, што далёка не ўсе бітвы XII ст. мелі рэгулярны характар. У многіх выпадках яны пачыналіся нечакана і праходзілі хаатычна. Палкаводцам не заўсёды ўдавалася належным чынам выстраіць войскі ў баявыя парадкі, таму некаторыя з пералічаных элементаў строю маглі папросту адсутнічаць.

Бой пачынаўся з атак конных ці пешых стральцоў, за якімі ў наступленне рушыла цяжкая конніца. Коннікі імкнуліся капійным ударам збіць варожы строй і вымусіць праціўніка да адступлення. У выпадку няўдачы, паламаўшы коп'і, абодва бакі хапаліся за мячы. Наступны рукапашны бой доўга не цягнуўся і не прыводзіў да масавай гібелі ваяроў. Войска было моцнае найперш сваім баявым парадкам. Дастаткова было парушыць баявыя парадкі праціўніка, каб ён пачаў адступленне.[325] Як заўважае летапісец аб баі пад Вышгарадам у 1173 г., «и тако бившеся крепко, и разиидоша». «Много же бе ратьныхъ, мртвых же бе не много».[326] Дасягнуўшы поспеху на адным участку бою, войскі не пачыналі неадкладнага праследавання. Замест гэтага яны спрабавалі развіць свой поспех для ўдару ў фланг ці тыл іншым часткам ворага. Такі ўдар звычайна і вырашаў зыход бою. Паражэнне і адступленне адной часткі войска станавіліся сігналам для агульнага адступлення. Менавіта такім чынам завяршыліся баявыя дзеянні пад Кіевам у 1149 і 1151 гг. У адрозненне ад ранейшых часоў пераможныя войскі ўжо не заставаліся святкаваць «на касцях», а ажыццяўлялі праследаванне пераможаных. У такіх умовах адступленне пераходзіла ў панічныя ўцёкі, падчас якіх гінула вялікая колькасць людзей. Перашкоды кшталту ракі ці балота служылі

---

325 Кирпичников А. Н. *Древнерусское оружие.* Вып. 3. С. 63.
326 Ипатьевская летопись. Ст. 576.

ўцекачам сапраўднай брацкай магілай. Поспех у баі вёў да стратэгічнай перамогі ва ўсёй кампаніі, якая ва ўмовах пастаянных міжусобных войнаў рэдка вяла да трывалых палітычных вынікаў. Праз некаторы час усё даводзілася пачынаць нанова.

Бой XII ст. быў імклівым і хуткацечным. Дружыннікі часта мелі ў сваім распараджэнні адзіны шанц на тое, каб сакрушальнай атакай адкінуць ворага, а пры няўдачы ўцячы з поля бою і захаваць сваё жыццё. Князі мелі адзіную магчымасць удала падрыхтавацца да бою. Змарнаваўшы яе, яны страчвалі свае войскі, уладанні, а часам і жыццё. У гэтым святле мы па-іншаму глядзім на ўзровень ваеннага майстэрства таго часу. Дружыннік мусіў быць не толькі ліхім рыцарам, які змагаўся за свой гонар і княскую славу. Ён павінен быў быць абвучаным і падрыхтаваным ваяром, стрымана і спакойна ацэньваць сітуацыю вакол сябе, дзейнічаць у інтарэсах агульнага поспеху і імкнуцца выціснуць найлепшы вынік з любых абставін. Князь павінен быў быць не проста першым са сваіх дружыннікаў паводле харобрасці і ваяўнічасці. Ён мусіў добра бачыць агульнае становішча на полі бою і вакол яго з тым, каб уступіць у бой у найбольш спрыяльных абставінах і размясціць войскі найлепшым чынам. Падчас бою ён павінен быў захоўваць кіраванне войскам і ўмець павярнуць ход падзей у патрэбнае яму рэчышча, нават калі яго баявыя парадкі пахіснуліся. Наяўнасць гэтых якасцяў у бліскавічных і недаравальных войнах адрознівала добрае войска ад пасрэднага і выдатнага князя-палкаводца ад вечнага няўдачніка-авантурыста.

Яшчэ раз можам згадаць баявыя дзеянні пад Кіевам у 1151 г. Гарачы кіеўскі князь Ізяслаў Мсціславіч узяў на сябе абавязкі шараговага дружынніка і першым сутыкнуўся з войскамі Юр’я Даўгарукага. У сутычцы ён быў паранены і скінуты з каня. Яго знайшлі свае ж воі, якія захацелі дабіць яго, прыняўшы за ворага. Яны паспелі нанесці яму некалькі ўдараў, пакуль ён не зняў шлем і не назваў сябе.[327] Эпізод гэты паказвае, што Ізяслаў біўся як шараговы ваяр і войскам фактычна не кіраваў. Заслуга перамогі належала Вячаславу Уладзіміравічу і Расціславу Мсціславічу Смаленскаму, якія і ажыццяўлялі камандаванне ў адсутнасць Ізяслава.

---

[327] Ипатьевская летопись. Ст. 438–439.

У той час як летапісцы падрабязна апісваюць бітвы паміж князямі Русі, тактыка літоўцаў і яцвягаў вядома нам недастаткова. Відавочна, ваеннае майстэрства балтаў у гэты час мусіла зрабіць якасны скачок у параўнанні з папярэднім перыядам. Дзяржаўная арганізацыя была падмуркам для больш складанай і дасканалай вайсковай арганізацыі, якая ў сваю чаргу ўзнімала на новы ўзровень стратэгію і тактыку. Войскі, якія ў 1183 г. спустошылі Пскоўшчыну, каля 1185 г. нанеслі паражэнне полацкаму войску, а каля 1200 г. на роўных змагаліся з нямецкім рыцарствам ля Кукейноса, мусілі мець параўнальны ўзровень ваеннага майстэрства з праціўнікамі. Яны былі здольнымі весці рукапашны бой у шчыльных баявых парадках, ажыццяўляць складаныя тактычныя манеўры і мелі добрае кіраванне.

Мы ведаем дакладна, што і ў XII ст. балцкія народы працягвалі з поспехам выкарыстоўваць ірэгулярную тактыку, якая характарызавалася нечаканымі нападзеннямі на непадрыхтаванага праціўніка і спалучалася з умелым выкарыстаннем перасечанай мясцовасці. Асабліва эфектыўнай такая тактыка была пры выкарыстанні яе супраць карных і заваёўных экспедыцый русінаў і палякаў у Літву і Ятвязь. Вялікія масы рускіх ці польскіх войскаў вымушаныя былі рухацца па незнаёмай лясістай ці забалочанай мясцовасці, не маючы магчымасці разгарнуцца ў баявы парадак. Праходзячы праз вузкія дэфіле, наступаючыя войскі расцягваліся і трацілі сувязь паміж асобнымі часткамі. Гэтым і карысталіся літоўцы і яцвягі. Атрымліваючы ад сваіх выведнікаў дакладныя звесткі аб месцазнаходжанні праціўнікаў, яны выбіралі дакладны момант для ўдару і гамілі захопленага знянацку ворага па частках. Нават спусташэнне ворагам іх земляў і паселішчаў не магло зламаць супраціўлення балтаў.

Менавіта такім чынам літоўцы разбілі кіеўскае апалчэнне ў 1132 г. У гэтым годзе Мсціслаў Уладзіміравіч Кіеўскі з сынамі, Ольгавічамі і Усеваладам Гарадзенскім хадзіў на Літву, каб такім чынам замацаваць сваю перамогу над Полацкай зямлёй. Па дарозе дадому кіяўляне «не втягли бо бяху съ князем», але «последи идяху по немъ особе». Адасобленасць варожых вайсковых частак была заўважана літоўцамі, якія «Кианъ тогда много побиша».[328]

[328] Ипатьевская летопись. Ст. 294.

Найбольш жа яскрава выкарыстанне балтамі ірэгулярнай тактыкі нападзення з засады выявілася ў вайне 1166 г., якую польскі кароль Баляслаў Кучаравы распачаў супраць прусаў, што разам з яцвягамі прадстаўлялі вялікую пагрозу яго ўладанням. Зыход гэтай вайны ярка і эмацыйна апісаны польскім хранístам Вінцэнтам Кадлубекам. «І вось, сабраўшы разам вялікае мноства найбольш дасведчаных ваяроў, Баляслаў рыхтаваўся абрынуцца на правінцыі гетаў (прусаў – *Я. Н.*), не ўмацаваныя ніякімі збудаваннямі, але недаступныя паводле прыроднага знаходжання. Ля самага ўваходу ў іх зямлю ёсць месца, пакрытае густымі зараснікамі, дзе пад зялянінай травы хаваецца бездань глеістай смалы. Знайшліся выведнікі і правадыры войска, якія нібыта адшукалі найвярнейшы і найкарацейшы шлях праз гэтае месца. Яны прынялі хабар ад ворагаў і ведалі пра засаду на сяброў. І вось тут на вузкай сцежцы адзін за адным гінуць першыя шэрагі самых адборных ваяроў, бо з іншага боку накідваюцца ворагі; і не толькі здалёк пускаюць стрэлы, як у іх заведзена ў іншых выпадках, але і палякаў, сціснутых, нібы вінаградным прэсам у давільні, працінаюць ва ўпор, бо яны самі натыркаюцца на вастрыі мячоў, нібы дзікі, адны імкнучыся адпомсціць, іншыя імкнучыся прыйсці на дапамогу, і большая частка гіне рачэй пад уласным націскам, чым ад варожай разні. Некаторых, прыціснутых вагай узбраення, усмоктваюць глыбіні разяўленай бездані; іншыя разрываюцца на часткі, гінуць, заблытаўшыся ў сетках галін цярноўніку – усіх ахінае змрок непазбежнай гібелі. Так узброенае войска загінула з-за падступнай здрады!»[329]

Уласцівасць падобнай тактыкі ваеннаму майстэрству балцкіх народаў у XII ст. пацвярджаецца і дзеяннямі земгалаў супраць полацкіх войскаў у 1106 г. Як адзначае В. Тацішчаў, «зимеголы, собравшись во множестве, нечаянно на неосторожных полотчан из лесов напав, победили».[330] Удалае спалучэнне рэгулярнай і нерэгулярнай тактыкі дазваляла войскам балтаў перамагаць у баях з колькасна пераважаючымі праціўнікамі і заставацца грознай ваеннай і палітычнай сілай у рэгіёне.

---

[329] Vinc. Kadl. III. 30. C. 104.

[330] Татищев В. Н. *История Российская.* Т. 2. 12. С. 125.

Разгледзеўшы агульныя рысы стратэгіі і тактыкі XII ст., пяройдзем да аналізу асобных выбітных узораў ваеннага майстэрства. Выдатным прыкладам тагачаснай стратэгіі з'яўляецца **вайна 1128 г. Мсціслава Уладзіміравіча Кіеўскага супраць Полацкай зямлі**. Гэтыя падзеі ў беларускай гістарыяграфіі звычайна ацэньваюцца адмоўным чынам, як паражэнне палачан у барацьбе за незалежнасць ад Кіеўскай дзяржавы і праецыруюцца на пазнейшую барацьбу Беларусі за незалежнасць ад агрэсіўных суседзяў. Сапраўдная іх карціна выглядае больш складанай. Перш за ўсё, з «таго», кіеўскага боку ў вайне прымалі ўдзел войскі Гарадзенскага, Тураўскага, Клецкага і Смаленскага княстваў, якія затым увайшлі ў склад Беларусі і ўнёсак якіх у беларускую гісторыю быў прынамсі параўнальным з Полацкам. Па-другое, правіцелі таго часу не маглі ацэньваць сучасныя ім падзеі акрамя як з абумоўленага сваім часам пункту гледжання. Перавагі рэтраспектыўнага погляду яны не мелі і не маглі разглядаць свае ўчынкі ў святле тварэння нацыі, якая афармілася ў пазнейшыя стагоддзі. На ўдзел у паходзе супраць Полацка яны глядзелі як на выкананне свайго абавязку перад кіеўскім сюзерэнам, а на сам паход – як на звычайную барацьбу за магутнасць і ўладу паміж дзьвюма дзяржавамі. Таму нам няма патрэбы нагружаць падзеі XII ст. сённяшнім зместам. З увагі на ўдзел у той вайне беларускіх ваяроў з абодвух бакоў, мы можам ацэньваць яе як складнік беларускай ваеннай гісторыі.

Мсціслаў распачаў гэтую вайну з нагоды адмовы полацкіх князёў даслаць яму дапамогу супраць полаўцаў. Сапраўднай прычынай яе было імкненне паставіць пад кіеўскі кантроль Полацкую зямлю, якая да таго часу заставалася адзінай у рэгіёне дзяржавай, якая не падпала пад уладу Кіева. Больш за тое, верагодная арыентацыя полацкага князя Давыда Усяславіча на чарнігаўскіх Ольгавічаў несла пагрозу ўнутранаму парадку і спакою ў самой Кіеўскай дзяржаве. Момант для нанясення ўдару быў абраны Мсціславам вельмі ўдала. Да сярэдзіны 1128 г. ён поўнасцю кантраляваў большасць валасцей Кіеўскай дзяржавы праз сваіх братоў і сыноў і прыцішыў знешнюю небяспеку з боку полаўцаў. Ненадзейная чарнігаўская сям'я Ольгавічаў была вымушана падтрымліваць з Мсціславам добразычлівыя адносіны. Мэтай

вайны з'яўлялася поўнае падпарадкаванне Полацкай зямлі.

Мсціслаў прытрымліваўся рашучай наступальнай стратэгіі. Для вядзення вайны ім была абрана форма канцэнтрычнага наступлення, выпрабаваная ў вайне яго бацькі супраць Глеба Менскага ў 1116–1117 гг. Стратэгія канцэнтрычнага наступлення складалася з адначасовых удараў па ключавых адміністрацыйных цэнтрах і ўмацаваных пунктах Полаччыны з наступным ударам на саму сталіцу. Такая стратэгія павінна была паралізаваць абарону Полацкай зямлі і пазбавіць яе магчымасці да арганізаванага супраціўлення. У якасці мэтаў для ўдару былі вызначаны Заслаўе, Лагойск, Барысаў, Стрэжаў і Друцк. Выбар гэты сведчыць аб добрым стратэгічным бачанні Мсціслава, бо кожны з пералічаных гарадоў выконваў у абароне Полацкай зямлі пэўную функцыю. У адпаведнасці са значэннем горада былі размеркаваныя і кантынгенты для дзеянняў супраць яго.

На Заслаўе былі накіраваныя войскі аж чатырох князёў: Вячаслава Уладзіміравіча Тураўскага, Андрэя Валынскага, Усеваладкі Гарадзенскага і Вячаслава Яраславіча Клецкага. Высылка такіх значных сіл тлумачылася тым, што пасля падзення Менска ў 1119 г. Заслаўе засталося галоўным памежным пунктам Полацкай зямлі на літоўскім напрамку. Праз яго полацкія князі падтрымлівалі сувязь са сваімі літоўскімі васаламі і атрымлівалі ад іх вайсковыя атрады. Узяцце Заслаўя павінна было адрэзаць Полаччыну ад літоўскай дапамогі і было жыццёва важным для агульнага поспеху кампаніі.

Ізяслаў Мсціславіч, які княжыў у Курску, атрымаў у дадатак да куран кіеўскі полк і быў накіраваны на Лагойск. Лагойск быў ключом да паўднёвых подступаў да Полацка.

Усевалад Ольгавіч Чарнігаўскі і Іван Вайцішыч з торкамі атрымалі заданне наступаць на Стрэжаў праз Барысаў. У такім наступленні не было пільнай ваеннай патрэбы, бо пры ўзяцці Лагойска дарога на Полацк з поўдня была б адкрытай так ці інакш. Але ў Мсціслава не было падстаў асабліва давяраць Ольгавічам, якія здаўна варагавалі з Манамахам і ягонымі сынамі. Старая варожасць Усевалада Ольгавіча да Манамахавічаў і яго саюзныя сувязі з полацкімі князямі маглі прымусіць яго ў ходзе вайны ўдарыць у спіну Мсціславу. Каб не пакідаць у сябе ў тыле патэнцыйнага

ворага, Мсціслаў вымусіў Усевалада таксама рушыць у паход. Кірунак наступлення, вылучаны для Усевалада, быў другасным. Таксама, наступаючы на Барысаў і Стрэжаў, Усевалад аказваўся паміж калонамі, наступаючымі на Заслаўе, Лагойск і Друцк. У выпадку пераходу на бок палачан ён аказваўся разам з імі у жалезных абцугах. Нарэшце, да яго быў далучаны Іван Вайцішыч з торкамі, які мог дапамагчы Усеваладу ў сумесных аперацыях ці выступіць супраць яго ў выпадку здрады.

Смаляне пад камандаваннем Расціслава Мсціславіча наступалі знаёмай дарогай на Друцк – цэнтр воласці, усходнюю цвярдыню Полаччыны, порт на гандлёвым шляху і вотчыну аднаго з адгалінаванняў роду Рагвалодавічаў.

Нарэшце, Усевалад Мсціславіч з наўгародцамі павінен быў нанесці адцягваючы ўдар з поўначы на Неклач, каб прымусіць палачан канчаткова рассеяць сваю ўвагу і раздрабіць сілы.

Сам Мсціслаў застаўся ў Кіеве, каб кіраваць агульным ходам баявых дзеянняў адтуль. Яго ныя паводзіны сведчаць аб разуменні ім функцыі военачальніка, якая заключалася не столькі ў асабістым удзеле ў баі, колькі ў камандаванні войскам. Гэтым Мсціслаў выгодна вылучаўся на фоне іншых князёў, якія на полі бою ператвараліся ў ліхіх рубак, ставячы пад пагрозу кіраванне войскам. Знаходжанне Мсціслава на адлегласці ад тэатра ваенных дзеянняў таксама характарызуе ступень надзейнасці і эфектыўнасці створанай ім сістэмы камандавання. У той час як многія палкаводцы не маглі дабіцца ад сваіх войскаў належнага падпарадкавання пры асабістым кантакце, кіеўскі князь са сталіцы ўпэўнена кіраваў войскамі на далёкай Полаччыне.

Скаардынаваўшы дзеянні наступаючых калон, Мсціслаў прызначыў штурм усіх полацкіх гарадоў на адзін дзень – 11 жніўня 1128 г. Гэтым самым абаронцы пазбаўляліся магчымасці аказваць дапамогу адзін аднаму. Палачане таксама не маглі даслаць дапамогу ўсім сваім валасцям адначасова. Адзіным нязначным адступленнем ад плану сталі дзеянні Ізяслава Мсціславіча Курскага, які напаў на Лагойск на дзень раней. Пазней уласная гарачнасць будзе часта давацца ў знакі Ізяславу, але гэтым разам фартуна яму спрыяла. Яму ўдалося захапіць некаторых лагажан па-за сценамі. Рэшта гара-

джан, пабачыўшы такую бяду, здалася без бою. Пад Лагойскам Ізяслаў захапіў і свайго зяця, мясцовага князя Брачыслава Давыдавіча, які кінуў давераны яму горад і накіраваўся да бацькі, але ад страху спыніўся на паўдарозе.

Праз два дні Ізяслаў накіраваўся на дапамогу войскам, якія стаялі пад Заслаўем, захапіўшы з сабой палонных. У адрозненне ад лагажан заслаўцы ўпарта біліся з абложным войскам, але сілы былі няроўнымі. Пабачыўшы Брачыслава і лагажан, якім захопнікі не зрабілі зла, яны вырашылі здацца Вячаславу Тураўскаму з умовай, што самі яны і іх маёмасць не будуць прызам пераможцаў. Увечары тысяцкі Андрэя Валынскага Вараціслаў і тысяцкі Вячаслава Іванка ўвялі сваіх отракаў у горад. Уранку рэшта вояў пабачыла, што горад ужо заняты мірным чынам і на здабычу разлічваць не варта. Раз'юшаныя ваяры ўварваліся ўнутр сцен і аддалі горад рабунку. Дайшло і да сутычкі з княскімі дружыннікамі, якія спрабавалі захаваць горад ад спусташэння. Нарэшце рабаўнікі дабіліся свайго. Горад быў разрабаваны дашчэнту, а жыхары захоплены ў палон. Паводле археалагічных дадзеных, рабунак суправаджаўся пажарамі і забойствамі.[331] Ад сквапных рук рабаўнікоў удалося ўратаваць толькі майно Брачыслававай жонкі, дачкі Мсціслава. Эпізод гэты выдатна ілюструе ступень дысцыпліны ў сярэднявечным войску, для кіравання якім патрабавалася жалезная воля. Мяккі, прастадушны Вячаслаў і гарачы, неразважлівы Ізяслаў такімі якасцямі не валодалі і аказаліся не на вышыні свайго становішча.

Тым не менш, ваенная мэта была дасягнута. Лагойск і Заслаўе апынуліся ў руках наступаючых войскаў. У гэты ж момант Усевалад Мсціславіч з наўгародцамі з'явіўся ля Неклача. Далейшае супраціўленне было бессэнсоўным, і палачане здаліся ці, як кажа летапісец, «сътъснувшеси».[332] Пра ваенныя дзеянні пад Стрэжавам, Барысавам і Друцкам летапіс нават не паведамляе. Відаць, належнага супраціўлення кіеўская кааліцыя не сустрэла і там. Давыд з сынамі быў выгнаны, а на яго месца пасаджаны паслухмяны Мсціславу Рагвалод Барысавіч.

Вышэйапісаная вайна стала дэманстрацыяй стратэгічнага майстэрства Мсціслава Уладзімравіча, у якім вылуча-

[331] Заяц Ю. А. *Заславль в эпоху феодализма.* С. 114.
[332] Ипатьевская летопись. Ст. 293.

юцца дзве рысы. Па-першае, маючы вялізную перавагу над палачанамі ў жывой сіле і іншых рэсурсах, ён не спакусіўся прамым наступленнем на Полацк, поспех якога быў гарантаваным у любым выпадку, але пры сутыкненні з полацкімі войскамі прывёў бы да значных страт. Замест гэтага Мсціслаў выкарыстаў канцэнтрычнае наступленне, якое цалкам паралізавала абарону Полацкай зямлі, прымусіла палачан раздрабіць свае сілы і дало наступаючым войскам перамогу малой крывёй. Па-другое, арганізацыя такой складанай аперацыі паказала выключны для Сярэднявечча ўзровень кіравання войскамі з боку Мсціслава і дакладную каардынацыю ім дзеянняў паміж калонамі, што дзейнічалі ў розных кірунках. Гэта дазволіла наступаючым войскам дакладна выйсці да прызначаных пунктаў і адначасова пачаць баявыя дзеянні, што стала ключом да поспеху ўсёй кампаніі.

Але не кожная вайна завяршалася малой крывёй. Не кожны ўладар меў пад рукой, як Мсціслаў, вялізныя рэсурсы і спрыяльнае палітычнае становішча. Не кожны мог дазволіць сабе раскошу разгуляць складаную стратэгічную камбінацыю і без вялікага кровапраліцця прыціснуць ворага да сцяны. У многіх выпадках зыход вайны даводзілася вырашаць на полі бою ў прамым сутыкненні двух войскаў. На беларускіх землях не было нястачы ў майстрах тактыкі, здольных умела расставіць войскі на полі бою і нанесці праціўніку сакрушальны ўдар. Адным з такіх майстроў быў менскі князь Валадар Глебавіч, а ягоныя **войны за гегемонію ў Полацкай зямлі ў 1162–1167 гг.** з'яўляюць нам класічныя прыклады тактыкі таго часу.

Валадар браў удзел у барацьбе свайго брата Расціслава з полацкім князем Рагвалодам Барысавічам у 1151–1161 гг., але роля яго нам вядомая недастаткова. У сваіх дзеяннях ён меў значную ступень самастойнасці, бо ў 1159 г. пры заключэнні міру паміж Расціславам і Рагвалодам ён адмовіўся цалаваць крыж. Барацьба менскіх і полацкіх князёў за гегемонію ў Полацкай зямлі рашучага выніку не давала. Рагвалод, які не вылучаўся ваенным талентам, у 1159–1161 гг. тры разы хадзіў на Менск, не дасягнуўшы вялікага поспеху. Але і Расціслаў абмяжоўваўся пасіўнай абаронай Менска і не здолеў павярнуць няўдачы праціўніка сабе на карысць.

Становішча змянілася карэнным чынам з прыходам Ва-

ладара да ўлады. Паход Рагвалода на Меншчыну ў 1162 быў ужо скіраваны супраць Валадара, а не Расціслава. Мэтай ваенных дзеянняў з абодвух бакоў было, як і раней, дасягненне панавання ва ўсёй Полацкай зямлі. Валадар разумеў, што стратэгія пасіўнай абароны была прыдатнай толькі для захавання існуючага становішча і не магла дапамагчы яму дасягнуць сваіх палітычных мэтаў. Для авалодання Полацкай зямлёй ён мусіў пазбавіць палачан магчымасці супраціўляцца, а для гэтага неабходна было нанесці рашучае паражэнне іх войскам. З мэтай дасягнення агульнай перамогі ў вайне Валадар адаптаваў свае метады. Ён імкнуўся перайсці ад пасіўнай да актыўнай абароны, сканцэнтраваць усе наяўныя сілы на вырашальным напрамку і разбіць праціўніка ў генеральнай бітве.

Ягоную стратэгію адрознівалі дзве рысы. Па-першае, набранае ім войска складалася ў большасці з літоўцаў, якія былі ягонымі васаламі альбо саюзнікамі. Гэта дазволіла яму колькасна ўзмацніць свае сілы. Па-другое, Валадар Глебавіч перанёс тэатр ваенных дзеянняў у іншае месца. Ад наступаючых войскаў Рагвалода ён абараняўся не ў Менску, а ў Гарадцы, які, верагодна, знаходзіўся на заходніх рубяжах Меншчыны. Такі ход, па-першае, наблізіў Валадара да Літвы як крыніцы сваёй вайсковай сілы і, па-другое, пазбавіў палачан перавагі вядзення вайны ў знаёмай мясцовасці. Мясцовасць вакол Менска яны за некалькі гадоў вайны паспелі вывучыць ужо не горай за саміх мянян, мясцовасць жа вакол Гарадца, як паказалі наступныя падзеі, не ведалі зусім.

З тактычнага пункту гледжання Валадар ужыў прыёмы, якія выгодна адрознівалі ягоныя дзеянні ад пасіўных метадаў Расціслава. Маючы ў сваім распараджэнні літоўцаў, Валадар патрапіў зразумець перавагі іх ірэгулярнай тактыкі нечаканых нападзенняў і засад. Ён усвядоміў, наколькі добра такая тактыка стасуецца да актыўнай абароны ўмацаванняў, і адседжвацца ў сценах не збіраўся.

У такіх умовах **у 1162 г. адбылася бітва пад Гарадцом**. Калі Рагвалод аблажыў Гарадзец, Валадар напоўніцу скарыстаў свае рэсурсы. Не абмяжоўваючыся абаронай умацаванняў, ён сам зрабіў нечаканую вылазку з літоўцамі па начной цемры: «Володарь же не да ему полку въ дне, но ночь выступи на нь из города с Литвою». Нечаканасць нападзен-

ня вырашыла зыход усёй справы: палачане былі дашчэнту разбітыя. Незнаёмая ж мясцовасць пазбавіла іх нават шанцаў арганізавана адступіць. «И много зла створися в ту ночь: онехъ избиша, а другыя руками изоимаша множьство паче избьеных».[333] Перавага Валадара была настолькі вялікай, што колькасць палоненых перавысіла колькасць забітых. Рагвалод пасля паражэння не наважыўся вяртацца ў Полацк і прыбыў у свае спадчынныя ўладанні ў Друцк. Полацкім князем быў абраны Усяслаў Васількавіч.

Менскі князь дасягнуў сваёй першачарговай мэты: Меншчына была пазбаўлена ад штогадовых нашэсцяў полацкіх войскаў. Наступнай мэтай была барацьба непасрэдна за полацкі стол. Глебавіч не рушыў на Полацк неадкладна. Наступальныя дзеянні былі ім прадпрынятыя толькі праз пяць гадоў. Разбіць войска палачан на сваёй тэрыторыі было нашмат прасцей, чым авалодаць добра ўмацаваным Полацкам. Таму паход патрабаваў доўгага і руплівага збору сіл і падрыхтоўкі.

У 1167 г. Валадар выступіў «ратью» на Полацк. Стратэгічная ініцыятыва была ў ягоных руках. Ад актыўнай абароны ён перайшоў да контрнаступлення. Усяслаў Васількавіч з палачанамі рушыў яму насустрач. **Бітва пад Полацкам** паказала поўную перавагу тактычнага майстэрства Валадара. Як кажа летапіс, «Володарь же оуведавъ оже идуть противу ему, не да ему съвъкупитися и вдари по них изнезапы». Паведамленне гэтае паказвае, што менскі князь меў дакладную інфармацыю аб руху сваіх праціўнікаў, тады як яны самі знаходзіліся ў фатальным няведанні. Да поля бою полацкія войскі рухаліся па-асобку. Відаць, апалчэнне і Усяславава дружына сувязі паміж сабой не мелі. Нечаканасць нападу мянян кажа аб тым, што і варта належным чынам арганізаваная не была. Вынікам атакі было поўнае паражэнне палачан. «И много ихъ изби, а инехъ руками изоимаша».[334] Перамога на полі бою дазволіла Валадару заняць Полацк і дабіцца фармальнага прызнання сябе полацкім князем. Усяслаў уцёк у Віцебск да Давыда.

Вайна за Полаччыну для Валадара не была скончанай, пакуль на Віцебшчыне сядзелі праціўнікі. Марудзіць было

[333] Ипатьевская летопись. Ст. 519.
[334] Тамсама. Ст. 526.

нельга, і Валадар выступіў на Віцебск. Але наяўныя сілы не адпавядалі пастаўленым задачам, бо супраць Валадара была ўся моц Смаленскай зямлі. Супрацьпаставіць такой магутнасці ён мог адно свае ваенныя таленты ды баявы досвед войскаў, чаго было відавочна недастаткова.

Процістаянне Валадара і Усяслава з Давыдам пад Віцебскам першапачаткова звялося да перастрэлкі цераз раку. Валадар, відаць, не наважваўся дзейнічаць наступальна з увагі на недастатковыя сілы, але і Усяслаў з Давыдам асцярожнічалі і хацелі дачакацца Рамана Расціславіча Смаленскага з падмацаваннямі. Раманава дапамога не спатрэбілася. Уначы пачалася страшэнная бура з моцнымі перунамі, якая зруйнавала баявы дух мянян. Забабонныя ваяры настойліва параілі свайму князю адступаць, каб не даводзіць справу да бітвы з аб'яднанымі сіламі віцьбічаў і смалян, што Валадар і зрабіў. Ягоныя камандныя здольнасці таксама далі асечку, бо арганізавана адступіць не ўдалося. Адступленне ператварылася ў панічныя ўцёкі. Давыд выслаў пагоню, якая многіх мянян пабрала ў палон голымі рукамі.[335] Цяпер яны ўжо на сабе зведалі цяжкасці руху па незнаёмай лясістай мясцовасці ўначы. Пасля такога паражэння прэтэндаваць на ўладу ў Полацку Валадар не мог. Тамтэйшым князем застаўся Усяслаў Васількавіч. Ваяўнічаму Глебавічу давялося задаволіцца спадчынным менскім княжаннем.

Зыход полацка-менскай вайны быў вельмі тыповым для XII ст. Нягледзячы на ваеннае майстэрства Валадара, шлях да поўнай перамогі яму перакрыў недахоп людской сілы і іншых рэсурсаў для вядзення вайны, а таксама агульная нестабільнасць сістэмы міждзяржаўных адносін, пры якой любы прэтэндэнт на гегмонію ў рэгіёне непазбежна збіраў супраць сябе кааліцыю князёў, якія хацелі захаваць існуючае становішча. Не дабіўшыся гегемоніі над Полаччынай, Валадар усё ж дасягнуў адноснай небяспекі самога Менскага княства. Калі меркаваць па звестках летапісаў (ці іх маўчанні), тэрыторыя Меншчыны на працягу доўгага часу не была мэтай варожых нашэсцяў ці тэатрам ваенных дзеянняў.

Цікавы ўзор развіцця тактыкі на беларускіх землях у XII ст. дэманструе **бітва пад Віцебскам, якая адбылася ў**

335 Ипатьевская летопись. Ст. 527.

**1196 г**. У барацьбе за Віцебск, які да таго часу ізноў адышоў да Смаленскай зямлі, злучаныя чарнігаўскія і полацкія войскі спустошылі віцебскую воласць. Даведаўшыся аб гэтым, Давыд Расціславіч Смаленскі выслаў супраць іх войскі пад камандаваннем свайго пляменніка Мсціслава Раманавіча, Расціслава Уладзіміравіча і зяця Глеба Разанскага.

12 сакавіка 1196 г. праціўнікі выстраіліся на полі бою. Баявыя парадкі кожнага боку складаліся з двух крылаў. Мяркуючы па дынамічнасці бою, значную частку абодвух войскаў складала конніца. Чарнігаўцы пад камандаваннем Алега Святаславіча «изнарядивше полкы своя, и сташа противоу имъ, и отоптавшеся во снегоу, бе бо снегъ великъ». Гэтая акалічнасць добра паказвае спосабы вядзення бою цяжкой дружыннай конніцай. Каб належным чынам аказаць націск на праціўніка, коннікам патрабавалася роўная мясцовасць і спрыяльнае надвор'е. Узімку і ранняй вясной прамерзлая зямля добра трымала конніцу, але снег ёй перашкаджаў. Насупраць чарнігаўцаў хутка пастроіліся смаляне Мсціслава. Расціслаў, які вёў дружыну самога Давыда Расціславіча, і Глеб Разанскі таксама сталі на гэтым крыле. На іншым крыле супраць палачан пад камандаваннем князя Васількі пастроілася смаленскае земскае апалчэнне на чале з тысяцкім Міхалкам.

Зместам **першага этапу бою** стала атака Мсціслававa крыла смаленскіх войскаў супраць чарнігаўцаў. Мсціслаў «изрядивше полковъ своихъ, наборзе оустремишася на нихъ, и поткоша къ нимъ, и сшибошася со Ольговым полкомъ, и стяги Ольговы потопташа, и сына его Давыда исекоша».[336] Адкінуўшы чарнігаўцаў, смаляне заняліся іх праследаваннем. Для чарнігаўска-полацкага войска наступіў крызіс бою.

**Другі этап бою** распачалі таксама смаляне. Другое іх крыло атакавала палачан, але не даехаўшы да полацкай баявой лініі, павярнула ўбок і пакінула поле бою. Прычынай гэтага можна лічыць незадаволенасць смалян Давыдам Расціславічам, які бясконца ўцягваў іх у міжусобныя войны. Пасля бітвы палонныя смаляне пацвердзілі гэта, расказаўшы чарнігаўцам аб сваёй варожасці з князем.

Без бою застаўшыся гаспадарамі на полі, палачане ў ходзе

---

[336] Ипатьевская летопись. Ст. 691.

**трэцяга этапу бою** разважылі, што поспех не можа лічыцца дасягнутым, пакуль ім пагражае пераможнае крыло смалян. Яны не сталі праследаваць смаленскіх апалчэнцаў, а нанеслі ўдар у тыл Мсціслававу палку «и потопташа и». Сам Мсціслаў, захапіўшыся праследаваннем, забег далёка наперад і арганізаваць супраціўленне ўжо не мог. Больш за тое, «мневъ, яко уже победивъ Ольга», «въеха въ ратныя, и познавше Полчане яша и».[337] Расціслаў з Глебам, вярнуўшыся з праследавання, пабачылі паражэнне свайго крыла і разам з рэштай войска ўцяклі ў Смаленск. Бітва скончылася рашучай перамогай палачан. Неўзабаве на поле бою вярнуўся Алег Святаславіч. Ён выпрасіў у Барыса Друцкага палоннага Мсціслава і адправіў яго ў Чарнігаў. Алег неадкладна сабраўся выступіць на Смаленск, заклікаўшы далучыцца ўсіх чарнігаўскіх князёў. Давыд Смаленскі апынуўся на мяжы ваеннай катастрофы, але быў уратаваны заступніцтвам свайго брата Рурыка, які пагразіў наступленнем на Чарнігаў. Буйны тактычны поспех ізноў не прывёў пераможцаў да жаданых палітычных вынікаў па прычыне агульнага палітычнага беспарадку.

Віцебская бітва з'явіла асноўныя характэрныя рысы тактыкі XII ст. Асноўнай ударнай сілай на полі бою была цяжкая дружынная конніца, якая дзейнічала наступальна. Бой адбываўся вельмі дынамічна і хуткаплынна. Пераможцамі сталі палачане, якія не абмежаваліся адкідваннем і праследаваннем працілеглага ім крыла, а скарысталі сваю конніцу для імгненнага ўдару ў тыл іншаму крылу варожага войска. Наадварот, смаленскі камандуючы Мсціслаў Раманавіч дапусціў памылку, захапіўшыся праследаваннем разбітых ім чарнігаўцаў. Таксама ў ходзе праследавання ён не здолеў падтрымаць парадак на сваім крыле, у выніку чаго яно моцна расцягнулася ў глыбіню, а сам камандуючы аказаўся ад задняга краю настолькі далёка, што пры ўдары палачан яму ў тыл войскамі фактычна ўжо не кіраваў. Ненадзейнасць асобных частак войска таксама была тыповай для таго часу з'явай.

Ваеннае майстэрства XII ст., нягледзячы на незаслужана нізкую рэпутацыю сярод пазнейшых ваенных гісторыкаў,

---

337 Ипатьевская летопись. Ст. 692.

зрабіла крок наперад у параўнанні з папярэднімі часамі. Вылучэнне дружыны ў адмысловы вайсковы слой і яе паступовая феадалізацыя вялі да ўдасканалення ваеннай справы. Зыход бітваў вырашаўся складанымі тактычнымі манеўрамі пры цесным узаемадзеянні падзеленых паводле ўзбраення груп вояроў пры асаблівай ролі цяжкай дружыннай конніцы. Пры спрыяльных абставінах палкаводцы XII ст. маглі ажыццяўляць і складаныя стратэгічныя планы, якія дапамагалі ім дасягаць перамог малой крывёй. Прычынай недаацэненасці тагачаснага ваеннага майстэрства стала палітычнае становішча, якое характарызавалася драбленнем беларускіх земляў на варожыя адно аднаму княствы і валасці і рабіла немагчымым пераўтварэнне ваенных поспехаў у сталыя палітычныя вынікі. Развіццё ваеннага майстэрства залежала ад пераадолення палітычнага крызісу.

# Заканчэнне

Вось і надышоў час развітацца з нашымі героямі і іх подзвігамі. Кінем на іх апошні позірк, каб захаваць іх адбітак у памяці. А перад тым яшчэ раз падумаем, якой мэце служыць апісанне мінулых падзей. Некаторыя могуць успрымаць гісторыю як прыемную і цікавую рэч, якая дапамагае з асалодай бавіць час. Натуры, больш схільныя да захапленняў, паставяцца да гісторыі як да збору старажытнасцяў, з якіх цікава складаць памятныя калекцыі. Калі і да гэтага даследавання паставяцца такім чынам, аўтар успрыме гэта з прыязнасцю і разуменнем.

Найбольшую ж радасць аўтару даставяць тыя, хто перагорне апошнюю старонку кнігі з усведамленнем авалодання ведамі, прыдатнымі і карыснымі ў штодзённай жыццёвай сітуацыі і ў разуменні падзей вялікага маштабу. Як развіццё прыроды на працягу тысячагоддзяў адбываецца па тых самых законах, так і рух чалавечай супольнасці на працягу ўсёй яе гісторыі накіроўваецца па тых самых шляхах, мяняючы толькі формы. Таму веданне мінуўшчыны дае нам у рукі ключ для разумення цяперашняга і прагназавання будучага часу. Як мудра зазначыў Палібій, «з двух шляхоў для выпраўлення, якія існуюць для ўсіх людзей, уласныя нягоды ці чужыя, першы шлях, уласныя нягоды, больш дзейсны, затое другі, нягоды чужыя, менш шкодны». «Ніколі не варта добраахвотна абіраць першы шлях, бо дадзены ім урок купляецца цяжкімі стратамі і небяспекамі; наадварот, мы заўсёды мусім ісці другім шляхам, бо ён дае нам магчымасць навучыцца без шкоды для нас. Хто зразумее гэта, той мусіць прызнацца, што лепшай школай правільнага жыцця служыць нам досвед, здабыты з праўдзівай гісторыі падзей. Бо толькі яна без шкоды для нас робіць людзей беспамылковымі суддзямі таго, што з'яўляецца лепшым ва ўсялякі час і ва ўсялякім становішчы».[1] Па гэтых прычынах і мы пішам не так дзеля забавы ці цікаўнасці, як дзеля навучання. І апошні погляд на нашы падзеі мусіць мінуць усё

---

[1] Полибий. *Всеобщая история*. (Polib.). Москва, 2004. I, 35. С. 52.

маланачнае і другаснае і захаваць толькі важнае, павучальнае і карыснае.

Звернемся яшчэ раз да сутнасці вайны, якая ёсць пачатак і нарожны элемент нашага даследавання. Ва ўводзінах мы падрабязна разважалі на гэты конт і прыйшлі да дакладнага азначэння вайны, зрабіўшы гэта, аднак, тэарэтычным шляхам. Цяпер, акінуўшы позіркам сотні год і мноства падзей ваеннай гісторыі беларускіх земляў, асэнсаваўшы іх прычыны, ход і вынікі, мы можам пацвердзіць нашыя высновы сведчаннямі і доказамі.

Па нашым меркаванні, вайна ёсць вынік імкнення дзяржаў, дзяржаўных фармаванняў і іх частак вырашаць узніклыя канфлікты з дапамогай узброенай сілы. Палітычная арганізацыя з'яўляецца натуральнай формай арганізацыі чалавечага грамадства і на высокім узроўні нясе на сабе адбітак праяваў асабістай чалавечай прыроды. Канфлікт, што зараджаецца ўжо на ўзроўні міжасабовых адносін паміж людзьмі і вынікае з іх імкнення вырашаць спрэчкі з дапамогай гвалту, на ўзроўні палітычнай арганізацыі мас людзей набывае форму вайны. Вайна не можа цалкам залежаць ад жаданняў асобных людзей. Яна не з'яўляецца праявай суб'ектыўных фактараў і выпадковым злом. Як ні сумна гэта гучыць, вайна ёсць неад'емны чыннік гісторыі чалавецтва. Ніводны з даследаваных намі перыядаў гісторыі беларускіх земляў не абышоўся без вялікай колькасці ўзброеных сутыкненняў. Ад першапачатковых хаатычных сутычак паміж балцкімі тубыльцамі і славянскімі каланістамі да нарманскіх паходаў на Візантыю і Каспій, войнаў паміж Полацкім княствам і Кіеўскай дзяржавай і княскіх міжусобіц XII ст. вайна неадступна прысутнічала на даляглядзе падзей.

Вайна была вынікам чалавечай недасканаласці. Яна была непазбежным злом, якое часта набывала самадастатковы і непадкантрольны чалавеку характар. Усё ж яе разбуральная сіла, будучы справай чалавечых рук, магла і павінна была людзьмі кантралявацца. У ходзе гістарычнага развіцця беларускіх земляў ваенная моц выкарыстоўвалася грамадствамі па-першае, для замацавання свайго міжнароднага становішча і ўрэгулявання адносін з суседзямі. Па-другое, ваенная моц была дарэчы пры ўнутраным уладкаванні саміх грамадстваў.

Знешняе выкарыстанне ваеннай моцы зводзілася да дасягнення і забеспячэння магутнасці аднаго грамадства адносна іншых. Найменшым прымальным узроўнем уласнай магутнасці было адстойванне права свайго грамадства на існаванне самастойнай палітычнай арганізацыі і ўтварэнне свайго дзяржаўнага фармавання. Максімальна дасяжным узроўнем магутнасці было навязванне сваёй улады іншым. Зыходзячы менавіта з такіх падстаў прышлыя славяне вялі змаганне на беларускіх землях з тутэйшымі балцкімі плямёнамі, што скончылася суіснаваннем і паступовым сінтэзам дзвюх этнічных груп. З мэтай дасягнення найбольшай магутнасці прышлыя нарманскія правадыры і мясцовае славянскае, балцкае і фіна-ўгорскае насельніцтва ў барацьбе з суседзямі ўмацоўвалі дзяржаву ўздоўж гандлёвых шляхоў паміж Балтыкай, Чорным морам і Каспіем, якая дала пачатак цывілізацыі Русі. Адбіўшы пагрозу з боку хазар і іншых стэпавых народаў і засцярогшыся ад нападаў ваяўнічых скандынаваў, яны ў сваю чаргу нанеслі шэраг моцных удараў па Візантыі і прыкаспійскіх краінах, прымусіўшы іх лічыцца з сабой. XI ст. было пікам магутнасці Полацкага княства і Кіеўскай дзяржавы, дзвюх дзяржаў, з якіх і складаўся рэгіён Русі. Полацк і Кіеў пашырылі свой уплыў на суседнія краі шляхам прамых заваяванняў і палітычнага ціску. Полацкія і кіеўскія князі не забыліся высветліць і адносіны паміж сабой у некалькіх войнах. Нарэшце, князі Полацкай, Смаленскай і Тураўскай земляў патрацілі шмат рэсурсаў, каб змяніць на сваю карысць баланс сіл у войнах паміж сабой і іншымі князямі Русі, што пры асобных поспехах паслабіла іх адносна іншых дзяржаў рэгіёну і адкрыла шлях для ўзыходжання Літвы і перамены палітычнага жыцця краю на іншых падставах.

Знешнія канфлікты аказалі моцны ўплыў на ўнутранае ўладкаванне грамадстваў на беларускіх землях. Сутыкненні, якія адбываліся ў ходзе пранікнення славян на тэрыторыі, заселеныя балтамі, вылучылі падтрыманне знешняй і ўнутранай бяспекі грамадства ў якасці асноўных функцый вярхоў грамадства. Асноўным інструментам падтрымання бяспекі была ваенная моц. Адпаведна дружыны і іх правадыры, якія гэтай моцай валодалі, і сталі галоўнымі прэтэндэнтамі на месца верхавіны. Так быў закладзены пад-

мурак улады і дзяржаўнасці. Нарманскія дружыны, валодаючы непараўнальным на свой час ваенным майстэрствам, як нельга лепей былі здольныя да выканання згаданых функцый. Часткова зліўшыся з мясцовымі славянскімі, балцкімі і фіна-угорскімі дружынамі, часткова іх выцесніўшы, яны ператварылі свой уплыў на грамадства ва ўладу, стаўшы ля пачаткаў дзяржаўнасці на беларускіх землях. Іх пераемнікі ў канцы X –XI стст. завяршылі будову дзяржаўных інстытутаў, стварыўшы дзяржаўны апарат і распрацаваўшы заканадаўства. Асновай апарату ізноў сталі ўзброеныя дружыннікі, якія маглі падтрымаць вайсковай сілай выкананне прынятых рашэнняў. Да канца X ст. адносяцца звязаныя з Уладзімірам Святаславічам першыя звесткі аб узброенай барацьбе з унутранай злачыннасцю. Магутным князям XI ст., якія выкарыстоўвалі сваю ваенную моц у інтарэсах большасці грамадства, у XII ст. наследавалі іх эпігоны. Скарыстаўшыся прафесіяналізацыяй ваеннай справы і яе засяроджваннем у руках дружыннікаў, яны ўзяліся весці войны на ўласны страх і рызыку сіламі дружын. Дамагаючыся своекарыслівых мэтаў і пагарджаючы інтарэсамі паспольства, яны падарвалі сацыяльную аснову ўлады і падрыхтавалі перадумовы свайго выцяснення ваяўнічымі літоўскімі князямі.

Як і любая іншая сфера чалавечай дзейнасці, вайна патрабавала ад яе ўдзельнікаў высокага ўзроўню майстэрства. Гісторыя беларускіх земляў не мае нястачы ў яго прыкладах. На працягу стагоддзяў з'яўляліся бліскучыя палкаводцы, здольныя ўзначаліць наяўныя сілы, выкарыстаць іх з найбольшай карысцю і ў складаных абставінах дамагчыся перамогі над ворагам. Сярод іх былі майстры найлепшым чынам падрыхтаваць свае войскі, пастроіць іх на полі бою, змацаваць дух войскаў сваёй асабістай мужнасцю, прадбачыць магчымыя павароты лёсу і адужаць ворага ў прамым баі. Прыгадаем героя баёў пад Вышгарадам Мсціслава Расціславіча Хаграбрага ці мужнага абаронцу Турава Юр'я Яраславіча.

Аддаючы належнае тактычнаму майстэрству, мы мусім памятаць, што мэта вайны зводзіцца да дасягнення палітычных мэтаў узброеным чынам. Таму найвялікшымі знаўцамі ваеннага майстэрства мусім прызнаць тых, хто здольны быў дакладна вызначыць свае мэты і зразумець, якім чынам вядзенне ваенных дзеянняў магло спрыяць іх дасяг-

ненню. Такія палкаводцы бачылі агульную карціну вайны, разлічвалі свае наяўныя рэсурсы і сілы праціўніка, у адпаведнасці з гэтым выпрацоўваючы уласную стратэгію. Кожны элемент стратэгіі выконваў дакладна акрэсленую функцыю, а ўсе яны разам утваралі складаную сістэму, якая была арыентаванай на агульную перамогу і не руйнавалася нават у выпадку асобнага тактычнага паражэння. Такімі мы памятаем людзей, што зведалі сваю долю перамог і паражэнняў на палях бітваў, але заўсёды аказваліся пераможцамі ў фінале і пакідалі нашчадкам трывалую і магутную дзяржаву: Яраслава Уладзіміравіча Кіеўскага, Брачыслава Ізяславіча і Усяслава Брачыславіча Полацкіх, Расціслава Мсціславіча Смаленскага і іншых.

І аддамо належнае тым людзям, якія пакінулі адмысловы крывава-слаўны след у ваеннай гісторыі: Святаславу Ігаравічу Кіеўскаму, Глебу Усяславічу і Валадару Глебавічу Менскім, Яраславу Святаполкавічу Валынскаму і іншым лютым і мужным правадырам. Пры поглядзе на іх здаецца, што ўдзел у вайне быў не толькі іх прафесіяй і грамадскім абавязкам. Да вайны хілілася само іх жорсткае сэрца. Мала хто ўмеў лепш за іх асабіста біцца з ворагам, кіраваць войскам у баі і раскідваць неабсяжныя стратэгічныя замыслы. І ўсё ж ніводны з іх цалкам не дасягнуў сваіх смелых мэтаў, спыніўшыся ад іх у некалькіх кроках. Вядома, іх фінальныя няўдачы можна цалкам абгрунтавана прыпісаць няўдаламу збегу абставін. Разам з тым цяжка пазбавіцца думкі, што менавіта іх нечалавечая магутнасць, непараўнальнае ваеннае майстэрства і прыхільнасць да вайны заводзілі іх занадта далёка і штурхалі ў бой там, дзе мірны шлях мог прывесці да шчаслівейшага выніку. Іх поспехі і няўдачы — яркая старонка ваеннай гісторыі, але агульны вынік іх дзейнасці служыць тэстаментам непрадказальнай ролі вайны, якая не задавольваецца роляй простага інструменту дасягнення палітычных мэтаў, выходзіць з-пад кантролю сваіх завадатараў і губіць іх.

З пункту гледжання развіцця самога ваеннага майстэрства заўважым, што на беларускіх землях паралельна выкарыстоўваліся прамыя і непрамыя метады вядзення вайны. Прамы метад звычайна заключаўся ў канцэнтрацыі ўсіх наяўных сіл на вырашальным напрамку і дасягнення перамогі над праціўнікам у прамым сутыкненні. Непрамыя ме-

тады зводзіліся да выяўлення прыступных месцаў у стане ворага, стварэння пагрозы на некалькіх кірунках адначасова, разбурэння зладжанай сістэмы варожай абароны і, нарэшце, дасягнення перамогі з мінімальнымі стратамі без генеральнай бітвы.

Перамога непрамымі метадамі звычайна ўяўляла сабой найлепшы з практычнага пункту гледжання вынік, але пакідала па сабе малы эмацыйны след. Наадварот, перамога, атрыманая ў выніку крывавага бою, прыносіла страты і пераможнаму войску, але была добрым узорам мужнасці і стойкасці і вяла да вялікага маральнага ўздыму сярод пераможцаў. Наогул, пытанне суадносін практычнага і псіхалагічнага выніку вайны і заплачанай за іх цаны з'яўляецца бязмежна цікавым і можа служыць тэмай асобнага даследавання.

Апошняй дэталлю, якую мы закранем, будзе агульны тон нашага даследавання. Паколькі агульнай мэтай яго з'яўляецца навучанне на досведзе гісторыі, мы стараліся заставацца аб'ектыўнымі і непрадузятымі, асабліва не вылучаючы слаўных і светлых падзей і не хаваючы непрывабных і цёмных. Такая пазіцыя разыходзіцца з узорамі гістарыяграфіі, мэтай якіх з'яўляецца міфалагізацыя гісторыі. Адпаведна, патрабаванні да дзейных асоб гісторыі значна зніжаюцца, а большасць іх дзеянняў трактуюцца як мудрыя і высакародныя. У параўнанні з гэтым наша гісторыя можа падацца занадта прыземленай і дэгераізаванай. Між тым нам здаецца, што такі падыход зможа хутчэй дапамагчы нам ацаніць дасягненні нашых продкаў і пазбегнуць іх памылак. Як трапна адзначыў Палібій, «Таму, хто бярэ на сябе задачу гісторыка,.. неабходна часта ўсхваляць і ўпрыгожваць сваіх ворагаў найвялікшымі пахваламі, калі іх паводзіны таго заслугоўваюць, ганіць і бязлітасна асуджаць сваіх бліжэйшых сяброў, калі таго патрабуюць памылкі ў іх паводзінах». «Як жывая істота робіцца ні да чаго не прыдатнай, калі траціць зрок, так уся гісторыя ператвараецца ў дарэмную балбатню, калі не ўтрымлівае ісціны».[2] Прыслухаемся да гэтых словаў мудрага ахейца і прымем іх на ўзбраенне. Паставімся да нашых продкаў з павагай і разуменнем, але без фальшывага ідэалізавання, і досвед іхні стане нашым неацэнным скарбам.

---
[2] Polib. I, 14. C. 36.

Jahor Novikau

# A Military History of Belarusian Lands Up to the End of 12th Century A.D.

## Volume II


Summary

The sub-period, which started in late 970s and ended in 1101 is called the sub-period of might as Kyivan Rus' achieved the peak of its strength under duke Jarasłaŭ (Yaroslav, 1019–1054) and the breakaway Duchy of Połack rose to power under dukes Bračysłaŭ (Briachislav, 1003–1044) and his son Usiasłaŭ (Vseslav, 1044–1101). Upon consolidating his power in Kyiv Uładzimir waged a number of successful wars. In 983 he defeated Yatvingians and brought them to submission. In 984 his voevode Voŭčy Chvost (Volchy Hvost) defeated Radimiches. In 988 after a successful war with the Byzantine Empire Uładzimir cemented Kyivan Rus' with the adoption of the Orthodox Christianity. Yet the cracks in the state soon started to show. In 1001 Uładzimir was unable to prevent another successful secession of Połack. The rest of Belarusian lands remained under the power of Kyiv. In 1015 Uładzimir died and an incredibly bloody civil war between his sons broke out. The Ruthenian, Polish and German chronicles and Scandinavian sagas present mutually contradicting accounts of those events. One can only be sure that Uładzimir's sons Barys (Boris) and Hleb (Gleb) were dead by 1018. In that year another Uładzimir's son Sviatapołk (Sviatopolk) of Turaŭ with the help of Polish king Boleslaw the Brave defeated Jarasłaŭ at Western Buh River and seized Kyiv. Yet in 1019 he lost a battle at Alta River to Jaras³aŭ and had to go to exile.

Jarasłaŭ remained the master of Kyivan Rus'. His most powerful rival was Bračys³aŭ, the Duke of Połack, who ascended the throne in 1003 and in 1021 seized and plundered Novgorod. Jaras³aŭ defeated Brałysłaŭ at Sudom River but ultimately had to conclude peace with him and concede him some of the disputed territories. Both Ruthenian dukes enjoyed mutually beneficial peace and political union. They used it for the expansion of their duchies into Lithuanian and Yatvingian territories.

Bračysłaŭ occupied the land of Nalša and consolidated his dominance there by founding the fortified town of Brasłau (Braslav). Jarasłaŭ clashed with Yatvingians in 1038 and twice with Lithuanians in 1040 and 1044. His advance into Yatvingian and Lithuanian lands was marked by the foundation of the towns of Vaŭkavysk (Volkovysk) and Navaharodak (Novogrudok).

The struggle against Ruthenian aggression, however, made Lithuanians and Yatvingians consolidate their societies under the authority of dukes. The increased influence of dukes in 11$^{th}$ century is reflected in written sources and confirmed by archaeological data, which point at the massive construction of wooden castles. The family aristocracy seemed to finally lose its grip on the authority. The Lithuanian and Yatvingian societies came very close to the emergence of their statehood.

The deaths of Bračysłaŭ in 1044 and Jarasłaŭ in 1054 marked the end of the union between Połack and Kyiv. Jarasłaŭ's sons Iziasłaŭ (Iziaslav, 1054–1073, 1077–1078), Sviatasłaŭ (Sviatoslav, 1073–1076) and Usievaład (Vsevolod, 1076–1077, 1078–1093), who succeeded him, started their rule with destroying the internal opposition. Sensing an imminent invasion, Bračysłaŭ's son Usiasłaŭ decided to render a pre-emptive blow. In 1066 he seized and plundered Novgorod. In the next year he lost the Battle of Niamiha (Nemiga) to Jarasłaŭ's sons and was briefly imprisoned but then released by insurgent people of Kyiv in 1068. He was expelled from Po$^{3}$ack in 1069 but returned to his throne for good in 1071. Usiasłaŭ once again interfered in Kyivan affairs by supporting the internal opposition in Kyivan Rus' and making a raid on Smalensk in 1078.

When the dust settled, Usiasłaŭ could claim to have achieved his goals. His pre-emptive strikes weakened Kyivan Rus' and neutralized potential threats from that side. That let Usiasłaŭ continue the expansion of Połack into Lithuania and Livonia until his death in 1101. At the same time Kyivan Rus' went through a severe political crisis. By the end of 11$^{th}$ century a shaky balance of power between Iziasłaŭ's son Sviatapołk (Sviatopolk) of Kyiv (1093–1113), Sviatasłaŭ's son Aleh (Oleg) of Chernihiv and Usievaład's son Uładzimir Manamach (Vladimir Monomah) of Pereyaslavl was established. At a congress in Lubech in 1097 the dukes of Kyivan Rus' mutually recognized their hereditary rights on their duchies. This concord became a legislative basis of the disintegration of Kyivan Rus' into a number of independent states.

In 11$^{th}$ century war was a powerful factor of the political evolution of the society. The successors of Uładzimir in both Połack and Kyiv built on his achievements and finished the transformation of the Duchy of Po$^{3}$ack and Kyivan Rus' into full-fledged states. War no longer belonged to heroes and outlaws but instead was institutionalized as an instrument of the state. While their Norse predecessors were busy looting neighbouring lands, the 11$^{th}$ century rulers were relentlessly developing and putting in order their own territories. Offence made way to defence. To provide security and protection from the external enemies, the Dukes of Połack and Kyiv waged defensive wars and built endless lines of border towns and fortresses. They paved new roads and exterminated robbers for the sake of safety on those roads. The members of their warbands and militiamen served as government officials, garrison soldiers and sometimes as a policing force. While the fortresses and roads constituted the infrastructure of the state, the military manned that infrastructure, thus forming the state administration. The emergence of the administration laid the final cornerstone in the foundation of the statehood.

Similarly, the economic impact of war in 11$^{th}$ century could be more attributed to the consistent colonization of newly conquered lands than looting.

The place of war in the spiritual culture and system of values of the Ruthenian society changed, too. Previously, the pagans had viewed war as the natural state of things. Everybody could wage war for power, gain and glory. Warriors had been considered to be akin to the beasts and had been believed to derive their strength from the animal world. Finally, they had not been held responsible for their deeds, no matter good or evil. Blind fate had ruled the life of a pagan warrior, leaving him no choice but follow it and accept his lot with dignity.

When Ruthenians adopted Christianity and shunned their pagan beliefs their views on war changed accordingly. This evolution is best represented in «The Story of Barys and Hleb» and Ruthenian chronicles. First, war was pronounced a necessary evil rather than the natural state of things. Second, starting with Uładzimir only the state represented by duke had the legitimate right to wage wars. Third, in compliance with the Bible war could be waged only to repel enemies, protect the helpless and fight criminals. E.g. Uładzimir for a while hesitated to prosecute

criminals for the fear of sin, but then took the advice from the bishops and started using the military force to fight crime. Fourth, now that a warrior was expected to fight for the right cause he could rely on heavenly support and derive his strength from divine sources. Finally, he was free to make the choice between good and evil and bear all responsibility for it. Faced with the temptation to start the war against his elder brother Sviatapo$^3$k, duke Barys refused to take up arms for an unjust cause, got murdered by Sviatapołk and found salvation as a martyr. On the opposite Sviatapołk was doomed for the eternal torture.

The new Christian ideal of the warrior was personified in the figures of military saints. Exported from the Byzantine Empire was the cult of Demetrius and George, soon joint by Barys and Hleb, sanctified by the Ruthenian clergy. The latter two were closer to martyrs than classic warrior saints, yet to an extent they assumed the functions of the warrior saints, in particular assisting Christian warriors on the battlefield. Christianity therefore set a very high and noble standard for the Ruthenian military elite.

The military organizations of the Duchy of Połack and Kyivan Rus' were developing within the established forms of the warband and the popular militia. Under the command of the duke both parts together constituted the army that was a regular institution of the state. It was aimed at achieving political ends by military means. The warband was a professional military detachment and the core of the whole army. With the development of cavalry the warband became mounted. It also grew in numbers. In 1093 duke Sviatapołk of Kyiv and Turaŭ had 800 otraks ready to fight. Together with dzetskis and senior warband members the warband could number more than 1,000 warriors.

The need for the mobilization of the popular militia lessened and the degree of the militarization of the society decreased compared to the epic Norse times. Accordingly the militia shrank relative to the quantity of population as the economy growth and the subsequent employment drew people away from the military service. Yet it still grossly outnumbered the warband and was battle-worthy quality wise. In cases of emergency Jaras$^3$au would mobilize the militia by sending an arrow around the country. Now some of the militiamen were mounted, too. The number of mobilized militiamen in wars of Kyivan dukes could reach 3,000–5,000. The numbers for the Duchy of Połack were smaller, proportional to the size of the territory and population. The militia

kept its old decimal organization but «tens», «hundreds» and «thousands» now were more of formal categories than real numbers. In fact, the contingent of a town with the adjacent area was referred to as a «thousand». A «hundred» was the contingent of a town district, and a «ten» – that of a street. Although the militia was under the general command of the duke, the direct commanders (voevodes) would more and more often be recruited from the townsfolk and be appointed by the local self-government rather than by the duke himself.

The garrisons of towns were staffed by either warband members or militiamen depending on whether a town was ruled directly by the duke or had a degree of self-government.

Hiring Norse mercenaries still was widely practiced in the first half of 11th century. Jarasłaŭ hired a contingent of 1,000 Norsemen in his struggle for Kyiv. The detachment of Eymund, hired first by Jarasłaŭ and then by Bračysłaŭ of Połack, numbered 600 soldiers.

The dukes of both Kyiv and Po³ack often resorted to using the auxiliary troops of allied and dependent lands. Kyivan dukes often had nomadic Pechenegs and Kumans take part in their campaigns, while the Dukes of Połack turned to Lithuanians and Livonians for help.

The arsenal of Ruthenian warriors gradually evolved. Sword was still the preferred weapon of warbands but the decreased militarization of the society and the decline of Norse presence in Rus' contributed to a less frequent use of swords by militiamen. Militias were predominantly armed with spears and axes. Bow went into decline because of the predominance of close combat. The biggest novelty of protective arms was a long almond-like shield, which originated in Western Europe circa 1000 but was later dubbed Norman. Its emergence is linked to the development of cavalry. The long Norman shield protected a horseman from shoulder to toe and with two fastening belts kept the left hand free to steer the horse.

Many towns and fortresses were still confined to their insular or cape shape. At the same time the urban growth set a task of protecting town suburbs. This situation gave birth to a new compound type of fortification, similar to the compound cape type. The difference was in the fact that with the compound type fortified sites the outer line of walls no longer depended on the landscape. Compound type fortifications were built in Połack,

Smalensk and Viciebsk. So called «round» fortresses adopted from Western Slavs represented an even more drastic departure from the old landscape dependent fortification. They could be built at any location and with their regular round shape provided opportunities for equally dense frontal shooting from any given section of the wall. Round fortresses first emerged in Western Belarusian lands on the border of Rus' with Yatvingians and Lithuanians and then in Turaŭ land. The best known attempt at building a round fortress in Belarusian lands though was an oval shaped Miensk (Minsk) in the Duchy of Połack.

The biggest technology innovations were: internal wooden frame constructions and external stone-work, used to strengthen the earthen wall; and complex gateways.

Massive construction of wooden castles in Lithuania resulted in some impressive examples of fortification, too. E.g. Impiltis hill-fort in addition to mighty walls had an advanced tunnel-like gateway. Some Lithuanian castles like Apuole were designed for long sieges and had specialized water reservoirs.

Despite the progress of fortification, the attack still had a significant advantage over the defence. As the seizure of Miensk in 1084 by Uładzimir Manamach showed even the best fortresses of the time sometimes could not resist a single sudden attack. The role of sudden attacks, however, started decreasing as generals tended to force the garrison of the besieged fortress to surrender by a long blockade.

Direct action still was the prevailing method of strategy. For example, the whole war between Uładzimir's sons in 1015–1019 consisted of a series of head-to-head campaigns with both rivals concentrating all of their forces in one point and trying to defeat each other in the general battle.

At the same time indirect forms of strategy found further development in the wars of the Dukes of Połack against Kyivan Rus'. The Duchy of Połack was the smaller and weaker of the two states. It was under a constant threat from Kyiv and therefore had to wage wars to prevent a potential aggression and keep the existing balance of power or shift it in favour of Połack. With little chance to defeat the Kyivan army in a straight battle, the Dukes of Połack preferred to launch pre-emptive strikes with limited goals. Such a strike would normally be launched against an ill-defended periphery of Kyivan Rus' while Kyivan rulers were busy elsewhere. The seizure of a town and devastation of the adjacent area would undermine

the defensive potential of Kyivan Rus' and be used as an irrefutable negotiating argument. The efficiency of such a strategy was first proven by Bračysłaŭ's successful raid on Novgorod in 1021 and the subsequent favourable peace treaty. Usiasłaŭ repeated his father's success by seizing and plundering Novgorod in 1066 and threatening Smalensk in 1078. Despite a number of tactical defeats, his formidable strategic skill won Usiasłaŭ the reputation of one of the best generals of his time.

Both direct and indirect strategy most often took the shape of an offence rather than a defence. Even the wars of the Dukes of Połack that ultimately had defensive goals were waged in an offensive manner.

Tactics also became more complicated. Instead of the monolithic «wall» a typical battle order of the Połack or Kyivan army would consist of three separate tactical units: centre and two flanks. This battle order was more flexible and better fit for manoeuvring. Each unit could be a mixed formation of cavalry and infantry. Alternately, infantry stayed in the centre while cavalry could be placed on flanks. It could easier protect its flanks or outflank the enemy. In the Battle of Koloksha against Aleh of Chernihiv in 1096 Mstislav of Novgorod used his longer front line to outflank Aleh, attack him in the rear and win the battle. Light cavalry and light infantry were often sent ahead for reconnaissance or to engage the enemy in the battle. Sometimes a separate detachment could be placed in ambush with the purpose of attacking the enemy in the rear. A sudden attack of Norse mercenaries from the ambush helped Jarasłaŭ win the Battle of Lubech in 1015. While the new tactics was potentially more efficient than the previous one, it required a much better control of the army on part of the command. Sometimes that was not the case. One of the reasons of Jarasłaŭ's defeat from Bolesław and Sviatapołk in the Battle of Western Buh in 1018 was the absence of connection and mutual aid between his detachments in the face of a blistering Polish attack.

After a magnificent 11$^{th}$ century, 12$^{th}$ century became a sub-period of constant internal wars. Both the Duchy of Połack and Kyivan Rus' disintegrated into a number of statelets when the dukes of the ruling dynasties had established their hereditary rights on certain lands. Having secured their rear, Ruthenian dukes were quick to go to war with each other. They tried either to gain power and wealth at the expense of each other or take control

over the capital city of the country (respectively Połack or Kyiv) to gain the formal supremacy over the rest. Their vast manors, which by 12th century they had managed to make their private property, delivered them plenty of resources for their military activities. The end result was the state of almost endless war.

The Duchy of Połack was the one to lose most from such a state of affairs. After the death of Usiasłaŭ in 1101 it broke up into a number of independent duchies, Połack and Miensk being the most important of them. After a period of rapprochement with Kyiv in late 11th – early 12th centuries the Dukes of Połack were unfortunate to take a line of confrontation with Kyiv in 1120s. That came in the time when Kyivan Rus' enjoyed its last blaze of glory under Uładzimir Manamach (1113–1125) and his son Mstislav (1125–1132), both skillful politicians and gifted generals. When Davyd of Połack (?–1128) refused to render military assistance to Mstislav against Kumans in 1127, the Kyivan duke responded by occupying Połack twice in 1128 and 1130 and sending some members of the ruling Połack dynasty to exile in Byzantium. In the meantime Miensk fared little better. Hleb of Miensk (1101–1119), the most active of all Po³ack dukes, had conquered Orša (Orsha) and Kopyś before 1104 and seized and plundered Słuck (Slutsk) in 1116. He fought off the coalition of the dukes of Kyiv, Chernihiv and Pereyaslavl in 1104 but in 1117 had to capitulate to Uładzimir Manamach and became his vassal. After one more clash in 1119 he was captured by Manamach and died in Kyiv prison.

Po³ack and Miensk separately restored their independence in 1130s but their revival was interrupted by a war between them in 1151–1167. Hleb's son Rascis³aŭ (Rostislav, 1135–1161) became the Duke of Połack in 1151 dethroning Rahvałod (Rogvolod, 1144–1151, 1158–1162), only to be expelled by the supporters of the latter in 1158. Rascisłaŭ's brother Vaładar (Volodar, 1162–?) called up his Lithuanian vassals and badly defeated Połack troops at Haradziec in 1162 and in 1167 at Dzvina River briefly ascending the Połack throne. Yet his limited resources could not match his military skills. In the same year he was defeated by the troops of the Duchy of Smalensk, who interfered in the war on the side of Połack, and had to return to Miensk. As a result of this «friendly» help Połack lost some of its eastern territories to Smalensk and came under the protectorate of the latter. Połack regained its independence yet again in 1180 and in a series of wars re-

conquered Druck (Drutsk) and Viciebsk (Vitebsk) from Smalensk. Yet by that time Połack hegemony over Lithuania was over and German crusaders supported by Holy See set their sights on Livonia. Po$^3$ack approached 13$^{th}$ century significantly weakened and facing a severe internal crisis.

The military history of Smalensk in 12$^{th}$ century was much more trouble-free than that of Po$^3$ack. While Połack for centuries had to fight for its independence tooth and nail, Smalensk quietly gained it in 1132 after the death of Mstislav of Kyiv when the political unity of Kyivan Rus' disappeared in all but name. Duke Rascisłaŭ (Rostislav, 1125–1167), a son of Mstislav, defined the foreign policy of Smalensk as selective engagement. He preferred to take care of his domestic affairs, interfering in the struggle for Kyiv only when it fitted his agenda, e.g. in 1149, 1151 and 1154. Otherwise he took advantage of others' feuds to carve large pieces out of the territories of Chernihiv in 1127 and Połack in 1165. Rascisłaŭ finally became the Duke of Kyiv in 1159 and before his death in 1167 solidified the positions of his family in Rus' by appointing his sons to govern Ovruch, Vyshgorod and Belgorod, strategically the most important towns around Kyiv.

Rascisłaŭ's sons continued his policy of selective engagement. In 1169 they joined a grand coalition of Ruthenian dukes headed by Andrey of Suzdal against Kyiv and took part in seizing and plundering the city. On the opposite, when the situation changed, they successfully defended Vyshgorod against Andrey in 1173 and later regained Kyiv. Facing a threat from Vsevolod of Chernihiv in 1176 Rascisłaŭ'son Raman (Roman) took it easy and left Kyiv for Smalensk. He perfectly knew that with the military presence of his brothers in Ovruch, Vyshgorod and Belgorod he still had a lot of influence in Kyivan affairs.

The situation somewhat deteriorated in 1180 when Raman died and was succeeded by his brother Davyd (1180–1197). Inflexible and authoritarian Davyd had to cope with the mutinies in his field army in 1185 and in Smalensk in 1186. He dragged his duchy into a number of unnecessary conflicts with Połack and Chernihiv that resulted in a decisive defeat of his army by united Połack and Chernihiv troops at Viciebsk in 1196. Although by the moment of his death one year later Smalensk still kept most of its political and military power, one can argue that Davyd left Smalensk to his successors in a worse shape than he had found it himself.

Of all Ruthenian duchies Turaŭ was the last to gain its independence from the central Kyivan government. The first attempt headed by one of Uładzimir Manamach's sons Viačasłaŭ (Viacheslav) in 1146 was crushed by his nephew Iziaslav of Kyiv. What turned out to be too difficult for a mild and simple-hearted Viačasłaŭ, was feasible for a brave and energetic Jury Jarasłavič (Yury Yaroslavich, a grandson of Sviatapołk Kyiv and Turaŭ and therefore a heir apparent of Turaŭ throne. In 1158 he turned up in town and was overwhelmingly welcome by the local community as a legitimate ruler. He immediately had to withstand a ten-week long siege by a large coalition of Ruthenian duchies. The length of the siege was a record for early mediaeval Rus'. Jury again successfully defended Turaŭ in 1160. In 1162 Rascisłaŭ of Smalensk, who by that time had also become the Duke of Kyiv, finally recognized *de facto* independence of Turaŭ and concluded peace with Jury. Jury and his successors were wise enough not to waste the results of this major diplomatic victory. They cautiously stayed out of major conflicts but were ready to supply necessary military aid to their stronger neighbours whenever those needed it. Even after the break-up of the Duchy of Turaŭ into separate statelets that happened between 1167 and 1174 their rulers managed to keep their relations non-hostile. Turaŭ land would never become a major international force to be reckoned with yet it stayed in peace and relative security amid intestine wars.

For the most part of 12$^{th}$ century Lithuanians and Yatvingians stayed in the shadow of Rus'. Lithuania, being a true vassal of Połack, survived a punitive expedition of Kyivan troops in 1131 immediately following the fall of Połack. Lithuanians even managed to defeat one of Kyivan detachments on its way back. In 1162 Lithuanians fought under the banners of Miensk duke Vaładar and in 1180 participated in the Druck expedition of Po$^{3}$ack dukes. Yatvingians clashed with Jarasłaŭ (Yaroslav), the Duke of Volyn' in 1112 and 1113.

At the same time political and social evolution of Lithuanian and Yatvingian societies led to the emergence of their statehood. Earlier chiefdoms or lands finally gave way to states, which had certain territory and were ruled by dukes in accordance with the customary law. If an increased military activity is any indication of early statehood, as it was the case with the Norsemen, the emergence of Yatvingian statehood could be dated by 1140s when Polish and Ruthenian dukes had to protect Mazovia from

Yatvingian threat. Yatvingian states enjoyed independence right from the outset while Lithuanians had to wait. They broke free from the Dukes of Połack and Miensk in early 1180s. The raid on Pskov in 1183 was the first independent military action of Lithuanian dukes. The raid on Livonia followed in 1184–1185. Then it was Połack's turn. In 1185 Lithuanians defeated Połack army and killed duke Iziasłaŭ (Iziaslav) in the battle. Yet their success was short-lived. In 1191 the Duke of Połack returned favour by raiding Lithuania. Yatvingians were defeated in 1192 by Polish king Bolesław and in 1196 by Volynian duke Raman (Roman).

In view of their limited resources Lithuanians had to abandon their all-out offensive on Rus' and instead switch to the policy of making alliances with selected Ruthenian duchies. Połack, as their former senior, was logically the first choice. In 1198 Lithuanians together with Połack troops plundered Velikiye Luki, which belonged to Novgorod land. Livonian Rhymed Chronicle tells about a joint operation of Lithuanians and Połack troops against Germans at Kokenhûsen in Livonia circa 1200, where both sides suffered heavy losses. Political and military cooperation between Rus' and Lithuania paved way for the subsequent formation of the Grand Duchy of Lithuania.

Just as the wars of 9th–11th centuries contributed to the promotion of capable and popular Ruthenian rulers, the wars of 12th century led to the decline of their epigones and a general political crisis in Rus'. Having secured their hereditary rights, Ruthenian dukes were eager to win more at the expense of each other and therefore easily went to war every now and then. Many clashes were caused by dynastic reasons. By 12th century the ruling dynasties of Rus' were connected by numerous family ties and divided into several blocks in accordance with those. A conflict around a small peripheral town could easily ignite all Ruthenian duchies through these connections. These wars benefited dukes and their closest environment but the rest of the society was not so happy. While dukes where busy fighting, a system of civil self-government emerged behind their backs in major Ruthenian cities. Most often it was headed by civil aristocracy. Popular assemblies (*viečа* or *veche*) wanted to restrain the authoritarian tendencies of dukes and their belligerence. The standoffs between the duke and the assembly caused major rebellions often directed against unnecessary military campaigns. E.g. in 1158 the residents of Połack

revolted against duke Rascisiaŭ after an unsuccessful expedition against Turaŭ. In 1185 Smalensk militia refused to fight against Kumans and forced duke Davyd to return back home.

To compensate for the reluctance of common folk to fight, Ruthenian dukes more and more often had to resort to the help from their vassals and auxiliaries. The Dukes of Połack and Miensk relied mostly on Lithuanians. In the battle of Haradziec between the troops of Połack and Miensk in 1162 the army of Miensk consisted completely of Lithuanians. When Lithuania gained its independence in 1180s, it first became a dangerous enemy of its former seniors and then their ally. In 1198 at Vialikiye Luki and in 1200 at Kokenhûsen Połack and Lithuanian warriors again fought side by side.

It was not long before the growing Lithuanization of the Połack army made the Połack society think that energetic Lithuanian dukes and their brave warriors contributed to the defence and security of Połack much more than Ruthenian ruling families, hopelessly stuck in their dynastic disputes. A real possibility of substitution of the existing elites by Lithuanians became visible. In exchange Połack attracted Lithuanians by its developed economy and trade, rich cultural tradition and elaborate legislation. Some other Ruthenian duchies were to follow the path of Połack. A synthesis of Lithuanian military power and Ruthenian civil tradition was to become the cornerstone of the Grand Duchy of Lithuania.

This process can be roughly compared to the Barbarization of the Roman army in $1^{st}$–$3^{rd}$ centuries A.D. when Barbarians were often promoted to the positions of high commanders and could eventually ascend the imperial throne. When the Roman Empire fell in 476 A.D., the lines of division between Romans and Barbarians had essentially blurred. As a result, the kingdoms of Goths in Italy and Spain and the kingdom of Franks in Gaul combined both Barbarian and Roman traditions.

The economy of Rus' in $12^{th}$ century was debilitated by internal wars just as badly as its political system. Dynastic wars could hardly achieve any meaningful goals yet provided endless opportunities for looting. Some rulers did not hesitate to take advantage of it. Hleb of Miensk was the most known of them. According to some sources, he used his raids on neighbouring lands to capture people and sell them later as slaves. Druck was used as the main river port for slave trade. Hleb then would use

the profits to finance his further military activities. The principle «War pays for war» worked some 500 years before Wallenstein. What went around came around, though. In 1117 Hleb had to capitulate to Kyivan duke Uładzimir Manamach. Druck was taken by storm. Its residents were taken prisoners and forcefully resettled in a newly built town of Zhelni.

The wars of 12th century also contributed to the emergence of certain cultural stereotypes. Ruthenian dukes and their environment put a lot of effort into emphasizing their status of the military elite by developing a chivalrous code of conduct and glorifying it in the literature. The most valued quality was nobleness. Some excellent examples of that were registered in chronicles. When Vsevolod of Pskov, an old enemy of the Dukes of Połack, was expelled in 1138 from his town and had to pass through the Połack territory, duke Vasilka (Vasilko, 1132–1144) of Połack met him on the border and accompanied him all the way to make sure that his unfortunate guest reached his destination safely. Ruthenian dukes also liked to show off their courage, pride and dignity sometimes verging on bravado. Mscisłau of Smalensk in 1173 played a practical joke on his powerful enemy Andrey of Suzdal by cutting off the beard of Andrey's envoy Mikhn and sending him back to his duke.

Yet the chivalry could not disguise two facts. First, Ruthenian dukes demonstrated their noble qualities in the atmosphere of endless wars that badly hurt other layers of society. Second, their courage and pride were often self–indulgent and had such downsides as vanity, selfishness and gratuitous cruelty. For these reasons the attitude of the society towards the princely corporate culture, reflected in the contemporary literature, was ambiguous. On one hand common people appreciated the courage of dukes when it contributed to the struggle against external enemies or protection of the weak. On the other hand they openly condemned dukes for meaningless belligerence. The famous «Lay of Igor's Campaign» splendidly presents this common view of Ruthenian rulers reflecting both their courageous nobleness and selfish vanity. Both images of the Ruthenian dukes that emerged in 12th century, the chivalrous one and the critical one, accompanied them for centuries to come.

The military organization of Belarusian lands in 12th century became quite complex. First, each independent statelet had its own army. Second, as the princely families branched out, the

senior dukes made dukes from junior branches their vassals. In their turn junior dukes could have their own princeling vassals. Every duke from the senior one in Po$^{3}$ack, Smalensk or Turaŭ to a very minor princeling had his own warband. Therefore a united army, called up for a certain campaign, was a loose crowd of separate dukes' warbands ranked in accordance with the hierarchy of vassalage. Skill wise warbands were as professional as ever yet the army of warbands was unreliable because of constant political infighting between seniors and vassals and even allies. Yet as war was becoming less of a state-wide cause and more of a dynastic affair, the dukes had to rely more and more on warbands and less on popular militias. The warband was gradually turning from a battle brotherhood into a feudal troop. The combined number of all warband soldiers of all dukes of Połack land in $12^{th}$ century equalled 3,400–3,500.

Militias shrank even further, compared to $11^{th}$ century, due to a general reluctance of common folk and civil aristocracy to fight. Under the normal circumstances only one of 30 battle-worthy men was subject to mobilization. In case of an extraordinary danger the norm was one of 12. Yet even these modest norms often were not observed and the actual numbers were smaller. Proceeding from these data the total number of men subject to mobilization in Połack land under the normal circumstances was about 2,300 and could reach 5,000–6,000 in case of emergency. The numbers for Smalensk and Turaŭ lands were comparable.

The number of armed Lithuanians who served in Połack army first as vassals and auxiliaries and then as allies constantly grew and by late $12^{th}$ century roughly equalled that of native Połack residents.

The arms in the described time became heavier. The Carolingian sword was replaced with the Romanic or Capetingian one, which was 1.2 metres long, 2 kg heavy and had a long handle and a crossing. Cavalry started using pikes with tetrahedral heads designed for ramming blows. The horseman would clasp the pike tight against his torso with his elbow, using all of his momentum to pierce the enemy. Protective arms followed the trend. Mail-coats became longer and sometimes had long sleeves and hood for head protection. Soldiers also frequently wore lamellar and scaly armours.

Fortification only had moderate innovations. Further spreading of round fortresses and frequent construction of watchtowers

(e.g. in Davyd-haradok and Carkovišča) were the main developments. However, one could argue that Ruthenians had learnt to build decent fortresses already in 11th century. Yet it was in 12th century when they learnt to defend them successfully. Well-organized guard service and sorties that disrupted enemy's activities were the major factors that contributed to the success of defence. One of the factors that helped Jury Jarasłavič to withstand the ten-week long siege of Turaŭ in 1158 was his pacifist propaganda among the enemy troops. The success of defence gave boost to the construction of small private castles like Mscibava (Mstibovo) and Viščyn (Vischin), which now had good chances to withstand sieges.

The art of war of 12th century gained a bad reputation among later military historians, who considered it primitive at best and non-existent at worst. Indeed, the political situation was very unstable and sometimes chaotic. No matter how brilliant a military victory was, it rarely led to meaningful political results. As a result, the rulers seldom set themselves big purposes. Small time political goals led to small time strategy. Wars were often reduced to pirate raids and simple head-to-head clashes. Yet this is only part of the truth. 12th century Ruthenian generals had to act in the situation, where wars were increasingly waged by professionals, who had equal arms and battle training in all Ruthenian duchies. It took a superior strategic thinking and tactical skill to beat an otherwise equal enemy. When generals had decent resources and favourable political situation on their side, they sometimes demonstrated outstanding examples of the art of war, undeservedly forgotten later.

An excellent example of strategic skill was the concentric offensive of Mstislav of Kyiv on Połack land in 1128. He divided his troops into four columns, which had to attack the most important towns around Połack: Zasłaŭje (Zaslavl), Łahojsk (Logoysk), Barysaŭ (Borisov) and Druck. The concentric form of the offensive was supposed to force Davyd, the Duke of Połack, to scatter his forces. The fifth column had to advance on Połack land from north and further divert the attention of defenders. Mstislav himself stayed in Kyiv to coordinate the whole operation. The invading troops attacked their goals simultaneously on August 10–11, 1129 and seized Zasłaŭje and Łahojsk, completely paralyzing the defence of the country. They did not even need to engage in battle with the army of Połack or besiege the capital as

Davyd had to capitulate. Implementation of Mstislav's brilliant plan was possible thanks to his superb control over the advancing armies and precise coordination of their actions.

On the opposite, Smalensk dukes, who had to defend Kyiv from the troops of Suzdal-led coalition in 1173, divided their forces, left Kyiv and locked themselves in nearby Vyshgorod and Belgorod. This time it was the attackers who had to scatter their forces and engage in fruitless sieges of Vyshgorod and Belgorod. After Suzdal troops wasted a lot of time and effort the arrival of reinforcements to the defenders made the attackers retreat in panic.

Sometimes generals would use indirect strategy by posing a threat to civilian targets, thus provoking unrest in enemy's camp and forcing him to surrender. In this way Kyiv-led coalitions including Połack and Smalensk troops gained victory over Chernihiv in 1139 and Halych in 1144.

While the jury on the state of strategy in 12th is still out, the art of tactics was definitely blooming. The growing professionalism of soldiers and their specialization gave generals handy material for building complex combinations on the battlefield. Newly emerged branches of army were now ready to accomplish specialized tasks. The fast-developing cavalry had a special knack for quick manoeuvres. Heavy warband cavalry was the main striking force of the army. Light cavalry and light infantry were used for engaging enemy and cutting off his communication lines. Mid-armed militia infantry still was the basis of the battle order. The battle orders mostly consisted of several tactical units. Cavalry tended to be placed on flanks, while mid-armed infantry stayed in the centre. Sometimes a reserve was detached. At the same time the battles were very dynamic and often irregular. They could start straight off without prior deployment. In this case some of the regular parts of the battle order might have been absent. The new developments put a premium on the skills of the commander and his control over the troops.

The Battle of Viciebsk between Połack and Chernihiv troops on one side and Smalensk troops on the other on March 12, 1196 was a classic example of 12th century tactics. The battle orders of both sides had two wings. On one wing Smalensk heavy cavalry attacked that of Chernihiv, threw it back and started chasing it. In the heat of the chase Smalensk commanders lost control over their soldiers. On the other wing Smalensk militia infantry,

unhappy with the whole war, made a half-hearted attempt to attack Połack troops but then turned to retreat. Połack cavalry led by Duke Vasilka was not carried away by this success but instead of chasing Smalensk militia hit Smalensk victorious cavalry in the rear and smashed it. Smalensk commander Mscisłaŭ (Mstislav) was taken prisoner and the rest of his army had to flee to Smalensk. The battle demonstrated the importance of efficient command and the role of heavy cavalry, whose quick manoeuvre decided the outcome.

Lithuanians and Yatvingians still stuck to irregular forms of tactics yet brought it to perfection. In 1131 Lithuanians defeated a detachment of the Kyivan punitive army with a sudden attack. Yatvingians and Prussians in 1166 defeated the army of Polish king Bolesław the Curly by ambushing it in a swamped area.

Overall, war was a complex phenomenon of Belarusian history in the early mediaeval period. Politically war was a mobilizing factor that catalyzed the emergence of the statehood on Belarusian lands and promoted the ascent of Ruthenian military aristocracy to power. Yet the latter's self-indulgence at war caused the political crisis in Rus' in $12^{th}$ century, left the society searching for help from neighbouring Lithuanians and ultimately led to the demise of Ruthenian rulers. Economically war helped the discovery of new trade routes and initial accumulation of wealth but would often leave previously prospering regions devastated. It contributed to the synthesis of cultures and appearance of stable cultural stereotypes, which glorified courage and patriotism yet condemned unnecessary belligerence and cruelty. Evil or good, war in early mediaeval times defined the paths of evolution for the Belarusian society for centuries to come.

This study of war is neither written just for the sake of it, nor intended for the exclusive use by scholars. It aims to return history to its basic function of providing people with an understanding of reality based on the analysis of the past experience of the humankind. The application of this knowledge may range from figuring out everyday situations to providing blueprint for decision-making by politicians, generals and researchers. Given the tendency of events to repeat in cycles throughout history, the analysis of such an important and persistent matter as war in the past must help to treat it more adequately in the future. This study, as raw and imperfect as it might be, is a step in this direction.

# Бібліяграфія

**Крыніцы**

1. Августин Аврелий. О граде божием. Мн., 2000.
2. Акоминат, Никита. Никиты Хониата История, начинающаяся с царствования Иоанна Комнина. Т. 1. Санкт-Петербург, 1860.
3. Беларускі эпас. Мн., 1959.
4. Бертинские анналы // Латиноязычные источники по истории Древней Руси. Германия. IX – первая половина XII вв. Москва–Ленинград, 1989. С. 7–15.
5. ал-Бируни, Абу-р-Райхан Мухаммед ибн Ахмед. Собрание сведений для познания драгоценностей (Минералогия). Москва, 1963.
6. Былины. Санкт-Петербург, 1999.
7. Бяздоннае багацце. Мн., 1990.
8. «Великая хроника» о Польше, Руси и их соседях. XI–XII вв. Москва, 1987.
9. Галл Аноним. Хроника и деяния князей или правителей польских. Москва, 1961.
10. Голб Н., Прицак О. Хазарско-еврейские документы X века. Москва–Иерусалим, 1997.
11. Древнерусские княжеские уставы XI–XV вв. Москва, 1976.
12. Житие святого Ансгария, написанное Римбертом и еще одним учеником Ансгария // Из ранней истории шведского народа и государства: первые описания и законы. Москва, 1999. С. 21–55.
13. Житье и хоженье Данила, Русьскыя земли игумена // Анталогія даўняй беларускай літаратуры: XI – першая палова XVIII стагоддзя. Мн., 2003. (Далей: Анталогія...). С. 132–138.
14. Ибн Хордадбех. Книга путей и стран. Москва, 1986.
15. Іларыён. Слова пра закон і ласку // Анталогія... С. 18–31.
16. Иоанн Эфесский. О народе славян и об опустошении, которое они произвели во Фракии в третьем году царствования тишайшего Тиверия царя // Свод древнейших письменных известий о славянах. Т. I. Москва, 1994. (Далей: Свод...). С. 276–291.
17. Ипатьевская летопись. Москва, 1998.
18. «История Иудейской войны» Иосифа Флавия: Древнерусский перевод. Том I. Москва, 2004.
19. Кассиодор, Марк. Внешние отношения нового варварского правительства в Италии (начало VI в.). (*Письмо Теодориха Великого к Клодовею, королю франков)* // История средних веков. От падения Западной Римской империи до Карла Великого. (476–768 гг.). Составитель М. М. Стасюлевич. (Далей: История средних веков...).

Москва–Санкт-Петербург, 2001. С. 245–246.
20. Кассиодор, Марк. Общий характер нового варварского правительства в Италии (начало VI в.). (*Из письма Тедодриха Великого к правителю провинции Севериану )* // История средних веков... С. 243–245.
21. Кведлингбургские анналы // Латиноязычные источники по истории Древней Руси. С. 105–106.
22. Киево-Печерский патерик // Древнерусские патерики. Москва, 1999. С. 7–80.
23. Клімент Смаляціч. Послание, написано Климентом митрополитом Руским Фоме Презвутеру, истолковано Афонасиемь Мнихом // Анталогія... С. 32–36.
24. Константин Багрянородный. Об управлении империей. Москва, 1989.
25. Красивая кожа // Джаксон Т. Н. Исландские королевские саги о Восточной Европе (с древнейших времен до 1000 г.). Москва, 1993. С. 76–78.
26. Красивая кожа // Джаксон Т. Н. Исландские королевские саги о Восточной Европе (середина XI – середина XIII вв.). Москва, 2000. С. 165–169.
27. Лаврентьевская летопись. Москва, 2001.
28. Лев Диакон. История. Москва, 1988.
29. Летописец Переяславля-Суздальского, составленный в начале XIII века (между 1214 и 1219 годов). Москва, 1851.
30. Летописный сборник, именуемый Патриаршей или Никоновской летописью. Москва, 2000.
31. Летописный сборник, именуемый Тверской летописью // Рогожский летописец. Тверской сборник. Москва, 2000. С. 215–504.
32. Летопись Рачинского // Полное собрание русских летописей. (ПСРЛ). Т. 35. Москва, 1980. С. 145–172.
33. Ливонская «Старшая» рифмованная хроника // Матузова В. И. Назарова Е. Л. Крестоносцы и Русь. Конец XII в. – 1270 г. Тексты, перевод, комментарий. Москва, 2002. С. 69–71, 193–198, 229–254.
34. Мас"уди о Кавказе // Минорский В. Ф. История Ширвана и Дербенда X–XI вв. Москва, 1963. С. 188–221.
35. Новгородская первая летопись старшего и младшего изводов. Москва, 2000.
36. Новгородская четвертая летопись. Москва, 2000.
37. Орозий короля Альфреда // Матузова В. И. Английские средневековые источники IX–XIII вв. Москва, 1979. С. 13–35.
38. Павел Диакон. История лангобардов // Свод... Т. II. С. 480–501.
39. Патриарх Никифор. Иже во святых отца нашего Никифора, патриарха Константинопольского, сокращенная история, начинающаяся с царствования Маврикия // Свод... Т. II. С. 221–247.
40. Плутарх. Александр // Плутарх. Сравнительные жизнеописания. Москва–Харьков, 1999. С. 884–958.

41. Полибий. Всеобщая история. Москва, 2004.
42. Продолжатель Феофана. Жизнеописания византийских царей. Санкт-Петербург, 1992.
43. Прокопий Кесарийский. Война с готами. Москва, 1996.
44. Пространная Русская Правда (по Троицкому списку второй половины XIV в.) // Тихомиров. М. Н. Пособие для изучения Русской Правды. Москва, 1953. С. 87–112.
45. Прядь об Эймунде Хрингссоне // Джаксон Т. Н. Исландские королевские саги о Восточной Европе (первая треть XI в.). Москва, 1994. С. 104–119.
46. Псамафийская хроника // Две византийские хроники X века. Москва, 1959. С. 27–81.
47. Псковская 3-я летопись // Псковские летописи. Выпуск второй. Москва, 2000. С. 70–77.
48. Путешествие Ибн Фадлана на Волгу. Москва–Ленинград, 1939.
49. Сага об Олаве сыне Трюггви // Стурлусон, Снорри. Круг Земной. Москва, 1980. С. 97–167.
50. Сага о гутах // Джаксон Т. Н. Исландские королевские саги о Восточной Европе (с древнейших времен до 1000 г.). С. 242–243.
51. Сага о Кнютлингах // Джаксон Т. Н. Исландские королевские саги о Восточной Европе (середина XI – середина XIII вв.). С. 231–243.
52. Сага о Харальде Прекрасноволосом // Стурлусон, Снорри. Круг Земной. С. 42–67.
53. Сальвиан. Рассуждение современника-очевидца о причинах падения Западной Римской империи (около 450 г.) // История средних веков... С. 68–74.
54. Сапунов А. П. Сказания исландских, или скандинавских, саг о Полоцке, князьях полоцких и р. Западной Двине // Полоцко–Витебская старина. Вып. III. Витебск, 1916. С. 1 – 34.
55. Сидоний Аполлинарий. Двор вестготских королей в Галлии. *(Из переписки современников)* // История средних веков... С. 404–408.
56. Симеоновская летопись // ПСРЛ. Т. XVIII. Санкт-Петербург, 1913.
57. Слово о пълку Игореве, Игоря, сына Святъславля, внука Ольгова // Анталогія... С. 166–175.
58. Старшая Эдда // Западноевропейский эпос. Санкт-Петербург, 2002. С. 5–330.
59. «Стратегикон» Маврикия // Свод... Т. I. С. 364–393.
60. Съказание и страсть и похвала святюю мученику Бориса и Глеба // Анталогія... С. 69–83.
61. Тацит, Публий Корнелий. О происхождении германцев и местоположении Германии // Тацит, Публий Корнелий. Анналы. Малые произведения. История. Москва, 2003. С. 458–483.
62. Устюжский летописный свод. Москва–Ленинград, 1950.
63. Феофилакт Симокатта. История. Москва, 1996.

64. Фукидид. История. Москва, 1999.
65. «Хроника Ливонии» Генриха // Матузова В. И. Назарова Е. Л. Крестоносцы и Русь. С. 49–57, 77–141.
66. Хроника магистра Винцентия Кадлубка // Щавелева Н. И. Польские латиноязычные средневековые источники. Москва, 1990. С. 86–112.
67. Хроника Титмара Мерзебургского // Латиноязычные источники по истории Древней Руси. С. 64–69.
68. Хроника Фредегара // Свод... Т. II. С. 364–397.
69. Цезарь, Гай Юлий. Галльская война // Записки Юлия Цезаря и его продолжателей о Галльской войне, о Гражданской войне, об Александрийской войне, об Африканской войне. Москва, 1999. (Далей: Записки...). С. 7–201.
70. Цезарь, Гай Юлий. Гражданская война // Записки... С. 202–326.
71. Чудеса св. Димитрия Солунского // Свод... Т. II. Москва, 1995. С. 91–211.
72. Saxo Grammaticus. The Danish History. Books I – IX // Site «The Online Medieval & Classical Library»; http://sunsite.berkeley.edu/OMACL/ - At: http://sunsite.berkeley.edu/OMACL/DanishHistory/ - 09.01.2004.
73. Stryjkowski M. Kronika Polska, Litewska, Żmódska i wszystkiéj Rusi. Warszawa, 1846. Tom I.

**Доследы**

1. Алексеев Л. В. Полоцкая земля. Очерки истории Северной Белоруссии в IX–XIII вв. Москва, 1966.
2. Алексеев Л. В. Смоленская земля в IX–XIII вв.: Очерки истории Смоленщины и Восточной Белоруссии. Москва, 1980.
3. Алексеев С. В. Славянская Европа V–VI веков. Москва, 2005.
4. Алиев С. М. О датировке набега русов, упомянутых Ибн Исфандийаром и Амоли // Восточные источники по истории народов Юго-Восточной и Центральной Европы. Т. 2. Москва, 1969. С. 316–321.
5. Арбман Х. Викинги. Санкт-Петербург, 2003.
6. Артамонов М. И. Воевода Свенельд // Культура Древней Руси. Москва, 1966. С. 30–35.
7. Артамонов М. И. История хазар. Санкт-Петербург, 2002.
8. Археалогія Беларусі. Т. 2. Мн., 1999. Т. 3. Мн., 2000.
9. Археалогія і нумізматыка Беларусі. Энцыклапедыя. Мн., 1993.
10. Баранаўскас Т. Вытокі Літоўскай дзяржавы. // Край=Kraj. Polonica – Albaruthenica – Lithuanica. 1-2 (4-5). Мн., 2002. С. 104–122.
11. Бацюкоў А. Самы старадаўні меч // Наша Ніва. № 36 (394), 1 кастрычніка 2004. Мінск. С. 5.

12. Бохан Ю. Зброя Вялікага княства Літоўскага 1385–1576. Мн., 2003.
13. Гісторыя Беларусі. Т. 1. Мн., 2000.
14. Голубовский П. В. История Смоленской земли. Киев, 1896.
15. Горемыкина В. И. К проблеме истории докапиталистических обществ. (На материале Древней Руси). Мн., 1970.
16. Горский А. А. Древнерусская дружина. Москва, 1989.
17. Губанов И. Б. X век на пути к раннему государству (Возникновение Древней Руси – о гипотетическом и очевидном в современном норманизме) // Скандинавские чтения 2000 года: Этнографические и культурно-исторические аспекты. Санкт-Петербург, 2002. С. 75–90.
18. Гуревич А. Я. Походы викингов. Москва, 1966.
19. Данилевич В. Е. Очерк истории Полоцкой земли до конца XIV столетия. Киев, 1896.
20. Данилевский И. Н. Древняя Русь глазами современников и потомков (IX–XII вв.). Москва, 2001.
21. Дельбрюк Г. История военного искусства. Т. 2. Санкт-Петербург, 1994. Т. 3. Санкт-Петербург, 1996.
22. Джонс, Г. Викинги: Потомки Тора и Одина. Москва, 2003.
23. Довженок В.Й. Військова справа в Київській Руси. Наук.-попул. нарис. Київ, 1950.
24. Довнар-Запольский М. Очерк истории Кривичской и Дреговичской земель до конца XII столетия. Киев, 1891.
25. Доўнар А. «Масты ў паўтара пруты». Нарыс з гісторыі дарожных камунікацыяў Беларусі XVI–XVIII стст. // Спадчына. №2–3/2003 (152). Мн., 2003. С. 63–69.
26. Дучыц Л. У. Браслаўскае Паазер'е ў IX–XIV стст. Гісторыка-археалагічны нарыс. Мн., 1991.
27. Ермаловіч М. І. Старажытная Беларусь. Полацкі і Новагародскі перыяды. Мн., 2001.
28. Живописная Россия. Отечество наше в его земельном, историческом, племенном, экономическом и бытовом значении. Т. 3. Литовское и Белорусское Полесье. Репринтное воспроизведение издания 1882 года. Мн., 1993.
29. Загорульский Э. М. Вищинский замок XII–XIII вв. Мн., 2004.
30. Загорульский Э. М. Возникновение Минска. Мн., 1982.
31. Загорульский Э. М. Генеалогия полоцких князей Изяславичей. Мн., 1994.
32. Заяц Ю. А. Заславль в эпоху феодализма. Мн., 1995.
33. Заяц Ю. А. Полоцкие события «Саги об Эймунде» // Полоцкий летописец. № 1 (2). Полоцк, 1993. С. 5–11.
34. Зверуго Я. Г. Верхнее Понеманье в IX–XIII вв. Мн., 1989.
35. Зинкявичюс З. Восточная Литва в прошлом и настоящем. Вильнюс, 1996.

36. Иллюстрированная хронология истории Беларуси. Мн., 2002.
37. Іоў А. В. Этнічны склад насельніцтва Заходняга Палесся ў X–XIII стст. (па матэрыялах сельскіх паселішчаў) // Старонкі гісторыі Беларусі. Мн., 1992. С. 25–36.
38. История Литовской ССР. Вильнюс, 1978.
39. Казакявичюс В. К. Оружие балтских племен II–VII веков на территории Литвы. Вильнюс, 1988.
40. Каинов С. Скандинавские наемники на Руси (конец IX – середина XI веков) // Сайт «Библиотека Ассоциации Гардарика»; http://arc.novgorod.ru/ - Па адрасе: http://arc.novgorod.ru/asgard/libri.php3?cont=_sk - 09.01.2004.
41. Кардини Ф. Истоки средневекового рыцарства. Москва, 1987.
42. Каробушкіна Т. М. Насельніцтва Беларускага Пабужжа, X–XIII стст. Мн., 1999.
43. Квятковская А. В. Ятвяжские могильники Беларуси (к. XI–XVIII вв.). Вильнюс, 1998.
44. Кирпичников А. Н. Великий Волжский путь: государства, главные партнеры, торговые маршруты // Скандинавские чтения 2000 года. С. 7–17.
45. Кирпичников А. Н. Вооружение воинов Киевской державы в свете русско-скандинавских контактов // Скандинавский сборник. Вып. 22. Таллин, 1977. С. 159–173.
46. Кирпичников А. Н. Древнерусское оружие. Вып. 1. Ленинград, 1966. Вып. 2. Ленинград, 1966. Вып. 3. Ленинград, 1971.
47. Кирпичников А. Н. О начале производства мечей на Руси // Труды VI Международного Конгресса славянской археологии. Т. 4. Москва, 1998. С. 246–251.
48. Кирпичников А. Н. Снаряжение всадника и верхового коня на Руси IX–XIII вв. Ленинград, 1973.
49. Кирпичников А. Н., Дубов И. В., Лебедев Г. С. Русь и варяги (русско-скандинавские отношения домонгольского времени) // Славяне и скандинавы. Москва, 1986. С. 189–297.
50. Клаузевиц К. О войне. Москва, 1997.
51. Козленко А. В. Военная история античности: полководцы, битвы, оружие. Мн., 2001.
52. Коновалов Ю. В. Русско-скандинавские связи середины IX – середины XI вв. // Историческая генеалогия. Вып. 5. Екатеринбург – Париж, 1995. С. 42–59.
53. Контамин Ф. Война в Средние века. Санкт-Петербург, 2001.
54. Корсунский А. Р. Гюнтер Р. Упадок и гибель Западной Римской империи и возникновение германских королевств (до середины VI в.). Москва, 1984.
55. Котлярчук А. Швэды ў гісторыі і культуры беларусаў. Менск, 2002.
56. Краўцэвіч А. Утварэнне Вялікага Княства Літоўскага. Rzeszyw, 2000.

57. Куликаускене Р. К. Погребения с конями у древних литовцев // Советская археология. XVII. Москва, 1953. С. 211–222.
58. Ласкавы Г. В. Да пытання аб арганізацыі і складзе ўзброеных сіл Полацкай зямлі ў канцы XI – пачатку XIII стст. // Гістарычна-археалагічны зборнік. Ч. 2. Мн., 1993. С. 5–21.
59. Ласкавы Г.В. Узбраенне воінаў XII–XIII стст. з феадальных сядзібзамкаў паўночнага захаду Полацкай зямлі (па матэрыялах раскопак гарадзішчаў Прудніскі і Маскавічы) // Старонкі гісторыі Беларусі. С. 47–57.
60. Ласкавый Г. Викинги: Походы, открытия, культура. Мн., 2004.
61. Ласкавый Г.В. К истории оружия Белорусского Подвинья в VI–XIII вв. // Полоцкий летописец. № 1 (2). С. 19–38.
62. Ластоўскі. В. Падручны расійска-крыўскі (беларускі) слоўнік. Коўна, 1924.
63. Лебедев Г. С. Эпоха викингов в Северной Европе. Ленинград, 1985.
64. Леонардов Д. С. Полоцкий князь Всеслав и его время // Полоцко–Витебская старина. Вып. III. С. 87–180.
65. Лиддел-Гарт Б. Стратегия непрямых действий (Энциклопедия военного искусства). Москва–Санкт-Петербург, 1999.
66. Литва. Краткая энциклопедия. Вильнюс, 1989.
67. Лысенко П. Ф. Дреговичи. Мн., 1991.
68. Лысенко П. Ф. Туровская земля IX–XIII вв. Мн., 2001.
69. Мельникова Е. А. Петрухин В. Я. Название «Русь» в этнокультурной истории древнерусского государства (IX–X вв.) // Вопросы истории. № 8. Москва, 1989. С. 24–38.
70. Моора Х. А. Возникновение классового общества в Прибалтике (По археологическим данным) // Советская археология. XVII. Москва, 1953. С. 105–132.
71. Мюллер Л. Понять Россию: историко-культурные исследования. Москва, 2000.
72. Нефёдкин А. К. Тактика славян в VI в. (по свидетельствам ранневизантийских авторов) // Византийский временник. Т. 62 (87). Москва, 2003. С. 79–91.
73. Носов К. С. Русские крепости и осадная техника VIII–XVII вв. Санкт-Петербург. 2003.
74. Нюлен Э. Эпоха викингов и раннее средневековье в Швеции // Славяне и скандинавы. С. 155–168.
75. Охманьский Е. Литовско-кривичское пограничье в племенную эпоху // Становление раннефеодальных славянских государств. Киев, 1972. С. 245–257.
76. Пашуто В. Т. Внешняя политика Древней Руси. Москва, 1968.
77. Пашуто В. Т. Образование Литовского государства. Москва, 1959.
78. Петрухин В. Я. Начало этнокультурной истории Руси IX–XI веков. Смоленск, 1995.

79. Піваварчык С. Беларускае Панямонне ў раннім сярэднявеччы (X – XIII ст.ст.) // Bia³oruskie Zeszyty Historyczne. Nr. 2 (6). Bia³ystok, 1996. Сайт «Камунікат»; http://kamunikat.net.iig.pl/ - Па адрасе: http://kamunikat.net.iig.pl/www/czasopisy/bzh/06/06art_pivavarczyk.htm - 09.26.2003.
80. Плавінскі А., Плавінскі М. Новыя дадзеныя па гісторыі Браслаўскага Паазер'я на мяжы I і II тыс. н. э. (па матэрыялах раскопак курганнага магільніка Опса) // Браслаўскія чытанні. Матэрыялы VI навукова-краязнаўчай канферэнцыі, прысвечанай 150-й гадавіне з дня нараджэння браслаўскага лекара, грамадскага дзеяча Станіслава Нарбута (1853–1926) 7–8 мая 2003 года. Браслаў, 2003. С. 78–80.
81. Плавінскі М. Адзін з тыпаў сярэднявечных мечаў з тэрыторыі Беларусі // Гістарычны альманах. Т. 10. Гародня, 2004. С. 201–207.
82. Плавінскі М.А. Засцерагальнае ўзбраенне IX–XIII стст. на тэрыторыі Беларусі // Гістарычна-археалагічны зборнік. № 16. Мн., 2001. С. 138–150.
83. Пчелов Е. В. Легендарная и начальная генеалогия Рюриковичей // Летопись Историко-родословного общества в Москве. Вып. 2 (46). Москва, 1994. С. 27–39.
84. Разин Е. А. История военного искусства. Т. 1. Москва, 1955., Т. 2. Москва, 1957.
85. Рапов О. М. Русская церковь в IX – первой трети XII в. Москва, 1988.
86. Раппопорт П. А. Военное зодчество западнорусских земель X–XIV вв. // Материалы и исследования по археологии СССР. № 140. Ленинград, 1967.
87. Рассадзін С. Я. Этнас поўдня Беларусі ў далетапісны час // Старонкі гісторыі Беларусі. С. 12–25.
88. Рыбаков Б. А. Отрицательный герой «Слова о полку Игореве» // Культура Древней Руси. С. 238–242.
89. Рыдзевская Е. А. Древняя Русь и Скандинавия в IX–XIV вв. Москва, 1978.
90. Рябцевич В.Н. Нумизматика Беларуси. Мн., 1995.
91. Сахаров А.Н. Дипломатия древней Руси: IX – первая половина X в. Москва, 1980.
92. Седин А. Никодимово – городище третьей четверти I-го тысячелетия н. э. в Восточной Беларуси // Край=Kraj. Polonica – Albaruthenica – Lithuanica. Магілёў, 2000. С. 31–42.
93. Седов В. В. Курганы ятвягов // Советская археология. № 4. Москва, 1964. С. 36–51.
94. Седов В. В. Славяне Верхнего Поднепровья и Подвинья // Материалы и исследования по археологии СССР. № 163. Москва, 1970.
95. Селицкий А. И. «Воданические короли»: религиозный аспект формирования королевской власти у древних германцев // Скандинав-

ские чтения 2000 года: Этнографические и культурно-исторические аспекты. С. 20–69.
96. Семянчук Г. Усяслаў Брачыславіч, князь полацкі (штрыхі да гістарычнага партрэта). // Bialoruskie Zeszyty Historyczne. Nr. 18. Bialystok, 2002. Сайт «Камунікат»; http://kamunikat.net.iig.pl/ - Па адрасе: http://kamunikat.net.iig.pl/www/czasopisy/bzh/18/18art_siemianczuk.htm - 06.16.2004.
97. Сойер П. Эпоха викингов. Санкт-Петербург, 2002.
98. Тарасаў С. В. Полацк IX–XVIII стст.: Гісторыя і тапаграфія. Мн., 2001.
99. Тарасаў С. В. Чарадзей сёмага веку Траяна: Усяслаў Полацкі. Мн., 1991.
100. Татищев В. Н. История Российская. Т. 2. Москва–Ленинград, 1963. Т. 3. Москва–Ленинград, 1964.
101. Толочко П. П. Нащадки Мономаха. Київ, 1972.
102. Трусаў А. А. Собаль В. Е. Здановіч Н. І. Стары замак у Гродне XI–XVIII стст.: Гісторыка-археалагічны нарыс. Мн., 1993.
103. Успенский Ф. И. История Византийской империи, XI–XV вв. Москва, 1997.
104. Федорова Е. В. Люди императорского Рима. Москва, 1990.
105. Филист Г. М. История «преступлений» Святополка Окаянного. Мн., 1990.
106. Финно-угры и балты в эпоху средневековья. Москва, 1987.
107. Флори Ж. Идеология меча. Предыстория рыцарства. Санкт-Петербург, 1999.
108. Фроянов. И. Я. Исторические реалии в летописном сказании о призвании варягов // Вопросы истории. № 6. Москва, 1991. С. 3–15.
109. Фроянов И. Я. Киевская Русь: Очерки социально-политической истории // Фроянов И. Я. Начала русской истории. Избранное. Москва, 2001.
110. Фроянов И. Я. Киевская Русь: Очерки социально-экономической истории // Фроянов И. Я. Начала русской истории. Избранное. С. 420–423.
111. Фроянов И. Я. Рабство и данничество. Санкт-Петербург, 1996.
112. Херрман Й. Славяне и норманны в ранней истории Балтийского региона // Славяне и скандинавы. С. 8–128.
113. Хит И. Викинги. Москва, 2004.
114. Чарняўскі М. М. Ілюстраваная гісторыя старадаўняй Беларусі: Першабытны перыяд. Мн., 2003.
115. Чичуров И. С. Политическая идеология средневековья (Византия и Русь). Москва, 1990.
116. Штыхаў Г. В. Крывічы. Мн., 1992.
117. Штыхов Г. В. Города Полоцкой земли. Мн., 1978.
118. Штыхов Г. В. Древний Полоцк IX–XIII вв. Мн., 1975.

119. Aron, Raymon, Peace and War: A Theory of International Relations (Malabari, Fla.: Krieger, 1981).
120. Baranauskas T. Lietuvos valstybės ištakos. Vilnius, 2000.
121. Baranauskas T. Saxo Grammaticus on the Balts. // Site «Medeival Lithuania»; http://viduramziu.lietuvos.net - At: http://viduramziu.lietuvos.net/en/vikings.htm - 09.01.2004.
122. Baubonis Z. Kūlgrindų, medgrindų ir žemgrindų klausimu // Aktualūs kultūros paminklų tyrinлjimų uždaviniai: Konferencijos pranešimų tezės. Vilnius, 1988. 47–53.
123. Girininkas A., Lukopešičius O. Lietuvos priešistorė. Materialinės ir dvasinės kultūros raida, genčių formavimasis. Vilnius, 1997.
124. Oleg Łatyszonek, Ales' Bely. On the Scandinavian Origin of Rahvalod. // Annus Albaruthenicus 2005. Krynki, 2005. 49–64.
125. Lindwall, Bo. Konung Erik XIV:s antavla i fjorton generationer. // Site «Nättidningen RÖTTER», http://www.genealogi.se/ - At: http://www.genealogi.se/erik.htm - 18.10.2004.
126. Lowmiański, Henryk. Studja nad początkami społeczeństwa i państwa Litewskiego. Tom II. Wilno, 1932.
127. Morgenthau, Hans J., *Politics Among Nations* (New York: McGraw-Hill, Inc., 1992).
128. Morgenthau, Hans J., *Scientific Man vs. Power Politics* (Chicago: University of Chicago Press, 1946).
129. Murrey, Stephen J. The Struggle for Northumbria. // Site «From Dot To Domesday»; http://www.stephen.j.murray.btinternet.co.uk/index.htm - At: http://www.stephen.j.murray.btinternet.co.uk/athelstan.htm - 10.03.2004.
130. Narbutt, Teodor. Dzieje staroïytne narodu litewskiego. Wilno, 1838. T. 3.
131. Ochmański, Jerzy. Historia Litwy. Wrocław, 1990.
132. Polska technika wojskowa do 1500 roku. Warszawa, 1994.
133. Walter, Christopher. The Warrior Saints in Byzantine Art and Tradition. Aldershot, 2003.
134. Waltz, Kenneth N., Man, the State and War: A Theoretical Analysis. (New York: Columbia University Press, 1959).
135. Wight, Martin, Wars of Gain, Fear and Doctrine, in Lawrence Freedman ed., *War* (Oxford: Oxford University Press, 1994). 90-94.
136. Zabiela G. Lietuvos medinės pilys. Vilnius, 1995.
137. • ygulski Z. Jun. Broń w dawnej Polsce na tle uzbrojenia Europy i Bliskiego Wschodu. Warszawa, 1982.

*Навуковае выданне*

**Новікаў** Ягор Уладзіміравіч

**Ваенная гісторыя беларускіх земляў**
(да канца XII ст.)
Том 2.

*Навуковы рэдактар* У. І. Кананові
*Карэктар* А. В. Высоцкая
*Дызайн* С. Ждановіч

Падпісана ў друк 27.11.2007 г. Фармат 84x108 1/32.
Папера афсетная. Друк афсетны. Гарнітура Newton.
Ум. друк. арк. 16,38. Ул.-выд. арк. 16,5. Наклад 500 асоб.
Замова № 1115.

**Выдавец І. П. Логвінаў.**
ЛИ 02330/013307 ад 30.04.2004 г.
220050, г. Мінск, пр-т Ф. Скарыны, 19–5.
logvinovpress@mail.ru

Друк **ТДА «НоваПрынт».**
ЛП 02330/0056647 ад 27.03.2004 г.
220047, г. Мінск, вул. Купрэвіча, 2.

Другі том кнігі Я.У. Новікава прысвечаны двум апошнім перыядам раннесярэднявечнай ваеннай гісторыі беларускіх земляў. Час магутнасці працягваецца ад 970–х гг. да 1101 г. і адзначае росквіт Полацкага княства і Кіеўскай дзяржавы, у склад якіх уваходзілі тады беларускія землі. Час міжусобных войнаў ахоплівае 1102–1200 гг. Зместам яго з'яўляецца палітычны крызіс старажытнарускіх княстваў і іх міжусобныя войны, якія садзейнічалі ўзвышэнню Літвы і заклалі падмуркі ўзнікнення Вялікага Княства Літоўскага. Акрамя гісторыі Полацкага і Тураўскага княстваў і гарадоў Беларускага Панямоння даследванне таксама закранае падзеі гісторыі Смаленшчыны, часткова Чарнігаўшчыны, Літвы, яцвягаў і Падляшша, разглядаючы іх як неад'емную частку беларускай палітычнай і этнічнай гісторыі.

ISBN 978-985-6800-65-1

9 789856 800651

Логвінаў

II • ВАЕННАЯ ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯЎ • Λ